# АПОШНІЯ
# СВЕДКІ

СВЯТЛАНА АЛЕКСІЕВІЧ



ГАЛАСЫ УТОПІІ

ДА 70-ГОДДЗЯ
СВЯТЛАНЫ АЛЕКСІЕВІЧ

Выдадзена
пры дапамозе
краўдфандынгу
Ulej.by

Паважаны чытач!

Гэтае унікальнае выданне стала магчымае дзякуючы супольным намаганням грамадскасці Беларусі, краўдфандынгавай платформы Ulej.by, «Белгазпрамбанка» і Цэнтра выяўленчага і медыямастацтва «Новая культурная ініцыятыва».

У найноўшым беларускім перакладзе апублікаваныя разам пяць кніг першай ў беларускай гісторыі лаўрэаткі Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры Святланы Алексіевіч, аб'яднаных у цыкл «Галасы Утопіі».

З мэтай зрабіць кнігі Алексіевіч даступнымі для чытачоў нашай краіны «Белгазпрамбанк» падбаў, каб гэтае выданне можна было знайсці ва ўсіх беларускіх бібліятэках.

СВЯТЛАНА АЛЕКСІЕВІЧ

# АПОШНІЯ СВЕДКІ

Сола для дзіцячага голасу

Пераклаў з рускай
Барыс Пятровіч

Логвінаў

Дакументальна-мастацкая хроніка «Галасы Утопіі» — пяць кніг, у якіх «маленькі чалавек» сам апавядае пра свой лёс. Гэта адметны жанр — шматгалосыя раманы-споведзі, у якіх з малых падзеяў складваецца вялікая гісторыя.

Перад чытачом — апошняя аўтарская рэдакцыя цыкла ў найноўшым беларускім перакладзе. Пісьменніца паводле свайго творчага метаду дапрацавала хроніку: скасавала цэнзурныя праўкі, далучыла новыя эпізоды, а таксама старонкі з уласнага дзённіка.

«Апошнія сведкі» — другая кніга хронікі. Успаміны пра Другую сусветную вайну дзяцей — самых бесстаронніх і самых няшчасных яе сведак. Вайна, убачаная дзіцячымі вачыма, выявілася яшчэ больш пераканаўчай і уражальнай, чымсьці адлюстраваная жаночымі поглядамі ў кнізе «У вайны не жаночы твар».

ISBN 978-609-8213-33-1

© Святлана Алексіевіч, 2018
© Барыс Пятровіч, пераклад на беларускую мову, 2018
© Logvino literatūros namai, 2018

# ЗАМЕСТ ПРАДМОВЫ:

*...адна цытата*

Падчас Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945 гады) — загінулі мільёны савецкіх дзяцей: рускія, беларусы, украінцы, габрэі, татары, латышы, цыганы, казахі, узбекі, армяне, таджыкі...

*Часопіс «Дружба народов», 1985, №5*

*...і адно пытанне расійскага класіка*

Некалі Дастаеўскі паставіў пытанне: а ці знойдзецца апраўданне свету, нашаму шчасцю і нават вечнай гармоніі, калі ў імя гэтага, дзеля трываласці падмурку, будзе пралітая хоць бы адна слязінка нявіннага дзіцяці? І сам адказаў: слязінка гэтая не апраўдае ні аднаго прагрэсу, ні адной рэвалюцыі. Ні адной вайны. Яна заўсёды пераважыць.

Усяго адна слязінка...

## «ЁН АЗІРНУЦЦА БАЯЎСЯ...»

*Жэня Бялькевіч, 6 гадоў.*
*Цяпер — рабочая.*

Чэрвень сорак першага года...

Я запомніла. Я была зусім маленькая, але я ўсё запомніла...

Апошняе, што я запомніла з мірнага жыцця — казку, мама чытала яе на ноч. Маю любімую — пра Залатую рыбку. Я заўсёды ў Залатой рыбкі таксама што-небудзь прасіла: «Залатая рыбка... Маленькая Залатая рыбка...» І сястрычка прасіла. Яна прасіла па-іншаму: «Па шчупаковым заданні, па маім жаданні...» Хацелі, каб мы паехалі на лета да бабулі, і каб тата з намі паехаў. Ён жа такі вясёлы.

Раніцай прачнулася ад жаху. Ад нейкіх незнаёмых гукаў...

Мама з татам думалі, што мы спім, а я ляжала побач з сястрычкай і прыкідвалася, што сплю. Бачыла: тата доўга цалаваў маму, цалаваў твар, рукі, а я здзіўлялася: ніколі раней ён так не цалаваў. У двор яны выйшлі, трымаючыся за рукі, я падскочыла да вакна — мама павісла ў таты на шыі і не адпускала яго. Ён адарваў яе ад сябе і пабег, яна дагнала і зноў не пускае і штосьці крычыць. Тады я таксама закрычала: «Тата! Тата!»

Прачнуліся сястрычка і брацік Вася, сястрычка ўбачыла, што я плачу, і таксама закрычала: «Тата!» Ён убачыў нас і, як цяпер памятаю, абхапіў галаву рукамі і пайшоў, нават пабег. Ён азірнуцца баяўся.

Сонца свяціла мне ў твар. Так цёпла… І цяпер не верыцца, што мой тата тым ранкам ішоў на вайну. Я была зусім маленькая, але мне здаецца, я ўсведамляла, што бачу яго апошні раз. Больш ніколі не сустрэну. Я была зусім… зусім маленькая…

Так і спалучылася ў маёй памяці, што вайна — гэта калі няма таты…

А потым памятаю: чорнае неба і чорны самалёт. Каля шашы ляжыць наша мама з раскінутымі рукамі. Мы просім яе ўстаць, а яна не ўстае. Не падымаецца. Салдаты загарнулі маму ў плашч-палатку і пахавалі ў пяску, на тым жа месцы. Мы крычалі і прасілі: «Не закопвайце нашу маму ў ямку. Яна прачнецца і мы пойдзем далей». Па пяску поўзалі нейкія вялікія жукі… Я не магла ўявіць, як мама будзе жыць пад зямлёй з імі. Як мы яе потым знойдзем, як мы сустрэнемся? Хто напіша нашаму тату?

Нехта з салдатаў пытаўся ў мяне: «Дзяўчынка, як цябе завуць?» А я забыла. «Дзяўчынка, а як тваё прозвішча? Як завуць тваю маму?» Я не памятала… Мы сядзелі каля мамінага грудочка да ночы, пакуль нас не падабралі і не пасадзілі на воз. Поўны воз дзяцей. Вёз нас нейкі дзядок, збіраў усіх па дарозе. Прыехалі ў чужую вёску, і нас разабралі па хатах чужыя людзі.

Я доўга не размаўляла. Толькі паглядала.

Потым памятаю — лета. Яркае лета. Чужая жанчына гладзіць мяне па галаве. Я пачынаю плакаць. І пачынаю гаварыць… Расказваю пра маму і тату. Як тата бег ад нас і нават не азірнуўся… Як мама ляжала… Як поўзалі жукі па пяску…

Жанчына гладзіць мяне па галаве. У гэтыя хвіліны я зразумела: яна падобная да маёй мамы…

## «МАЯ ПЕРШАЯ І АПОШНЯЯ ЦЫГАРЭТА...»

*Гена Юшкевіч, 12 гадоў.*
*Цяпер — журналіст.*

Ранак першага дня вайны...

Сонца. І незвычайная цішыня. Незразумелае маўчанне.

Наша суседка, жонка вайскоўца, выйшла ў двор уся ў слязах. Яна штосьці шапнула маме, але паказала знакамі, што трэба маўчаць. Усе баяліся вымавіць услых тое, што здарылася, нават тады, калі ўсё ведалі, бо ўжо камусьці паспелі паведаміць. Але яны баяліся, каб іх не назвалі правакатарамі. Панікёрамі. А гэта страшней за вайну. Яны баяліся... Гэта я цяпер так думаю... І, вядома, ніхто не верыў. Што вы! Наша армія — на мяжы, нашы правадыры — у Крамлі! Краіна надзейна абароненая, непрыступная для ворагаў! Гэта я тады так думаў... Я быў піянерам.

Слухалі радыё. Чакалі выступу Сталіна. Ягоны голас быў патрэбны. Але Сталін маўчаў. Потым выступіў Молатаў. Усе слухалі. Молатаў сказаў: «Вайна». Усё роўна яшчэ ніхто не верыў. Дзе Сталін?

Наляцелі на горад самалёты... Дзясяткі незнаёмых самалётаў. З крыжамі. Яны занялі ўсё неба, закрылі сонца. Жах! Пасыпаліся бомбы... Безупынна чуліся выбухі. Трэск. Усё адбывалася нібы ў сне. Не на яве. Я ўжо быў не маленькі, я запомніў свае пачуцці. Свой страх, які распаўзаўся па ўсім целе. Па ўсіх словах. Думках. Мы

выскачылі з дома, беглі кудысьці па вуліцы… Мне здавалася, што горада ўжо няма, адны руіны. Дым. Агонь. Нехта сказаў: трэба бегчы на могілкі, бо могілкі бамбіць не будуць. Навошта бамбіць мёртвых? У нашым раёне былі вялікія габрэйскія могілкі са старымі дрэвамі. І ўсе кінуліся туды, там сабраліся тысячы людзей. Яны абдымалі камяні, хаваліся за пліты.

Там мы з мамай прасядзелі да ночы. Ніхто вакол не вымавіў слова «вайна», я чуў іншае слова — «правакацыя». Яго паўтаралі ўсе. Размовы былі, што вось-вось нашы войскі пяройдуць у наступ. Сталін даў загад. І ў гэта верылі.

Але ўсю ноч гулі заводскія трубы на ўскраінах Мінска…

Першыя забітыя…

Першым… убачыў забітага каня… Потым… забітую жанчыну… Гэта мяне здзівіла. Я думаў, што на вайне забіваюць толькі мужчынаў.

Прачнуся ранкам… Хачу ўстаць, а потым згадваю, што вайна. І заплюшчваю вочы. Не хочацца верыць.

На вуліцах перасталі страляць. Раптам цішыня. Некалькі дзён было ціха. І потым адразу пачаўся рух… Ідзе, напрыклад, белы чалавек, увесь ад чаравікаў да валасоў белы. У муцэ. І нясе на сабе белы мех. Наступны бяжыць… У яго з кішэнь падаюць бляшанкі кансерваў. Цукеркі… Пачкі тытуню… Нехта нясе перад сабой шапку з цукрам… Каструлю з цукрам… Не апісаць! Адзін цягне рулон тканіны, іншы ідзе ўвесь абматаны сінім сітцам. Чырвоным… Смешна, але ніхто не смяецца. Гэта разбамбілі харчовыя склады… Вялікую краму недалёка ад нашага дома… Людзі кінуліся разбіраць тое, што там засталося. На цукровым заводзе некалькі чалавек утапілася ў чанах з цукровай патакай. Жах! Увесь

горад лушчыць семкі. На маіх вачах прыбегла да крамы жанчына… У яе з сабой нічога не было: ні мяшка, ні сеткі — дык яна зняла з сябе начную сарочку. Рэйтузы. І набіла іх грэцкімі крупамі. Пацягнула. Усё гэта чамусьці моўчкі. Ніхто не размаўляў.

Калі я паклікаў маму, засталася адна гарчыца, жоўтыя слоікі з гарчыцай. «Не бяры нічога», — прасіла мама. Пазней яна прызналася, што ёй было сорамна, бо ўсё жыццё яна вучыла мяне іншаму. Нават калі мы галадалі і ўспаміналі тыя дні, усё роўна ні пра што не шкадавалі. Такая была мая мама.

Па горадзе… Па нашых вуліцах спакойна гулялі нямецкія салдаты. Здымалі ўсё на кінастужку. Смяяліся. У нас да вайны была любімая гульня, мы малявалі немцаў. Малявалі іх з вялікімі зубамі. Ікламі. А тут яны ходзяць… Маладыя, прыгожыя… З прыгожымі гранатамі, засунутымі за халявы каваных ботаў. Іграюць на губных гармоніках. Нават жартуюць з нашымі прыгожымі дзяўчатамі.

Сталы немец цягне нейкую скрынку. Скрынка цяжкая. Ён паклікаў мяне і паказаў: дапамажы. У скрынкі былі дзве ручкі, мы ўзяліся з ім за гэтыя ручкі. Калі данеслі, куды трэба, немец паляпаў мяне па плячы і дастаў з кішэні пачок цыгарэт. Вось, маўляў, плата.

Я прыйшоў дамоў. Мне карціць, сеў наварыўні і закурыў. І не пачуў, як грукнулі дзверы, заходзіць мама:

— Курыш?

— М-м…

— А цыгарэты чые?

— Нямецкія.

— Курыш, ды яшчэ цыгарэты ворагаў. Гэта здрада Радзіме.

То была мая першая і апошняя цыгарэта.

Аднойчы ўвечары мама села каля мяне:

—Мне невыносна, што яны тут. Ты мяне разумееш?

Яна жадала змагацца. З першых дзён. Мы вырашылі шукаць падпольшчыкаў, мы не сумняваліся, што яны ёсць. Ні на хвілю не сумняваліся.

—Я люблю цябе больш за ўсіх на свеце, — сказала мама. — Але ты мяне разумееш? Ты мне даруеш, калі з намі нешта здарыцца?

Я любіў сваю маму, з гэтага моманту я слухаў яе не пярэчачы. І гэта потым засталося на ўсё жыццё.

## «БАБУЛЯ МАЛІЛАСЯ... ЯНА ПРАСІЛА, КАБ МАЯ ДУША ВЯРНУЛАСЯ...»

*Наташа Голік, 5 гадоў.*
*Цяпер — архітэктарка.*

Я навучылася маліцца... Часта ўзгадваю, як у вайну навучылася маліцца...

Сказалі: вайна, я — і гэта зразумела — у пяць гадоў не ўяўляла за гэтым ніякіх малюнкаў. Ніякіх страхаў. Але ад страху, менавіта ад страху, заснула. І спала два дні. Два дні ляжала, як лялька. Усе думалі, што я памерла. Мама плакала, а бабуля малілася. Яна малілася два дні і дзве ночы.

Я расплюшчыла вочы, і першае, што памятаю — святло. Яркае-яркае святло, незвычайна яркае. Мне ад гэтага святла стала балюча. Чую чыйсьці голас, пазнаю: гэта маёй бабулі голас. Бабуля стаіць перад абразом і моліцца. «Бабуля... Бабуля...» — паклікала я яе. Яна не азірнулася. Не паверыла, што я яе клічу... А я прачнулася ўжо... расплюшчыла вочы...

— Бабуля, — потым пытала я, — як ты малілася, калі я памірала?

— Я прасіла, каб твая душа вярнулася.

Праз год памерла наша бабуля. Я ўжо ўмела маліцца. Я малілася і прасіла, каб яе душа вярнулася.

А яна не вярнулася.

## «ЯНЫ ЛЯЖАЛІ НА ВУГОЛЛІ РУЖОВЫЯ...»

*Каця Каратаева, 13 гадоў.*
*Цяпер — інжынер-гідратэхнік.*

Раскажу пра пах... Як пахне вайна...

Да вайны я закончыла шэсць класаў. Тады ў школе было так, што пачынаючы з чацвёртага класа ўсе здавалі іспыты. І вось мы здалі апошні іспыт. Гэта быў чэрвень, а травень і чэрвень у сорак першым былі халодныя. Калі ў нас бэз цвіце недзе ў траўні, то ў той год ён цвіў у сярэдзіне чэрвеня. І таму пачатак вайны ў мяне назаўсёды звязаны з пахам бэзу. З пахам чаромхі. Гэтыя дрэвы заўсёды пахнуць мне вайной...

Жылі мы ў Мінску, і нарадзілася я ў Мінску. Бацька — вайсковы капельмайстар. Я хадзіла на вайсковыя парады з ім. Апроч мяне ў сям'і былі яшчэ два старэйшыя браты. Мяне, вядома, усе любілі і песцілі, як самую малодшую, ды яшчэ сястрычку.

Наперадзе — лета, наперадзе — канікулы. Гэта было вельмі радасна. Я займалася спортам, хадзіла ў Дом Чырвонай Арміі плаваць у басейне. І мне вельмі зайздрасцілі, нават хлопчыкі ў класе зайздрасцілі. А я выхвалялася, што ўмею добра плаваць. Дваццаць другога чэрвеня, у нядзелю, павінныя былі святкаваць адкрыццё Камсамольскага возера. Яго доўга капалі, будавалі, нават наша школа хадзіла на суботнікі. Я збіралася пайсці пакупацца адной з першых. А як жа!

У нас была завядзёнка раніцай хадзіць па свежыя булачкі. Гэта лічылася маім абавязкам. Па дарозе

я сустрэла сяброўку, яна мне сказала, што пачалася вайна. На нашай вуліцы было шмат садоў, дамы патаналі ў кветках. Я падумала: «Якая вайна? Што яна кажа?»

Дома бацька ставіў самавар... Не паспела я нічога расказаць, як пачалі прыбягаць суседзі, і ўва ўсіх на вуснах было адно і тое ж слова: «Вайна! Вайна!» А назаўтра ў сем раніцы самаму старэйшаму брату прынеслі позву ў ваенкамат. Удзень ён збегаў на працу, і яму аддалі грошы, ён атрымаў разлік. З гэтымі грашыма ён прыйшоў дадому і сказаў маме: «Я іду на фронт, мне нічога не трэба. Вазьмі гэтыя грошы. Купіце Каці новае паліто». А я, як толькі перайшла ў сёмы клас, стала старшакласніцай, марыла, што мне пашыюць сіняе бастонавае паліто з шэрым каракулевым каўняром. І ён пра гэта ведаў.

Я дагэтуль памятаю, што, ідучы на фронт, брат даў грошы мне на паліто. А жылі мы сціпла, дзірак у сямейным бюджэце хапала. Але мама купіла б мне тое паліто, калі брат прасіў. Нічога яна не паспела.

Мінск пачалі бамбіць. Мы перасяліліся з мамай у каменны склеп да суседзяў. У мяне была любімая котка, вельмі дзікая, далей за двор нікуды не хадзіла, але калі пачыналі бамбіць, і я бегла з двара да суседзяў, котка — за мной. Я яе ганю: «Ідзі дадому!» — а яна за мной. Яна таксама баялася заставацца адна. Нямецкія бомбы ляцелі з якімсьці звонам, з выццём. Я была дзяўчынка музычная, на мяне гэта моцна ўплывала. Гэтыя гукі... Было так страшна, што ў мяне былі мокрыя далонькі. У склепе з намі сядзеў суседскі чатырохгадовы хлопчык, ён не плакаў. У яго толькі вочы рабіліся вялікімі.

Спачатку гарэлі асобныя будынкі, потым загарэўся горад. Мы любім глядзець на агонь, на вогнішча, але страшна, калі гарыць дом, а тут агонь ішоў з усіх бакоў,

неба і вуліцы засцілаў дым. І месцамі — моцнае асвятленне... Ад агню... Памятаю тры адчыненыя вакны ў нейкім драўляным доме, на падаконніках — раскошныя філакактусы. Людзей у гэтым доме ўжо няма, толькі кактусы цвітуць... Было такое ўражанне, што гэта не чырвоныя кветкі, а полымя. Кветкі гараць.

Мы ўцякалі...

Па дарозе ў вёсках нас кармілі хлебам і малаком, больш нічога ў людзей не было. А мы — без грошай. Я пайшла з дому ў хустачцы, а мама чамусьці выбегла ў зімовым паліто і ў туфлях на высокіх абцасах. Нас кармілі так, дарма, ніхто пра грошы і не заікаўся. Бежанцы цяклі натоўпамі.

Потым хтосьці першы пераказаў, што дарога наперадзе перарэзаная нямецкімі матацыклістамі. Паўз тыя вёскі, паўз тых жа цётак з гладышкамі малака мы беглі назад. Прыбеглі на нашу вуліцу... Яшчэ колькі дзён таму тут была зеляніна, тут былі кветкі, а цяпер усё выпалена. Нават ад стогадовых ліпаў нічога не засталося. Усё было выпалена да жоўтага пяску. Кудысьці знік чарназём, на якім усё расло, толькі жоўты-жоўты пясок. Адзін пясок. Быццам стаіш каля свежавыкапанай магілы...

Засталіся заводскія печы, яны былі белыя, перапаліліся ў моцным полымі. Больш нічога знаёмага... Згарэла ўся вуліца. Згарэлі бабулькі і дзядулі і шмат маленькіх дзяцей, бо яны не ўцякалі разам з усімі, думалі — іх не зачэпяць. Агонь ні з кога не зліставаўся. Ідзеш — ляжыць чорны труп, значыць, стары чалавек згарэў. А ўбачыш здалёку штосьці маленькае, ружовае — значыць, дзіцё. Яны ляжалі на вуголлі ружовыя...

Мама зняла з сябе хустку і завязала мне вочы... Так мы дайшлі да нашага дома, да таго месца, дзе некалькі дзён таму стаяў наш дом. Дома не было. Нас сустрэла

цудам уратаваная наша котка. Яна прытулілася да мяне — і ўсё. Ніхто не мог гаварыць… Нават котка не мяўкала. Некалькі дзён яна маўчала. Усе анямелі.

Убачыла першых фашыстаў, нават не ўбачыла, а пачула — у іх усіх былі падкаваныя боты, яны гучна грукаталі. Грукаталі па нашай брукаванцы. А мне здавалася, што нават зямлі балюча, калі яны крочаць.

А бэз так цвіў у тым годзе… Чаромха цвіла…

## «А Я ЎСЁ РОЎНА ХАЧУ МАМУ...»

*Зіна Касяк, 8 гадоў.*
*Цяпер — цырульніца.*

Першы клас...

Я закончыла першы клас у траўні сорак першага года, і бацькі адвезлі мяне на лета ў піянерскі лагер у Гарадзішча пад Мінскам. Прыехала, адзін раз пакупалася, а праз два дні — вайна. Нас пасадзілі ў цягнік і павезлі. Ляталі нямецкія самалёты, а мы крычалі: «Ура!» Таго, што гэта могуць быць чужыя самалёты, мы не разумелі. Пакуль яны не пачалі бамбіць... Тады зніклі ўсе фарбы. Усе колеры. З'явілася ўпершыню слова «смерць», усе пачалі казаць гэтае незразумелае слова. А мамы і таты няма побач.

Калі ад'язджалі з лагера, кожнаму ў навалку што-небудзь насыпалі — каму круп, каму цукру. Нават самых маленькіх не забылі, усім давалі што-небудзь з сабой. Хацелі ўзяць як мага болей прадуктаў у дарогу, і гэтыя прадукты вельмі берaглі. Але ў цягніку мы ўбачылі параненых салдатаў. Яны стагналі, ім было так балюча, што хацелася ўсё аддаць гэтым салдатам. Гэта ў нас называлася «карміць татаў». Усіх вайскоўцаў мы называлі татамі.

Нам распавялі, што Мінск згарэў, згарэў увесь, там ужо немцы, а мы едзем у тыл. Едзем туды, дзе няма вайны.

Везлі больш за месяц. Накіруюць у нейкі горад, прыбудзем на адрас, а пакінуць нас не могуць, бо ўжо блізка немцы. І так даехалі да Мардовіі.

Месца вельмі прыгожае, там вакол стаялі цэрквы. Дамы нізкія, а цэрквы высокія. Спаць не было на чым, спалі на саломе. Прыйшла зіма, а ў нас на чацвярых — адны чаравікі. А потым пачаўся голад. Галадаў не толькі дзіцячы дом, галадалі і людзі вакол нас, бо ўсё аддавалі фронту. У дзіцячым доме жылі дзвесце пяцьдзясят дзяцей, і аднойчы — паклікалі палуднаваць, а есці ўвогуле няма чаго. Сядзяць у сталоўцы выхавальніцы і дырэктар, глядзяць на нас, і вочы ў іх поўныя слёз. А была ў нас кабылка Майка… Яна была старая і вельмі ласкавая, мы вазілі на ёй ваду. На наступны дзень забілі гэтую Майку. І давалі нам ваду і такі маленькі кавалачак Майкі… Але ад нас гэта доўга ўтойвалі. Мы не змаглі б яе есці… Ні за што! Гэта быў адзіны конік у нашым дзіцячым доме. І яшчэ два галодныя каты. Шкілеты! Добра, думалі мы потым, гэта шчасце, што каты такія худыя, нам не давядзецца іх есці. Бо няма там чаго есці.

Хадзілі мы з вялізнымі жыватамі, я, напрыклад, магла з'есці вядро супу, бо ў тым супе нічога не было. Колькі мне будуць наліваць, столькі я буду есці і есці. Ратавала нас прырода, мы былі як жвачная жывёла. Вясной вакол дзіцячага дома ў радыусе некалькіх кіламетраў не распускалася ніводнае дрэва… Мы з'ядалі ўсе пупышкі, здзіралі нават маладую кару. Елі траву, усю без разбору елі. Нам далі бушлаты, і ў гэтых бушлатах мы прарабілі кішэні і насілі з сабой траву, насілі і жавалі. Лета нас ратавала, а зімой рабілася вельмі цяжка. Маленькіх дзяцей, нас было чалавек сорак, пасялілі асобна. Па начах — плач. Клікалі маму і тату. Выхавальнікі і настаўнікі стараліся не прамаўляць пры нас слова «мама». Яны расказвалі нам казкі і падбіралі такія кніжкі, каб там не было гэтага слова. Калі ж хтосьці казаў «мама», адразу пачынаўся плач. Няўцешны плач.

Вучыцца я зноў пайшла ў першы клас. А атрымалася так: першы клас я закончыла з пахвальным лістом, аднак калі мы прыехалі ў дзіцячы дом і ў нас спыталі, у каго пераэкзаменоўка, я сказала, што ў мяне, бо падумала, што пераэкзаменоўка — гэта і ёсць пахвальны ліст. У трэцім класе я ўцякла з дзіцячага дома. Пайшла шукаць маму. Галодную і знясіленую, мяне знайшоў у лесе дзядуля Бальшакоў. Даведаўся, што я з дзіцячага дома, і забраў да сябе ў сям'ю. Жылі яны ўдваіх з бабуляй. Я падужэла і стала ім дапамагаць па гаспадарцы: траву збірала, бульбу палола — усё рабіла. Елі мы хлеб, але гэта быў такі хлеб, што ў ім было мала хлеба. Горкі-горкі. У муку дамешвалі ўсё, што малолася: лебяду, кветкі арэха, бульбу. Я да гэтага часу не магу спакойна глядзець на тлустую траву і ем шмат хлеба. Ніяк не магу наесціся... За дзясяткі гадоў...

Колькі я ўсё-ткі памятаю... Шмат яшчэ памятаю...

Я памятаю звар'яцелую маленькую дзяўчынку, якая залазіла да кагосьці ў агарод, знаходзіла норку і вартавала каля яе мышку. Дзяўчынка хацела есці. Я памятаю ейны твар, нават сарафанчык, у якім яна хадзіла. Аднойчы я падышла да яе і яна мне... расказала... Пра мышку... Мы разам сядзелі і вартавалі-чакалі тую мышку.

Усю вайну я марыла, што, калі скончыцца вайна, мы запражом з дзядулем коніка і паедзем шукаць маму. У хату заходзілі эвакуяваныя, я ўва ўсіх пытала, ці не сустракалі яны маёй мамы. Эвакуяваных было шмат, так шмат, што ў кожнай хаце стаяў чыгун цёплай крапівы. Калі людзі зойдуць, каб было ім што-небудзь цёплае пасёрбаць. Больш не было чаго даць. Але чыгун крапівы стаяў у кожнай хаце... Я гэта добра памятаю. Я тую крапіву збірала.

Вайна скончылася... Чакаю дзень, два, па мяне ніхто не едзе. Мама па мяне не едзе, а тата, я ведала, у арміі. Прачакала я так два тыдні, больш чакаць не было сілаў. Залезла ў нейкі цягнік пад лаўку і паехала... Куды? Не ведала. Я думала (гэта ж дзіцячае разуменне было), што ўсе цягнікі ідуць у Мінск. А ў Мінску мяне чакае — мама! Потым прыедзе наш тата... Герой! З ордэнамі, з медалямі.

Яны прапалі, загінулі недзе пад бамбёжкай. Суседзі потым расказвалі — паехалі ўдваіх шукаць мяне. Пабеглі на станцыю.

Мне ўжо пяцьдзясят адзін год, у мяне ёсць свае дзеці. А я ўсё адно хачу маму.

## «ТАКІЯ ПРЫГОЖЫЯ НЯМЕЦКІЯ ЦАЦКІ...»

*Таіса Насветнікава, 7 гадоў.*
*Цяпер — настаўніца.*

Перад вайной...

Як я сябе памятаю... Усё было добра: дзіцячы садок, ранішнікі, наш двор. Дзяўчаткі і хлопчыкі. Я шмат чытала, баялася чарвякоў і любіла сабакаў. Жылі мы ў Віцебску, тата працаваў у будаўнічым упраўленні. З дзяцінства больш за ўсё запомніла, як тата вучыў мяне плаваць у Дзвіне.

А потым была школа. Ад школы ў мяне засталося такое ўражанне: вельмі шырокая лесвіца, шкляная празрыстая сценка, вельмі шмат сонца і вельмі шмат радасці. Было такое адчуванне, што жыццё — гэта свята.

У першыя ж дні вайны тата пайшоў на фронт. Я памятаю развітанне на вакзале... Тата ўвесь час казаў маме, што яны адгоняць немцаў, але хацеў, каб мы эвакуяваліся. Мама не разумела: навошта? Калі мы застанемся дома, ён знойдзе нас хутчэй. Адразу. А я ўсё паўтарала: «Татачка, міленькі! Толькі вяртайся хутчэй. Татачка, міленькі...»

Паехаў тата, праз некалькі дзён з'ехалі і мы. Па дарозе нас увесь час бамбілі, бамбіць нас было лёгка, бо ўсе эшалоны ў тыл ішлі праз кожныя пяцьсот метраў. Ехалі мы ўлегцы: у мамы была сацінавая сукенка ў белы гарошак, а ў мяне сітцавы чырвоны сарафанчык з кветачкамі. Усе дарослыя казалі, што чырвонае вельмі ўжо відаць зверху, і як толькі налёт, усе кідаліся па кустах,

а мяне чым толькі можна было накрывалі, каб мой гэты чырвоны сарафанчык не быў бачны, а то я бы ліхтар.

Ваду пілі з балотаў і канаў. Пачаліся страўнікавыя хваробы. Я таксама захварэла. Трое сутак не прыходзіла ў прытомнасць… Потым мама распавядала, як мяне ратавалі. Калі мы спыніліся ў Бранску, на суседнія рэйкі падалі вайсковы эшалон. Маёй маме было дваццаць шэсць гадоў, яна была вельмі прыгожая. Наш цягнік стаяў доўга. Яна выйшла з вагона, і нейкі афіцэр з таго эшалона сказаў ёй камплімент. Мама папрасіла: «Адыдзіце, я не магу бачыць вашай усмешкі. У мяне дачка памірае». Афіцэр аказаўся вайсковым фельчарам. Ён ускочыў у вагон, агледзеў мяне і паклікаў свайго сябра: «Хуценька прынясі чай, сухары і беладонну». Вось гэтыя салдацкія сухары… літровая пляшка моцнай гарбаты і некалькі таблетак беладонны ўратавалі мне жыццё.

Пакуль мы ехалі ў Акцюбінск, увесь эшалон перахварэў. Нас, дзяцей, не пускалі туды, дзе ляжалі мёртвыя і забітыя, нас абаранялі ад гэтай карціны. Мы чулі толькі размовы: там столькі закапалі ў яму, там столькі… Мама прыходзіла з бледным-бледным тварам, рукі ў яе дрыжэлі. А я ўсё распытвала: «А куды падзеліся людзі?»

Ніякіх пейзажаў не памятаю. І гэта вельмі дзіўна, бо я любіла прыроду. Запомніліся толькі тыя кусты, пад якімі мы хаваліся. Равы. Чамусьці мне здавалася, што нідзе няма лесу, мы едзем толькі сярод палёў, сярод нейкай пустэльні. Аднойчы зазнала такі страх, што пасля яго ўжо ніякага бамбавання не баялася. Нас не папярэдзілі, што цягнік стаіць дзесяць-пятнаццаць хвілін. Коратка. Цягнік пайшоў, а я засталася. Адна… Не памятаю, хто мяне падхапіў… Мяне літаральна ўкінулі ў вагон… Аднак не ў наш вагон, а ў нейкі перадапошні. Тады я ўпершыню спалохалася, што застануся адна,

а мама паедзе. Пакуль мама была побач, нішто не было страшна. А тут я анямела ад жаху. І пакуль мама да мяне не прыбегла, не абняла, я была нямая, ніхто ад мяне слова не змог дабіцца. Мама — гэта быў мой свет. Мая планета. Калі ў мяне нават штосьці балела, возьмешся за маміну руку, і балець перастае. Ноччу я заўсёды спала побач з ёй, чым шчыльней, тым менш страху. Калі мама блізка, здаецца, што ў нас усё — як раней дома было. Заплюшчыш вочы — ніякай вайны няма. Мама толькі не любіла размаўляць пра смерць. А я ўвесь час распытвала...

З Акцюбінска паехалі ў Магнітагорск, там жыў татаў родны брат. Да вайны ў яго была вялікая сям'я, шмат мужчынаў, а калі мы прыехалі, у доме жылі адны жанчыны. Мужчыны ўсе пайшлі на вайну. Напрыканцы сорак першага мы атрымалі дзве пахавальныя — загінулі дзядзькавы сыны...

З той зімы яшчэ запомнілася вятранка, якой мы перахварэлі ўсёй школай. І чырвоныя штаны... Па картках мама атрымала адрэз бардовай байкавай тканіны, з якой пашыла мне штаны. І дзеці мяне дражнілі: «Манах у чырвоных штанах». Мне было вельмі крыўдна. Трохі пазней атрымалі па картках галёшы, я іх падвязвала і так бегала. Каля костачак яны націралі ранкі, дык увесь час пад пяткі даводзілася штосьці падкладваць, каб пятка стала вышэй і не было гэтых ранак. Зіма была такая халодная, што ў мяне ўвесь час мерзлі рукі і ногі. У школе часта ламалася ацяпленне, у класах замярзала вада на падлозе, і мы каталіся паміж партамі. Сядзелі ў паліто, у рукавічках, толькі абразалі іх, каб можна было трымаць ручку. Памятаю, што нам нельга было крыўдзіць і дражніць тых, у каго загінуў бацька. За гэта строга каралі. А яшчэ мы ўсе шмат чыталі. Як ніколі...

Перачыталі дзіцячую бібліятэку, юнацкую. І нам сталі даваць дарослыя кнігі. Іншыя дзяўчаткі баяліся… Нават хлопчыкі не любілі, прапускалі старонкі, дзе было пра смерць. А я чытала.

Выпала шмат снегу. Усе дзеці выбягалі на вуліцу і ляпілі снегавікоў. А я не разумела: як можна ляпіць снегавікоў і радавацца, калі вайна?

Дарослыя ўвесь час слухалі радыё, без радыё жыць не маглі. І мы таксама. Радаваліся кожнаму салюту ў Маскве, перажывалі кожнае паведамленне: як там на фронце? У падполлі, у партызанах? Выйшлі фільмы пра бітву пад Сталінградам і пад Масквой, дык мы па пятнаццаць-дваццаць разоў іх глядзелі. Тройчы запар будуць паказваць, і мы будзем тройчы глядзець. Фільмы паказвалі ў школе, спецыяльнай кіназалы не было, паказвалі ў калідоры, а мы сядзелі на падлозе. Па дзве-тры гадзіны сядзелі. Я запамінала смерць… Мама сварылася на мяне за гэта. Раілася з дактарамі, чаму я такая… Чаму мяне цікавяць такія недзіцячыя рэчы, як смерць. Як навучыць мяне думаць пра дзіцячае…

Я перачытала казкі… Дзіцячыя казкі… Што я зноў заўважыла? Я заўважыла, як шмат там забіваюць. Шмат крыві. Гэта стала для мяне адкрыццём…

Напрыканцы сорак чацвёртага года… Я ўбачыла першых палонных немцаў… Яны ішлі шырокай калонай па вуліцы. І мяне ўразіла, што людзі падыходзілі да іх і давалі хлеб. Мяне гэта так уразіла, што я пабегла на працу да мамы спытаць: «Чаму нашы людзі даюць немцам хлеб?» Мама нічога не сказала, яна толькі заплакала. Тады ж я ўбачыла першага мёртвага ў нямецкай форме, ён ішоў-ішоў у калоне і ўпаў. Калона пастаяла і рушыла далей, а каля яго паставілі нашага салдата. Я падбегла… Мяне цягнула паглядзець на смерць збліз-

ку, пабыць побач. Калі па радыё аб'яўлялі пра страты немцаў, я заўсёды радавалася... А тут... Я ўбачыла... Чалавек як быццам спаў... Ён нават не ляжаў, а сядзеў, паўсагнуўшыся, галава трохі на плячы. Я не ведала: ненавідзець мне яго ці шкадаваць? Гэта быў вораг. Наш вораг! Не памятаю, малады ён ці стары. Дужа стомлены. Праз гэта мне было цяжка яго ненавідзець. Я таксама маме пра гэта расказала. І яна зноў плакала.

Дзявятага мая мы прачнуліся раніцай ад таго, што ў пад'ездзе хтосьці вельмі гучна крычаў. Было яшчэ зусім рана. Мама пайшла даведацца, што здарылася, прыбегла разгубленая: «Перамога! Няўжо перамога?» Гэта было так нязвыкла: вайна скончылася, такая доўгая вайна. Хтосьці плакаў, хтосьці смяяўся, хтосьці крычаў... Плакалі тыя, хто страціў родных, радаваліся таму, што ўсё-ткі гэта — Перамога! У кагосьці была жменька круп, у кагосьці — бульба, у кагосьці — буракі, — усё знеслі ў адну кватэру. Я ніколі не забуду гэтага дня. Усю тую раніцу... Нават пад вечар ужо было не так...

У вайну ўсе чамусьці размаўлялі ціха, мне здавалася, што шэптам, а тут усе раптам загаварылі гучна. Мы ўвесь час былі побач з дарослымі, нас частавалі, нас лашчылі і праганялі: «Ідзіце на вуліцу. Сёння — свята». І клікалі назад. Нас ніколі столькі не абдымалі і не цалавалі, як у той дзень.

Аднак я — шчаслівы чалавек, у мяне вярнуўся з вайны тата. Тата прывёз прыгожыя дзіцячыя цацкі. Цацкі былі нямецкія. Я не магла зразумець, як могуць быць такія прыгожыя цацкі нямецкімі...

З татам я таксама паспрабавала загаварыць пра смерць. Пра бамбаванні, калі мы з мамай эвакуяваліся... Як уздоўж дарогі, абапал, ляжалі нашы мёртвыя салдаты. Твары іхныя былі прыкрытыя галінкамі, над

імі гулі мухі... Мноства мух... Пра мёртвага немца... Распавяла пра тату маёй сяброўкі, які вярнуўся з вайны і праз некалькі дзён памёр. Памёр ад хваробы сэрца. Я не магла зразумець: як можна памерці пасля вайны, калі ўсе шчаслівыя?

Тата маўчаў.

# «АДНА ЖМЕНЬКА СОЛІ... УСЁ, ШТО ЗАСТАЛОСЯ АД НАШАГА ДОМА...»

*Міша Маёраў, 5 гадоў.*
*Цяпер — кандыдат сельскагаспадарчых навук.*

Падчас вайны я любіў сны. Я любіў сны пра мірнае жыццё, пра тое, як мы жылі да вайны...

Першы сон...

Бабуля ўправілася па гаспадарцы... Я чакаю гэтай хвіліны. Вось яна адсоўвае стол да вакна, рассцілае тканіну, накладвае на яе вату, накрывае вату другім слоем тканіны і пачынае падшываць коўдру. У мяне таксама ёсць праца: з аднога боку коўдры бабуля ўбівае цвічкі, да іх пачаргова прывязвае шпагат, які націрае крэйдачкай, а я нацягваю яго з іншага боку. «Цягні, Мішачка, як мацней», — просіць бабуля. Я нацягваю — яна адпускае: бах — і гатовая крэйдавая палоска на чырвоным ці сінім сацінe. Палоскі перакрыжоўваюцца, атрымліваюцца ромбікі, па іх пабягуць швы чорных нітак. Наступная аперацыя: бабуля раскладвае папяровыя выкрайкі (цяпер гэта называецца трафарэтам), і на падшытай коўдры з'яўляецца малюнак. Вельмі прыгожа і цікава. Мая бабуля — майстрыца і кашулі шыць, асабліва ўдала ў яе каўняры атрымліваюцца. Ейная швейная машынка «Зінгер» працуе і тады, калі я ўжо сплю. І дзядуля спіць.

Другі сон...

Дзядуля займаецца шавецтвам. У мяне і тут ёсць справа — тачыць драўляныя шпількі. Цяпер усе

падноскі — на жалезных цвічках, але яны іржавеюць, і падноска хутка адвальваецца. Магчыма, і тады выкарыстоўваліся ўжо жалезныя цвічкі, але я памятаю драўляныя. З роўнай, без сучкоў цуркі старой бярозы трэба было напілаваць кружкоў і пакінуць іх сохнуць пад паветкай, потым насекчы брусочкаў таўшчынёй каля трох сантыметраў і даўжынёй сантыметраў дзесяць і таксама прасушыць. З гэтых брусочкаў лёгка адколваліся папярэчныя пласцінкі таўшчынёй два-тры міліметры. Шавецкі нож востры, і ім лёгка зрэзаць край у пласцінкі з двух бакоў: упрэшся ёю ў вярстак, жыкжык — і пласцінка вострая, а затым ужо адколвай цвічкі-шпількі. Дзядуля наколюшкам (такое шавецкае шыла) наколвае адтулінкі ў падноску бота, устаўляе шпільку, стук шавецкім малатком! — і цвік у падноску. Шпількі набіваюцца ў два шэрагі, гэта не толькі прыгожа, але і вельмі трывала: ад вільгаці сухія бярозавыя цвічкі толькі разбухнуць і яшчэ мацней будуць трымаць падносак, і ён не адскочыць, пакуль не зносіцца.

А яшчэ дзядуля падшывае валёнкі, дакладней, робіць другую падэшву на валёнках, яны тады даўжэй носяцца, і можна ў іх хадзіць без галёшаў. Ці абшывае скурай заднік валёнка, каб у галёшах той хутка не праціраўся. Мой абавязак — сукаць ільняную нітку, смаліць варам і вашчыць воскам дратву, уцягваць яе ў іголку. Але шавецкая цыравальная іголка — вялікая каштоўнасць, і таму дзядуля часцей за ўсё карыстаецца шчацінай, самай звычайнай шчацінай з карка дзіка, можна і са свойскага кабана, але яна мякчэйшая. У дзядулі такой шчэці — цэлы пук. Ёю можна і падэшву прышыць, і маленькую латачку ў нязручным месцы: шчацінка гнуткая і дзе заўгодна пралезе.

Трэці сон…

Старэйшыя хлопцы ў суседскім вялікім хляве арганізавалі тэатр, ідзе спектакль пра памежнікаў і шпіёнаў. Білеты — па дзесяць капеек, а ў мяне няма іх, і мяне не пускаюць, пачынаю раўці: я таксама хачу «ўбачыць вайну». Заглядваю крадком у хлеў — «памежнікі» там у сапраўдных гімнасцёрках. Спектакль ашаламляльны…

Далей сны мае абрываюцца…

У хуткім часе я ўбачыў салдацкія гімнасцёркі ў нас дома… Бабуля карміла стомленых і запыленых салдатаў, а яны казалі: «Немец прэ». Я пачаў чапляцца да бабулі: «А якія яны, немцы?»

Грузім на воз вузлы, мяне саджаюць на іх. Кудысьці едзем. Потым вяртаемся… У нашай хаце — немцы! Яны падобныя да нашых салдатаў, толькі ў іншай форме і вясёлыя. Мы з бабуляй і мамай цяпер жывём за печчу, а дзядуля — у хляве. Бабуля ўжо не падшывае коўдраў, дзядуля не займаецца шавецтвам. Адзін раз адсоўваю фіранку: у куце каля вакна стаіць немец у навушніках і круціць ручкі рацыі, чутна музыка, потым выразна па-руску… Іншы немец у гэты час намазваў масла на хлеб, убачыў мяне і махнуў нажом ля самага майго носа, я хаваюся за фіранку і больш ужо не вылажу з-за печы.

Па вуліцы паўз нашу хату вядуць чалавека ў прапаленай гімнасцёрцы, босага, са звязанымі дротам рукамі. Чалавек увесь чорны… Потым я бачыў яго на шыбеніцы каля сельсавета. Казалі, што гэта наш лётчык. Ноччу ён мне прысніўся. У сне ён вісеў у нашым двары…

Усё памятаецца ў чорным колеры: чорныя танкі, чорныя матацыклы, нямецкія салдаты ў чорнай форме. Я не ўпэўнены, што ўсё гэта было насамрэч толькі чорным, аднак я так запомніў. Чорна-белая стужка…

…Мяне захутваюць у штосьці, і мы хаваемся ў балоце. Увесь дзень і ўсю ноч. Ноч халодная. Крычаць страшным голасам невядомыя птушкі. Здаецца, што поўня свеціць ярка-ярка. Страх! А калі нас убачаць ці пачуюць нямецкія аўчаркі? Час ад часу далятаў іхны хрыпаты брэх. Ранкам — дамоў! Я хачу дамоў! Усе хочуць дамоў, у цяпло! Але хатаў ужо няма, толькі грудкі галавешак, якія дымяцца. Абгарэлае месца… Пасля вялікага вогнішча… Знаходзім у попеле камяк солі, якая заўсёды ў нас ляжала на прыпечку. Акуратна сабралі соль, потым гліну, змяшаную з соллю, ссыпалі яе ў гарлачык. Гэта ўсё, што засталося ад нашае хаты…

Бабуля маўчала, маўчала, а ноччу загаласіла: «Ах, мая ты хатка! Ах, мая ты хатка! Тут я ў дзеўках гуляла-а-а-а… Сюды сваты прыязджалі-і-і-і… Тут дзяцей нарадзіла-а-а-а…» Яна хадзіла па нашым чорным двары, як прывід.

Ранкам я расплюшчыў вочы — мы спім на зямлі. На нашым агародзе.

## «І ПАЦАЛАВАЛА Ў ПАДРУЧНІКУ ЎСЕ ПАРТРЭТЫ...»

*Зіна Шыманская, 11 гадоў.*
*Цяпер — касірка.*

Я азіраюся назад з усмешкаю... Са здзіўленнем. Няўжо гэта было са мною?

У дзень, калі пачалася вайна, мы пайшлі ў цырк. Усім класам. На ранішні паказ. Ні пра што не здагадваліся. Ні пра што... Дарослыя ўжо ведалі, а мы — не. Пляскалі ў ладкі. Смяяліся. Быў там вялікі слон. Сланішча! Танцавалі малпачкі... І вось... Выбеглі мы весела на вуліцу — а людзі ідуць заплаканыя: «Вайна!» Усе дзеці: «Ур-ра!» Абрадаваліся. Вайна нам уяўлялася так: людзі ў будзёнаўках і на конях. Цяпер мы сябе пакажам, дапаможам нашым байцам. Станем героямі. Я больш за ўсё любіла кніжкі пра вайну. Пра баі, пра подзвігі. Усялякія там мары... Як я схіляюся над параненым байцом, выношу яго з дыму. З агню. Дома ўсю сцяну над сваім сталом абклеіла ваеннымі здымкамі з газет. Там — Варашылаў, там — Будзённы...

Мы з сяброўкай уцякалі на фінскую вайну, а нашы знаёмыя хлопчыкі — на іспанскую. Вайна нам уяўлялася самай цікавай падзеяй у жыцці. Самай вялікай прыгодай. Мы пра яе марылі, мы былі дзецьмі свайго часу. Добрымі дзецьмі! Мая сяброўка заўсёды хадзіла ў старой будзёнаўцы, дзе яна яе ўзяла, я ўжо забыла, аднак гэта была ейная любімая шапка. А як мы ўцякалі на вайну? Нават не памятаю, на якую, напэўна, усё ж у Іспанію. Зараз распавяду... Яна засталася ў мяне начаваць, ну гэта,

вядома, спецыяльна, а на світанку мы разам ціхенька выйшлі з дому. На дыбачках… Цс-с, цс-с… Прыхапілі з сабою нейкія прадукты. А старэйшы брат, мабыць, ужо сачыў, як мы апошнія дні шапталіся, штосьці пхалі ў мяшэчкі. У двары дагнаў нас і вярнуў. Насварыўся і прыстрашыў, што выкіне з маёй бібліятэкі ўсе кніжкі пра вайну. Увесь дзень я плакала. Вось такія мы былі!

А тут сапраўдная вайна…

Праз тыдзень у Мінск увайшлі нямецкія войскі. Саміх немцаў я не запомніла адразу, а запомніла іхнюю тэхніку. Вялікія машыны, вялікія матацыклы… У нас такіх не было, такіх мы не бачылі. Людзі анямелі і аглухлі. Хадзілі са спалоханымі вачыма… На платах і слупах з'явіліся чужыя плакаты і ўлёткі. Чужыя загады. Прыйшоў «новы парадак». Праз нейкі час зноў адчыніліся школы. Мама вырашыла, што вайна вайной, а перапыняць вучобы не варта, я ўсё роўна павінна вучыцца. На першым уроку геаграфічка, тая самая, якая нас вучыла і да вайны, пачала выступаць супраць савецкай улады. Супраць Леніна. Я сказала сабе: вучыцца ў такой школе больш не буду. Не-е-е… Не хачу! Прыйшла дамоў і пацалавала ў падручніку ўсе партрэты… Усе любімыя партрэты нашых правадыроў.

Немцы ўрываліся ў кватэры, кагосьці ўвесь час шукалі. То габрэяў, то партызанаў… Мама сказала: «Схавай свой піянерскі гальштук». Удзень я гальштук хавала, а ноччу, калі клалася спаць, завязвала. Мама баялася: а раптам немцы прыйдуць ноччу? Угаворвала мяне. Плакала. Я чакала, калі мама засне, стане ціха ў пакоі і на вуліцы. Тады даставала з шафы чырвоны гальштук, даставала савецкія кніжкі. А мая сяброўка спала ў будзёнаўцы.

Мне і цяпер падабаецца, што мы такія былі…

## «Я ІХ РУКАМІ ЗБІРАЛА... ЯНЫ БЕЛЫЯ-БЕЛЫЯ...»

*Жэня Сяленя, 5 гадоў.*
*Цяпер — журналіст.*

У тую нядзелю... Дваццаць другога чэрвеня...

Пайшлі з братам у грыбы. Ужо быў час тоўстых баравікоў-каласавікоў. Лясок наш невялікі, мы там ведалі кожны кусцік, кожную палянку, дзе якія грыбы растуць, якія ягады і нават кветкі. Дзе скрыпень, а дзе жоўты святаяннік. Ружовы верас... Ужо вярталіся дахаты, калі пачулі падобны да грому гул. Гул ішоў з неба. Паднялі галовы — над намі штук дванаццаць-пятнаццаць самалётаў... Яны ляцелі высока, вельмі высока, я падумаў, што раней нашы самалёты так высока не лялі. Быў чутны гул: у-у-у!

Тут мы ўбачылі нашу маму, яна бегла да нас — плакала, голас зрываўся. Такім і засталося ўражанне ад першага дня вайны — мама не кліча ласкава, як звычайна, а крычыць: «Дзеці! Мае дзеці!» У яе вялікія вочы — адны вочы...

Праз два дні, напэўна, да нас на хутар зайшлі некалькі чырвонаармейцаў. Запыленыя, потныя, з засмяглымі вуснамі, яны прагна пілі ваду са студні. І як жа яны ажылі... Як прасвятлелі іхныя твары, калі ў небе паявіліся чатыры нашы самалёты. На іх мы заўважылі такія выразныя чырвоныя зоркі. «Нашы! Нашы!» — крычалі мы разам з чырвонаармейцамі. Але раптам аднекуль вынырнулі маленькія чорныя самалёты, яны

круціліся вакол нашых, штосьці там трашчала, грымела. Дзіўныя гукі даходзілі да зямлі… Як быццам хтосьці рве цырату ці палатно… Гучна так. Я яшчэ не ведаў, што так здалёк ці з вышыні гучаць кулямётныя чэргі. За нашымі самалётамі, якія пачалі падаць, пацягнуліся чырвоныя пісягі агню і дыму. Бабах! Чырвонаармейцы стаялі і плакалі, не саромеючыся сваіх слёз. Я першы раз бачыў… Першы раз… Каб чырвонаармейцы плакалі… У ваенных фільмах, якія я хадзіў глядзець у наш пасёлак, яны ніколі не плакалі.

Яшчэ праз некалькі дзён… З вёскі Кабакі прыбегла маміна сястра — цётка Каця. Чорная, страшная. Яна расказала, што ў іхную вёску прыехалі немцы, сабралі актывістаў і вывелі за ваколіцу, там расстралялі з кулямётаў. Сярод расстраляных быў і мамін брат, дэпутат сельскага савета. Стары камуніст.

Дагэтуль памятаю словы цёткі Каці:

—Яны яму разбілі галаву, і я рукамі мазгі збірала. Яны белыя-белыя.

Яна жыла ў нас два дні. І ўсе дні распавядала… Паўтарала… За гэтыя два дні ў яе пабялела галава. І калі мама сядзела побач з цёткай Кацяй, абдымала яе і плакала, я гладзіў яе па галаве. Баяўся.

Я баяўся, што мама таксама стане белаю…

## «ЖЫЦЬ ХАЧУ! ЖЫЦЬ ХАЧУ!..»

*Вася Харэўскі, 4 гады.*
*Цяпер — архітэктар.*

Гэтыя карціны, гэтыя агні. Маё багацце. Гэта — раскоша, тое, што я пражыў…

Мне ніхто не верыць, нават мама не верыла. Калі пасля вайны сталі згадваць, яна здзіўлялася: «Ты не мог сам гэта запомніць, ты быў маленькі. Табе нехта расказаў…»

Не, я сам памятаю…

Выбухаюць бомбы, а я чапляюся за старэйшага брата: «Жыць хачу! Жыць хачу!» Баяўся памерці, хоць што я мог тады ведаць пра смерць? Ну, што?

Сам памятаю…

Мама аддала нам з братам дзве апошнія бульбіны, а сама толькі глядзела на нас. Мы ведалі, што бульбіны гэтыя апошнія. Я хацеў ёй пакінуць… маленькі кавалачак… І не змог. Брат таксама не здолеў… Нам было сорамна. Дужа сорамна.

Не, я сам…

Убачыў першага нашага салдата… Па-мойму, гэта быў танкіст, вось гэта дакладна не скажу… Падбег да яго: «Тата!» А ён падняў мяне на рукі да неба: «Сынок!»

Я ўсё памятаю…

Я памятаю, як дарослыя казалі: «Ён — маленькі. Не разумее». А я здзіўляўся: «Якія дзіўныя гэтыя дарослыя, чаму яны вырашылі, што я нічога не разумею?» Мне здавалася, што я разумею больш чым дарослыя, бо я не плачу, а яны плачуць.

Вайна — гэта мой падручнік гісторыі. Мая адзінота… Я прапусціў час дзяцінства, яно выпала з майго жыцця. Я чалавек без дзяцінства, замест дзяцінства ў мяне — вайна.

Так у жыцці мяне ўзрушыла потым толькі каханне. Калі я закахаўся… Калі зведаў каханне…

## «ПРАЗ ПЯЦЕЛЬКУ ДЛЯ ГУЗІКА...»

*Іна Ляўкевіч, 10 гадоў.*
*Цяпер — інжынер-будаўніца.*

У першыя ж дні... З самага ранку...

Над намі выбухалі бомбы... На зямлі ляжалі слупы і правады. Людзі спалоханыя, усе выбягалі з дамоў. Са сваіх дамоў усе беглі на вуліцу, папярэджвалі адно аднога: «Асцярожна — провад! Асцярожна — провад!», каб ніхто не зачапіўся, не ўпаў. Як быццам гэта было самае страшнае.

Яшчэ раніцай дваццаць шостага чэрвеня мама выдавала заробак, яна працавала бухгалтаркаю на заводзе, а вечарам мы ўжо былі бежанцамі. І калі сыходзілі з Мінска, то бачылі, як гарэла наша школа. Полымя вырывалася з кожнага вакна. Так ярка... Так... Так моцна, да самага неба... Мы плакалі, што гарыць наша школа. Нас было чацвёра ў мамы, трое ішлі пешкам, а малодшая «ехала» ў мамы на руках. Мама яшчэ хвалявалася, што ключ узяла з сабой, а кватэру забылася зачыніць. Яна спрабавала спыняць машыны, крычала і прасіла: «Вазьміце нашых дзяцей, а мы пойдзем абараняць горад». Не хацела паверыць, што немцы ўжо ў горадзе. Горад здалі.

Страшным і незразумелым было ўсё, што адбывалася на нашых вачах. З намі. Асабліва смерць... Каля забітых ляжалі чайнікі і каструлі. Усё гарэла... здавалася, што мы бяжым па гарачых вугельчыках... Я заўсёды сябравала з хлопчыкамі. Расла гарэзай. Мне было цікава

паглядзець: як гэта ляцяць бомбы, як гэта яны свішчуць і як яны падаюць. Калі мама крычала: «Кладземся на зямлю!», я праз пяцельку для гузіка падглядвала... Што там на небе? І як людзі бягуць... На дрэве нешта вісіць... Калі я зразумела, што гэта нешта ад чалавека на дрэве вісіць, у мяне быў слупняк. Я заплюшчыла вочы...

Сястры Ірме было сем гадоў, яна несла прымус і маміны туфлі, страшна баялася згубіць гэтыя туфлі. Туфлі былі новыя, бледна-ружовага колеру, з гранёным абцасам. Мама ўзяла іх нечакана, а мажліва таму, што гэта была ў яе самая прыгожая рэч.

І з ключом, і з туфлямі мы хутка вярнуліся назад у горад, дзе ўсё згарэла. У хуткім часе пачалі галадаць. Збіралі лебяду, елі лебяду. Елі нейкія засохлыя кветкі! Набліжалася зіма. Немцы спалілі вялікі калгасны сад за горадам, баяліся партызанаў, дык усе хадзілі і абсякалі там пянькі, каб прынесці хоць трохі дроў. Працаліць дома печ. З дражджэй рабілі пячонку: смажылі дрожджы на патэльні, і ў іх з'яўляўся прысмак печані. Мама дала мне грошы, каб я купіла хлеба на кірмашы. А там старая жанчына прадавала казлянятак, і я ўявіла, што ўратую ўсю нашую сям'ю, калі куплю казлянё. Казлянё падрасце — і ў нас будзе шмат малака. І я купіла казлянё, заплаціла за яго ўсе грошы, якія мне далі з сабой. Я не памятаю, як мама на мяне сварылася, памятаю толькі, што мы некалькі дзён сядзелі галодныя: грошы скончыліся. Варылі нейкую зацірку, кармілі ёю казлянё, я брала яго з сабою спаць, каб яму было цёпла, але яно мерзла. І ў хуткім часе памерла. Гэта была трагедыя. Мы вельмі плакалі, не дазвалялі яго выносіць з дому. Мацней за ўсіх плакала я, бо лічыла вінаватай сябе. Мама вынесла яго ноччу ціхенька, а нам сказала, што козліка з'елі мышы.

Аднак пад акупацыяй мы адзначалі ўсе майскія і кастрычніцкія святы. Нашы святы! Нашы! Абавязкова спявалі песні, у нас уся сям'я пявучая. Няхай гэта была бульба ў мундзірах, часам адзін кавалачак цукру на ўсіх, але ў гэты дзень стараліся прыгатаваць нешта крышачку лепшае, няхай заўтра застанемся галоднымі, аднак святы мы ўсе адзначалі. Шэптам спявалі маміну любімую песню: «Утро красит нежным светом стены древнего Кремля...» Гэта абавязкова.

Суседка напякла булачак для продажу і прапанавала нам: «Вазьміце ў мяне гуртам, а прадайце ўраздроб. Вы маладыя, у вас ногі лёгкія». Я вырашыла ўзяцца за гэтую справу, ведаючы, як маме цяжка адной пракарміць нас. Прынесла суседка гэтыя булачкі, мы з сястрой Ірмай сядзім і глядзім на іх:

—Ірма, табе не здаецца, што гэтая булачка большая за тую? — кажу я.

—Здаецца...

Вы не ўяўляеце, як хацелася пакаштаваць кавалачак.

—Давай адрэжам трошачкі, а потым пойдзем прадаваць.

Пасядзелі так дзве гадзіны, і няма чаго несці на кірмаш. Потым суседка пачала варыць падушачкі — гэта такія цукеркі, іх даўно ўжо няма чамусьці ў нашых крамах. Дала яна нам прадаць гэтыя падушачкі. Зноў мы з Ірмай сядзім над імі:

—Адна падушачка вялікая, большая за іншыя. Давай, Ірма, трошачкі паліжам.

—Давай...

У нас было адно паліто на траіх, адны валёнкі. Мы часта сядзелі дома. Расказвалі адна адной казкі... Нейкія кніжкі... Але гэта было нецікава. А цікава нам было

марыць, як закончыцца вайна і як мы пачнём жыць пасля вайны. Будзем есці толькі булачкі ды цукеркі.

Калі вайна скончылася, мама апранула крэпдэшынавую кофтачку. Як у яе засталася гэтая кофтачка, я не памятаю. Усе добрыя рэчы мы памянялі на харчы. На гэтай кофтачцы былі чорныя манжэты, мама іх па-спорвала, каб нічога не было маркотнага, а ўсё толькі светлае.

Мы адразу пайшлі ў школу і з першых дзён пачалі развучваць песні для параду.

## «ТОЛЬКІ МАМІН КРЫК ЧУЛА...»

*Ліда Пагаржэльская, 8 гадоў.*
*Цяпер — кандыдатка біялагічных навук.*

Усё жыццё згадваю гэты дзень... Першы дзень без таты...

Хацелася спаць. Мама падняла нас на світанку і сказала: «Вайна!» Які ўжо сон? Сталі збірацца ў дарогу. Яшчэ страху не было. Усе глядзелі на тату, а тата наш паводзіў сябе спакойна. Як заўсёды. Ён быў партыйным работнікам. Кожнаму, сказала мама, трэба ўзяць з сабою што-небудзь. Я нічога не скеміла ўзяць, а сястра малодшая прыхапіла ляльку. Мама ўзяла на рукі нашага маленькага брацікa. Тата дагнаў нас ужо ў дарозе.

Я забыла сказаць, што жылі мы ў горадзе Кобрыне. Непадалёку ад Брэста. Вось чаму вайна дакацілася да нас ужо ў першы ж дзень. Апамятацца не паспелі. Дарослыя амаль не размаўлялі, ішлі моўчкі, ехалі на конях моўчкі. І рабілася страшна. Ідуць ды ідуць людзі, шмат людзей, і ўсе маўчаць.

Калі тата нас дагнаў, мы крыху супакоіліся. Тата ў нашай сям'і ўва ўсім быў галоўным, бо мама вельмі маладая, яна ў шаснаццаць гадоў выйшла замуж. Яна не ўмела нават гатаваць. А тата — сірата, ён усё ўмеў. Я памятаю, як мы любілі, калі ў таты быў час, і ён мог што-небудзь смачнае нам прыгатаваць. Усім — свята. Мне і цяпер здаецца, што няма нічога смачнейшага за манку, якую гатаваў тата. Колькі мы ехалі без яго, столькі мы яго і чакалі. Застацца ў вайну без таты — гэтага мы ўявіць сабе не маглі. Такая ў нас была сям'я.

Абоз атрымаўся вялікі. Рухаўся марудна. Час ад часу ўсе спыняліся і глядзелі на неба. Шукалі вачыма, дзе нашы самалёты… Шукалі дарэмна…

У полудзень убачылі калону нейкіх вайскоўцаў. Яны ехалі на конях і былі апранутыя ў новенькую чырвонаармейскую форму. Коні сытыя. Вялікія. Ніхто не здагадаўся, што гэта дыверсанты. Вырашылі: нашы! Абрадаваліся. Тата выйшаў да іх насустрач, і я пачула крык мамы: «А-а-а… ы-ы-ы…» Я памятаю, што гэтыя вайскоўцы не злезлі нават са сваіх коней… Калі мама закрычала, я пабегла. Усе кудысьці беглі. Беглі моўчкі. Я чула толькі, як наша мама крычыць. Я бегла, пакуль не заблыталася і не ўпала ў высокай траве…

Да вечара нашы коні стаялі. Чакалі. А мы вярнуліся на гэтае месца, калі пачало цямнець. Мама адна там сядзела і чакала. Нехта прамовіў: «Вы паглядзіце, яна сівая». Памятаю, як дарослыя капалі яму… Як потым нас з сястрычкай падпіхвалі: «Ідзіце. Развітайцеся з бацькам». Я ступіла два крокі, а далей ісці не змагла. Села на зямлю. А сястрычка побач са мною. Брацік спаў, ён быў яшчэ зусім маленькі, нічога не разумеў. А мама наша ляжала на возе без прытомнасці, нас да яе не пускалі.

Так ніхто з нас і не бачыў таты нябожчыкам. І не запомніў яго нябожчыкам. Я заўсёды, калі згадвала яго, чамусьці ўспамінала ў белым кіцелі. Маладога і прыгожага… Нават цяпер, а цяпер я ўжо старэйшая за нашага тату.

У Сталінградскай вобласці, куды нас эвакуявалі, мама працавала ў калгасе. Мама, якая нічога не ўмела, не ведала, як палоць градкі, не адрознівала аўса ад пшаніцы, стала ўдарніцай. У нас не было таты. У кагосьці іншага не было мамы. Ці брата. Ці сястры. Ці дзядулі. Аднак мы сіротамі сябе не адчувалі. Нас шкадавалі і га-

давалі ўсе. Памятаю цётку Таню Марозаву. У яе загінулі двое дзяцей, яна жыла адна. І яна ад сябе адрывала ўсё для нас, як наша мама. А гэта ж быў зусім чужы чалавек, але за вайну стаў родным. Брацік, калі падрос, казаў, што ў нас няма таты, затое ў нас дзве мамы: наша мама і цёця Таня. Так мы ўсе і раслі. З дзвюма, з трыма мамамі.

Яшчэ памятаю, як па дарозе ў эвакуацыю нас бамбілі, і мы беглі хавацца. Мы беглі хавацца не да мамы, а да салдатаў. Закончыцца бамбаванне, мама сварыцца на нас, што мы ад яе ўцякаем. Але ўсё роўна, як зноў пачнуць бамбіць, бяжым да салдатаў.

Калі вызвалілі Мінск, вырашылі вяртацца. Дахаты. У Беларусь. Мама наша — карэнная мінчанка, але калі мы выйшлі на мінскім вакзале, яна не ведала, куды ісці. Гэта быў іншы горад. Адны руіны... Пясок з каменю... Я ўжо вучылася ў Горацкай сельгасакадэміі... Жыла ў інтэрнаце, жыло нас у пакоі восем чалавек. Усе — сіроты. Ніхто нас асобна не сяліў, не збіраў — нас было шмат. Не адзін пакой. Памятаю, як мы ноччу ўсе крычалі... Я магла падхапіцца з ложка і грукаць у дзверы... Кудысьці ірвалася... Дзяўчаты мяне лавілі. Тады я пачынала плакаць. І яны ўслед. Усім пакоем равём. А ранкам трэба ісці на заняткі і слухаць лекцыі.

А аднойчы на вуліцы сустрэла мужчыну, падобнага да таты. Доўга ішла за ім. Я ж не бачыла таты мёртвым...

## «МЫ ГУЛЯЛІ, А САЛДАТЫ ПЛАКАЛІ...»

*Валодзя Чыстаклетаў, 10 гадоў.*
*Цяпер — музыкант.*

Гэта была прыгожая раніца...

Ранішняе мора. Сіняе, спакойнае. Першыя дні, як я прыехаў у дзіцячы санаторый Савет-Кваджэ на Чорным моры. Пачулі гул самалётаў... Я нырнуў у хвалі, але і там, пад вадой, быў чутны гэты гул. Мы не спалохаліся, а пачалі гуляць «у вайну», не падазраючы, што недзе ўжо ідзе вайна. Не гульня, не вайсковыя вучэнні, а вайна.

Праз некалькі дзён нас выправілі дамоў. Я — у Растоў. На горад падалі першыя бомбы... Усе рыхтаваліся да вулічных баёў: капалі равы, будавалі барыкады. Вучыліся страляць. А мы, дзеці, вартавалі скрынкі, у якія складвалі бутэлькі з запальнай сумессю, падвозілі пясок і ваду на выпадак пажару.

Усе школы пераўтварыліся ў шпіталі. У нашай сямідзясятай школе размяшчаўся армейскі палявы шпіталь для лёгкапараненых. Туды накіравалі маму. Ёй дазвалялі і мяне браць з сабой, каб не заставаўся адзін дома. А калі адступалі — куды ехаў шпіталь, туды ехалі і мы.

Пасля чарговага бамбавання прыкмеціў стосы кніг сярод разбітага каменю, падабраў адну, яна называлася «Жыццё жывёлы». Вялікая, з прыгожымі малюнкамі. Усю ноч не спаў, чытаў і не мог адарвацца... Памятаю, што ваенных кніжак я не ўзяў, чытаць пра вайну ўжо не хацелася. А вось пра жывёлу, пра птушак...

У лістападзе сорак другога... Начальнік шпіталя загадаў выдаць мне форму, праўда, яе давялося тэрмінова перашываць. А боты на мяне не маглі знайсці цэлы месяц. Так я стаў выхаванцам шпіталя. Салдатам. Што я рабіў? Ад адных бінтоў можна было звар'яцець. Іх заўсёды не хапала. Даводзілася мыць, сушыць, скручваць. Паспрабуйце скруціць тысячу штук за дзень! А я налаўчыўся яшчэ хутчэй за дарослых. Спрытна атрымалася і першая самакрутка... У дзень майго дванаццацігоддзя старшыня з усмешкай уручыў мне пачок махоркі, як паўнапраўнаму байцу. Я пакурваў. Ціхенька ад мамы. Ганарыўся, вядома. Ну... і страшна... Я з цяжкасцю да крыві прывык. Баяўся абгарэлых. З чорнымі тварамі...

Калі разбамбілі вагоны з соллю і парафінам, і адно, і другое ў справу пайшло. Соль — кухарам, парафін — мне. Давялося авалодаць спецыяльнасцю, не прадугледжанай ніякімі вайсковымі спісамі, — рабіў свечкі. Гэта горш за бінты! Мая задача — сачыць, каб свечкі доўга гарэлі: імі карысталіся, калі не было электрычнасці. Дактары не спынялі аперацыі ні пад бамбаваннем, ні пад абстрэлам. Ноччу адно завешвалі вокны. Прасцінамі. Коўдрамі.

Мама плакала, а я ўсё роўна марыў уцячы на фронт. У тое, што мяне могуць забіць, не верыў. Паслалі аднойчы па хлеб... Ледзь ад'ехалі, пачаўся абстрэл. Білі з мінамётаў. Сяржанта забіла, фурмана забіла, мяне кантузіла. Страціў мову, а калі праз нейкі час загаварыў, усё роўна засталося заіканне. Яно і цяпер у мяне ёсць. Усе здзіўляліся, што я жывы застаўся, а ў мяне было іншае пачуццё: хіба могуць мяне забіць? Як гэта мяне могуць забіць? Праехалі мы са шпіталем усю Беларусь, Польшчу... Я вывучыў польскія словы...

У Варшаве… Сярод параненых быў чэх — трамбаніст Пражскай оперы. Начальнік шпіталя абрадаваўся яму і, калі той пачаў выздараўліваць, папрасіў прайсці па палатах, пашукаць музыкаў. Аркестр атрымаўся выдатны. Мяне навучылі іграць на альце, на гітары навучыўся сам. Мы ігралі, а салдаты плакалі. Ігралі мы вясёлыя мелодыі.

Так даехалі да Германіі…

У разбітым нямецкім мястэчку ўбачыў: дзіцячы ровар валяецца. Абрадаваўся. Сеў і паехаў. Добра так коціцца! Я за вайну ні адной дзіцячай рэчы не бачыў. Забыўся, што яны недзе ёсць. Дзіцячыя цацкі…

## «НА МОГІЛКАХ НЯБОЖЧЫКІ ЛЯЖАЛІ НАВЕРСЕ... ЯК БЫЦЦАМ ЯШЧЭ РАЗ ЗАБІТЫЯ...»

*Ваня Цітоў, 5 гадоў.*
*Цяпер — меліяратар.*

Чорнае неба...

Чорныя тоўстыя самалёты... Яны гудуць нізка. Над самай зямлёю. Гэта — вайна. Як я яе памятаю... Памятаю асобнымі праблісками...

Нас бамбілі, а мы хаваліся ў садзе пад старымі яблынямі. Усе пяцёра. У мяне было яшчэ чацвёра брацікаў, самаму старэйшаму — дзесяць гадоў. Ён навучыў, як трэба хавацца ад самалётаў — пад вялікімі яблынямі, дзе шмат лісця. Мама збірала нас і вяла ў склеп. А ў склепе страшна. Там жылі пацукі з маленькімі вочкамі-свердламі, якія гарэлі ў цемры. Гарэлі ненатуральным бляскам. Яшчэ пацукі ноччу павісквалі. Гуляліся.

Калі нямецкія салдаты зайшлі ў хату, мы схаваліся на печы. Пад старой вопраткай. Ляжалі з заплюшчанымі вачыма. Ад страху.

Спалілі нашу вёску. Разбамбілі вясковыя могілкі. Прыбеглі людзі туды — нябожчыкі ляжаць наверсе... Яны ляжалі, нібыта яшчэ раз забітыя... Наш дзядуля ляжаў, які нядаўна памёр. Іх зноў пахавалі...

У вайну мы гулялі «У вайну». Калі надакучвала «ў белых і чырвоных», «у Чапаева», гулялі «ў рускіх і немцаў». Ваявалі. Бралі ў палон. Расстрэльвалі. Адзявалі на галовы салдацкія каскі, нашы і нямецкія, каскі валяліся

паўсюль — у лесе, на палях. Ніхто не хацеў быць немцам, з-за гэтага мы нават біліся. Гулялі ў сапраўдных бліндажах і акопах. Змагаліся на палках, кідаліся ў рукапашную. А маці сварыліся на нас…

Мы здзіўляліся, бо раней… да вайны… яны на нас за гэта не сварыліся…

# «І ЗРАЗУМЕЎ — ГЭТА БАЦЬКА... У МЯНЕ ДРЫЖЭЛІ КАЛЕНІ...»

*Лёня Хасяневіч, 5 гадоў.*
*Цяпер — канструктар.*

У маёй памяці застаўся колер...

Мне было пяць гадоў, але я цудоўна памятаю... Хату свайго дзеда — жоўтую, драўляную, за штыкетнікам на траве — бярвёны. Белы пясок, у якім мы гулялі, — як вымыты. Белы-белы. Яшчэ памятаю, як мама нас з сястрычкай вадзіла фатаграфавацца кудысьці ў горад, і як Элачка плакала, а я яе суцяшаў. Фотаздымак той захаваўся, адзіны наш даваенны здымак... Ён чамусьці запомніўся зялёным.

Потым усе ўспаміны — у цёмным колеры... Калі гэтыя, першыя, — у светлай афарбоўцы (трава зялёная, такая светлая акварэль, і пясок белы-белы, і штыкетнік жоўты-жоўты), дык потым усё ў цёмных фарбах: я задыхаюся ад дыму, і мяне кудысьці выносяць, на вуліцы — нашы рэчы, вузлы, чамусьці стаіць адно крэсла... Людзі плачуць. І мы з мамай доўга ідзём па вуліцах, я трымаюся за спадніцу. Усім, каго мама сустракае, яна паўтарае адну фразу: «У нас згарэла хата».

Начавалі ў нейкім пад'ездзе. Мне холадна. Грэю рукі ў кішэні мамінай кофты. Намацваю там штосьці халоднае. Гэта — ключ ад нашае хаты.

Раптам — мамы няма. Мама знікае, застаюцца бабуля і дзядуля. У мяне з'явіўся сябар, на два гады старэйшы, — Жэня Савачкін. Яму сем гадоў, мне — пяць. Мяне

вучаць чытаць па кнізе казак братоў Грымаў. Вучыць бабуля па сваёй методыцы, ад яе можна атрымаць і крыўдную пстрычку ў лоб: «Эх, ты!» І вучыць Жэня. Чытаючы кнігу, ён паказвае літары. Аднак больш я люблю слухаць казкі, асабліва калі расказвае бабуля. Ейны голас падобны да мамінага. Аднойчы ўвечары прыходзіць прыгожая жанчына і прыносіць нешта вельмі смачнае. Я разумею з ейных словаў, што мама жывая, яна, як і тата, ваюе. Хачу выскачыць у двор і падзяліцца навіной са сваім сябрам. Атрымліваю ад бабулі папругай. За мяне заступаецца дзед.

Калі яны ляглі спаць, я сабраў усе папругі ў хаце і закінуў за шафу.

Увесь час хочацца есці. Ходзім з Жэнем у жыта, яно расце проста за хатамі. Расціраем каласкі і жуем зярняткі. А поле ўжо нямецкае… І каласкі нямецкія… Убачылі легкавы аўтамабіль, уцякаем. Літаральна ля нашых веснічак мяне выхоплівае афіцэр у зялёнай форме з бліскучымі пагонамі і ці то б'е стэкам, ці то папругай хвошча. Ад страху акамянеў — болю не адчуваю. Раптам бачу бабулю: «Паночак, міленькі, аддай унука. Богам прашу, аддай!» Бабуля — перад афіцэрам на каленях. Афіцэр сыходзіць, я ляжу ў пяску. Бабуля на руках нясе мяне ў хату. Я з цяжкасцю варушу вуснамі. Пасля гэтага доўга хварэю.

Яшчэ памятаю, што па вуліцы едуць фурманкі, шмат фурманак. Дзед з бабуляй адчыняюць вароты. І ў нас селяцца бежанцы. Праз некаторы час яны захворваюць на тыфус. Іх забіраюць, як мне тлумачаць, у бальніцу. Яшчэ праз нейкі час захворвае дзед. Сплю з ім. Худнее і ледзь ходзіць па пакоі бабуля. Іду ўдзень гуляць з хлопчыкамі. Вяртаюся ўвечары — ні дзеда, ні бабулі не знаходжу дома. Суседзі кажуць, што іх таксама адвезлі ў бальніцу.

Мне страшна — я адзін. Я ўжо здагадваюся, што з той бальніцы, куды адвезлі бежанцаў, а цяпер дзеда з бабуляй, не вяртаюцца. Страшна жыць адному ў хаце, ноччу хата вялікая і незнаёмая. Нават удзень страшна. Мяне забірае да сябе дзедаў брат. У мяне новы дзядуля.

Мінск бамбяць, хаваемся ў склепе. Калі я выходжу адтуль на святло, вочы слепіць сонца, і я глухну ад грукату матораў. Па вуліцы ідуць танкі. Хаваюся за слуп. Раптам бачу — на вежы чырвоная зорка. Нашы! Адразу бягу да свае хаты: калі прыйшлі нашы, значыць, і мама прыйшла! Падыходжу да хаты — каля ганка стаяць нейкія жанчыны з вінтоўкамі, яны падхопліваюць мяне на рукі і пачынаюць распытваць. Адна з іх чымсьці мне знаёмая. Кагосьці нагадвае. Яна падыходзіць да мяне бліжэй, абдымае. Астатнія жанчыны пачынаюць плакаць. Я як закрычу: «Мама!» А потым як некуды праваліўся…

Хутка мама прывезла з дзіцячага дома сястрычку, і тая мяне не пазнала — забыла зусім. За вайну забыла. А я быў такі рады, што ў мяне зноў ёсць сястрычка.

Прыйшоў са школы і ўбачыў, што на канапе спіць бацька, які вярнуўся з вайны. Ён спаў, а я выцягнуў у яго з планшэта дакументы і прачытаў. І зразумеў — гэта бацька. Я сядзеў і глядзеў на яго, пакуль ён не прачнуўся.

У мяне ўвесь час дрыжэлі калені…

## «ЗАПЛЮШЧЫ ВОЧЫ, СЫНОК... НЕ ГЛЯДЗІ...»

*Валодзя Парабковіч, 12 гадоў.*
*Цяпер — персанальны пенсіянер.*

Я рос без мамы...

Зусім не памятаю сябе маленькім... Мама мая памерла, калі мне было сем гадоў. Жыў у цёткі. Пасвіў кароў, нарыхтоўваў дровы, ганяў коней у начное. Хапала спраў і на агародзе. Затое зімой каталіся на драўляных санках і самаробных каньках, таксама драўляных, падбітых жалезкамі і падвязаных да лапцяў вяровачкамі, хадзілі на лыжах з дошак ці з клёпак бочак, якія разваліліся. Усё рабіў сабе сам.

Дагэтуль памятаю, як абуў першыя свае чаравікі, купленыя бацькам. І якое было гора, калі падрапаў іх сучком у лесе. Мне так іх было шкада, што я думаў: лепш бы я парэзаў нагу — зажыла б. У гэтых чаравіках я сыходзіў з бацькам з Оршы, калі горад бамбілі фашысцкія самалёты.

За горадам яны нас расстрэльвалі ва ўпор. Людзі падалі на зямлю... У пясок, у траву... «Заплюшчы вочы, сынок... Не глядзі...» — прасіў бацька. Я баяўся глядзець і на неба — там было чорна ад самалётаў, і на зямлю — усюды ляжалі забітыя. Блізка праляцеў самалёт... Бацька таксама ўпаў і не падняўся. Я сядзеў над ім: «Тата, расплюшчы вочы... Тата, расплюшчы вочы...» Нейкія людзі крычалі: «Немцы!» — і цягнулі мяне за сабой. А да мяне не даходзіла, што бацька больш не ўстане, і вось так у пыле, на дарозе, я павінен яго пакінуць.

На ім нідзе не было крыві, ён проста моўчкі ляжаў. Мяне ад яго адцягнулі сілай, але шмат дзён я ішоў і азіраўся, чакаў — бацька мяне здагоніць. Прачынаўся ноччу, прачынаўся ад ягонага голасу... Я не мог паверыць, што бацькі больш у мяне няма. Так застаўся я адзін і ў адным суконным касцюмчыку.

Пасля доўгіх бадзянняў... Ехаў на цягніку, ішоў пешкам... Забралі мяне ў дзіцячы дом горада Мелекеса Куйбышаўскай вобласці. Некалькі разоў спрабаваў уцячы на фронт, аднак кожны раз гэта заканчвалася няўдачай. Лавілі і вярталі. І, як кажуць, не было б шчасця, ды няшчасце дапамагло. У лесе, на нарыхтоўцы дроў, я не ўтрымаў сякеры, яна адскочыла ад дрэва і трапіла мне па пальцы правай рукі. Выхавальніца перавязала сваёй хусткай і накіравала ў гарадскую паліклініку.

На зваротным шляху ў дзіцячы дом з Сашам Ляпіным, якога адправілі разам са мной, каля гаркама камсамолу мы заўважылі марака ў бесказырцы са стужачкамі, ён прыклейваў на дошцы аб'яву. Падышлі бліжэй і ўбачылі, што гэта правілы прыёму ў школу юнгаў Ваенна-Марскога Флоту на Салавецкіх астравах. Школа юнгаў камплектавалася толькі з добраахвотнікаў. Перавага ў наборы аддавалася дзецям маракоў і выхаванцам дзіцячых дамоў. Як цяпер чую голас гэтага марака:

— Ну што, хочаце быць маракамі?

Адказалі яму:

— Мы з дзіцячага дому.

— Тады заходзьце ў гарком і пішыце заявы.

Хіба можна пераказаць захапленне, якое авалодала намі ў той момант! Бо гэта быў самы просты шлях на фронт. А я ўжо не верыў, што змагу адпомсціць за бацьку! Паспею на вайну.

Зайшлі ў гарком камсамолу і напісалі заявы. Праз некалькі дзён мы ўжо праходзілі медыцынскую камісію. Адзін з чальцоў камісіі паглядзеў на мяне:

—Дужа худзенькі ён і маленькі.

А другі, у афіцэрскай форме, уздыхнуў:

—Нічога, падрасце.

Нас пераапранулі, з цяжкасцю падбіраючы патрэбныя памеры. Калі я ўбачыў сябе ў люстэрку ў марской форме, быў шчаслівы. Яшчэ праз суткі мы ўжо плылі на параходзе да Салавецкіх астравоў.

Усё ў навінку. Нязвыкла. Глыбокая ноч… Стаім на палубе… Маракі гоняць нас спаць:

—Ішлі б вы, хлопцы, у кубрык. Там цёпла.

Ранкам убачылі манастыр, які блішчэў на сонцы, і пазалочаны лес. Гэта і былі Салаўкі, дзе адчынялася першая ў краіне школа юнгаў Ваенна-Марскога Флоту. Але, перш чым распачаць заняткі, мы павінны былі пабудаваць школу, а дакладней — зямлянкі. Салавецкая зямля — суцэльны камень. Не хапала піл, сякер, рыдлёвак. Навучыліся рабіць усё ўручную: капаць цяжкую глебу, спілоўваць стагадовыя дрэвы, карчаваць пні, цяслярыць. Пасля працы ішлі адпачываць у халодныя намёты, ложкамі былі матрацы і навалкі, набітыя травой, пад імі ляжалі хваёвыя лапкі. Накрываліся шынялямі. Мылі самі, вада з лёдам… Плакалі — так нылі рукі.

У сорак другім годзе… Прынялі прысягу. Нам выдалі бесказыркі з надпісам «Школа юнгаў ВМФ», але, да нашага жалю, не з доўгімі стужкамі на плячах, а з банцікам на правым баку. Уручылі вінтоўкі. У пачатку сорак трэцяга… Я трапіў на праходжанне службы на гвардзейскі эсмінец «Кемлівы». Для мяне ўсё было ўпершыню: грэбні хваляў, у якія ўторкваўся носам карабель, «фосфарная» сцяжынка ад грабных вінтоў… Дыханне займала…

— Страшна, сынок? — спытаўся камандзір.

— Не, — я ні на хвілю не задумаўся. — Прыгожа!

— Калі б не вайна, было б прыгожа, — сказаў камандзір і чамусьці адвярнуўся.

Мне было чатырнаццаць гадоў…

## «БРАЦІК ПЛАЧА, БО ЯГО НЕ БЫЛО, КАЛІ БЫЎ ТАТА...»

*Ларыса Лісоўская, 6 гадоў.*
*Цяпер — бібліятэчная работніца.*

Згадаю пра свайго тату... І пра майго браціка...

Тата быў у партызанах. Фашысты яго схапілі і расстралялі. Маме жанчыны падказалі, дзе іх пакаралі — тату і яшчэ некалькі чалавек. Яна пабегла туды, дзе яны ляжалі... Усё жыццё ўспамінала, што было холадна, ледзяная корка на лужынах. А яны ляжалі ў адных шкарпэтках...

Мама была цяжарная. Чакала нашага браціка.

Нам трэба было хавацца. Партызанскія сем'і арыштоўвалі. Забіралі з дзецьмі. Адвозілі ў крытых брызентам машынах...

Доўга сядзелі ў суседзяў у склепе. Ужо надыходзіла вясна... Ляжалі на бульбе, а бульба прарастала... Заснеш, а ноччу парастак выскачыць і казыча каля носу. Як жучок. Жучкі ў мяне жылі ў кішэнях. І шкарпэтках. Я не баялася іх — ні ўдзень, ні ноччу.

Выйшлі мы са склепа, і мама нарадзіла браціка. Ён падрос, пачаў размаўляць, мы згадваем тату:

—Тата быў высокі...

Гэта мы з сястрой кажам, а брацік пытаецца:

—А я дзе быў?

—Цябе тады не было...

Ён пачынае плакаць, бо яго не было, калі быў тата...

## «ПЕРШАЙ ПРЫЙШЛА ГЭТАЯ ДЗЯЎЧЫНКА...»

*Ніна Ярашэвіч, 9 гадоў.*
*Цяпер — настаўніца фізкультуры.*

У хаце ўсе перажывалі вялікую падзею...

Увечары да старэйшай сястры прыходзіў жаніх сватацца. Усе да ночы абмяркоўвалі, калі вяселле, дзе маладыя будуць распісвацца, колькі паклікаць гасцей. А раніцай бацьку выклікалі ў ваенкамат. Па вёсцы ўжо загаварылі — вайна! Мама разгубілася: як быць? А я толькі пра адно думала: перажыць бы гэты дзень. Мне яшчэ ніхто не патлумачыў, што вайна — гэта не дзень і не два, гэта можа быць вельмі доўга.

І вось лета, спякотны дзень. Хочацца пайсці на рэчку, а мама нас збірае ў дарогу. У нас быў яшчэ брат, яго толькі забралі з бальніцы, там яму зрабілі аперацыю на назе, і ён вярнуўся на мыліцах. Але мама сказала: «Трэба ісці ўсім». Куды? Ніхто нічога не ведаў. Прайшлі кіламетраў пяць. Брат кульгаў і плакаў. Ну куды з ім? Павярнулі назад. Дома нас чакаў бацька. Мужчыны, якія ранкам пайшлі ў ваенкамат, усе вярнуліся, немцы ўжо занялі наш райцэнтр. Горад Слуцк.

Ляцелі першыя бомбы — я стаяла і сачыла за імі, пакуль яны на зямлю не падалі. Нехта падказаў, што трэба адкрываць рот, каб не аглушыла. І вось разяўляеш рот, закрываеш вушы і ўсё роўна чуеш, як яны ляцяць. Завываюць. Гэта так страшна, што скура не толькі на твары, на ўсім целе нацягваецца. Вісела ў нашым двары вядро. Калі ўсё сціхла, знялі яго: налічылі пяцьдзясят восем

прабоін. Вядро белае, з вышыні лётчыкам падалося, што гэта хтосьці стаіць у белай хустачцы, і яны стралялі… Забаўляліся…

Першыя немцы ўехалі ў вёску на вялікіх машынах, упрыгожаных бярозавымі галінкамі. Так у нас, калі вяселле гулялі, упрыгожвалі. Наломяць-наломяць бярозавых галінак… Мы разглядвалі іх праз пляцень, тады платоў не было, а плятні. З лазы. Прыглядваліся… Да звычайных людзей быццам падобныя… Я хацела ўбачыць, якія ў іх галовы. Чамусьці ў мяне было такое ўяўленне, што ў іх не чалавечыя галовы… Ужо хадзілі чуткі, што яны забіваюць. Спальваюць. А яны едуць, смяюцца. Задаволеныя, загарэлыя.

Раніцай рабілі фіззарадку ў двары школы. Абліваліся халоднай вадой. Падкасаюць рукавы, сядуць на матацыклы — і паехалі.

За некалькі дзён за вёскай каля малаказавода выкапалі вялікую яміну, і кожны дзень у пяць-шэсць раніцы адтуль чуліся стрэлы. Як пачнуць там страляць, нават певні перастаюць спяваць, хаваюцца. Едзем мы з бацькам пад вечар на падводзе, ён прытрымаў каня непадалёк ад той яміны. «Пайду, — кажа, — пагляджу». Там і яго стрыечную сястру расстралялі. Ён ідзе, а я за ім.

Раптам бацька паварочваецца, затуляе ад мяне яміну: «Вярніся. Табе далей нельга». Я толькі ўбачыла, калі пераступала ручаіну, што вада ў ёй чырвоная… І як вароны ўзляцелі. Іх было так шмат, што я закрычала… А бацька пасля гэтага некалькі дзён нічога есці не мог. Убачыць варону і ў хату бяжыць, трасецца ўвесь… У ліхаманцы…

У Слуцку ў парку павесілі дзве партызанскія сям'і. Стаялі моцныя маразы, павешаныя былі такія змерзлыя,

што калі іх хістала ветрам, яны звінелі. Звінелі, як замерзлыя дрэвы ў лесе... Звон гэты...

Калі нас вызвалілі, бацька пайшоў на фронт. Пайшоў з арміяй. Ужо без яго мне пашылі першую сукенку за вайну. Пашыла яе мама з салдацкіх ануч, яны былі белыя, яна іх пафарбавала атрамантам. На адзін рукаў атраманту не хапіла. А мне хацелася паказаць сяброўкам новую сукенку. І я стаяла ля веснічак бокам — добры рукаў паказвала, а кепскі хавала. Мне здавалася, што я так шыкоўна адзетая, такая прыгожая!

У школе паперадзе мяне сядзела дзяўчынка Аня. У яе загінулі бацька і маці, яна жыла з бабуляй. Яны былі бежанцы, з-пад Смаленска. Школа ёй купіла паліто, валёнкі і бліскучыя галёшы. Настаўніца прынесла і паклала ўсё гэта ёй на парту. А мы сядзелі прыціхлыя, бо ні ў кога з нас не было ні такіх валёнкаў, ні такога паліто. Мы зайздросцілі. Хтосьці з хлопчыкаў штурхануў Аню і сказаў: «Пашанцавала!» Яна кінулася за парту і заплакала. Плакала ўсе чатыры ўрокі. Вярнуўся з фронту бацька, усе прыйшлі паглядзець на нашага тату. І на нас, бо да нас вярнуўся тата.

Першай прыйшла гэтая дзяўчынка...

## «Я — ТВАЯ МАМА...»

*Тамара Пархімовіч, 7 гадоў.*
*Цяпер — сакратар-машыністка.*

Усю вайну я думала пра маму. Маму я згубіла ў першыя дні...

Мы спім, а наш піянерскі лагер бамбяць. Выскачылі з намётаў, бегаем, крычым: «Мама! Мама!» Мяне выхавальніца за плечы трасе, каб супакоілася, а я крычу: «Мама! Дзе мая мама!» Пакуль яна мяне да сябе не прытуліла: «Я — твая мама».

У мяне на ложку віселі спаднічка, белая кофтачка і чырвоны гальштук. Я іх надзела, і мы пайшлі пешкам у Мінск. Па дарозе шмат каго з дзяцей сустракалі бацькі, а маёй мамы не было. Раптам кажуць: «Немцы ў горадзе...» Павярнулі назад. Нехта мне сказаў, што бачыў маю маму — забітую.

І тут у мяне правал у памяці...

Як мы даехалі да Пензы — не памятаю, як мяне прывезлі ў дзіцячы дом — не памятаю. Чыстыя старонкі ў памяці... Памятаю толькі, што нас было шмат, спалі па двое на адным ложку. Калі адна заплакала, то і другая плача: «Мама! Дзе мая мама?» Я была маленькая, мяне хацела ўдачарыць адна нянечка. А я думала пра маму...

Іду са сталоўкі, дзеці крычаць: «Прыехала твая мама!» У мяне ў вушах: «Твая ма-а-а-ма... Твая ма-а-а-ма...» І раптам — яна наяве, але мне падалося, што гэта ўва сне. Бачу — мама! І не веру. Некалькі дзён мяне ўгаворвалі, а я баялася да мамы падыходзіць. Раптам гэта

сон? Сон! Мама плача, а я крычу: «Не падыходзь! Маю маму забілі». Я баялася… Я баялася паверыць у сваё шчасце…

Я і цяпер… Усё жыццё плачу ў шчаслівыя моманты. Абліваюся слязьмі. Усё жыццё… Мой муж… Мы жывём у каханні шмат гадоў. Калі ён зрабіў мне прапанову: «Я цябе кахаю. Давай пажэнімся». Я — у слёзы. Ён спалохаўся: «Я цябе пакрыўдзіў?» «Не! Не! Я — шчаслівая!» Але я ніколі не магу быць да канца шчаслівай. Цалкам шчаслівай. Не атрымліваецца ў мяне шчасце. Баюся шчасця. Мне заўсёды здаецца, што яно вось-вось скончыцца. Ува мне заўсёды жыве гэтае «вось-вось». Той дзіцячы страх…

## «ПРОСІМ: МОЖНА АБЛІЗАЦЬ?..»

*Вера Ташкіна, 10 гадоў.*
*Цяпер — рознарабочая.*

Перад вайной я шмат плакала...

Памёр бацька. У мамы засталося сямёра дзяцей на руках. Жылі мы бедна. Цяжка. Але затым, у вайну, яно здавалася шчасцем, тое мірнае жыццё.

Дарослыя плачуць — вайна, а мы не спалохаліся. Мы часта гулялі «ў вайну», і гэтае слова было нам вельмі добра знаёмае. Я здзіўлялася, чаму мама ўсю ноч плача. Ходзіць з чырвонымі вачыма. Толькі пазней зразумела...

Мы елі... ваду... Прыйдзе час палуднаваць, мама ставіць на стол каструлю гарачай вады. І мы разліваем яе па талерках. Вячэра. На стале каструля гарачай вады. Чыстай гарачай вады, зімой і закрасіць яе няма чым. Нават травы няма.

Ад голаду брат з'еў вугал печы. Грыз, грыз кожны дзень, калі заўважылі, у печы была ямка. Мама брала апошнія рэчы, ездзіла на кірмаш і мяняла на бульбу, кукурузу. Зварыць тады мамалыгу, падзеліць, а мы на каструлю паглядваем, просім: можна аблізаць? Аблізвалі па чарзе. А пасля нас яшчэ котка ліжа, яна таксама хадзіла галодная. Не ведаю, што яшчэ і ёй заставалася ў каструлі. Пасля нас там ні адной кропелькі. Нават паху ежы ўжо няма. Пах вылізаны...

Увесь час чакалі нашых...

Калі пачалі бамбіць нашы самалёты, я не пабегла хавацца, а паімчала глядзець на нашы бомбы. Знайшла асколак...

—І дзе гэта цябе носіць? — сустракае дома спалоханая мама. — Што гэта ты хаваеш?

—А я не хаваю. Я прынесла асколак.

—Вось заб'е цябе, будзеш ведаць.

—Што ты, мама! Гэта ж ад нашай бомбы асколак. Хіба ён мог мяне забіць?

Я яго доўга захоўвала…

## «...ЯШЧЭ ПАЎЛЫЖАЧКІ ЦУКРУ»

*Эма Левіна, 13 гадоў.*
*Цяпер — работніца друкарні.*

У той дзень мне заставаўся роўна месяц да чатырнаццаці гадоў...

—Не! Мы нікуды не паедзем, нікуды. Таксама мне прыдумалі — вайна! Не паспеем ад'ехаць ад горада, як яна і закончыцца. Не паедзем! Не па-е-е-едзем! — так казаў мой тата, член партыі з тысяча дзевяцьсот пятага года. Не раз сядзеў ён у царскіх турмах, браў удзел у Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Аднак з'ехаць усё ж давялося. Добранька палілі кветкі на вокнах, кветак у нас было шмат, зачынілі вокны і дзверы, толькі фортку пакінулі расчыненай, каб котка магла выходзіць, калі ёй трэба. Узялі з сабою самае неабходнае. Тата ўсіх пераканаў: праз некалькі дзён — вернемся. А Мінск гарэў.

Не пайшла з намі толькі сярэдняя сястра, яна была старэйшая за мяне на тры гады. Доўга мы пра яе нічога не ведалі. Перажывалі. А гэта было ўжо ў эвакуацыі... Ва Украіне... Атрымалі ад сястры ліст з фронту, потым яшчэ і яшчэ. Пазней прыйшла падзяка ад камандавання часткі, у якой яна служыла санінструктаркаю. Каму толькі мама гэтую падзяку не паказвала! Ганарылася. Старшыня калгаса выдаў нам у гонар такой падзеі адзін кілаграм фуражнай мукі. Смачнымі аладкамі мама частавала ўсіх.

Рабілі розную вясковую працу, хоць самыя што ні ёсць гарадскія людзі. Але працавалі добра. Старэйшая

сястра, якая да вайны працавала суддзёй, вывучылася на трактарыстку. Аднак у хуткім часе пачалі бамбіць Харкаў, і мы паехалі далей.

Ужо ў дарозе даведаліся, што вязуць нас у Казахстан. У нашым вагоне ехала сем'яў дзесяць, у адной была цяжарная дачка. Наляцелі самалёты, пачалі бамбіць цягнік, ніхто не паспеў выскачыць з вагона. Тут мы чуем крык: цяжарнай адарвала нагу. Той жах дагэтуль сядзіць у маёй памяці. Жанчына пачала раджаць... І родны бацька стаў прымаць роды. І гэта на вачах ва ўсіх. Грукат. Кроў, бруд. Дзіцё нараджаецца...

Выехалі мы з-пад Харкава летам, а на канцавую станцыю прыехалі к зіме. Прыехалі ў казахскія стэпы. Доўга не магла прывыкнуць, што нас не бамбяць, не абстрэльваюць. І быў у нас яшчэ адзін вораг — вошы! Вялізныя, сярэднія, маленькія! Чорныя! Шэрыя! Усялякія. Але аднолькава бязлітасныя, якія не давалі спакою ні ўдзень, ні ноччу. Не, хлушу! Калі цягнік рухаўся, яны нас не так кусалі. Сядзелі больш-менш ціха. Аднак як толькі мы ўваходзілі ў хату... Божа мой, што яны пачыналі вычвараць... Божа мой! Уся спіна і рукі ў мяне былі раз'едзеныя, у нарывах. Калі я здымала кофтачку, мне рабілася лягчэй, але ў мяне больш не было чаго апрануць. Усё роўна давялося кофтачку спаліць. Такая яна была вашывая, і я накрывалася газетай, хадзіла апранутая ў газету. У мяне кофтачка была з газеты. Адмывала нас гаспадыня такой гарачай вадой, што калі б я цяпер памылася такой, дык у мяне разлезлася б скура. А тады... Гэта такое шчасце — цёплая вада. Гарачая!

Мама наша была цудоўнай гаспадыняй, цудоўнай кулінаркай. Толькі яна магла так прыгатаваць сусліка, што яго можна было есці, хоць мяса сусліка лічыцца не вельмі прыдатным да ежы. Ляжыць суслік на стале...

Ад яго на кіламетр агідны пах, непаўторна агідны пах. А іншага мяса ніякага няма, і нічога ў нас няма. І мы елі гэтых суслікаў…

Жыла побач з намі вельмі добрая, файная жанчына. Яна бачыла ўсе нашы пакуты і сказала маме: «Няхай ваша дачка дапамагае мне па гаспадарцы». Надта ж я была кволая. Пайшла яна ў поле, а мяне пакінула з унукам, паказала, што дзе ляжыць, каб я яго накарміла і сама паела. Я падыду да стала, пагляджу на ежу, а браць баюся. Мне здавалася, што калі я вазьму штонебудзь, то ўсё адразу знікне, што гэта сон. Не тое што есці, я нават пальцам баялася крошку крануць — толькі б усё гэта не перастала існаваць. Я лепш буду глядзець, доўга буду глядзець. То збоку, то ззаду падыду. Вочы баялася заплюшчыць. Так за ўвесь дзень у рот нічога не ўзяла. А ў гэтай жанчыны былі карова, авечкі, куры. І яна пакінула мне масла, яйкі…

Прыйшла гаспадыня ўвечары, пытае:

— Ела?

Адказваю:

— Ела…

— Ну тады ідзі дамоў. А гэта маме занясі. — І дае мне хлебца. — А заўтра зноў прыходзь.

Прыйшла я дамоў, і гэтая жанчына — адразу за мной. Я спалохалася: ці не прапала што? А яна цалуе мяне і плача:

— Што ж ты, дурненькая, нічагусенькі не ела? Чаму ўсё на месцы ляжыць? — І гладзіць мяне па галаве.

Зімы ў Казахстане суровыя. Паліць печ няма чым. Ратавалі каравякі. Раненька ўстаеш і чакаеш, калі каровы выйдуць з двароў, падстаўляеш вядро. Бегаеш ад каровы да каровы. Ды я не адна ж — усе эвакуяваныя тут. Набярэш поўнае вядро, выльеш каля сваёй хаты

і хутчэй назад. Потым усё гэта перамешвалася з саломай, высушвалася, і атрымліваліся такія чорныя камякі. Кізякі. Гэтым мы і палілі печ.

Памёр тата. Напэўна, у яго разарвалася ад жалю да нас сэрца. Яно даўно ў яго было хворае.

Мяне ўзялі ў рамесніцкую вучэльню. Выдалі форму: паліто, абутак, і — хлебную картку. Я хадзіла раней стрыжаная, а тут у мяне адраслі валасы, я заплятала іх у коскі. Мне ўручаюць камсамольскі білет. Сфатаграфавалі для газеты. Несла білет у руках, а не ў кішэні. Такая каштоўнасць… Баялася ў кішэню пакласці, раптам згублю. Сэрца білася: тук-тук-тук. Вось бы наш тата мяне ўбачыў, які б ён шчаслівым быў.

Цяпер думаю: «Які страшны час, але якія цудоўныя людзі былі». Здзіўляюся, якія мы былі тады! Як верылі! Не хочацца пра гэта забываць… Я даўно не веру ў Сталіна, у камуністычныя ідэі. Гэтую частку свайго жыцця я хацела б забыць, але я захоўваю ў сэрцы тыя перажыванні. Тую вышыню. Я не хачу забываць сваіх пачуццяў. Каштоўныя…

Дома ў той вечар мама прыгатавала сапраўдную гарбату, з заваркай. А як жа, такое свята! А мне дала — як імяніннніцы — дабаўку: яшчэ паўлыжачкі цукру…

## «ХАТКА, НЕ ГАРЫ! ХАТКА, НЕ ГАРЫ!..»

*Ніна Рачыцкая, 7 гадоў.*
*Цяпер — рабочая.*

Часам — вельмі ярка... Усё вяртаецца...

Як немцы прыехалі на матацыклах... У кожнага было вядро, і яны грукалі гэтымі вёдрамі. А мы схаваліся... У мяне яшчэ былі два маленькія браты — чатыры і два гады. Мы з імі схаваліся пад ложак і ўвесь дзень прасядзелі там.

Я дужа здзівілася, што малады фашысцкі афіцэр, які пачаў жыць у нас, быў у акулярах. Я сабе ўяўляла, што ў акулярах ходзяць толькі настаўнікі. Ён жыў з дзеншчыком у адной палове дома, а мы — у другой. Брацік, самы маленькі ў нас, застудзіўся і моцна кашляў. У яго была высокая тэмпература, ён увесь гарэў, плакаў начамі. Раніцай афіцэр заходзіць на нашу палову і кажа маме, што калі кіндэр будзе плакаць, не даваць яму спаць, дык ён яго «пуф-пуф» — і паказвае на свой пісталет. Ноччу, як толькі брат закашляе ці заплача, мама хапае яго ў коўдру, бяжыць на вуліцу і там калыша, пакуль ён не засне ці не супакоіцца. Пуф-пуф...

Забралі ў нас усё, мы галадалі. На варыўню не пускалі, варылі яны там толькі сабе. Брат маленькі, ён пачуў пах і папоўз па падлозе на гэты пах. А яны кожны дзень варылі гарохавы суп, добра чуваць, як пахне гэты суп. Праз пяць хвілінаў пачуўся крык майго брата, страшны віск. Яго аблілі кіпнем на варыўні, аблілі за тое, што ён прасіў паесці. А ён быў такі галодны, што

прасіў маму: «Давай зварым маю качачку». Качачка ў яго была любімай цацкай, ён нікому яе раней у рукі не даваў. Спаў з ёю.

Нашы дзіцячыя размовы…

Сядзем і разважаем: калі злавіць мыш (а іх у вайну распладзілася шмат — і ў хаце, і ў полі), ці можна яе з'есці? Ці ядуць сінічак? Ці ядуць сарок? Чаму мама не зварыць супу з тлустых жукоў?

Не давалі вырасці бульбе, лазілі ў зямлю рукамі і правяралі: вялікая яна ці маленькая? І чаму ўсё так марудна расце: і кукуруза, і сланечнік…

У апошні дзень… Перад сваім адступленнем немцы падпалілі нашу хату. Мама стаяла, глядзела на агонь, і ў яе — ні слязінкі на твары. А мы ўтрох бегалі і крычалі: «Хатка, не гары! Хатка, не гары!» Вынесці з хаты нічога не паспелі, я толькі схапіла свой буквар. Усю вайну я ратавала яго, берагла. Спала з ім, ён у мяне заўсёды быў пад падушкай. Вельмі хацела вучыцца. Потым, калі мы ў сорак чацвёртым годзе пайшлі ў першы клас, мой буквар быў адзін на трыццаць чалавек. На ўвесь клас.

Застаўся ў памяці першы пасляваенны канцэрт у школе. Як спявалі, танчылі… Я адбіла далоні. Пляскала і пляскала. Мне было весела, пакуль нейкі хлопчык не выйшаў на сцэну і не пачаў чытаць верша.

Ён чытаў гучна, верш быў доўгім, але я пачула адно слова — «вайна». Азіраюся: усе сядзяць спакойна. А ў мяне страх — толькі вайна скончылася і зноў вайна? Я гэтага слова чуць не магла. Падхопліваюся і бягу дамоў. Прыбягаю, мама штосьці варыць наварыўні: значыць, ніякай вайны няма. Тады я — назад, у школу. На канцэрт. Зноў пляскаю.

Тата наш з вайны не вярнуўся, маме прыслалі паперку, што ён прапаў без вестак. Пойдзе мама на працу, мы

збяромся ўтраіх і плачам, што таты няма. Перавярнулі хату, шукалі паперку, дзе было пра тату. Думалі: там не напісана, што тата забіты, там напісана — тата прапаў без вестак. Парвём гэтую паперку, і прыйдзе вестка, дзе наш тата. Але мы паперкі не знайшлі. А калі прыйшла з працы мама, яна не магла зразумець, чаму ў хаце такі гармідар. Яна спытала ў мяне: «Што гэта вы тут рабілі?» За мяне адказаў малодшы брат: «Тату шукалі…»

Да вайны любіла, калі тата расказваў казкі, ён ведаў шмат казак і ўмеў іх расказваць. Пасля вайны казак я ўжо не хацела чытаць…

## «ЯНА ПРЫЙШЛА Ў БЕЛЫМ ХАЛАЦЕ, ЯК МАМА...»

*Саша Суэцін, 4 гады.*

*Цяпер — слесар.*

Памятаю толькі маму...

Першы малюнак...

Мама — заўсёды ў белым халаце... Тата — афіцэр, мама працавала ў шпіталі. Гэта потым ужо старэйшы брат мне распавёў. А я памятаю толькі белы мамін халат. Нават твару не памятаю, адзін белы халат... І яшчэ — белую шапачку, яна заўсёды стаяла на маленькім століку, менавіта стаяла, а не ляжала, такая накрухмаленая.

Другі малюнак...

Мама не прыйшла... Да таго, што тата не прыходзіў, я прывык, а мама раней вярталася дадому заўсёды. Мы з братам адны сядзім некалькі дзён у кватэры, нікуды не выходзім: а раптам з'явіцца мама? Стукаюць чужыя людзі, апранаюць і кудысьці вядуць нас. Я плачу:

— Мама! Дзе мая мама?

— Не плач, мама нас знойдзе, — суцяшае мяне брат, ён старэйшы за мяне на тры гады.

Мы апынаемся ў нейкім доўгім ці то доме, ці то хляве, на нарах. Увесь час хочацца есці, я смакчу гузікі на кашулі, яны падобныя да ледзянцоў, якія прывозіў з камандзіровак тата. Я чакаю маму.

Трэці малюнак...

Нейкі мужчына запіхвае нас з братам у кут нараў, накрывае коўдрай, прыкідвае анучамі. Пачынаю плакаць, ён гладзіць мяне па галаве. Я супакойваюся.

І так паўтараецца кожны дзень. Але аднойчы мне надакучвае сядзець пад коўдрай. Пачынаю ціха, а потым гучна плакаць. Нехта скідвае з мяне і брата анучы, сцягвае коўдру. Расплюшчваю вочы — каля нас стаіць жанчына ў белым халаце:

—Мама! — паўзу да яе.

Яна таксама гладзіць мяне. Спачатку па галаве… Потым па руцэ… Затым бярэ штосьці з металічнай каробачкі. Але я не звяртаю на гэта ніякай увагі, я бачу толькі белы халат і белую шапачку.

Раптам! — востры боль у руцэ. У мяне пад скурай іголка. Не паспяваю накрычацца, як страчваю прытомнасць. Ачуньваю — нада мною сядзіць той самы мужчына, які нас хаваў. Побач ляжыць брат.

—Не пужайся, — кажа мужчына. — Ён не мёртвы, ён спіць.

—Гэта была мама?

—Не…

—Яна прыйшла ў белым халаце, як мама… — паўтараю і паўтараю я.

—Я зрабіў табе цацку, — мужчына падае мне мячык з лапікаў тканіны.

Бяру цацку і перастаю плакаць.

Далей нічога не памятаю: хто і як нас ратаваў у нямецкім канцлагеры? У дзяцей там бралі кроў для параненых нямецкіх салдатаў. Дзеці ўсе паміралі. Як апынуліся мы з братам у дзіцячым доме? І як у канцы вайны атрымалі паведамленне, што бацькі нашы загінулі? Што здарылася з маёй памяццю? Не памятаю твараў, не памятаю словаў…

Закончылася вайна. Я пайшоў у першы клас. Іншыя два-тры разы прачытаюць верш — і запомнілі. А я дзесяць разоў прачытаю і не запамінаю. Аднак двоек мне настаўнікі чамусьці не ставілі. Іншым ставілі, а мне не.

Вось мая гісторыя...

## «ЦЁТАЧКА, ВАЗЬМІЦЕ МЯНЕ НА КАЛЕНІ...»

*Марына Кар'янава, 4 гады.*
*Цяпер — кінаработніца.*

Не люблю ўспамінаць... Не люблю. Адно слова — не люблю...

Спытаць бы ўва ўсіх: што такое дзяцінства? Кожны сказаў бы сваё. А для мяне дзяцінства — гэта мама з татам і цукеркі. Усё дзяцінства я хацела маму з татам і цукерак. За вайну ні адной цукеркі не тое што не пакаштавала на смак, якая яна, — нават не бачыла. Першую цукерку я з'ела праз некалькі гадоў пасля вайны... Праз тры гады... Я ўжо была вялікай дзяўчынкай. Дзесяць гадоў.

Ніколі не разумела, што хтосьці можа не хацець шакаладных цукерак. Ну як гэта? Гэта немагчыма.

А мамкі з татам я не знайшла. Нават прозвішча свайго сапраўднага не ведаю. Падабралі мяне ў Маскве на Северным вакзале.

—Як завуць? — спыталі ў дзіцячым доме.

—Марыначка.

—А прозвішча?

—Прозвішча не памятаю...

Запісалі Марына Северная.

Увесь час хацелася есці. Аднак яшчэ больш хацелася, каб хтосьці абняў, прылашчыў. А ласкі было мала, вакол вайна, ува ўсіх — гора. Іду па вуліцы... Наперадзе мама дзяцей сваіх вядзе. Аднога возьме на рукі, пранясе, гэтага паставіць — іншага бярэ. Селі яны на лавачцы,

і яна пасадзіла меншага сабе на калені. Я стаяла, стаяла. Глядзела, глядзела. Падыходжу да іх: «Цётачка, вазьміце мяне на калені». Яна здзівілася.

Я зноў папрасіла: «Цётачка, ну калі ласка…»

## «...І СТАЛА КАЛЫХАЦЬ, ЯК ЛЯЛЬКУ»

*Дзіма Суфранкоў, 5 гадоў.*
*Цяпер — інжынер-механік.*

Да гэтага я баяўся толькі мышэй. А тут адразу столькі страхаў...

Не так маю дзіцячую свядомасць працяла слова «вайна», як напалохала слова «самалёты». «Самалёты!» — і мама нас зграбае з печы. А мы баімся з печы злазіць, баімся з хаты выходзіць, пакуль яна аднога здыме, другі назад лезе. Нас — пяцёра. І яшчэ — любімая котка.

Самалёты нас расстрэльваюць...

Меншых брацікаў... Іх мама ручнікамі да сябе прывязвала, а мы, старэйшыя, самі беглі. Калі ты маленькі... Ты жывеш у іншым свеце, ты не глядзіш з вышыні, а жывеш блізка да зямлі. Там самалёты яшчэ страшнейшыя, там бомбы яшчэ страшнейшыя. Я памятаю, як зайздросціў жучкам: яны такія маленькія, што заўсёды могуць дзе-небудзь схавацца, у зямлю запаўзуць... Мне ўяўлялася, што калі я памру, дык стану якім-небудзь зверам, збягу ў лес.

Самалёты нас расстрэльваюць...

Мая стрыечная сястра, ёй было дзесяць гадоў, несла нашага брацiка трох гадоў. Бегла-бегла, сілаў не хапіла, і яна ўпала. І праляжалі яны ў снезе ўсю ноч, і ён замерз, а яна жыць засталася. Выкапалі ямку яго пахаваць, яна не дае: «Мішачка, не памірай! Навошта ты паміраеш?»

Уцяклі мы ад немцаў і жылі ў балоце… На выспачках… Курані сабе пабудавалі і ў іх жылі. Курані — гэта такія буданчыкі: голыя бярвёны і дзірка зверху. Для дыму. А ўнізе — зямля. Вада. І зімой, і летам там жылі. На хваёвых галінках спалі. Вярнуліся раз з мамай з лесу ў вёску, хацелі што-небудзь у сваёй хаце ўзяць. А там — немцы. Хто прыйшоў, усіх сагналі ў школу. Паставілі на калені і накіравалі на нас кулямёты. І мы, дзеці, аднога росту з кулямётамі.

Чуем — у лесе страляюць. Немцы: «Партызаны! Партызаны!» — і да машынаў. Хутка з'ехалі. А мы — у лес.

Пасля вайны я баяўся жалеза. Ляжыць асколак, а ў мяне страх, што ён яшчэ раз выбухне. Суседская дзяўчынка — тры гады і два месяцы… Я запомніў… Мама яе над труной паўтарала: «Тры гады і два месяцы… Тры гады і два месяцы…» Яна знайшла «лімонку». І стала калыхаць, як ляльку. У анучку загарнула і калыша… Граната маленькая, як цацка, толькі цяжкая. Маці дабегчы не паспела…

Пасля вайны ў нашай вёсцы Старыя Галоўчыцы Петрыкаўскага раёна яшчэ два гады хавалі дзяцей. Ваеннае жалеза валялася паўсюль. Падбітыя чорныя танкі, бронетранспарцёры. Кавалкі мінаў, бомбаў… А ў нас жа цацак не было… Потым усё гэта пачалі збіраць і звозіць кудысьці на заводы. Мама растлумачыла, што з гэтага жалеза пачнуць рабіць трактары. Станкі і швейныя машынкі. Калі я бачыў новы трактар, я не падыходзіў да яго, чакаў, што ён выбухне. І стане чорным, як танк…

Я ведаў, з якога ён жалеза…

## «МНЕ ЎЖО БУКВАР КУПІЛІ...»

*Ліля Мельнікава, 7 гадоў.*
*Цяпер — настаўніца.*

Я павінна была пайсці ў першы клас...

Мне ўжо буквар купілі і партфель. Я самая старэйшая. Сястры Раі было пяць гадоў, а нашай Томачцы — тры гады. Жылі мы ў Расонах, бацька наш працаваў дырэктарам лясгасу, але за год да вайны ён памёр. Жылі мы з мамай.

У той дзень, калі да нас дайшла вайна, мы ўсе трое былі ў дзіцячым садку, і самая маленькая — таксама. І вось усіх дзяцей разабралі, а мы засталіся, па нас ніхто не прыходзіць. Нам страшна. Мама прыбегла апошняя. Яна працавала ў лясгасе, яны спальвалі нейкія паперы, закопвалі. І яна затрымалася.

Мама сказала, што будзем эвакуявацца, нам далі фурманку. Трэба было ўзяць з сабой самыя неабходныя рэчы. Памятаю, што ў калідоры стаяў кош, мы паставілі гэты кош на воз, сястрычка ўзяла сваю ляльку. Мама хацела ляльку пакінуць... Лялька была вялікая... Сястра пачала плакаць: «Я яе не пакіну!» Выехалі за Расоны, і перавярнулася наша фурманка, раскрыўся кош, адтуль пасыпаўся наш абутак. Аказалася, што мы нічога не ўзялі з сабой: ні паесці, ні адзення на змену. Мама разгубілася і пераблытала кашы, узяла той, у які збірала абутак на рамонт.

Не паспелі мы сабраць той абутак, як наляцелі самалёты і сталі бамбіць, абстрэльваць з кулямётаў. Ляльку

нашу прабілі наскрозь, а сястрычка засталася абсалютна цэлай, нават ні драпіны. Плакала: «Я яе ўсё роўна не кіну».

Вярнуліся мы назад і пачалі жыць ужо пры немцах. Мама насіла прадаваць рэчы бацькі, памятаю, што першы раз яна выменяла ягоны касцюм на гарох. Месяц елі гарохавы суп. Гарох скончыўся. Была ў нас вялікая старая коўдра, ватная. Мама шыла з яе буркі, калі хто-небудзь прасіў, ёй плацілі, чым маглі. У нас была калі заціркa, калі адно яйка на ўсіх... А часта — і зусім нічога не было. Мама толькі абдыме і пагладзіць...

Мама не казала, што яна дапамагае партызанам, але я здагадвалася. Яна часта кудысьці хадзіла і не прызнавалася — куды. Калі яна ішла нешта мяняць, дык мы пра гэта ведалі, а тут яна сыходзіла — і ўсё. Я ганарылася мамай і казала сваім сястрычкам: «Хутка прыйдуць нашы. Прыйдзе дзядзя Ваня». Гэта татаў брат, ён ваяваў у партызанах.

У той дзень мама наліла малако ў пляшку, пацалавала нас і пайшла, а дзверы зачыніла на ключ. Мы трое залезлі пад стол, са стала звісаў вялікі абрус, пад ім цёпла, і гулялі ў «дочкі-мацеры». Раптам чуем трэск матацыклаў, потым страшны грукат у дзверы, і мужчынскі голас з акцэнтам выгуквае маміна прозвішча. Няправільна. Я адчула нешта нядобрае. А ў нас пад вакном з боку агарода стаяла лесвіца, мы незаўважна спусціліся па ёй. Хуценька. Я схапіла адну сястру, другую пасадзіла на шыю, гэта ў нас называлася «аты-баты», і мы выйшлі на вуліцу.

Там сабралася шмат людзей. І дзяцей. Тыя, хто прыехаў па маму, нас не ведалі і не заўважылі. Яны выбіваюць дзверы... А я бачу, што на дарозе паказалася мама, такая маленькая, такая худзенькая. І немцы яе ўбачылі, яны пабеглі наверх, на горку, схапілі маму, заламалі ёй

рукі і пачалі біць. А мы бяжым і крычым усе ўтрох, колькі ёсць сілаў: «Мама! Мама!» Укінулі яе ў матацыклетную каляску, яна толькі крыкнула суседцы: «Феня, мілая, ты прыгледзь за маімі дзецьмі». Нас суседзі адвялі ад дарогі, але кожны баяўся да сябе браць: а раптам прыедуць і па нас? І мы пайшлі плакаць у канаву. Дадому нельга, нам ужо расказалі, што ў суседняй вёсцы забралі бацькоў, а дзяцей спалілі, зачынілі ў хаце і спалілі. Баімся ўвайсці ў сваю хату... Так працягвалася, напэўна, тры дні. То мы ў куратніку сядзім, то да агарода нашага падыдзем. Есці хочацца, але ў агародзе нічога не чапаем, бо мама сварылася, што мы рана рвём моркву, калі яна яшчэ не вырасла, што гарох абрываем. Мы нічога не бярэм і кажам адна адной, маўляў, наша мама перажывае, што мы без яе ўсё знішчым на агародзе. Вядома, яна так думае. Яна не ведае, што мы нічога не чапаем. Слухаемся. Дарослыя перадавалі, і дзеці прыносілі нам — хто бручку вараную, хто бульбіну, хто бурак...

Потым нас забрала да сябе цётка Арына. У яе застаўся адзін хлопчык, а двух яна страціла, калі сыходзіла з бежанцамі. Мы ўвесь час згадвалі маму, і цётка Арына павяла нас да каменданта турмы, пачала прасіць спаткання. Камендант сказаў, што размаўляць з мамай нельга, адзінае, што ён нам дазволіў, — гэта прайсці паўз ейнае акенца.

Мы прайшлі паўз акенца, і я ўбачыла маму... Нас вялі так хутка, што маму ўбачыла я адна, а сястрычкі не паспелі. Яна нас таксама ўбачыла і толькі крыкнула: «Дзеці! Дзяўчаткі мае!» І больш не выглянула ў акенца. Потым нам перадавалі, што яна ўбачыла нас і страціла прытомнасць...

Праз некалькі дзён мы даведаліся — маму расстралялі. Я і сястрычка Рая разумелі, што нашай мамы ўжо

няма, а самая малодшая, Томачка, казала, што вось вернецца мама, я ёй усё раскажу, калі мы яе крыўдзілі, не бралі на рукі. Калі нам давалі паесці, я лепшы кавалак аддавала ёй. Так, я памятала, рабіла мама…

Калі маму расстралялі… На наступны дзень да нашага дому пад'ехала машына… Сталі забіраць рэчы… Суседзі паклікалі нас: «Ідзіце, папрасіце свае валёнкі, свае цёплыя паліто. Хутка зіма, а вы апранутыя па-летняму». Стаім мы ўтрох, маленькая Томачка сядзіць у мяне на шыі, і я кажу: «Дзядзя, дайце ёй валёнкі». Паліцэйскі ў гэты час іх узяў і нясе. Я дагаварыць не паспела, як ён піхнуў мяне нагой, і сястра звалілася… І выцялася галавой аб камень. Раніцай мы ўбачылі на тым месцы вялікі нарыў, ён пачаў расці. У цёткі Арыны была тоўстая хустка, яна завяжа ёй галоўку, а нарыў усё роўна відаць. Я ноччу абдыму сястрычку, а галоўка ў яе вялікая-вялікая. І ў мяне страх, што яна памрэ.

Даведаліся пра гэта партызаны і забралі нас да сябе. У партызанскім атрадзе нас суцяшалі, як маглі, вельмі любілі. Мы нават забыліся на нейкі час, што ў нас няма мамы з татам. У кагосьці кашуля парвалася, рукаў згарнулі, намалявалі вочы, нос — і падарылі нам лялькі… Вучылі нас чытаць, пра мяне нават верш склалі, пра тое, як я не люблю ўмывацца халоднай вадой. А ўмовы ў лесе — якія? Зімой умываліся снегам…

Ліля ў ваннасчцы сядзіць,
Ліля жаласна крычыць:
«Ой, бяда, бяда, бяда,
Вельмі мокрая вада».

Калі стала небяспечна, нас адвезлі назад да цёткі Арыны. Камандзір — а камандзірам атрада быў легендарны

Пётр Міронавіч Машэраў — спытаў: «Што вам трэба? Чаго б вы хацелі?» А нам трэба вельмі шмат усяго, найперш, патрэбныя сукенкі. І нам пашылі сукенкі з такой жа тканіны, як гімнасцёркі. Зялёненькія такія сукенкі, з выстрачанымі кішэнькамі. Усім звалілі валёнкі, усім траім пашылі кажушкі, звязалі рукавічкі. Памятаю, што прывезлі нас да цёткі Арыны на возе разам з мяшочкамі, у мяшочках была мука, крупы. Нават кавалкі скуры, каб яна магла пашыць нам чаравічкі.

А калі да цёткі Арыны прыйшлі зператрусам, яна назвала нас сваімі дзецьмі. У яе доўга выпытвалі, чаму мы беленькія, а сын у яе чорненькі. Штосьці яны ведалі… Пагрузілі ў машыну нас і цётку Арыну з хлопчыкам, прывезлі ў Ігрыцкі канцлагер. Гэта было зімой, спалі ўсе на падлозе, на дошках толькі салома. Мы клаліся так: я, потым маленькая Тома, з ёю побач — Рая, а далей цётка Арына і ейны хлопчык. Я апынулася з краю, побач са мною часта мяняліся людзі. Дакрануся ноччу да халоднай рукі і ўжо разумею, што чалавек памёр. Раніцай пагляджу — ён такі, як жывы, толькі халодны. Адзін раз спалохалася… Я ўбачыла, як пацукі выелі ў мёртвага чалавека губы і шчокі. Пацукі былі тлустыя і нахабныя. Я іх баялася больш за ўсё… У нашай маленькай нарыў на галоўцы ў партызанскім атрадзе знік, а ў канцлагеры з'явіўся зноў. Цётка Арына ўвесь час хавала гэты нарыў, бо ведала: убачаць, што дзяўчынка хворая, расстраляюць. Ноччу я чула, як яна малілася: «Госпадзе, калі ты забраў іхнюю маці, захавай дзяцей». І я малілася. Я прасіла: хай застанецца хоць бы маленькая Томачка, яна такая маленькая, што ёй нельга паміраць.

З канцлагера нас кудысьці павезлі… Везлі ў вагонах для быдла. На падлозе — засохлы гной. Памятаю, што даехалі мы толькі да Латвіі, і там нас разабралі мясцовыя

жыхары. Самую першую забралі Томачку. Цётка Арына на руках вынесла яе старому латышу і стала на калені: «Толькі ўратуйце яе. Толькі ўратуйце». Ён сказаў: «Калі я данясу яе дахаты, то яна будзе жыць. А ісці мне два кіламетры. Праз рэчку, потым — могілкі...» Усе мы трапілі да розных людзей. Цётку Арыну таксама забралі ад нас...

Мы чулі... Нам сказалі — Перамога. Я прыйшла да людзей, у якіх была сястра Рая:

—Мамы няма... Пойдзем забярэм нашу Тому. І трэба шукаць цётку Арыну.

Пагаварылі так і пайшлі шукаць цётку Арыну. І тое, што мы яе знайшлі, гэта цуд. А знайшлі дзякуючы таму, што яна вельмі добра шыла. Мы зайшлі ў адну хату папіць вады. У нас пытаюць: куды вы ідзяце? Адказваем, што ідзем шукаць цётку Арыну. Дзяўчынка гаспадыні адразу ж адазвалася: «Хадзем, я вам пакажу, дзе яна жыве». Цётка Арына ахнула, калі ўбачыла нас. Худзенькія, як дошчачкі. Быў канец чэрвеня, самы цяжкі час: стары ўраджай з'елі, а новы яшчэ не паспеў. Мы елі каласкі, яшчэ зялёныя: нацярэбім жменьку і глытаем, нават пагрызці не паспявалі, так хацелася есці.

Непадалёк ад тых мясцінаў, дзе мы жылі, быў горад Краслава. Цётка Арына сказала, што нам трэба ў гэты горад ехаць у дзіцячы дом. Яна была ўжо зусім хворая і папрасіла, каб нас адвезлі. Нас прывезлі на світанку, брама была яшчэ зачыненая, пасадзілі пад вакенца дзіцячага дома і паехалі. Раніцай устала сонейка... З дому выбеглі дзеці, усе ў чырвоненькіх туфельках, трусіках, без маечак, з ручнічкамі ў руках. Бягуць да рэчкі, смяюцца. А мы глядзім... Не верым, што можа быць такое жыццё. Дзеці заўважылі нас, а мы сядзім абарваныя, брудныя, яны закрычалі: «Новенькія прыехалі!»

Паклікалі выхавальніц. У нас ніхто не пытаў пра нейкія дакументы. Адразу ж прынеслі кавалак хлеба і кансервы. Мы не ядзім, баімся — зараз гэтае шчасце скончыцца. Гэтае немагчымае шчасце… Нас супакоілі: «Дзяўчаткі, вы пакуль пасядзіце, а мы пойдзем лазню паліць. Памыем вас і пакажам, дзе вы будзеце жыць».

Увечары прыехала дырэктарка, убачыла нас і кажа, што ў іх перапоўнена, і нас трэба адвезці ў мінскі дзіцячы прыёмнік, а там размяркуюць у нейкі дзіцячы дом. Мы як пачулі, што нам зноў трэба кудысьці ехаць, сталі плакаць і ўпрошваць пакінуць нас. Дырэктарка папрасіла: «Дзеці, не плачце. Не магу бачыць вашых слёз», — кудысьці пазваніла, і нас пакінулі ў гэтым дзіцячым доме. Там быў цудоўны, дзівосны дзіцячы дом, там былі такія выхавальніцы, такіх, напэўна, цяпер няма. З такімі сэрцамі! Як яны ў іх такія засталіся пасля вайны?

Нас вельмі любілі. Вучылі, як трэба паводзіць сябе адно з адным. Быў такі выпадак. Нам распавядаюць: калі ты кагосьці частуеш, то не даставай з кулька цукеркі, а паднясі ўвесь кулёк. А той, хто бярэ, павінен узяць адну цукерку, а не ўвесь кулёк. І вось, калі гэтая размова была, адзін хлопчык адсутнічаў. Прыходзіць сястра аднай дзяўчынкі і прыносіць каробку цукерак. Дзяўчынка — выхаванка дзіцячага дома — падносіць каробку цукерак гэтаму хлопчыку, і ён бярэ ў яе ўсю. Мы смяёмся. Ён разгубіўся і пытае: «А што трэба рабіць?» Яму адказваюць, што трэба было ўзяць адну цукерку. Тады ён здагадаўся: «Цяпер я разумею — трэба заўсёды дзяліцца. А то мне добра, а вам дрэнна». Сапраўды, нас вучылі рабіць так, каб было добра ўсім, а не аднаму. І нас было лёгка вучыць, мы ўсе шмат перажылі.

Старэйшыя дзяўчаткі шылі ўсім партфелі, шылі іх нават са старых спаднічак. На свята дырэктарка

дзіцячага дома абавязкова раскатвала з сырога цеста вялізны, як прасціна, блін. І кожны сабе па кавалачку адразаў і рабіў варэнік, хто якія хоча: маленькі, вялікі, круглы, трохкутны...

Калі нас было шмат, мы былі разам, дык рэдка згадвалі пра мам і татаў. А ў ізалятары, калі хварэлі, ляжым, нічога не робім, толькі і гаворым пра іх, пра тое, хто і як трапіў у дзіцячы дом. Мне адзін хлопчык распавёў, як у яго ўсіх спалілі, а ён у гэты час паехаў на кані ў суседнюю вёску. Ён казаў, што маму вельмі шкада, тату вельмі шкада, але больш за ўсё шкада маленькую Надзечку. Маленькая Надзечка ляжала ў белых пялюшках, а яе спалілі. Ці яшчэ, калі на палянцы збіраемся ў цеснае кола, расказваем адно аднаму пра родны дом. Пра тое, як жылі да вайны.

Прывезлі ў дзіцячы дом маленькую дзяўчынку. У яе пытаюць:

—Як тваё прозвішча?

—Марыя Іванаўна.

—Як цябе завуць?

—Марыя Іванаўна.

—Як тваю маму звалі?

—Марыя Іванаўна.

Адгукалася яна толькі на «Марыю Іванаўну». Настаўніца ў нас была Марыя Іванаўна, і гэтая дзяўчынка Марыя Іванаўна.

На Новы год яна чытала верш Маршака: «Курыца-красуня ў мяне жыла». І дзеці празвалі яе — курыца. Дзеці ёсць дзеці, надакучыла ўсім зваць яе Марыяй Іванаўнай. І вось адзін наш хлопчык пайшоў да свайго сябра ў рамесную вучэльню, якая шэфствавала над намі, і нешта яны паспрачаліся, і ён назваў іншага хлопчыка курыцай. Той пакрыўдзіўся: «Чаму ты мяне курыцай

назваў? Хіба я падобны на курыцу?» А наш хлопчык кажа, што ў дзіцячым доме ёсць дзяўчынка, і яна вельмі падобная да яго. У яе такі ж нос, такія ж вочы, а завём мы яе ўсе курыцай, і расказаў чаму.

І аказалася, што гэта родная сястра таго хлопчыка. Калі яны сустрэліся, дык згадалі, як ехалі на возе... Як бабуля ім штосьці разагравала ў бляшанцы з-пад кансерваў, як бабулю забіла пры бамбёжцы... Як старая суседка, бабуліна сяброўка, клікала яе, ужо мёртвую: «Марыя Іванаўна, падыміцеся, у вас двое ўнукаў засталося... Як вы маглі памерці, Марыя Іванаўна? Навошта вы памерлі, Марыя Іванаўна?» Дзяўчынка, аказваецца, усё гэта памятала, але не была ўпэўненая, што гэта яна памятае і гэта з ёю было. У яе ў вушах толькі засталіся два словы: «Марыя Іванаўна».

Мы ўсе вельмі абрадаваліся, што яна знайшла брата, бо ўва ўсіх нехта быў, а ў яе — нікога. У мяне, напрыклад, было дзве сястры, у кагосьці брат ці стрыечныя браты і сёстры. А ў каго не было, тыя самі радніліся: давай, ты будзеш мой брат, ці давай, ты будзеш маёй сястрой. І тады ўжо аберагалі адно аднога, клапаціліся. У нашым дзіцячым доме сабраліся адзінаццаць Тамар... Прозвішчы ў іх былі: Тамара Невядомая, Тамара Незнаёмая, Тамара Безымянная, Тамара Вялікая і Тамара Маленькая...

Што яшчэ памятаю? Памятаю, што на нас мала сварыліся ў дзіцячым доме, на нас зусім не сварыліся. Мы каталіся зімой на санках з мясцовымі дзецьмі, і я бачыла, як маці насварыцца і нават адлупцуе сваё дзіця, калі яно надзене валёнкі на босую нагу. Калі мы выбягалі на босую нагу, на нас ніхто не сварыўся. Я спецыяльна абувала так валёнкі, каб на мяне насварыліся. Мне так хацелася, каб на мяне насварыліся.

Я добра вучылася, і мне сказалі, што я павінна падцягнуць па матэматыцы аднога хлопчыка. З вёскі. А вучыліся мы разам — дзетдомаўскія і вясковыя, мясцовыя. Трэба было пайсці да яго ў сям'ю, у хату. І мне было страшна. Я думала: а якія там рэчы, як і дзе яны стаяць, як там трэба сябе паводзіць? Родная хата — гэта было нешта недасягальнае для нас, самае жаданае.

Пагрукала да іх у дзверы, і ў мяне замёрла сэрца…

## «…І НЕ ЖАНІХІ, І НЕ САЛДАТЫ»

*Вера Новікава, 13 гадоў.*
*Цяпер — дыспетчарка ў трамвайным дэпо.*

Колькі гадоў прайшло… А ўсё роўна страшна…

Памятаю, дзень сонечны такі, вецер гоніць павуцінне. Гарыць наша вёска, гарыць наша хата. Мы выйшлі з лесу. Маленькія дзеці крычаць: «Вогнішча! Вогнішча! Прыгожа!» А ўсе астатнія плачуць, мама плача. Жагнаецца.

Хата згарэла… Мы капаліся ў попеле, але там нічога не знайшлі. Адны відэльцы абгарэлыя. Печ як была, так і засталася, там стаяла ежа — дранікі. Дранікі… Мама дастала патэльню рукамі: «Ежце, дзеці». А есці дранікі немагчыма, так яны прапахлі дымам, аднак елі, бо нічога, апроч травы, у нас больш не было. Засталіся трава і зямля.

Колькі гадоў прайшло… А ўсё роўна страшна…

Стрыечную сястру павесілі… Муж ейны быў камандзірам партызанскага атрада, а яна цяжарная. Нехта немцам паведаміў, яны прыехалі. Выгналі ўсіх на плошчу. Скамандавалі, каб ніхто не плакаў. Каля сельсавета расло высокае дрэва, яны падагналі каня. Сястра стаіць на санях… У яе каса доўгая… Накінулі пятлю, яна вынята з яе касу. Сані з канём торгнулі, і яна павісла, закруцілася… Бабы закрычалі… Крычалі без слёз, крычалі адным голасам. Плакаць не дазвалялі. Крычаць — крычы, але не плач — не шкадуй. Падыходзяць і забіваюць таго,

хто плача. Падлеткі шаснаццаці-сямнаццаці гадоў, іх пастралялі. Яны плакалі.

Такія маладыя... Яшчэ і не жаніхі, і не салдаты...

Навошта я вам расказала? Цяпер мне яшчэ страшней, чым тады. Я таму і не ўзгадваю...

## «ХОЦЬ БЫ АДЗІН СЫНОЧАК ЗАСТАЎСЯ...»

*Саша Каўрус, 10 гадоў.*
*Цяпер — кандыдат філалагічных навук.*

Я вучыўся ў школе...

Выйшлі на вуліцу, пачалі гуляць, як звычайна, у гэты момант наляцелі фашысцкія самалёты і скінулі бомбы на нашу вёску. А нам ужо расказвалі пра баі ў Іспаніі, пра лёс іспанскіх дзяцей. Цяпер бомбы ляцелі на нас. Старыя жанчыны падалі на зямлю і маліліся... Так... На ўсё жыццё я запомніў голас Левітана, які аб'явіў пра пачатак вайны. Прамовы Сталіна не памятаю. Людзі стаялі днямі каля калгаснага рэпрадуктара і чагосьці чакалі, я стаяў побач з бацькам...

Першым у нашу вёску Брусы Мядзельскага раёна ўварваўся атрад карнікаў. Пастралялі ўсіх сабакаў і катоў, затым пачалі выпытваць, дзе жывуць актывісты. У нашай хаце да вайны быў сельсавет, аднак ніхто з людзей на бацьку на паказаў. Так... Не выдалі... Ноччу мне сніўся сон. Мяне расстралялі, я ляжу і думаю: чаму я не паміраю?..

Запомніўся эпізод, як немцы за курамі ганяліся. Зловіць, падыме ўверх і круціць да таго часу, пакуль у руцэ галава не застанецца. Рагочуць. А мне здавалася, што нашы куры крычаць... Як людзі... Чалавечымі галасамі... І каты, і сабакі, калі іх стралялі... Я да таго не бачыў нічыёй смерці. Ні чалавечай, нічыёй. У лесе аднойчы мёртвых птушанят, і ўсё. Больш смерці не бачыў...

Вёску нашу падпалілі ў сорак трэцім… Мы ў гэты дзень капалі бульбу. Сусед Васіль, ён быў на першай сусветнай і ведаў трохі нямецкую мову, сказаў: «Я пайду і папрашу немцаў, каб не палілі вёскі. Тут — дзеці». Пайшоў, і яго самога спалілі. Спалілі школу. Усе кнігі. Згарэлі нашы агароды. Сады.

Куды нам ісці? Бацька павёў да партызанаў у Козінскія лясы. Ідзём, сустракаем людзей з іншай вёскі, яе таксама спалілі, яны кажуць, што немцы зусім побач… Залезлі мы ў нейкую яму: я, брат Валодзя, мама з маленькай сястрычкай і бацька. Бацька ўзяў гранату, і дамовіліся, што калі немцы заўважаць нас, дык ён вырве загваздку. Развіталіся ўжо. Мы з братам знялі папругі, зрабілі сабе петлі, каб павесіцца, надзелі на шыі. Мама пацалавала нас усіх. Я чуў, як яна казала бацьку: «Хоць бы адзін сыночак застаўся…» Тады бацька кажа: «Хай уцякаюць. Маладыя, можа, уратуюцца». А мне так шкада было маму, што я не пайшоў. Так… Не пайшоў…

Чуем — сабакі брэшуць, чуем — каманды чужыя, чуем — страляюць. А лес у нас — гэта такі буралом, ялiны вывернутыя, за дзесяць метраў нічога не відаць. То побач усё было, а то чуем — галасы далей і далей. Калі сціхла, мама ўстаць не магла, у яе адняліся ногі. Тата нёс яе на сабе.

Праз некалькі дзён сустрэлі партызанаў, яны бацьку ведалі. Мы ўжо ледзь ішлі, галодныя. Ногі збітыя. Ідзём, і адзін з партызанаў пытае ў мяне: «Што б ты хацеў знайсці пад хвояй: цукеркі, печыва? Хлеба кавалачак?» Я адказваю: «Прыгаршчы патронаў». Партызаны потым доўга згадвалі. Так я ненавідзеў немцаў за ўсё… І за маму…

Ішлі паўз спаленую вёску… Жыта не зжатае, бульба расце. Яблыкі ляжаць на зямлі. Грушы… А людзей няма.

Каты і сабакі бегаюць. Адзінокія. Так… Людзей няма. Ніводнага чалавека. Галодныя каты…

Памятаю, што пасля вайны ў нас у вёсцы быў адзін буквар, а першая кніга, якую я знайшоў і прачытаў, быў зборнік задач па арыфметыцы.

Я чытаў яе як вершы… Так-так…

## «СЛЁЗЫ РУКАВОМ ВЫЦІРАЕ...»

*Алег Болдыраў, 8 гадоў.*
*Цяпер — майстар.*

Гэта пытанне... Што лепш — успамінаць ці забыць? Можа, лепш маўчаць? Я шмат гадоў забываў...

Да Ташкента дабіраліся месяц. Месяц! Гэта быў глыбокі тыл. Бацьку накіравалі туды як спецыяліста. Туды перавозілі заводы. Фабрыкі. Углыб. Добра, што краіна вялікая.

Там я даведаўся, што старэйшы брат загінуў пад Сталінградам. Ірваўся на фронт, а мяне не хацелі нават на завод браць, бо маленькі. «Табе да дзесяці яшчэ паўгода расці, — ківала галавой маці. — Выкінь гэтыя дзіцячыя думкі з галавы». Хмурнеў і бацька: завод — не дзіцячы сад, працаваць трэба па дванаццаць гадзінаў. Ды як працаваць!

Завод вырабляў міны, снарады, авіябомбы. Падлеткаў дапускалі на шліфоўку... Адлітыя з металу загатоўкі шліфаваліся ўручную... Спосаб просты са шланга пад высокім ціскам на загатоўкі накіроўваўся струмень пяску, распаленага да ста пяцідзесяці градусаў, адскокваючы ад металу, пясок абпальваў лёгкія, біў у твар, у вочы. Рэдка хто вытрымліваў больш за тыдзень. Патрэбен быў характар.

Аднак у сорак трэцім годзе... Мне споўнілася дзесяць гадоў, і бацька ўсё ж узяў мяне да сябе. Прывёў у свой трэці цэх. На ўчастак, дзе зварвалі запалы для бомбаў.

Працавалі ўтрох: я, Алег і Ванька, яны ўсяго на два гады старэйшыя за мяне. Збіралі запал, а Якаў Міронавіч Сапожнікаў (прозвішча запомнілася назаўсёды), цудоўны майстар сваёй справы, яго зварваў. Затым трэба было падняцца на скрынку, каб дацягнуцца да ціскоў, заціснуць муфту запала і калаўротам з метчыкам адкалібраваць унутраную разьбу муфты. Рабіць гэта мы налаўчыліся... Хутка... А далей і зусім проста: уставіць корак і — у скрынку. Калі поўная набярэцца — пад пагрузку яе. Цяжкаватая, праўда, да пяцідзесяці кілаграмаў вагой, аднак удвух спраўляліся. Якава Міронавіча не запрашалі: у яго самая тонкая праца. Самая адказная — зварка!

Самае непрыемнае — агонь электразваркі. Быццам і стараешся не глядзець на сіні агеньчык, а за дванаццаць гадзінаў наловіш «зайчыкаў». Вочы ад гэтага нібы пяском засыпаныя. Праціраеш, а ўсё дарэмна. Ці ад таго, ці ад манатоннага гуду дынама-машыны, якая давала ток для зваркі, ці проста ад стомы, але часам страшна хацелася спаць. Асабліва ў начныя змены. Спаць! Спаць!

Калі Якаў Міронавіч бачыў, што ёсць хоць якая магчымасць даць нам перадышку, камандаваў:

— Марш у электродны!

Угаворваць не даводзілася: не было на ўсім заводзе куточка ўтульнейшага і цяплейшага, чым той, дзе сушылі гарачым паветрам электроды. Залезшы на цёплую драўляную паліцу, імгненна засыналі. А хвілінаў праз пятнаццаць прыходзіў у электродны Якаў Міронавіч, будзіў.

Аднойчы я прачнуўся раней, чым ён пачаў будзіць. Бачу: дзядзька Яша глядзіць на нас. Адцягвае хвіліны. І слёзы рукавом выцірае.

## «ЁН ВІСЕЎ НА ВЯРОВАЧЦЫ, ЯК ДЗІЦЯНЁ...»

*Люба Александровіч, 11 гадоў.*
*Цяпер — рабочая.*

Не хачу... Я не хачу нават паўтараць гэтага слова, «вайна»...

Вайна дакацілася да нас хутка. Дзявятага ліпеня, праз некалькі тыдняў, я памятаю, ужо ішоў бой за наш раённы цэнтр Сянно. З'явілася шмат бежанцаў, так шмат, што людзям не было куды падзецца, не хапала дамоў. У нас, напрыклад, размясцілася сем'яў шэсць з дзецьмі. І гэтак у кожнага.

Спачатку ішлі людзі, а потым пачалася эвакуацыя быдла. Гэта мне вельмі добра запомнілася, бо было страшна. Страшныя малюнкі. Бліжэйшая ад нас станцыя — станцыя Багдань, яна і цяпер ёсць, гэта паміж Оршай і Лепелем. Сюды, у гэтым кірунку, эвакуявалі жывёлу не толькі з нашага сельсавета, а з усёй Віцебскай вобласці. Лета было спякотнае, жывёлу гналі вялікімі статкамі: каровы, авечкі, свінні, цяляты. Коней гналі асобна. Пагоншчыкі, якія іх гналі, настолькі стаміліся, што ім было ўсё роўна... Каровы ішлі не доеныя, яны заходзілі ў двор і стаялі да таго часу каля ганку, пакуль іх не падояць. Іх даілі на дарогу, на зямлю... Асабліва цяжка было свінням, яны не выносяць спякоты і доўгай дарогі. Яны ішлі і падалі. Ад гарачыні колькасць трупаў павялічвалася, і гэта так палохала, што ўвечары я баялася выходзіць з дому. Усюды ляжалі мёртвыя коні... авечкі... каровы... Іх не паспявалі

закопваць, і яны кожны дзень ад спякоты раслі... Павялічваліся, надзімаліся...

Вяскоўцы, яны ведаюць, што такое выгадаваць адну карову, якая гэта праца. Колькі трэба часу. Яны плакалі, гледзячы, як гіне жывое. Гэта ж не дрэва, што ўпала і маўчыць, гэтае ўсё рыкала, іржала, мэкала. Стагнала...

Запомніліся словы дзядулі: «Ну а гэтыя, бязвінныя, за што гінуць? Яны ж і сказаць нічога не могуць». Дзядуля ў нас быў кніжнік, ён заўсёды вечарамі чытаў.

Мая старэйшая сястра да вайны працавала ў райкаме партыі, і яе пакінулі ў падполлі. Яна прынесла дадому шмат кніг з райкамаўскай бібліятэкі, партрэты, чырвоныя сцягі. Мы іх закапалі ў садзе пад яблынямі. І ейны партыйны білет. Закопвалі ноччу, а ў мяне было такое пачуццё, што чырвонае... чырвоны колер... і з-пад зямлі будзе відаць.

Як прыйшлі немцы, чамусьці не памятаю... Памятаю, што яны ўжо былі, даўно былі, і вось сагналі ўсіх нас, усю вёску. Паставілі спераду кулямёты: дзе партызаны, да каго яны прыходзілі? Усе маўчалі. Тады яны адлічылі кожнага трэцяга і павялі на расстрэл. Расстралялі шэсць чалавек: дваіх мужчынаў, дзвюх жанчын і дваіх падлеткаў. І з'ехалі.

Ноччу выпаў снег... Гэта Новы год... А пад гэтым свежым снегам ляжаць забітыя. Пахаваць не было каму, труны рабіць не было каму. Мужчыны хаваліся ў лесе. Старыя жанчыны палілі бярвёны, каб хоць трохі прагрэць зямлю і выкапаць магілы. Яны доўга білі рыдлёўкамі па прамерзлай зямлі...

Немцы вярнуліся... Праз некалькі дзён... Сабралі ўсіх дзяцей, нас было трынаццаць чалавек, паставілі паперадзе калоны — баяліся партызанскіх мінаў. Мы ішлі спераду, а яны за намі ехалі. Калі трэба было, на-

прыклад, спыніцца і ўзяць ваду з калодзежа, яны спачатку пускалі да калодзежа нас. Так мы ішлі кіламетраў пятнаццаць. Хлопчыкі не так баяліся, а дзяўчаткі ішлі і плакалі. А яны за намі на машынах... Не ўцячэш... Памятаю, што мы ішлі босыя, а яшчэ толькі надыходзіла вясна. Першыя дні...

Хачу забыць... Гэта хачу забыць...

Немцы хадзілі па хатах... Сабралі тых, у каго дзеці пайшлі ў партызаны... І адсеклі ім галовы пасярод вёскі... Нам загадалі: глядзіце. У адной хаце нікога не знайшлі, злавілі і павесілі іхнага ката. Ён вісеў на вяровачцы, як дзіцянё...

Хачу ўсё забыць...

## «ЦЯПЕР БУДЗЕЦЕ МАІМІ ДЗЕЦЬМІ...»

*Ніна Шунто, 6 гадоў.*
*Цяпер — кухарка.*

Вой-вой-вой! Сэрца адразу забалела...

Да вайны мы жылі з адным бацькам... Мама памерла. Калі тата пайшоў на фронт, засталіся з цёткай. Цётка наша жыла ў вёсцы Задоры Лепельскага раёну. Толькі тата нас прывёз да яе — яна наткнулася вокам на сук, выкалала вока. У яе пачалося заражэнне крыві, і яна памерла. Наша адзіная цётка. І мы засталіся адны з братам, а брат быў маленькі. Мы з ім пайшлі ў лес шукаць партызанаў, чамусьці вырашылі, што там наш тата. Начавалі дзе прыйдзецца. Памятаю, калі была навальніца, мы начавалі ў стозе сена, выцягнулі сена, зрабілі ямку і схаваліся там. Такіх дзяцей, як мы, было шмат. І ўсе шукалі сваіх бацькоў, нават калі яны ведалі, што бацькі забітыя, усё роўна казалі нам, што таксама шукаюць тату з мамай. Ці каго-небудзь з родных.

Ішлі... Ішлі... У нейкай вёсцы... У адной хаце было адчыненае вакно. І там, відаць, нядаўна пяклі бульбяныя пірагі. Калі мы наблізіліся, брат пачуў пах гэтых пірагоў і страціў прытомнасць. Я зайшла ў тую хату, хацела папрасіць кавалачак для брата, бо ён бы не ўстаў. А я яго не панесла б, сілаў мала. У хаце нікога не было, не стрымалася і адламала кавалачак пірага. Сядзім і чакаем гаспадароў, каб не падумалі, што мы крадзем. Прыйшла гаспадыня, яна жыла адна. Яна нас не адпусціла, яна сказала: «Цяпер будзеце маімі дзецьмі...» Як

яна гэта сказала, мы з братам тут жа за сталом і заснулі. Так нам стала добра. У нас з'явіўся свой дом.

Аднак у хуткім часе вёску спалілі карнікі. Людзей усіх таксама. І нашу новую цётку. А мы засталіся жыць, бо раненька пайшлі ў ягады… Сядзелі на горцы і глядзелі на агонь… Ужо ўсё разумелі… Не ведалі: куды нам ісці? Як знайсці яшчэ адну цётку? Толькі гэтую мы палюбілі. Мы нават казалі між сабою, што будзем называць нашу новую цётку мамай. Такая яна добрая, яна заўсёды цалавала нас на ноч.

Нас падабралі партызаны. З партызанскага атрада на самалёце адправілі за лінію фронту…

Што ў мяне засталося з вайны? Я не разумею, што такое чужыя людзі, бо мы з братам выраслі сярод чужых людзей. Нас выратавалі чужыя людзі. Аднак якія ж яны мне чужыя? Усе людзі свае. Я жыву з гэтым пачуццём, хоць часта расчароўваюся. Мірнае жыццё іншае…

## «МЫ ЦАЛАВАЛІ ІМ РУКІ...»

*Давід Гольдберг, 14 гадоў.*
*Цяпер — музыкант.*

Мы рыхтаваліся да свята...

У гэты дзень намячалася ўрачыстае адкрыццё нашага піянерскага лагера «Талька». Чакалі ў госці памежнікаў і раніцай выправіліся ў лес. Па кветкі. Выпусцілі святочную насценгазету, прыгожа ўбралі ўваходную арку. Месца было цудоўнае, надвор'е выдатнае. У нас канікулы! Нас нават не насцярожыў гул самалётаў, які чулі ўсю раніцу, такія мы хадзілі шчаслівыя.

Раптам нас строяць на лінейку і аб'яўляюць, што раніцай, калі мы спалі, Гітлер напаў на нашу краіну. У маёй свядомасці вайна звязвалася з падзеямі на Халхын-Голе, гэта было штосьці далёкае і кароткачасовае. Не было сумневу, што наша армія — непераможная і несакрушальная, у нас самыя лепшыя танкі і самалёты. Усё гэта нам казалі ў школе. І дома. Хлопчыкі паводзілі сябе ўпэўнена, а многія дзяўчаткі плакалі, спалохаліся. Тым, хто старэйшы, даручылі хадзіць па атрадах ды супакойваць іх, асабліва маленькіх. Увечары хлопчыкам, якім ужо было чатырнаццаць-пятнаццаць гадоў, выдалі дробнакаліберныя вінтоўкі. Здорава! Мы, вядома, заганарыліся. Падцягнуліся. У лагеры было чатыры вінтоўкі, мы стаялі па тры чалавекі і ахоўвалі лагер. Мне гэта нават падабалася. Я заходзіў з гэтай вінтоўкай у лес, правяраў сябе — баюся ці не баюся? Не хацеў здавацца баязліўцам.

Некалькі дзён мы чакалі, што па нас прыедуць. Не дачакаліся нікога і самі пайшлі на станцыю Пухавічы. На станцыі сядзелі доўга. Дзяжурны сказаў, што з Мінска цягнікоў больш не будзе, сувязь перарваная. Раптам бяжыць нехта з дзяцей і крычыць, што ідзе цяжкі, цяжкі састаў. Мы сталі на рэйкі... Спачатку махалі рукамі, а потым знялі гальштукі... І махалі чырвонымі гальштукамі, каб спыніць цягнік. Машыніст убачыў нас і пачаў паказваць рукамі ў адчаі, што спыніць цягнік ён не можа — потым не зрушыцца. «Калі можаце, кідайце дзяцей на платформы» — крычаў ён. На платформах сядзелі людзі, і яны нам таксама крычалі: «Ратуйце дзяцей! Ратуйце дзяцей!»

Цягнік толькі крыху павольней паехаў. З платформаў цягнулі рукі параненыя, падхоплівалі маленькіх. І ўсіх да аднога пагрузілі. Гэта быў апошні цягнік з Мінска...

Ехалі доўга, цягнік ішоў павольна. Добра было відаць... На насыпе ляжалі забітыя, складзеныя акуратна, як шпалы. У памяці засталося... Як нас бамбілі, як вішчалі мы, і вішчалі асколкі. Як на станцыях нас кармілі жанчыны, яны аднекуль ужо ведалі, што ідзе цягнік з дзецьмі, і мы цалавалі ім рукі. Як апынулася з намі грудное дзіця, маці яго забіла пры абстрэле. І як жанчына на станцыі ўбачыла яго і зняла з галавы хустку, аддала на пялюшкі...

Усё! Баста! Моцна хвалююся... Мне нельга хвалявацца. Сэрца хворае. Скажу вам, калі не ведаеце: тыя, хто быў у вайну дзіцём, часта паміраюць раней за сваіх бацькоў, якія ваявалі на фронце. Раней, чым былыя салдаты. Раней...

Я ўжо столькі сваіх сяброў пахаваў...

# «Я ГЛЯДЗЕЛА НА ІХ ВАЧЫМА МАЛЕНЬКАЙ ДЗЯЎЧЫНКІ...»

*Зіна Гурская, 7 гадоў.*
*Цяпер — шліфавальніца.*

Я глядзела на іх вачыма маленькай дзяўчынкі. Маленькай вясковай дзяўчынкі. Шырока расплюшчанымі вачыма...

Блізка ўбачыла першага немца... Высокі, блакітныя вочы. Я так здзівілася: «Такі прыгожы, а забівае». Напэўна, гэта маё самае моцнае ўражанне. Маё першае ўражанне ад вайны...

Жылі мы: мама, дзве сястрычкі, брацік і курачка. У нас адна курачка засталася, яна з намі ў хаце жыла, з намі спала. З намі ад бомбаў хавалася. Яна прывыкла і хадзіла за намі, як сабачка. Як мы ні галадалі, а курачку ўратавалі. А галадалі так, што мама за зіму зварыла стары кажух і ўсе пугі, а нам яны пахлі мясам. Брацік грудны... Запарвалі ў кіпені яйка, і гэтую вадзічку давалі яму замест малака. Ён пераставаў тады плакаць і паміраць.

А вакол забівалі. Забівалі. Забівалі... Людзей, коней, сабакаў... За вайну ў нас усіх коней забілі. Усіх сабакаў. Праўда, каты ацалелі.

Удзень немцы прыходзяць: «Матка, дай яйка. Матка, дай сала». Страляюць. А ноччу партызаны... Партызанам трэба было выжыць у лесе, асабліва зімой. Яны ноччу грукалі ў вакно. Калі па-добраму забяруць, а калі сілай... У нас вывелі кароўку... Мама плача. І партызаны плачуць... Не расказаць. Не расказаць, мілая. Не! Не!

Мама з бабуляй аралі так: спачатку мама надзявала на шыю хамут, а бабуля ішла за плугам. Потым яны мяняліся, другая рабілася канём. Я марыла хутчэй вырасці. Шкада было і мамы і бабулі.

Пасля вайны на ўсю вёску быў адзін сабака (чужы прыбіўся) і адна наша курачка. Яйкі мы не елі. Збіралі, каб вывесці куранятак.

Я пайшла ў школу… Адарвала са сцяны кавалак старой шпалеры — гэта быў мой сшытак. Замест гумкі — корак з бутэлькі. Выраслі ўвосень буракі, дык мы так радаваліся, што натрэм буракоў, і ў нас будзе атрамант. Дзень-два гэтая каша пастаіць і робіцца чорнай. Ужо было чым пісаць.

Яшчэ памятаю, што мама і я любілі вышываць гладдзю, абавязкова, каб вясёленькія кветачкі былі. Чорных нітак я не любіла.

І цяпер не люблю чорнага колеру…

## «МАМА НАША НЕ ЎСМІХАЛАСЯ...»

*Кіма Мурзіч, 12 гадоў.*
*Цяпер — рэгуліроўшчыца радыёапаратуры.*

Нашая сям'я...

Нас было тры сястры: Рэма, Мая і Кіма. Рэма — гэта Рэвалюцыя, Электрыфікацыя і Мір, Мая — гэта Першага Мая, Кіма — гэта Камуністычны інтэрнацыянал моладзі. Такія імёны даў нам бацька. Ён быў камуніст, рана ўступіў у партыю. І нас так выхоўваў. У доме ў нас было шмат кніг, былі партрэты Леніна і Сталіна. У першы дзень вайны мы закапалі іх у хляве, я пакінула сабе толькі «Дзяцей капітана Гранта» Жуля Верна. Адну любімую кнігу. Усю вайну я яе чытала і перачытвала.

Мама хадзіла ў вёскі пад Мінскам, мяняла хусткі на ежу. Была ў яе пара добрых туфляў. Яна аднесла нават сваю адзіную крэпдэшынавую сукенку. Мы з Маяй сядзелі і чакалі мамку: вернецца ці не вернецца? Стараліся адна адну адарваць ад гэтых думак, успаміналі, як да вайны бегалі на возера, купаліся, загаралі, як танчылі ў школьнай самадзейнасці. Якія ў нас былі доўгія-доўгія прысады на шляху ў школу. Пах вішнёвага сочыва, якое мама варыла ў двары на камянях... Такое ўсё было далёкае, такое ўсё добрае. Згадвалі Рэму, старэйшую сястру. Усю вайну мы думалі, што яна загінула. Як пайшла дваццаць трэцяга чэрвеня на працу на завод, так і не вярнулася дамоў...

Скончылася вайна, мама ўсюды пасылала запыты, шукала Рэму. Быў такі адрасны стол, там заўсёды быў

натоўп людзей, усе адно аднога шукалі. Я насіла і насіла туды маміны лісты. А нам лістоў не было. Надыдзе выходны, мама сядзе ля вакна і чакае, калі будзе ісці паштарка. А яна заўсёды праходзіла міма.

Аднойчы вярнулася з працы мама. Заходзіць да нас суседка. Яна кажа маме: «Танцуйце», — і штосьці трымае ў руцэ за спінай. Мама здагадалася, што гэта ліст. Яна не танцавала, яна села на лаўку і не магла ўстаць. І не гаварыла.

Так сястра знайшлася. Яна была ў эвакуацыі. Мама пачала ўсміхацца. Усю вайну, пакуль мы не знайшлі сястры, мама наша не ўсміхалася…

## «НЕ МАГЛА ПРЫВЫКНУЦЬ ДА СВАЙГО ІМЯ...»

*Лена Краўчанка, 7 гадоў.*
*Цяпер — бухгалтарка.*

Я, вядома, нічога не ведала пра смерць... Ніхто не паспеў растлумачыць, я яе адразу ўбачыла...

Калі кулямёты страляюць з самалёта, дык здаецца, што ўсе кулі ляцяць у цябе. У твой бок. Я прасіла: «Мамачка, кладзіся на мяне...» Яна ляжа, тады я нічога не бачу і не чую.

Самым жахлівым было страціць маму... Я бачыла забітую маладую жанчыну, а дзіця смактала ў яе грудзі. Пэўна, яе хвіліну назад забіла. Дзіця нават не плакала. А я сядзела побач...

Толькі б не згубіць мне маму... Мама ўвесь час трымае мяне за руку і гладзіць па галаве: «Усё будзе добра. Усё будзе добра».

Ехалі мы на нейкай машыне, і ўсім дзецям надзелі на галовы вёдры. Я не слухалася маму...

Потым памятаю — гоняць нас у калоне... І там у мяне маму забіраюць... Я хапаю яе за рукі, чапляюся за яе маркізетавую сукенку, яна апранулася не для вайны. Яе шыкоўную сукенку. Самую шыкоўную. Не адпускаю... Плачу... А фашыст мяне адкідвае спачатку аўтаматам, а з зямлі, калі я ўпала, — ботам. Падбірае мяне нейкая жанчына. І вось мы з ёю ўжо чамусьці ў вагоне, едзем. Куды? Яна кліча мяне «Анечка»... Але я думаю, што ў мяне іншае імя... Як быццам памятаю, што яно ў мяне іншае, але якое — забыла. Ад жаху. Ад

жаху, што ў мяне забралі маму… Куды мы едзем? Мне так здаецца, з размоваў дарослых я зразумела, вязуць нас у Германію. Памятаю свае думкі: навошта я немцам такая маленькая? Што я буду ў іх рабіць? Калі пачало цямнець, жанчыны паклікалі мяне да дзвярэй і проста выштурхалі з вагона: «Бяжы! Можа, уратуешся».

Звалілася ў нейкую канаву, там і заснула. Было холадна, і сніўся мне сон, што мама ўхутвае мяне ў штосьці цёплае і гаворыць ласкавыя словы. Гэты сон мне сніцца ўсё жыццё…

Праз дваццаць пяць гадоў пасля вайны я знайшла адну толькі нашу цётку. Яна мне назвала маё сапраўднае імя, і я доўга не магла да яго прывыкнуць.

Не адгукалася…

## «ГІМНАСЦЁРКА Ў ЯГО БЫЛА МОКРАЯ...»

*Валя Мацюшкова, 5 гадоў.*
*Цяпер — інжынерка.*

Вы здзівіцеся! А я хацела б згадаць што-небудзь смешнае. Вясёлае. Я люблю смяяцца, я не хачу плакаць. О-о-о... Ужо плачу...

Тата вядзе мяне ў радзільню да мамы і кажа, што мы хутка купім хлопчыка. Я хачу ўявіць, які ў мяне будзе брацік. Пытаю ў таты: «Які?» Ён адказвае: «Маленькі».

Раптам мы з татам недзе высока, і ў вакно паўзе дым. Тата нясе мяне на руках, а я прашу, каб мы вярнуліся па маю дзіцячую сумачку. Капрызую. Тата маўчыць і моцна прыціскае мяне да сябе, прыціскае так моцна, што мне цяжка дыхаць. Хутка таты не стала, я іду па вуліцы з нейкай жанчынаю. Мы ідзём уздоўж дроту, за якім ваеннапалонныя. Горача, яны просяць піць. У мяне толькі дзве цукеркі ў кішэні. Я кідаю за дрот цукеркі. Але адкуль у мяне гэтыя цукеркі? Я ўжо не памятаю. Нехта кідае хлеб... Агуркі... Ахоўнік страляе, мы ўцякаем...

Дзіўна, аднак я ўсё гэта памятаю... З падрабязнасцямі...

Потым памятаю сябе ў дзіцячым прыёмніку, ён быў агароджаны дротам. Ахоўвалі нас нямецкія салдаты і нямецкія аўчаркі. Там былі і такія дзеці, што не ўмелі яшчэ хадзіць, а поўзалі. Калі яны хацелі есці, яны лізалі падлогу... Елі бруд... Яны хутка паміралі. Кармілі кепска, давалі нейкі хлеб, ад яго так распухаў язык, што мы не маглі нават размаўляць. Думалі толькі пра ежу.

Паснедаеш і думаеш — а што будзе на полудзень? Папалуднуеш — а што будзе на вячэру? Пралазілі пад дротам і ўцякалі ў горад. Мэта адна — сметнікі. Неверагодная радасць, калі знойдзеш шкурку селядца ці бульбяное шалупінне. Шалупінне елі сырым.

Памятаю, як мяне злавіў на сметніку нейкі дзядзька. Я спалохалася:

— Дзядзечка, я больш не буду.

Ён спытаў:

— Ты чыя?

— Я — нічыя. Я — з дзіцячага прыёмніка.

Ён павёў мяне дадому і накарміў. У хаце ў іх была толькі бульба. Зварылі, і я з'ела цэлы чыгунок бульбы.

З дзіцячага прыёмніка перавезлі ў дзіцячы дом, які размяшчаўся насупраць мединстытута, а там быў нямецкі шпіталь. Памятаю нізкія вокны, цяжкія аканіцы, якія зачынялі на ноч.

Тут кармілі добра, я паправілася. Мяне вельмі любіла жанчына, якая там прыбірала. Яна шкадавала ўсіх, а мяне асабліва. Калі прыходзілі да нас браць кроў, усе хаваліся: «Урачы ідуць...» — яна засоўвала мяне ў які-небудзь куток. І ўвесь час паўтарала, што я падобная да ейнай дачкі. Іншыя лезлі пад ложак, іх адтуль выцягвалі. Выманьвалі. То кавалачак хлеба дадуць, то пакажуць дзіцячую цацку. Я запомніла чырвоны мячык...

«Урачы» сыходзілі, я вярталася ў пакой... Памятаю, ляжыць маленькі хлопчык, у яго рука з ложка звісае, а па ёй кроў цячэ. А іншыя дзеці плачуць... Праз двазтры тыдні дзеці мяняліся. Адных кудысьці адвозілі, яны ўжо ўсе былі бледныя, слабыя, а іншых прывозілі. Адкормлівалі.

Нямецкія дактары меркавалі, што кроў дзяцей да пяці гадоў дапамагае хутчэй ачуняць параненым. Мае

амаладжальны эфект. Гэта я даведалася потым… Вядома, потым…

А тады… Мне хацелася атрымаць прыгожую цацку. Чырвоны мячык.

Калі немцы пачалі ўцякаць з Мінска… Адступалі… Жанчына гэтая, што мяне ратавала, вывела нас за браму: «У каго ёсць хто-небудзь, шукайце. У каго няма, ідзіце ў любую вёску, там вас людзі ўратуюць».

І я пайшла. Жыла ў адной бабулі… Ні прозвішча яе, ні вёскі не памятаю. Памятаю, што ў яе дачку арыштавалі, і мы засталіся ўдваіх — старэнькая і маленькая. На тыдзень у нас быў кавалачак хлеба.

Пра тое, што ў вёсцы — нашы, я даведалася апошняя. Я хварэла. Як пачула, паднялася і прыбегла да школы. Убачыла першага салдата, як прыліпла да яго. І памятаю, што гімнасцёрка ў яго была мокрая.

Так яго абдымалі, цалавалі і плакалі.

## «ЯК БЫЦЦАМ ЯНА ЯМУ ДАЧКУ ВЫРАТАВАЛА...»

*Геня Завойнер, 7 гадоў.*
*Цяпер — рэгуліроўшчыца радыёапаратуры.*

Што я захоўваю ў памяці больш за ўсё? З тых дзён...

Як забіралі бацьку... Ён быў у ватоўцы, а твару ягонага не памятаю, ён зусім знік з маёй памяці. Памятаю ягоныя рукі... Яны звязалі іх вяроўкамі. Татавы рукі... Аднак як ні напружваюся, тых, хто прыйшоў па яго, таксама не памятаю. Іх было некалькі чалавек...

Мама плакала. Яна ўвесь дзень прастаяла ля вакна.

Бацьку забралі, а нас перасялілі ў гета, сталі мы жыць за дротам. Наш дом стаяў каля дарогі, кожны дзень у наш двор ляцелі палкі. Я бачыла фашыста ля нашае брамкі, калі гурт людзей вялі на расстрэл, ён біў іх гэтымі палкамі. Палкі ламаліся, і ён кідаў іх за спіну. У наш двор. Я хацела разгледзець яго лепей, а не толькі спіну, і аднойчы ўбачыла: ён быў маленькі, з лысінай. Крактаў і адсопваўся. Маё дзіцячае ўяўленне агаломшыла тое, што ён такі звычайны...

Бабулю нашу мы знайшлі забітай у кватэры... Самі пахавалі... Нашу вясёлую і мудрую бабулю, якая любіла нямецкую музыку. Нямецкую літаратуру.

Мама пайшла мяняць рэчы на ежу, а ў гета пачаўся пагром. Звычайна мы хаваліся ў склепе, а тут палезлі на гарышча. Яно было з аднога боку цалкам разбітае, і гэта нас уратавала. Немцы ўвайшлі ў наш дом і штыхамі білі ў столь. І не палезлі на гарышча толькі таму, што яно было разбітае. А ў склеп яны кінулі гранаты.

Тры дні працягваўся пагром, і тры дні мы сядзелі на гарышчы. А мамы з намі не было. Думалі толькі пра яе. Скончыўся пагром, сталі каля брамкі і чакаем: жывая яна ці не? Раптам паказаўся з-за павароту наш былы сусед, ён прайшоў не спыняючыся, але мы пачулі: «Ваша мама жывая». Калі мама вярнулася, мы ўтрох стаялі і глядзелі на яе, ніхто не плакаў, слёз не было, надышло нейкае супакаенне. Нават не адчувалі голаду.

Стаім з мамай каля дроту, паўз нас ідзе прыгожая жанчына. Яна спынілася каля нас па той бок і кажа маме: «Як мне вас шкада». Мама ёй адказвае: «Калі вам шкада, вазьміце маю дачку да сябе». «Добра», — задумваецца жанчына. Астатняе яны дагаворваюць шэптам.

На наступны дзень мама прывяла мяне да брамы гета:

— Генечка, ты возьмеш вазочак з лялькай і пойдзеш да цёткі Марусі. — (Гэта наша суседка.)

Я памятаю, у што тады была апранутая: блакітная кофтачка, швэдрык з белымі кутасікамі. Усё самае лепшае, святочнае.

Мама мяне штурхае за браму гета, а я тулюся да яе. Яна штурхае, а сама слязьмі абліваецца. І памятаю, як я пайшла… Памятаю, дзе брама была, дзе пост аховы…

Так і прыкаціла вазочак, куды мама загадала, там мяне апранулі ў кажушок і пасадзілі на фурманку. Колькі мы ехалі, столькі я плакала і казала: «Там, дзе ты, мама, там і я. Там, дзе ты…»

Прывезлі на хутар, пасадзілі на доўгую лаўку. У гэтай сям'і, куды я трапіла, было чацвёра дзяцей. І яны ўзялі яшчэ мяне. Я хачу, каб усе ведалі імя жанчыны, якая мяне ўратавала: Алімпія Пажарыцкая з вёскі Гіневічы Валожынскага раёна. Страх у гэтай сям'і жыў столькі часу, колькі я там жыла. Іх маглі расстраляць

у любую хвіліну… Усю сям'ю… І чацвярых дзяцей… За тое, што яны хаваюць габрэйскае дзіця. З гета. Я была іх смерцю… Гэта якое трэба мець вялікае сэрца! Нечалавечае чалавечае сэрца… З'яўляліся немцы, мяне адразу куды-небудзь накіроўвалі. Лес быў побач, лес ратаваў. Жанчына гэтая мяне вельмі шкадавала, яна шкадавала аднолькава сваіх дзяцей і мяне. Калі яна штосьці давала, дык давала ўсім, калі яна цалавала, дык цалавала ўсіх. І гладзіла ўсіх аднолькава. Я называла яе «мамуся». Недзе ў мяне была мама, а тут мамуся…

Калі да хутара падышлі танкі, я пасвіла кароў, убачыла танкі і схавалася. Мне не верылася, што танкі нашы, аднак калі разгледзела на іх чырвоныя зоркі, выйшла на дарогу. З першага танка саскочыў вайсковец, падхапіў мяне на рукі і высока-высока падняў. Тут прыбегла гаспадыня хутара, яна была такая шчаслівая, такая прыгожая, ёй так хацелася чымсьці добрым падзяліцца, сказаць, што яны таксама штосьці рабілі дзеля гэтай перамогі. І яна расказала, як яны мяне ўратавалі. Габрэйскую дзяўчынку… Гэты вайсковец прытуліў мяне да сябе, а я была тоненькая-тоненькая, і схавалася ў яго пад рукой, і ён абняў гэтую жанчыну, ён абняў яе з такім тварам, нібыта яна яму дачку выратавала. Ён сказаў, што ў яго ўсе загінулі, вось скончыцца вайна, ён вернецца і забярэ мяне ў Маскву. А я ні за што не згаджалася, хоць не ведала, жывая мая мама ці не.

Прыбеглі іншыя людзі, яны таксама абдымалі мяне. І ўсе прызнаваліся, што здагадваліся, каго хаваюць на хутары.

Потым прыехала мая мама па мяне. Яна ўвайшла ў двор і стала перад гэтай жанчынай і ейнымі дзецьмі на калені…

## «У АТРАД МЯНЕ НЕСЛІ НА РУКАХ... УСЁ ЎВА МНЕ БЫЛО АДБІТА АД ПЯТАК ДА МАКАЎКІ...»

*Валодзя Ампілогаў, 10 гадоў.*
*Цяпер — слесар.*

Дзесяць гадоў мне, роўненька дзесяць гадоў... І вайна. Гэтая сволач — вайна!

Гулялі мы ў двары з хлопчыкамі ў «палачкі-стукалачкі». Заехала вялікая машына, з яе выскачылі нямецкія салдаты, пачалі нас лавіць і кідаць у кузаў пад брызент. Прывезлі на вакзал, машына задам падышла да вагона, і нас, як мяшкі, пакідалі туды. На салому.

Вагон набілі так, што першы час мы маглі толькі стаяць. Дарослых не было, адныя дзеці ды падлеткі. Два дні і дзве ночы нас везлі з зачыненымі дзвярыма, нічога не бачылі, чулі толькі, як колы грукаюць па рэйках. Удзень яшчэ святло неяк прабівалася скрозь шчыліны, а ноччу рабілася так страшна, што ўсе плакалі: нас кудысьці далёка вязуць, а нашы бацькі не ведаюць, дзе мы. На трэці дзень адчыніліся дзверы, і салдат кінуў у вагон некалькі буханак хлеба. Хто быў бліжэй, паспелі схапіць, і ў адну хвілю гэты хлеб праглынулі. Я быў каля супрацьлеглага боку ад дзвярэй і хлеба не бачыў, толькі мне падалося, што на момант адчуў ягоны пах, калі пачуў крык: «Хлеб!» Адзін толькі пах.

Ужо не памятаю, якія гэта ішлі суткі ў дарозе... Але дыхаць ужо не было чым, бо мы ў гэтым вагоне

і ў прыбіральню хадзілі. І па вялікай, і па маленькай патрэбе… Цягнік пачалі бамбіць… У маім вагоне сарвала дах. Я быў не адзін, а з сябрам Грышкам, яму, як і мне, дзесяць гадоў, да вайны мы вучыліся ў адным класе. З першых хвілінаў, як нас пачалі бамбіць, мы трымаліся адзін аднога, каб не згубіцца. Калі сарвала дах, вырашылі вылезці з вагона праз верх і ўцякаць. Уцякаць! Нам ужо было зразумела — вязуць на захад. У Германію.

У лесе было цёмна, і мы азіраліся — гарэў наш цягнік, ён гарэў адным вогнішчам. Высокім полымем. Усю ноч ішлі, пад раніцу прыбіліся да нейкай вёскі, але вёскі не было, замест хат… Гэта я ўпершыню бачыў: стаялі адныя чорныя печы. Слаўся туман… Мы ішлі, як па могілках… Сярод чорных помнікаў… Шукалі што-небудзь паесці, печы стаялі пустыя і халодныя. Пайшлі далей. Пад вечар зноў наткнуліся на патухлае пажарышча і пустыя печы… Ішлі ды ішлі… Грыша раптам упаў і памёр, у яго спынілася сэрца. Усю ноч я прасядзеў над ім, чакаў раніцы. На світанку выкапаў рукамі ямку ў пяску і пахаваў Грышу. Хацеў запомніць гэтае месца, аднак як ты запомніш, калі ўсё вакол незнаёмае.

Брыду, і ад голаду кругам ідзе галава. Раптам чую: «Стой! Хлопчык, куды ідзеш?» Я спытаў: «Хто вы такія?» Яны кажуць: «Мы свае. Партызаны». Ад іх я даведаўся, што знаходжуся ў Віцебскай вобласці, трапіў у Аляксееўскую партызанскую брыгаду…

Калі трохі акрыяў, пачаў прасіцца ваяваць. Нада мною ў адказ паджартоўвалі і накіроўвалі дапамагчы на кухні. Але здарылася такое… Такі выпадак… Тры разы накіроўвалі да станцыі разведчыкаў, і яны не вярталіся. Пасля трэцяга разу камандзір атрада пашыхтаваў усіх і сказаў:

—У чацвёрты раз пасылаць сам не магу. Пойдуць добраахвотнікі…

Я стаяў у другім шэрагу, пачуў:

—Хто добраахвотнікі? — Цягну, як у школе, руку ўверх. А ватоўка ў мяне доўгая, рукавы матляліся па зямлі. Падымаю руку, а яе не відаць, рукавы вісяць, я з іх вылезці не магу.

Камандзір камандуе:

—Добраахвотнікі, крок наперад.

Зрабіў я крок наперад.

—Сынок… — толькі і сказаў мне камандзір. — Сынок…

Далі мне торбачку, старую зімовую шапку, адно вуха ў яе было адарванае.

Як толькі выйшаў на вялікую дарогу… З'явілася адчуванне, што за мною сочаць. Азіраюся — нікога няма. Тут я звярнуў увагу на тры кучаравыя хвоі. Асцярожна прыгледзеўся і заўважыў, што там сядзяць нямецкія снайперы. Любога, хто выходзіў з лесу, яны «здымалі». А паявіўся на ўскрайку лесу хлопчык, ды яшчэ з торбачкай, чапаць не сталі.

Вярнуўся я ў атрад і даклаў камандзіру, што ў хвоях сядзяць нямецкія снайперы. Ноччу мы іх узялі без аднога стрэлу і жывымі прывялі ў атрад. Гэта была мая першая разведка…

У канцы сорак трэцяга… У вёсцы Старыя Чаўнышкі Бешанковіцкага раёна мяне эсэсаўцы злавілі… Білі шомпаламі. Білі нагамі ў каваных ботах. Боты бы каменныя… Пасля катаванняў выцягнулі на вуліцу і аблілі вадой. Гэта было зімой, я пакрыўся ледзяной крывавай коркай. Да мяне не даходзіла, што за грукат чую над сабой. Збівалі шыбеніцу. Я ўбачыў яе, калі мяне паднялі

і паставілі на калоду. Апошняе, што я запомніў? Пах свежага дрэва… Жывы пах…

Пятля зацягнулася, але яе паспелі сарваць… У засадзе сядзелі партызаны. Калі да мяне вярнулася свядомасць, я пазнаў нашага доктара. «Яшчэ дзве секунды — і ўсё, я цябе не ўратаваў бы, — сказаў ён. — А так ты шчаслівы, сынок, бо жывы».

У атрад мяне неслі на руках, ува мне ўсё было адбіта ад пятак да макаўкі. Было так балюча, што я думаў: ці буду я расці?

## «А ЧАМУ Я ТАКІ МАЛЕНЬКІ?..»

*Саша Стральцоў, 4 гады.*
*Цяпер — лётчык.*

Тата мяне нават не бачыў...

Я нарадзіўся без яго. У яго было дзве вайны: вярнуўся з фінскай — пачалася Айчынная. Другі раз пайшоў з хаты.

Ад мамы ў памяці засталося, як мы ідзём па лесе, і яна мяне вучыць: «Ты не спяшайся. Паслухай, як падае лісце. Як лес шуміць...» Потым мы сядзім з ёю на дарозе, і яна малюе мне птушак на пяску дубчыкам.

Яшчэ памятаю, што хацеў быць высокім і пытаў у мамы:

—Тата высокі?

Мама адказвала:

—Вельмі высокі і прыгожы. Але ніколі гэтым не выхваляецца.

—А чаму я такі маленькі?

Я яшчэ толькі рос... У нас не засталося ніводнага фотаздымка таты, а мне трэба было пацвярджэнне, што я да яго падобны.

—Падобны. Вельмі падобны, — супакойвала мама.

У сорак пятым... Мы даведаліся, што тата загінуў. Мама яго так любіла, што звар'яцела... Яна нікога не пазнавала, нават мяне. І колькі я потым сябе памятаю, заўсёды са мною была толькі бабуля. Бабулю звалі Шура, каб нас не блыталі, мы з ёю дамовіліся: я Шурык, яна — баба Саша.

Казак баба Саша не расказвала, з раніцы да позняй ночы яна прала, арала, варыла, бяліла. Пасвіла карову. А ў святы любіла ўспамінаць, як я нарадзіўся. І вось расказваю вам, а ў мяне ў вушах бабулін голас: «Быў цёплы дзень. У дзеда Ігната ацялілася карова, а да старога Якімшчука залезлі ў сад. І ты з'явіўся на свет…»

Над хатай увесь час пралятаді самалёты… Нашы самалёты. У другім класе я цвёрда вырашыў стаць лётчыкам.

Бабуля пайшла ў ваенкамат. У яе папрасілі мае дакументы, дакументаў маіх у яе не было, але яна ўзяла з сабой пахавальную на тату. Дамоў вярнулася са словамі: «Выкапаем бульбу, і паедзеш у Мінск у сувораўскую вучэльню».

Перад дарогай яна пазычыла ў кагосьці мукі і напякла булачак. Ваенкам пасадзіў мяне на машыну і сказаў: «Гэта табе павага за твайго тату».

Я ехаў на машыне ўпершыню ў жыцці.

Праз некалькі месяцаў прыехала ў вучэльню бабуля і прывезла мне гасцінец — яблык. Прасіла: «Еж».

А я не хацеў адразу застацца без ейнага падарунка…

## «ІХ ЦЯГНУЛА НА ЧАЛАВЕЧЫ ПАХ...»

*Надзя Савіцкая, 12 гадоў.*
*Цяпер — рабочая.*

Чакалі з войска брата. Ён напісаў ліст, што прыйдзе ў чэрвені...

Думалі: брат вернецца, і будзем будаваць яму хату. Бацька ўжо вазіў на конях бярвёны, вечарам мы ўсе сядзелі на гэтых бярвёнах, і я памятаю, як мама казала тату, што хату паставяць вялікую. У іх будзе шмат унукаў.

Пачалася вайна, брат, вядома, не прыйшоў з войска. У нас — пяць сясцёр і адзін брат, і гэты брат быў самы старэйшы з дзяцей. Усю вайну мама плакала, і ўсю вайну мы чакалі брата. Я так памятаю, што чакалі яго кожны дзень.

Пачуем, што кудысьці прыгналі нашых ваеннапалонных, — хутчэй туды. Спячэ мама дзесяць бульбін — у вузельчык, і пайшлі. Аднойчы ўзяць з сабой не было чаго, а ў полі стаяла спелае жыта. Мы наламалі каласкоў, нацерлі ў руках зерня. І трапілі на немцаў, на патруль, які вартаваў поле. Высыпалі яны наша зерне і паказваюць: станавіцеся, расстрэльваць будзем. Мы ў плач, а мама ім боты цалуе. Яны на конях сядзяць, высока, яна хапае іх за ногі, цалуе і просіць: «Паночкі! Пашкадуйце... Паночкі, гэта ж усе мае дзеці. Вы бачыце, адны дзяўчаткі». Не сталі яны страляць, паехалі.

Як яны паехалі, я пачала смяяцца. Смяюся і смяюся, дзесяць хвілінаў прайшло, а я смяюся. Дваццаць

хвілінаў... Падаю ад смеху. Мама сварыцца на мяне — не дапамагае, мама мяне просіць — не дапамагае. Колькі мы ішлі, столькі я смяялася. Прыйшла дамоў — смяюся. У падушкі ўпаду, супакоіцца не магу — смяюся. І ўвесь дзень я так смяялася. Думалі, што я... Ну, разумееце... Ва ўсіх страх... Баяліся, што я розум страціла. Збажаволіла.

У мяне дагэтуль засталося: калі спалохаюся, пачынаю гучна смяяцца. Гучна-гучна.

Сорак чацвёрты год... Вызвалілі нас, і тады мы атрымалі ліст, што брат наш загінуў. Мама плакала, плакала і аслепла. Жылі мы за вёскай у нямецкіх бліндажах, бо вёска згарэла, згарэла наша старая хата і бярвёны для новай хаты. Нічога ў нас не ацалела, знайшлі ў лесе салдацкія каскі і ў іх варылі. Нямецкія каскі былі вялікія, як чыгуны. Карміліся мы ў лесе. У ягады і грыбы хадзіць было страшна. Пазаставалася шмат нямецкіх аўчарак, яны кідаліся на людзей, загрызалі дзяцей маленькіх. Яны ж былі прывучаныя да чалавечага мяса, да чалавечай крыві. Да яе свежага паху... Калі мы ішлі ў лес, дык збіраліся вялікімі гуртамі. Чалавек па дваццаць... Маці нас вучылі, што трэба хадзіць па лесе і крычаць, тады сабакі пужаюцца. Пакуль кошык ягад назбіраеш, так накрычышся, што голас страціш. Ахрыпнеш. Распухала горла. А сабакі вялікія, як ваўкі.

Іх цягнула на чалавечы пах...

## «НАВОШТА ЯНЫ СТРАЛЯЛІ Ў ТВАР? МАЯ МАМА БЫЛА ТАКАЯ ПРЫГОЖАЯ...»

*Валодзя Коршук, 7 гадоў.*
*Цяпер — прафесар, доктар гістарычных навук.*

Жылі мы ў Брэсце. На самай мяжы...

Увечары былі ў кіно ўсе ўтраіх: мама, тата і я. А так здаралася рэдка, каб мы ўсе ўтраіх куды-небудзь хадзілі, бо тата быў увесь час заняты. Ён працаваў загадчыкам аблана, заўсёды ў камандзіроўках.

Апошні вечар без вайны... Апошняя ноч...

Калі ранкам мама расштурхала мяне, усё вакол грукатала, грукала, гуло. Гэта было вельмі рана. Я запомніў, што за вокнамі яшчэ было цёмна. Бацькі мітусіліся, складвалі чамадан, нічога чамусьці не знаходзілася.

У нас быў свой дом, вялікі сад. Тата кудысьці пайшоў, мы з мамай паглядзелі ў вакно: у садзе стаялі нейкія вайскоўцы і размаўлялі на ламанай рускай мове, апранутыя яны былі ў нашу форму. І мама сказала, што гэта — дыверсанты. У мяне ніяк не ўкладвалася ў галаве, што ў нашым садзе, дзе на століку яшчэ застаўся з учарашняга вечара самавар, раптам — дыверсанты! А дзе нашы памежнікі?

Сыходзілі з горада пешкам. На вачах у мяне рассыпаўся каменны будынак наперадзе, і з вакна вылецеў тэлефон. Пасярод вуліцы стаяў ложак, на ім ляжала забітая дзяўчынка пад коўдрай. Нібыта ложак аднекуль вынеслі і паставілі, такое ўсё было цэлае, толькі коўдра трохі абгарэлая. Адразу за горадам пачыналася жытнё-

вае поле, самалёты абстрэльвалі нас з кулямётаў, і ўсе рухаліся не па дарозе, а па гэтым полі.

Увайшлі ў лес, стала не так страшна. З лесу я ўбачыў вялікія машыны. Гэта ехалі немцы, яны гучна смяяліся. Чулася незнаёмая мова. У ёй было шмат р-р-р…

Бацькі ўвесь час пыталі адзін у аднога: дзе нашы? Дзе наша войска? Я ўяўляў сабе, што зараз прымчыць Будзённы на баявым кані, і немцы пабягуць у жаху. Нашай конніцы роўных няма — не так даўно пераконваў мяне тата.

Мы ішлі доўга. Ноччу заходзілі на хутары — нас кармілі, абагравалі. Шмат хто ведаў тату, і тата таксама ведаў шмат каго з іх. Зайшлі на адзін хутар, памятаю дагэтуль прозвішча настаўніка, які жыў на тым хутары: Павук. У іх было дзве хаты — новая і старая побач. І яны прапаноўвалі нам застацца, аддавалі адну хату. Але тата адмовіўся. Гаспадар давёз нас да вялікай дарогі, мама паспрабавала даць яму грошы, аднак ён пахітаў галавой і сказаў, што за сяброўства ў цяжкую хвіліну грошай не плоцяць. Вось гэта я запомніў.

Так дайшлі мы да горада Узда, з гэтых мясцінаў быў родам мой тата. Пасяліліся ў дзеда ў вёсцы Мрочкі.

Першы раз партызанаў у нашай хаце я ўбачыў зімой, і з таго часу яны мне ўяўляліся людзьмі ў белых маскхалатах. Хутка тата пайшоў з імі ў лес, мы засталіся ў дзядулі з мамай.

Мама штосьці шыла… Не… Яна сядзела за вялікім сталом і штосьці вышывала на красёнках, а я быў на печы. Немцы ўвайшлі ў хату са старастам, і староста паказаў на маму: «Вось — яна». Маме загадалі збірацца. Тут я вельмі напалохаўся. Маму вывелі ў двор, яна клікала мяне развітацца, а я залез пад лаўку, і мяне не маглі адтуль выцягнуць.

Маму далучылі да дзвюх іншых жанчын, у якіх таксама мужы былі ў партызанах. І павезлі. Ніхто не ведаў — куды? У які бок? Назаўтра іх усіх знайшлі непадалёку за вёскай, яны ляжалі ў снезе... Усю ноч ішоў снег... Што мне запомнілася, калі маму прывезлі, дык гэта тое, што стралялі чамусьці ў твар, у мамы на шчацэ было некалькі чорных дзірачак ад куль. Я ў дзядулі пытаўся: «Навошта яны стралялі ў твар? Мая мама была такая прыгожая...» Маму пахавалі... За труной ішлі дзядуля з бабуляй і я. Людзі баяліся. Яны прыходзілі развітвацца ноччу... Усю ноч у нас не зачыняліся дзверы, а ўдзень мы былі адны. Я не мог зразумець, за што забілі маю маму, калі яна нічога кепскага не рабіла. Яна сядзела і вышывала...

Аднойчы ноччу прыйшоў тата і сказаў, што забірае мяне з сабой. Я быў шчаслівы. Па першым часе жыццё маё ў партызанах мала чым адрознівалася ад жыцця ў дзядулі. Тата ішоў на заданне, а мяне пакідаў у каго-небудзь у вёсцы. І вось я памятаю, як гаспадыні, у якой ён мяне аднойчы пакінуў, прывезлі на санях забітага мужа. Яна білася галавой аб стол, на якім стаяла труна, і паўтарала адно слова: «ірады».

Таты доўга, доўга не было, я чакаў яго і думаў: «У мяне няма мамы, недзе далёка бабуля з дзядулем, што ж я буду адзін, маленькі, рабіць, калі прывязуць тату на санях забітага?» Калі тата вярнуўся, мне падалося, прайшла вечнасць. А пакуль я чакаў, даў сабе слова, што буду называць цяпер яго толькі на «вы». Гэтым мне хацелася падкрэсліць, як я яго люблю, як сумую, і тое, што ён у мяне адзін. Відаць, тата спачатку не заўважыў, як я да яго звяртаюся, а потым ён мяне спытаў: «Чаму ты кажаш мне «вы»?» Я яму прызнаўся, якое даў сабе слова і чаму. А ён мне патлумачыў: «Ты таксама ў мяне адзін, таму мы павінны казаць адзін аднаму «ты». Мы

самыя блізкія на свеце людзі». Яшчэ я папрасіў яго, каб мы з ім ніколі не расставаліся. «Ты ўжо дарослы, ты — мужчына», — пераконваў ён мяне.

Запомнілася татава ласка. Як нас абстрэльвалі... Ляжалі на халоднай красавіцкай зямлі, травы яшчэ не было... Тата знайшоў глыбокую ямку і сказаў мне: «Кладзіся ўніз, а я наверх, калі мяне заб'юць, ты жыць застанешся». У атрадзе мяне шкадавалі ўсе. Памятаю, падышоў сталы партызан, зняў з мяне шапку і доўга гладзіў па галаве, і казаў тату, што ў яго таксама такі недзе бегае. А калі мы ішлі праз балота, па пояс у вадзе, тата спрабаваў мяне несці на сабе, але хутка стаміўся. Тады партызаны пачалі несці мяне па чарзе. Гэтага я ніколі не забуду. Не забуду, як знайшлі яны трошкі шчаўя і ўсё аддалі мне. А самі заснулі галодныя.

...У Гомельскім дзіцячым доме, куды мяне і яшчэ некалькі партызанскіх дзяцей пераправілі на самалёце, як толькі горад вызвалілі, хтосьці перадаў мне ад таты грошы, вялікую чырвоную паперку. Мы пайшлі з хлопчыкамі на кірмаш і на ўсе гэтыя грошы купілі цукерак. Атрымалася вельмі шмат. Хапіла ўсім. Выхавальніца спытала: «Што ты зрабіў з грашыма, якія перадаў тата?» Я прызнаўся, што купіў цукерак. «І ўсё?» — здзівілася яна.

Вызвалілі Мінск... Па мяне прыйшоў нейкі мужчына і сказаў, што адвязе мяне да таты. Сесці ў цягнік было цяжка. Мужчына ўлез, а мяне перадалі яму ў вакно.

Сустрэліся мы з татам, і я зноў прасіў яго, каб мы ніколі, ніколі з ім не расставаліся, бо аднаму быць кепска. Памятаю, што сустракаў ён мяне не адзін, а з новай мамай. Яна прыгарнула маю галаву да сябе, а я так засумаваў па мацярынскай ласцы, і мне так было прыемна ад яе дотыку, што адразу заснуў у машыне. У яе на плячы.

У дзесяць гадоў я пайшоў у першы клас. Але я быў вялікі і ўмеў чытаць, праз паўгода мяне перавялі ў другі клас. Чытаць я ўмеў, а пісаць не. Выклікалі да дошкі, трэба было напісаць слова з літарай «у». Я стаяў і з жахам думаў, што не ведаю, як пішацца літара «у». А страляць ужо ўмеў. Добра страляў.

У адзін дзень я не знайшоў у шафе татавага пісталета, перавярнуў усю шафу — пісталета не было.

— Як гэта так? Што ты цяпер будзеш рабіць? — спытаўся я ў таты, калі ён вярнуўся з працы.

— Я буду вучыць дзяцей, — адказаў ён.

Я разгубіўся... Я думаў, што праца — гэта толькі вайна...

## «ТЫ ПРОСІШ, КАБ Я ЦЯБЕ ПРЫСТРЭЛІЎ...»

*Вася Байкачоў, 12 гадоў.*
*Цяпер — майстар вытворчага навучання.*

Я гэта часта прыгадваў... Гэта былі апошнія дні дзяцінства...

У час зімовых канікулаў уся наша школа брала ўдзел у ваеннай гульні. Перад гэтым мы вывучалі страявую падрыхтоўку, майстравалі драўляныя вінтоўкі, пашылі маскхалаты, вопратку для санітараў. Шэфы з вайсковай часткі прыляцелі на самалётах «кукурузніках». Усе былі ў захапленні!

А ў чэрвені над намі лёталі ўжо нямецкія самалёты і скідвалі лазутчыкаў. Гэта былі маладыя хлопцы ў шэрых пінжаках і кепках у клетку. Разам з дарослымі мы злавілі некалькі чалавек і здалі ў сельсавет. І вельмі ганарыліся, што ўдзельнічалі ў вайсковай аперацыі, яна нам нагадала зімовую гульню. Але хутка паявіліся іншыя... Гэтыя былі не ў пінжаках ды кепках у клетку, а ў зялёнай форме з закасанымі рукавамі, у ботах з шырокімі халявамі, кавanымі абцасамі, на спіне — ранцы з цялячай скуры, на баку — доўгія бляшанкі супрацьгазаў, і аўтаматы наперавес. Сытыя, цяжкія. Яны спявалі і крычалі: «Цвай монат — Масква капут». Тата мне патлумачыў: «цвай монат» — гэта два месяцы. Усяго два месяцы? Усяго? Гэтая вайна зусім не была падобная да той, у якую мы нядаўна гулялі і якая мне падабалася.

У нашай вёсцы Малевічы немцы ў першыя дні не спыняліся, ехалі на станцыю Жлобін. Там працаваў

мой бацька. Але ён ужо не хадзіў на станцыю, ён чакаў, што вось-вось вернуцца нашы войскі і паганяць немцаў назад да мяжы. Мы верылі бацьку і таксама чакалі нашых. Чакалі іх з дня на дзень. А яны… Нашы салдаты… Яны ляжалі вакол: на дарогах, у лесе, у канавах, у полі… На агародах… У тарфяных ямах… Ляжалі забітыя. Ляжалі разам са сваімі вінтоўкамі. Са сваімі гранатамі. Было цёпла, і яны раслі ад цяпла, іх нібыта больш і больш рабілася з кожным днём. Цэлая армія. Ніхто іх не хаваў…

Бацька запрог каня, і мы паехалі ў поле. Пачалі збіраць забітых. Капалі ямы… Складвалі ў шэрагі па дзесяць-дванаццаць чалавек… Мой школьны партфель запоўніўся дакументамі. Памятаю па адрасах, што гэта былі тыя, хто нарадзіўся ў Куйбышаўскай вобласці, у горадзе Ульянаўску.

Праз некалькі дзён я знайшоў за вёскай забітага бацьку і свайго сябра, чатырнаццацігадовага Васю Шаўцова. Мы з дзедам прыехалі на гэтае месца… Пачалася бамбёжка… Васю закапалі, а бацьку пахаваць не паспелі. Пасля бамбёжкі мы ўжо нічога ад яго не знайшлі. Ніякага следу. Паставілі на могілках крыж — і ўсё. Адзін крыж. Пад ім закапалі святочны бацькаў касцюм.

Праз тыдзень салдатаў ужо немагчыма было збіраць… Іх нельга было падняць… Пад гімнасцёркамі хлюпала вада… Мы збіралі іхныя вінтоўкі. Салдацкія кніжкі.

Дзеда забіла пры бамбёжцы…

Як жыць далей? Як жыць без бацькі? Без дзеда? Мама плакала і плакала. Што рабіць са зброяй, якую мы сабралі і закапалі ў надзейным месцы? Каму яе аддаць? Параіцца няма з кім. Мама плача.

Зімою выйшаў на сувязь з падпольшчыкамі. Яны абрадаваліся майму падарунку. Зброю пераправілі партызанам…

Прайшоў час, колькі — не памятаю… Можа быць, месяцы чатыры. Памятаю, што ў той дзень на леташнім бульбяным полі збіраў мёрзлую бульбу. Вярнуўся дамоў мокры, галодны, але прынёс поўнае вядро. Толькі разуўся, зняў прамоклыя лапці, як пачуўся грукат у люк склепа, у якім мы жылі. Хтосьці пытаўся: «Байкачоў тут?» Калі я паказаўся з люка склепа, пачулася каманда вылезці. У спешцы замест зімовай шапкі надзеў будзёнаўку, за што адразу ж агрэлі пугай.

Каля склепа стаялі тры кані, на якіх сядзелі немцы і паліцаі. Адзін паліцай злез з каня, накінуў папругу мне на шыю і прывязаў да сядла. Мама пачала прасіць: «Дайце я яго пакармлю». Яна палезла ў склеп па праснак з мерзлай бульбы, а яны сцебанулі коней і пагналі адразу рыссю. І так цягнулі мяне кіламетраў пяць да пасёлка Вясёлы.

На першым допыце фашысцкі афіцэр задаваў простыя пытанні: тваё прозвішча, тваё імя, год нараджэння… Хто бацька і маці? Перакладчыкам быў малады паліцай. Напрыканцы допыту ён сказаў: «Зараз ты пойдзеш і прыбярэш пакой для катаванняў. Паглядзі добранька там на лаўку…» Далі мне вядро з вадой, венік, анучу і павялі…

Там я ўбачыў страшны малюнак: пасярод пакоя стаяла шырокая лаўка з прыбітымі да яе рамянямі. Тры рамяні — прывязаць чалавека за шыю, за паясніцу і за ногі. У куце стаялі тоўстыя бярозавыя палкі і вядро з вадой. Вада была чырвоная. На падлозе лужыны крыві… Мачы… І калу…

Я насіў і насіў ваду.Ануча, якой мыў, усё роўна была чырвоная.

Раніцай афіцэр паклікаў мяне:

—Дзе зброя? З кім з падпольшчыкаў трымаеш сувязь? Якія меў заданні? — пытанні сыпаліся адно за другім.

Я адгаворваўся, што нічога не ведаю, яшчэ малы, а на полі збіраў не зброю, а мерзлую бульбу.

—У склеп яго, — загадаў афіцэр салдату.

Мяне апусцілі ў склеп з халоднай вадой. Перад гэтым паказалі партызана, якога толькі што выцягнулі адтуль. Ён не вытрываў катаванне і… утапіўся… А цяпер ляжаў на вуліцы…

Вады было па горла… Я адчуваў, як б'ецца маё сэрца і кроў у жылах, як кроў сагравае ваду вакол майго цела. Баяўся: хоць бы не страціць прытомнасці. Каб не захлынуцца. Не ўтапіцца…

Наступны допыт: руля пісталета прыстаўленая да майго вуха, стрэл — трэснула сухая масніца. Стрэлілі ў падлогу! Удар палкай па шыі, падаю… Нада мною нехта стаіць высокі і цяжкі, ад яго пахне кілбасой і гарэлкай. Мяне ванітуе, а ванітаваць няма чым. Чую: «Зараз выліжаш языком тое, што ад цябе на падлозе… Языком, зразумеў?.. Зразумеў, чырвонае дзіцянё?!»

У камеры не засынаў, а губляў прытомнасць ад болю. То мне здавалася, што я стаю на школьнай лінейцы, і настаўніца Любоў Іванаўна Лашкевіч кажа: «Восенню прыйдзеце ў пяты клас, а цяпер да пабачэння, хлопчыкі і дзяўчаткі. За лета падрасцяце ўсе. Вася Байкачоў цяпер самы маленькі. А стане самым вялікім». Любоў Іванаўна ўсміхаецца…

А то мы ідзём па полі з бацькам, шукаем нашых забітых салдатаў. Бацька недзе наперадзе, а я знаходжу

пад хвояй чалавека... Не чалавека, а тое, што ад яго засталося. Рук няма, ног няма... Ён яшчэ жывы і просіць: «Прыстрэль, сынок...»

Стары, які ляжыць побач у камеры, будзіць мяне:

— Не крычы, сынок.

— А што я крычаў?

— Ты просіш, каб я цябе прыстрэліў...

Прайшлі дзясяткі гадоў, а я ўсё здзіўляюся: жывы?!

## «А НА МНЕ НАВАТ КАСЫНАЧКІ НЯМА...»

*Надзя Гарбачова, 7 гадоў.*
*Цяпер — супрацоўніца тэлебачання.*

Мяне ў вайне цікавіць невытлумачальнае... Я дагэтуль пра яе шмат думаю...

Як ішоў тата на фронт, не запомніла...

Нам не сказалі. Пашкадавалі. Ён адвёў раніцай нас з сястрой у дзіцячы садок. Усё было як заўсёды. Увечары мы, вядома, спыталі, чаму няма таты, але мама супакоіла: «Ён хутка вернецца. Праз некалькі дзён».

Памятаю дарогу... Ехалі машыны, у кузавах рыкалі каровы, вішчалі свінні, у адной машыне — хлопчык трымаў у руках кактус і ад штуршкоў бегаў з ім ад аднога борта да другога... Нам з сястрой было смешна глядзець, як ён бегае. Мы былі дзецьмі... Мы бачылі палі, мы бачылі матылькоў. Нам падабалася ехаць. Мама ахоўвала нас, мы сядзелі пад маміным «крылом». Недзе ў свядомасці было, што здарылася бяда, аднак з намі — мама, і там, куды мы едзем, усё будзе добра. Яна захінула нас ад бомбаў, ад дарослых перапалоханых размоў, ад усяго дрэннага. Калі б мы маглі прачытаць мамін твар, дык прачыталі б на ім усё. Але я яго не памятаю, я памятаю вялікую страказу, якая села на плячо сястрычцы, і я закрычала: «Самалёт!» — а дарослыя чамусьці пасаскоквалі з машын і пачалі задзіраць галовы ўверх.

Прыехалі да дзядулі ў вёску Гарадзец Сенненскага раёна. Сям'я ў яго была вялікая, мы пасяліліся ў летняй кухні. Нас пачалі зваць «дачнікамі», так гэта за намі да

канца вайны і засталося. Я не памятаю, каб мы гулялі, прынамсі, у першы год вайны летніх гульняў не было. Падрастаў маленькі брат, ён быў на нашых руках, бо мама капала, саджала, шыла. Пакіне нас адных: трэба вымыць лыжкі, талеркі, падлогу, прапаліць печ, назбіраць галінак на заўтра, назапасіць вады, поўнае вядро мы не маглі падняць, насілі па палове. З вечара мама прызначала: ты старэйшая па кухні, а ты — старэйшая па брату. І кожная ўжо за сваю справу адказвала.

Было голадна, але ў нас з'явілася котка, за ёй — сабака. Гэта былі чальцы сям'і, мы ўсё дзялілі з імі пароўну. Іншы раз не хапае на котку ды сабаку, дык таемна кожная з нас старалася прыхаваць ім кавалачак. І калі котка загінула ад асколка, гэта была такая страта, што, здавалася, перажыць яе немагчыма. Плакалі два дні. Хавалі з вынасам, са слязьмі. Паставілі крыжык, пасадзілі кветкі, палівалі.

Я і цяпер, як згадваю нашы слёзы, колькі мы пераплакалі, не магу завесці ката. Дачка, калі была маленькая, прасіла купіць сабачку, а я не змагла.

А потым штосьці з намі здарылася. Мы перасталі баяцца смерці.

Прыехалі вялікія нямецкія машыны, нас выгналі ўсіх з хат. Паставілі ў шэраг і лічаць: «Айн, цвай, драй…» Мама дзявятая, а дзясятага — на расстрэл. Нашага суседа… Мама трымала на руках брацікa, дык ён у яе з рук выпаў.

Я запамінала пахі… Калі бачу цяпер у кіно фашыстаў, чую салдацкі пах. Скуры, добрага сукна, поту…

Сястра ў той дзень дзяжурыла па брату, а я палола ў агародзе. У бульбе нагнуся, мяне не відаць, ведаеце, у дзяцінстве ўсё здаецца вялікім і высокім. Калі заўважыла самалёт, ён ужо кружляў нада мною,

я ўбачыла зусім выразна лётчыка. Ягоны малады твар. Кароценькая кулямётная чарга — бах-бах! Самалёт другі раз разварочваецца... Ён не імкнецца мяне забіць, ён забаўляецца. Ужо тады, дзіцячым розумам я гэта зразумела. А на мне нават касыначкі няма, няма чым прыкрыцца...

Ну што гэта? Як растлумачыць? Цікава: ці жывы той лётчык? І што ён згадвае?

Праходзіла тая хвіліна, калі вырашалася: загінеш ад кулі ці памрэш ад жаху, і надыходзіла нейтральная паласа — адну бяду пранесла, а пра другую пакуль людзі не ведаюць — і было шмат смеху. Пачыналі падджартоўваць адзін з аднога: хто і дзе хаваўся, як беглі, як куля ляцела ды не трапіла. Я гэта добра памятаю. Нават мы, дзеці, збяромся і пасмейваемся адзін з аднога — хто спалохаўся, а хто не. Смяяліся і плакалі адначасова.

Я згадваю пра вайну, каб разабрацца... А інакш — навошта?

У нас былі дзве куры. Калі ім казалі: «Ціха — немцы!» — яны маўчалі. Яны сядзелі ціха-ціха разам з намі пад ложкам, ні адна не кудахча. Колькі я потым ні бачыла ў цырку прыручаных курэй, яны мяне не здзіўлялі. А нашы да ўсяго спраўна нясліся пад ложкам у скрынцы — два яйкі на дзень. Мы адчувалі сябе такімі багатымі!

Усё-ткі нейкую ялінку на Новы год мы ставілі. Вядома, гэта мама памятала, што ў нас дзяцінства. З кніг выразалі яркія малюнкі, рабілі шарыкі з паперы: адзін бок белы, другі — чорны, гірлянды са старых нітак. І ў гэты дзень нейк асабліва ўсе ўсміхаліся адно аднаму, замест падарункаў (іх не было) мы пакідалі пад ялінкай запісачкі.

У сваіх запісачках я пісала маме: «Мамулечка, я цябе моцна люблю. Моцна! Моцна!» Дарылі адно аднаму добрыя словы.

Прайшлі гады... Я столькі кніжак прачытала. А ведаю пра вайну не нашмат больш, чым тады, калі была дзіцём.

## «ГУЛЯЦЬ НА ВУЛІЦЫ НЯМА З КІМ...»

*Валя Нікіценка, 4 гады.*
*Цяпер — інжынерка.*

У дзіцячай памяці захоўваецца ўсё, як у альбоме. Асобнымі здымкамі...

Мама просіць:

— Бяжым, бяжым! Тупаем, тупаем!

У яе рукі занятыя. А я капрызую:

— У мяне ножкі баляць.

Трохгадовы брацік штурхае мяне:

— Бязым, — «ж» ён не вымаўляў, — а то немцы дагоняць! — І «бязым» побач моўчкі.

Ад бомбаў я хаваю галаву і ляльку, а лялька ўжо без рукі і без ног. Плачу, каб мама яе перавязала...

Нехта прынёс маме ўлётку. Я ўжо ведаю, што гэта...

Гэта такі вялікі ліст з Масквы, добры ліст. Яны з бабуляй кажуць, і я разумею, што дзядзька наш — у партызанах. Па суседстве ў нас жыла сям'я паліцая. І ведаеце, як дзеці: выйдуць, і кожны хваліцца сваім татам. Іх хлопчык кажа:

— У майго таты аўтамат...

Я таксама хачу пахваліцца:

— А нам дзядзька прынёс улётку...

Гэта пачула маці паліцая, яна прыйшла да мамы папярэдзіць: смяротная бяда пагражае нашай сям'і, калі ейны сын пачуе мае словы ці хто-небудзь з дзяцей перакажа.

Мама паклікала мяне з вуліцы і просіць:

—Дачушка, не будзеш больш расказваць?

—Буду!

—Нельга расказваць.

—Яму можна, а мне не?

Тады яна дастала дубчык з веніка, а біць мяне ёй шкада. Паставіла ў кут:

—Не будзеш? А то маму заб'юць.

—Прыляціць на самалёце наш дзядзька з лесу і выратуе цябе.

Так і заснула ў куце…

Гарыць наша хата, мяне выносяць на руках сонную. Паліто і чаравічкі згарэлі. Я хаджу ў маміным пінжаку, ён да самай зямлі.

Жывём у зямляначцы. Вылажу з зямлянкі і чую пах прасяной кашы, заскваранай салам. Да сёння для мяне смачней ежы няма, чым прасяная каша, засквараная салам. Хтосьці крычыць: «Нашы прыйшлі!» На агародзе ў цёткі Васілісы — так кажа мама, а дзеці цётку Васілісу завуць «бабай Васяй» — стаіць палявая салдацкая кухня. У кацялках нам раздаюць кашу, памятаю дакладна, што ў кацялках. Як мы елі, не памятаю, лыжак не было…

Мне даюць кубак малака, а я ўжо забыла пра яго за вайну. Малако налілі ў кубак, ён у мяне ўпаў і разбіўся. І я плачу. Усе думаюць, што я плачу з-за разбітага кубка, а я плакала, што разліла малако. Яно такое смачнае, і я баюся, што мне яго больш не дадуць.

Пасля вайны пачаліся хваробы. Хварэлі ўсе, усе дзеці. Хварэлі больш, чым у вайну. Незразумела, праўда?

Эпідэмія дыфтэрыту… Дзеці паміраюць. Я ўцякла з-пад замка на пахаванне суседскіх хлопчыкаў-блізнятак, з якімі сябравала. Стаю ля трунačак у маміным

пінжаку і з босымі нагамі. Мама выцягвае мяне адтуль за руку. Яны з бабуляй баяцца, што і я заразілася дыфтэрытам. Не, я толькі кашляю.

У вёсцы зусім не засталося дзяцей. Гуляць на вуліцы няма з кім…

## «Я АДЧЫНЮ НОЧЧУ ВАКНО... І АДДАМ АРКУШЫКІ ВЕТРУ...»

*Зоя Мажарава, 12 гадоў.*
*Цяпер — супрацоўніца пошты.*

Я бачыла анёла...

Ён з'явіўся... Прыйшоў да мяне ў сне, калі нас везлі ў Германію. У вагоне. Там нічога не было відаць, ні кавалачка неба. А ён прыйшоў...

Вы мяне не баіцеся? Маіх словаў? Я то галасы чую, то анёла бачу... Пачну расказваць, не кожны хоча доўга слухаць. Мяне ў госці рэдка клічуць. За святочны стол. Нават суседзі. Я расказваю, расказваю... Можа, старою стала? Не магу спыніцца...

Я пачну з самага пачатку... Першы год вайны я жыла з мамай і татам. Жала і арала. Касіла і малаціла. Усё здавалі немцам: збожжа, бульбу, гарох. Яны прыязджалі ўвосень на конях. Хадзілі па дварах і збіралі... Як гэта? Забыла ўжо тое слова — аброк. Нашы паліцаі таксама з імі хадзілі, яны ўсе былі нам знаёмыя. З суседняй вёскі. Так мы і жылі. Можна сказаць, абвыклі. Гітлер, казалі нам, пад Масквой ужо. Пад Сталінградам.

Ноччу прыходзілі партызаны... А яны расказвалі ўсё па-іншаму: Сталін ні за што не аддасць Масквы. І Сталінграда не аддасць. А мы аралі і жалі. Вечарамі ў выходныя дні і на святы былі ў нас танцы. Танчылі на вуліцы. Быў гармонік.

Я памятаю, здарылася гэта ў Вербную нядзелю... Наламалі мы вярбы, у царкву схадзілі. Сабраліся на вуліцы.

Чакаем гарманіста. Тут прыехалі немцы. На вялікіх крытых машынах, з аўчаркамі. Акружылі нас, камандуюць: залазьце ў машыны. Штурхаюць прыкладамі. Хтосьці плача, хтосьці крычыць... Пакуль нашы бацькі прыбеглі, мы ўжо — у машынах. Пад брызентам. Ад нас непадалёку была чыгуначная станцыя, прывезлі туды. Там ужо стаялі пустыя вагоны напагатове. Паліцай мяне цягне ў вагон, а я вырываюся. Ён накруціў сабе на руку маю касу:

—Не крычы, дурніца. Фюрэр вызваляе вас ад Сталіна.

—А што нам на той чужыне? — дагэтуль нас ужо агітавалі, каб мы ехалі ў Германію. Абяцалі прыгожае жыццё.

—Дапаможаце нямецкаму народу перамагчы бальшавізм.

—Я да мамы хачу.

—Будзеш жыць у доме пад чарапічным дахам і есці шакаладныя цукеркі.

—Я да мамы...

О-о-о-о! Калі б чалавек ведаў свой лёс, то ён бы да раніцы не дажыў.

Пагрузілі і павезлі. Ехалі мы доўга, але колькі, не ведаю. У маім вагоне ўсе былі з нашай Віцебскай вобласці. З розных вёсак. Усе маладыя і такія, як я, малалетнія. У мяне пыталіся:

—А як ты папалася?

—З танцаў.

Ад голаду і страху я губляла прытомнасць. Ляжу. Заплюшчу вочы. І вось упершыню тады... Там... Убачыла анёла... Анёл маленькі, і крылцы ў яго маленькія. Як у птушачкі. А я бачу, што ён хоча мяне выратаваць. «Як ён уратуе мяне, — думаю я, — калі ён сам такі маленькі?» Гэта першы раз яго ўбачыла...

Смага… Мы ўсе пакутавалі ад смагі, увесь час хацелася піць. Усё ўсярэдзіне перасыхала, ды так, што язык вывальваўся з рота, і я не магла яго запхнуць. Удзень ехалі з высалапленымі языкамі. З раскрытым ротам. А ноччу было трохі лягчэй.

Я буду век памятаць… Я за жыццё не забуду…

У куце ў нас стаялі вёдры, куды мы хадзілі па малой патрэбе, пакуль ехалі. І адна дзяўчынка… Яна дапаўзла да гэтых вёдраў, абхапіла адно вядро рукамі, прыпала да яго і пачала піць. Піла вялікімі глыткамі… А потым яе пачало выварочваць… Яе вырве, і яна зноў паўзе да вядра… Яе зноў вываочвае…

О-о-о-о! Калі б чалавек ведаў свой лёс наперад…

Я запомніла горад Магдэбург… Там нас пастрыглі нагала і абмазалі цэлы белым растворам. Дзеля прафілактыкі. Цела гарэла агнём ад гэтага раствору, ад гэтай вадкасці. Скура злазіла. Не дай Бог! Я не хацела жыць… Мне ўжо нікога не было шкада: ні сябе, ні маму з татам. А падымеш вочы — вакол яны стаяць. З аўчаркамі. У аўчарак вочы страшныя. Сабака ніколі чалавеку проста ў вочы не глядзіць, адводзіць вочы, а гэтыя глядзелі. Глядзелі нам проста ў вочы. Я не хацела жыць… Са мною ехала знаёмая дзяўчынка, я не ведаю — як, але ўзялі яе разам з мамай. Можа, мама за ёю ў машыну ўскочыла… Я не ведаю…

Я век буду памятаць… Я за жыццё не забуду…

Дзяўчынка гэтая стаіць і плача, бо яна, калі нас гналі на прафілактыку, згубіла маму. Мама ў яе была маладая… Прыгожая мама… А мы ехалі заўсёды ў цемры: ніхто нам дзвярэй не адчыняў, вагоны таварныя, без акон. Усю дарогу яна не бачыла сваёй мамы. Цэлы месяц. Стаіць яна, плача, а нейкая старая жанчына, таксама пастрыжаная нагала, цягне рукі да яе, хоча яе

пагладзіць. А яна ўцякае ад гэтай жанчыны, пакуль тая не паклікала: «Донька...» І толькі па голасе яна здагадалася, што гэта ейная мама.

О-о-о-о! Калі б... Калі б ведаць...

Увесь час хадзілі галодныя. Я не запамінала, дзе былі, куды везлі. Назвы, імёны... Ад голаду жылі як у сне...

Памятаю, што цягала нейкія скрынкі на патронна-порахавай фабрыцы. Там усё пахла запалкамі. Пах дыму... Дыму няма, а дымам пахне...

Памятаю, што даіла кароў у нейкага баўэра. Секла дровы... Па дванаццаць гадзінаў у суткі...

Кармілі нас бульбяным шалупіннем, турнэпсам і давалі гарбату з сахарынам. Гарбату ў мяне адбірала мая напарніца. Украінская дзяўчына. Яна была старэйшай... Дужая... Казала: «Я павінна выжыць. У мяне мама засталася дома адна».

Яна пела ў полі прыгожыя ўкраінскія песні. Дужа прыгожыя.

Я... я за адзін раз... За адзін вечар усяго не раскажу. Не паспею. Маё сэрца не вытрымае.

Дзе гэта? Я не памятаю... Але гэта ўжо было ў лагеры... Я, відаць, трапіла ў Бухенвальд...

Там мы разгружалі машыны з мёртвымі і ўкладвалі ў штабелі, укладвалі слаямі — слой мёртвых, слой прасмоленых шпалаў. Адзін слой, другі слой... І так з раніцы да вечара, мы рыхтавалі вогнішчы. Вогнішчы з... ну ясная справа... з трупаў... Сярод мёртвых трапляліся яшчэ жывыя, і яны хацелі штосьці нам сказаць. Нейкія словы. А нам нельга было каля іх спыняцца...

0-о-о-о! Жыццё чалавечае... Я не ведаю, ці лёгка жыць дрэву, усяму жывому, каго чалавек прыручыў. Жывёле, птушкам... Але пра чалавека я ўсё ведаю...

Я хацела памерці, мне ўжо нікога не было шкада... Ужо збіралася — вось-вось, нож шукала. Да мяне прылятаў мой анёл... Гэта было не раз... Я не памятаю, якімі словамі ён мяне суцяшаў, але словы былі ласкавыя. Ён доўга мяне ўгаворваў... Калі я расказвала іншым пра свайго анёла, усе думалі, што я звар'яцела. Знаёмых людзей ужо даўно побач не заўважала, вакол былі адны чужыя людзі. Адны незнаёмцы. Ніхто не хацеў ні з кім знаёміцца, бо заўтра ці той, ці гэты памрэ. Навошта знаёміцца? Але адзін раз я палюбіла маленькую дзяўчынку... Машачку... Яна была беленькая і ціхая. Мы сябравалі з ёй месяц. У лагеры месяц — гэта цэлае жыццё, гэта — вечнасць. Яна першая падышла да мяне:

—У цябе няма алоўка?

—Не.

—А аркушыка паперы?

—Таксама няма. А навошта табе?

—Я ведаю, што хутка памру, і хачу маме ліст напісаць.

У лагеры гэта было забаронена — і аловак, і папера. Але мы ёй знайшлі. Яна ўсім падабалася — такая беленькая і ціхая. І голас ціхі.

—Як ты пашлеш ліст? — спытала я.

—Я адчыню ноччу вакно... І аддам аркушыкі ветру...

Можа, ёй было восем гадоў, а магчыма, і дзесяць. Як угадаеш па костачках? Там не людзі хадзілі, а шкілеты... Хутка яна захварэла, не магла ўставаць і хадзіць на працу. Я яе прасіла... У першы дзень я нават не дацягнула яе да дзвярэй, яна павісла на дзвярах, а ісці не можа. Два дні яна ляжала, а на трэці дзень па яе прыйшлі і вынеслі на насілках. Выхад з лагера быў адзін — праз комін... Адразу на неба...

Я век буду памятаць... Я за жыццё не забуду...

Мы ноччу з ёй размаўлялі:

—Да цябе прылятае анёл? — я хацела распавесці ёй пра свайго анёла.

—Не. Да мяне мама прыходзіць. Яна заўсёды ў белай блузцы. Я памятаю гэтую ейную блузку з вышытымі сінімі валошкамі.

Увосень... Я дажыла да восені. Якім цудам? Я не ведаю... Нас раніцай пагналі на работу ў поле. Збіралі моркву, зразалі капусту — я любіла гэтую працу. Я ўжо даўно не выходзіла ў поле, не бачыла нічога зялёнага. У лагеры не відаць неба, не відаць зямлі з-за дыму — комін высокі, чорны. Дзень і ноч з яго валіць дым... У полі я ўбачыла жоўтую кветачку, а я ўжо забыла, як кветкі растуць. Я пагладзіла кветачку... І іншыя жанчыны яе пагладзілі. Мы ведалі, што сюды прывозяць попел з нашага крэматорыя, а ў кожнага хто-небудзь загінуў. У каго сястра, у каго мама... А ў мяне Машачка...

Калі б я ведала, што выжыву, я спытала б адрас ейнай мамы. Але я не думала...

Як я выжыла, калі памірала сто разоў? Не ведаю... Гэта мой анёл мяне выратаваў. Угаварыў. Ён і цяпер з'яўляецца, ён любіць такую ноч, каб поўня ярка ў вакно свяціла. Белым святлом...

А вам не страшна са мною? Мяне слухаць...

О-о-о-о...

## «КАПАЙЦЕ ТУТ...»

*Валодзя Барсук, 12 гадоў.*
*Цяпер — старшыня Беларускай рэспубліканскай рады спартыўнага таварыства «Спартак».*

Адразу пайшлі ў партызаны...

Усёй сям'ёй: тата, мама і мы з братам. Брат быў старэйшы. Яму выдалі вінтоўку. Я зайздросціў, і ён вучыў мяне страляць.

Аднойчы брат не вярнуўся з задання... Мама доўга не хацела верыць, што ён загінуў. У атрад перадалі, што група партызанаў, якую акружылі немцы, падарвала сябе супрацьтанкавай мінай, каб не трапіць жывымі ў палон. У мамы было падазрэнне, што сярод іх апынуўся і наш Аляксандр. Яго з гэтай групай не пасылалі, але ён мог яе сустрэць. Яна да камандзіра атрада прыйшла і кажа:

— Я адчуваю, што там і мой сын ляжыць. Дазвольце мне туды з'ездзіць.

Ёй далі некалькі байцоў, і мы паехалі. І вось што такое мацярынскае сэрца! Байцы пачынаюць капаць у адным куце, а мама паказвае на іншае месца: «Капайце тут...» Пачынаюць капаць там і знаходзяць брата, яго ўжо было не пазнаць, ён увесь пачарнеў. Мама пазнала яго па рубцы ад апендыцыту і па грабеньчыку ў кішэні.

Я заўсёды згадваю сваю маму...

Памятаю, як закурыў першы раз. Яна ўбачыла, паклікала тату:

— Ты паглядзі, што Воўка робіць!

— А што ён робіць?

— Курыць.

Тата падышоў да мяне, паглядзеў:

— Няхай курыць. Пасля вайны разбяромся.

У вайну ўвесь час успаміналася, як мы жылі да вайны. Жылі ўсе разам, некалькі сем'яў сваякоў — у адным вялікім доме. Жылі весела і дружна. Цётка Алена ў дзень заробку купляла вельмі шмат піражных і сыроў, збірала ўсіх дзяцей і частавала. Загінула яна, ейны муж і сын. Загінулі ўсе мае дзядзькі…

Скончылася вайна… Запомніў, як мы з мамай ішлі па вуліцы, яна несла бульбу, ёй далі трохі на заводзе, дзе яна працавала. З будаўнічай пляцоўкі выходзіць да нас палонны немец:

— Мутэр, бітэ, бульба…

Мама кажа:

— Я табе не дам. Можа, ты забіў майго сына?

Немец збянтэжыўся і маўчыць. Мама адышла… Потым вярнулася, дастала некалькі бульбін і падае яму:

— На, еж…

Цяпер збянтэжыўся я… Як? Зімой мы некалькі разоў каталіся на замерзлых нямецкіх трупах, іх яшчэ доўга знаходзілі за горадам. Каталіся як на санках… Маглі піхнуць мёртвых нагой… Скакалі па іх. Мы працягвалі іх ненавідзець.

Мама вучыла мяне… Гэта быў мой першы пасляваенны ўрок любові…

## «ДЗЯДУЛЮ ПАХАВАЛІ ПАД ВАКНОМ...»

*Вара Вырко, 6 гадоў.*
*Цяпер — ткачыха.*

Я запомніла зіму, халодную зіму. Зімой забілі нашага дзядулю.

Яго забілі ў двары нашай хаты. Каля брамы.

Мы пахавалі яго ў сябе пад вакном...

На могілках не далі пахаваць, бо ён выцяў немца. Паліцаі стаялі каля брамкі і нікога да нас не пускалі. Ні родных, ні суседзяў. Мама і бабуля самі збілі труну з нейкіх скрынак. Яны самі дзядулю абмылі, хоць не прынята, каб блізкія мылі. Гэта павінны рабіць чужыя людзі. Такі наш звычай. Я памятаю размовы пра гэта ў хаце... Паднялі труну. Данеслі да брамы... Паліцаі крыкнулі: «Паварочвайце назад! А то пастраляем вас усіх! Пахавайце, як сабаку, на сваім агародзе».

І так тры дні... Яны дойдуць да брамы, а іх назад. Назад гоняць...

На трэці дзень бабуля пачала дзяўбці яму пад вакном... На вуліцы сорак градусаў марозу, бабуля ўсё жыццё ўспамінала, што на вуліцы было сорак градусаў. Пахаваць чалавека ў такі мароз вельмі цяжка. Мне, напэўна, тады было сем гадоў, не, напэўна, ужо восем гадоў, я ёй дапамагала. Мама дастала мяне з ямы з плачам.

Там... На тым месцы, дзе ляжыць дзядуля, вырасла яблыня. Стаіць замест крыжа. Ужо старая яблыня...

# «...ЯШЧЭ РЫДЛЁЎКАМІ ПРЫПЛЯСКАЛІ, КАБ БЫЛО ПРЫГОЖА»

*Леанід Шакінка, 12 гадоў.*
*Цяпер — мастак.*

Як нас расстрэльвалі...

Сагналі да хаты брыгадзіра... Усю вёску... Цёплы дзень, трава цёплая. Хто стаяў, а хто сядзеў. Жанчыны ў белых хустках, дзеці босыя. На гэтым месцы, куды нас сагналі, заўсёды збіраліся ў святы. Пелі песні. На зажынкі, дажынкі. І таксама — хто сядзеў, а хто стаяў. Мітынгі там праводзілі.

Цяпер... Ніхто не плакаў... Не размаўляў... Нават тады мяне гэта ўразіла. Чытаў, што звычайна людзі плачуць, крычаць, прадчуваючы смерць, — ніводнай слязінкі не памятаю. Нават слязіначкі... Цяпер, калі я пра гэта згадваю, пачынаю думаць: можа, я аглух у тыя хвіліны і таму нічога не чуў? Чаму не было слёз?

Дзеці збіліся ў асобную чародку, хоць ніхто нас не адлучаў ад дарослых. Чамусьці нашы маці не трымалі нас каля сябе. Чаму? Да гэтага часу не ведаю. Звычайна мы, хлапчукі, мала з дзяўчаткамі сябравалі, прынята было: дзяўчынка, значыць, трэба адлупцаваць, за коскі пацягаць. А тут усе прыціснуліся адно да аднога. Разумееце, нават сабакі не гаўкалі.

За некалькі крокаў ад нас паставілі кулямёт, каля яго селі два эсэсаўцы, яны пра штосьці пачалі спакойна размаўляць, жартавалі і нават смяяліся.

Мне запомніліся менавіта такія дэталі...

Падышоў малады афіцэр. І перакладчык пераказаў:

—Пан афіцэр загадвае назваць імёны тых, хто трымае сувязь з партызанамі. Будзеце маўчаць, расстраляем усіх.

Людзі як стаялі ці сядзелі, так і працягвалі стаяць і сядзець.

—Тры хвіліны — і вас расстраляюць, — перакладчык сказаў і выкінуў уверх тры пальцы.

Цяпер я глядзеў увесь час на ягоную руку.

—Дзве хвіліны — і вас расстраляюць…

Туліліся шчыльней адзін да аднога, хтосьці камусьці казаў нешта, але не словамі, а рухам рукі, вачыма. Я, напрыклад, ясна сабе ўяўляў, што нас расстраляюць і нас болей не будзе.

—Апошняя хвіліна — і вам капут…

Я бачыў, як салдат зняў затвор, заклаў стужку і ўзяў кулямёт у рукі. Да каго было два метры, да каго — дзесяць…

З тых, што стаялі паперадзе, адлічылі чатырнаццаць чалавек. Далі ім рыдлёўкі і загадалі капаць яму. А нас падагналі бліжэй, глядзець, як яны капаюць… Капалі яны хутка-хутка. Ляцеў пыл. Я памятаю, што яма была вялікая, глыбокая, на поўны чалавечы рост. Такія ямы капаюць пад дом, пад падмурак.

Расстрэльвалі па тры чалавекі. Паставяць ля краю яміны — і ва ўпор.

Астатнія глядзяць… Не памятаю, каб з дзецьмі бацькі развітваліся ці дзеці з бацькамі. Адна маці падняла прыпол сукенкі і закрыла дачцэ вочы. Але нават маленькія дзеці не плакалі…

Расстралялі чатырнаццаць чалавек і пачалі закопваць яму. А мы зноў стаялі і глядзелі, як закідваюць зямлёй, як утоптваюць ботамі. Зверху рыдлёўкамі

прыпляскалі, каб было прыгожа. Акуратна. Разумееце, нават рагі зрэзалі, пачысцілі. Адзін сталы немец выціраў хусцінкай пот з лоба, нібыта ён у полі працаваў. Да яго падбег маленькі сабачка... Ніхто не мог зразумець — адкуль? Чый ён? Немец яго пагладзіў...

Праз дваццаць дзён дазволілі забітых раскапаць. Узяць у сем'і і пахаваць. Вось тады і закрычалі бабы, загаласіла ўся вёска. Загаласіла!

Я шмат разоў нацягваў палатно. Хацеў гэта намаляваць... А атрымлівалася іншае: дрэвы, трава...

## «КУПЛЮ САБЕ СУКЕНКУ З БАНЦІКАМ...»

*Поля Пашкевіч, 4 гады.*
*Цяпер — краўчыха.*

Мне было чатыры гады... Я ніколі не думала пра вайну...

Але вайна мне ўяўлялася так: вялікі чорны лес, і там нейкая вайна. Штосьці такое страшнае. Чаму ў лесе? Бо ў казках самае страшнае заўсёды адбывалася ў лесе.

Праз нашы Бялынічы ішлі ды ішлі войскі, тады я не разумела, што гэта адступленне. Нас пакідаюць. Памятаю, што ў доме было шмат вайскоўцаў, яны бралі мяне на рукі. Шкадавалі. Хацелі пачаставаць, а пачаставаць не было чым. Раніцай, калі яны сыходзілі, у доме на падаконніках і ўсюды заставалася шмат патронаў. І сарваныя чырвоныя лычкі. Знакі адрознення. Я з імі гулялася... Я не разумела, якія гэта цацкі...

А гэта мне ўжо цётка расказвала... Калі немцы ўвайшлі ў наш горад, у іх быў спіс камуністаў. І ў гэтым спісе былі наш тата і настаўнік, які жыў насупраць. У іх быў сын, я з ім сябравала, мы называлі яго Ігрушка. А яго, напэўна, звалі Ігарам, так я цяпер думаю. Таму што ў памяці ў мяне засталося ці то імя, ці то дражнілка — Ігрушка. Нашых татаў павялі разам...

На маіх вачах... Маму расстралялі на вуліцы. Калі яна ўпала, расхінулася паліто, яно стала чырвоным, і снег вакол мамы стаў чырвоным...

А потым нас доўга трымалі ў нейкім хляве. Было вельмі страшна, мы плакалі, крычалі. У мяне яшчэ былі

сястра і брат — два з паловай годзікі і год, а мне чатыры гады, я — самая старэйшая. Маленькія мы ўжо ведалі, калі бухаюць снарады, дык гэта не самалёт бамбіць, а гарматы б'юць. Па гуку адрознівалі — наш ці не наш самалёт ляціць, далёка ці блізка ад нас упадзе бомба. Было страшна, вельмі, а галаву схаваеш, і ўжо не страшна, галоўнае — не бачыць.

Далей ехалі кудысьці на санях, усе трое, у нейкай вёсцы нас разабралі жанчыны па хатах — хто каго. Браціка доўга ніхто не хацеў браць, а ён плакаў: «А мяне?» Мы з сястрой спалохаліся, што нас раздзяляюць і цяпер не будзем разам. Заўсёды жылі разам.

Аднойчы мяне ледзь не з'ела нямецкая аўчарка. Я сядзела ля вакенца, па вуліцы ехалі немцы, з імі дзве вялікія аўчаркі. Адна з іх кінулася да вакна і разбіла шыбку. Мяне паспелі схапіць з падаконня, але я так спалохалася, што з таго дня пачала заікацца. І нават цяпер баюся вялікіх сабакаў.

…Пасля вайны аддалі нас у дзіцячы дом, а ён стаяў непадалёку ад шашы. Нямецкіх палонных было шмат, яны ішлі па гэтай шашы суткамі. Мы кідалі ў іх зямлёй, камянямі. Канвойныя адганялі нас і сварыліся.

У дзіцячым доме ўсе чакалі бацькоў, што яны прыйдуць і забяруць дамоў. З'яўляўся незнаёмы мужчына ці незнаёмая жанчына, усе беглі да іх і крычалі:

—Мой тата… Мая мама…

—Не, гэта мой тата!

—Па мяне прыйшлі!

—Не, гэта па мяне прыйшлі!

Вельмі зайздросцілі тым, каго бацькі знаходзілі. А яны не давалі падысці да сваіх мам і татаў: «Не чапай, гэта мая мама», ці: «Не чапай, гэта мой тата». Яны не адпускалі іх ад сябе ні на хвіліну, баяліся, як бы

хто-небудзь не адабраў. Ці ад страху, раптам зноў куды-небудзь пойдуць.

Вучыліся мы ў школе разам — дзетдомаўцы і звычайныя дзеці. Тады кепска ўсе жылі, але дзіцё прыйдзе з дому, у яго ў палатнянай торбачцы кавалачак хлеба ці бульбіна, а ў нас — нічога. Усе мы былі аднолькава апранутыя. Пакуль маленькія, дык нічога, а калі падраслі, перажывалі. У дванаццаць, трынаццаць гадоў хацелася прыгожую сукенку, туфелькі, а мы ўсе насілі чаравікі. І хлопчыкі, і дзяўчаткі. Хацелася яркую стужачку ў валасы, каляровыя алоўкі хацелася. І партфель хацелася. Хацелася цукерак, а цукеркі ў нас былі толькі на Новы год — ледзянцы. Далі нам удосталь чорнага хлеба, мы смакталі яго, як цукеркі, такім ён нам здаваўся смачным.

Была ў нас адна маладая настаўніца, а астатнія сталыя жанчыны, дык усе яе вельмі любілі. Абагаўлялі. Урокі не пачыналіся, пакуль яна не прыходзіла ў школу. Сядзім ля вакна і чакаем: «Ідзе-е! І-і-і…» Яна ўваходзіла ў клас, і кожны хацеў да яе дакрануцца, кожны думаў: «Вось такая мая мама…»

Марыла: вырасту, пачну працаваць і куплю сабе шмат сукенак: чырвоную, зялёную, у гарошак, з банцікам. З банцікам — абавязкова! У сёмым класе спыталі: на каго хочаш вучыцца, а я даўно вырашыла — на краўчыху.

Шыю сукенкі…

## «ЯК ПАМЁР, КАЛІ СЁННЯ НЕ СТРАЛЯЛІ?..»

*Эдуард Варашылаў, 11 гадоў.*
*Цяпер — супрацоўнік тэлебачання.*

Я расказваў пра вайну толькі маме... Сваёй маме... Толькі блізкаму чалавеку...

У вёсцы, дзе стаяў наш партызанскі атрад, памёр стары, якраз у ягонай хаце я жыў. Калі мы яго хавалі, зайшоў хлопчык гадоў сямі і пытае:

— Чаму дзед ляжыць на стале?

Яму адказалі:

— Дзед памёр...

Хлопчык страшна здзівіўся:

— Як памёр, калі сёння не стралялі?

Хлопчыку было сем гадоў, але ўжо два гады ён чуў, што паміраюць толькі тады, калі страляюць.

Я гэта запомніў...

Я пачаў свой расповед з партызанскага атрада, куды трапіў не адразу, а напрыканцы другога года вайны. Я прапусціў, як мы з мамай за тыдзень да вайны прыехалі ў Мінск, як яна адвезла мяне ў піянерскі лагер пад Мінскам...

У лагеры мы спявалі песні: «Если завтра война», «Три танкиста», «По долинам и по взгорьям». Апошнюю вельмі любіў мой тата. Часта напяваў... Тады толькі з'явіўся фільм «Дзеці капітана Гранта», і мне спадабалася песенька з гэтага фільма: «А ну-ка песню нам пропой весёлый ветер...» З гэтай песенькай я заўсёды выскокваў на зарадку.

У той дзень зарадкі не было, над намі гулі самалёты… Я падняў вочы і ўбачыў, як ад самалёта адлучаюцца чорныя кропкі, мы яшчэ нічога не ведалі пра бомбы. Побач з піянерскім лагерам была чыгунка, і я пайшоў па ёй у Мінск. Разлік быў простым: непадалёку ад медінстытута, дзе працуе мама, — чыгуначны вакзал, калі я пайду па рэйках, то прыйду да мамы. Паклікаў з сабой хлопчыка, які жыў каля вакзала, той быў нашмат меншы за мяне і вельмі плакаў, ішоў павольна, а я хадзіць любіў, з татам мы абхадзілі ўсе ваколіцы роднага Ленінграда. Вядома, я злаваў… Але да Мінскага вакзала мы ўсё ж дайшлі, дайшлі да Заходняга моста, там была чарговая бамбёжка, і я яго згубіў.

У медінстытуце мамы не было, непадалёку жыў прафесар Голуб, з якім мама цяпер працавала, я знайшоў ягоную кватэру. Аднак яна была пустая… Праз шмат гадоў я даведаўся, што адбылося: як толькі пачалі бамбіць горад, мама села на спадарожную машыну і паехала па мяне па шашы ў Ратамку. Яна прыехала туды і ўбачыла разбомблены лагер…

З горада ўсе кудысьці сыходзілі. Я вырашыў, што да Ленінграда далей, чым да Масквы, у Ленінградзе ў мяне — тата, але ён на фронце, а ў Маскве ў мяне — цёткі, яны нікуды не паедуць. Не паедуць, бо жывуць у Маскве… У нашай сталіцы… У дарозе прыбіўся да адной жанчыны з дзяўчынкай. Жанчына незнаёмая, аднак яна зразумела, што я адзін, і ў мяне нічога няма, я галодны. Яна мяне паклікала: «Ідзі да нас, разам будзем есці».

Я памятаю, што тады ўпершыню ў жыцці еў цыбулю з салам. Спачатку я крывіўся, потым усё-ткі з'еў. Калі пачыналася бамбёжка, я заўсёды сачыў: дзе гэтая жанчына са сваёй дзяўчынкай? Увечары выбралі канаву і размясціліся адпачыць. Бамбілі нас без перапынку.

Жанчына азірнулася і ўскрыкнула… Я таксама прыпаднняўся і паглядзеў у той бок, куды толькі што глядзела яна, убачыў, як нізка ляціць самалёт, і побач з маторам у яго на плоскасцях пабліскваюць агеньчыкі. І ў кірунку гэтых агеньчыкаў уздоўж дарогі падымаюцца фантанчыкі пылу. Абсалютна інстынктыўна я зваліўся на дно канавы. Кулямётная чарга праляцела над галавой, і самалёт панёсся далей. Я падымаюся і бачу: ляжыць гэтая жанчына на краі канавы, а замест твару ў яе крывавая пляма. Вось тут я спалохаўся, выскачыў з канавы і кінуўся ўцякаць. З таго часу, і нават цяпер, мне не дае спакою пытанне: а што з той дзяўчынкай? Больш я яе не сустракаў…

Дайшоў да нейкай вёскі… На вуліцы пад дрэвамі ляжалі нямецкія параненыя. Так я ўпершыню ўбачыў немцаў…

Жыхароў вёскі выганялі з хат, прымушалі насіць ваду, нямецкія санітары грэлі яе на вогнішчы ў вялікіх вёдрах. Раніцай яны паклалі параненых на машыны і ў кожную машыну пасадзілі аднога-двух хлопчыкаў. Нам далі біклагі з вадой і паказалі, як мы павінны дапамагаць: каму змачыць хусцінку і пакласці на галаву, каму змачыць вусны. Паранены просіць: «Васэр… Васэр…» Прыкладваеш біклажку да ягоных губ, і цябе б'юць дрыжыкі. Не вызначу цяпер пачуццё, якое адчуваў тады. Грэблівасць? Не. Нянавісць? Таксама не. Тут было ўсё разам. І шкадаванне таксама… Нянавісць у чалавеку таксама фармуецца, яна не першапачатковая. У школе ж нас вучылі дабрыні, вучылі любіць. Зноў забягу наперад… Калі ўпершыню немец ударыў мяне, я не боль адчуў, адчуў іншае. Як гэта ён мяне ўдарыў, якое меў права ён мяне ўдарыць? Гэта было ўзрушэнне.

Зноў вярнуўся ў Мінск…

І пасябраваў з Кімам. Пазнаёміліся мы з ім на вуліцы. На маё пытанне, з кім ты жывеш, ён адказаў: ні з кім.

Даведаўся, што ён таксама згубіўся, і прапанаваў:

—Давай жыць разам.

—Давай, — абрадаваўся ён, бо яму не было дзе жыць.

А я жыў у пакінутай кватэры прафесара Голуба.

Неяк мы з Кімам убачылі, што па вуліцы ішоў хлопец, старэйшы за нас, і нёс падстаўку для чысткі абутку. Праслухалі ягоную кансультацыю: якая патрэбна скрынка, як рабіць гуталін. Для гуталіну трэба было дастаць сажы, а яе ў горадзе было поўна, хоць адбаўляй, і змяшаць з якім-небудзь алеем. Адным словам, зрабілі нейкую смуродную сумесь, але яна была чорнага колеру. І калі яе акуратна размазаць, то яна нават блішчэла.

Аднойчы немец падышоў да мяне, паставіў нагу на скрынку, боты былі брудныя, прычым бруд стары, засохлы. Мы ўжо сутыкаліся з такім абуткам, у мяне быў спецыяльны скрабок, каб спачатку саскрэбці бруд, а потым ужо намазаць крэм. Я ўзяў скрабок, правёў ім толькі два разы, і яму гэта не спадабалася. Ён ударыў нагой па скрынцы, а мяне ў твар…

Мяне наогул ніколі ў жыцці не білі. Хлапчуковыя бойкі не ў лік, іх у ленінградскіх школах было нямала. Але ніхто з дарослых мяне дагэтуль не біў.

Кім убачыў мой твар і закрычаў:

—Не глядзі на яго так! Не глядзі! Ён заб’е цябе…

Тады мы ўпершыню сутыкнуліся з тым, што на вуліцах з’явіліся людзі з жоўтымі нашыўкамі на паліто, на пінжаках. Пачулі пра гета… Слова гэтае ўсе вымаўлялі шэптам… Кім быў габрэйскім хлопчыкам, але ён пастрыгся дагала, і мы вырашылі выдаваць яго за

татарына. Калі валасы пачалі адрастаць, кучаравыя чорныя валасы, хто мог паверыць, што ён татарын? Я перажываў за сябра, ноччу прачнуся, убачу яго кучаравую галаву і не магу заснуць: трэба штосьці прыдумаць, каб Кіма не забралі ў гета.

Мы знайшлі машынку, і я яшчэ раз пастрыг Кіма. Ужо пачаліся замаразкі, чысціць зімой абутак бессэнсоўна. У нас новы план. Нямецкае камандаванне арганізавала ў горадзе гатэль для афіцэраў. Яны прыязджалі з вялізнымі пляцакамі, чамаданамі, а да гатэлю было не блізка. Нейкім цудам мы раздабылі вялікія санкі і пільнавалі на вакзале цягнікі. Цягнік прыйдзе, пагрузім рэчы двух-трох чалавек на гэтыя санкі і вязём на сабе праз увесь горад. За гэта нам давалі хлеб ці цыгарэты, а за цыгарэты на кірмашы можна было выменяць усё, любую ежу.

А тады, калі забралі Кіма, цягнік прыйшоў позна ноччу, з вялікім спазненнем. Мы добра прамерзлі, але з вакзала пайсці не змаглі, ужо дзейнічала каменданцкая гадзіна. З самога будынка нас выгналі, чакалі на вуліцы. Нарэшце цягнік прыбыў, мы загрузілі санкі — і ў дарогу. Цягнем, рамяні рэжуць, а яны нас падганяюць: «Шнэль! Шнэль!» Хутка ісці мы не маглі, яны сталі нас біць.

Занеслі рэчы ў гатэль, чакаем, калі з намі разлічацца. Адзін загадаў: «Прэч адсюль!» — і штурхнуў Кіма, у Кіма зляцела з галавы шапка. Тады яны закрычалі: «Юдэ!» Схапілі яго…

Праз некалькі дзён я даведаўся. Што Кім у гета. Пайшоў туды… Цэлымі днямі кружляў вакол… Некалькі разоў бачыў яго праз дрот. Прыносіў хлеб, бульбу, моркву. Вартавы адвернецца спінай, ідзе да павароту, тады я кідаю бульбіну. Кім пройдзе, падыме…

Жыў я за некалькі кіламетраў ад гета, але начамі адтуль далятталі такія крыкі, што іх чулі ва ўсім горадзе, я прачынаўся: ці жывы Кім? Як мне яго выратаваць? Пасля чарговага пагрому прыйшоў на дамоўленае месца, мне паказалі знакам: Кіма няма!

Я быў няшчасны... Аднак я яшчэ спадзяваўся...

Аднойчы раніцай нехта пагрукаў да мяне. Я падскочыў... І першая думка: Кім! Не, гэта быў не ён. Мяне разбудзіў хлопчык з ніжняга паверха, ён сказаў: «Пайшлі са мной на вуліцу, там ляжаць забітыя. Пашукаем майго тату». Мы з ім выйшлі, каменданцкая гадзіна ўжо скончылася, але мінакоў амаль не было. Вуліцу замяло лёгкім снегам, прыпарушаныя гэтым снегам праз пятнаццаць-дваццаць метраў ляжалі расстраляныя нашы ваеннапалонныя. Іх гналі праз горад ноччу, а тых, хто адставаў, расстрэльвалі ў патыліцу. Усе яны ляжалі тварам уніз.

Хлопчык не мог дакрануцца да забітых, ён баяўся, што недзе тут ягоны бацька. І вось тады я сябе злавіў на думцы, што ў мяне чамусьці няма страху перад смерцю. У думках я з ёю ўжо зжыўся. Я пераварочваў, а ён глядзеў кожнаму ў твар. Так мы прайшлі ўсю вуліцу...

У мяне з таго часу... больш няма слёз... Няма іх нават тады, калі, можа быць, і трэба. Я не ўмею плакаць. За ўсю вайну я плакаў адзін раз. Калі загінула наша партызанская медсястра Наташа... Яна любіла вершы, і я любіў вершы. Яна любіла ружы, і я любіў ружы, цягаў ёй летам букеты шыпшыны.

Неяк яна спытала ў мяне:

—Колькі класаў ты скончыў да вайны?

—Чатыры...

—Скончыцца вайна, пойдзеш у суворАўскую вучэльню?

Да вайны мне падабалася бацькава вайсковая форма, мне таксама хацелася насіць зброю. Але я ёй адказаў, што не, вайскоўцам не буду.

Мёртвая, яна ляжала на хваёвых лапках каля намёта, а я сядзеў над ёю і плакаў. Упершыню плакаў, гледзячы на забітага чалавека.

…Я сустрэўся з мамай… Калі мы сустрэліся, яна толькі глядзела на мяне, нават не гладзіла, паўтарала:

— Ты? Няўжо ты?

Прайшло шмат дзён, перш чым мы змаглі расказваць адно аднаму пра вайну…

## «БО МЫ — ДЗЯЎЧАТКІ, А ЁН — ХЛОПЧЫК...»

*Рыма Пазнякова (Камінская), 6 гадоў.*
*Цяпер — рабочая.*

Я была ў дзіцячым садку... Гуляла ў лялькі...

Мяне клічуць: «Па цябе прыехаў тата. Вайна!» А я не хачу нікуды ісці. Хачу гуляць. Плачу.

Што гэта такое, вайна? Як гэта — мяне заб'юць? Як гэта — тату заб'юць? Мама пачапіла нам на шыі мяшэчкі з нашымі метрыкамі і паперкамі з адрасам. Калі яе заб'юць, каб чужыя людзі даведаліся, хто мы.

Доўга-доўга ішлі. Згубілі тату. Спалохаліся. Мама сказала, што тату забралі ў канцлагер. А што такое канцлагер? Сабралі ежы, а ежа якая? Печаныя яблыкі. Дом наш згарэў, сад згарэў, на яблынях віселі печаныя яблыкі. Мы іх збіралі і елі.

Канцлагер знаходзіўся ў Драздах, каля Камсамольскага возера. Цяпер гэта ўжо Мінск, а тады была вёска. Памятаю чорны калючы дрот, людзі — таксама ўсе чорныя, усе на адзін твар. Таты мы не пазналі, ён нас пазнаў. Ён хацеў пагладзіць мяне, а я чамусьці баялася падыходзіць да дроту, цягнула маму дамоў.

Калі і як тата вярнуўся дахаты, не памятаю. Ведаю, што працаваў ён на млыне, і мама нас пасылала да яго з абедам — мяне і сястрычку малодшую, Тому. Томачка была драбнюсенькай, а я крыху большай, ужо станік маленькі насіла, да вайны былі такія дзіцячыя станікі. Мама дасць нам клуначак з ежай, а ў станік пакладзе мне ўлёткі. Улёткі былі маленькія, на адным аркушыку

са школьнага сшытка, напісаныя ад рукі. Мама вядзе нас да брамкі, плача і вучыць: «Ні да кога не падыходзьце, толькі да таты». Потым стаіць, чакае нас назад, пакуль не ўбачыць, што жывыя вяртаемся.

Страху не памятаю… Калі мама сказала, што трэба ісці, мы ідзем. Мама сказала — гэта галоўнае. Страх быў не паслухацца маму, не зрабіць таго, што яна прасіла. Мама была ў нас любімая. Мы нават не ўяўлялі, як гэта можна яе не паслухацца.

Холадна, залезем усе на печ, у нас быў вялікі кажух. Каб печ выпаліць, бегалі на станцыю красці вугаль. На каленях паўзеш, каб вартавы не заўважыў, паўзеш і локцямі сабе дапамагаеш. Вядро вугалю прынясём, а самі — як камінары: і калені, і локці, і нос, і лоб — чорныя.

Ноччу ўсе клаліся разам, ніхто не хацеў спаць адзін. Было нас чацвёра: я, дзве мае сястрычкі і чатырохгадовы Барыс, якога мама ўсынавіла. Гэта потым мы даведаліся, што Барыс — сын падпольшчыцы Лёлі Равінскай, мамінай сяброўкі. А тады мама нам сказала, што ёсць маленькі хлопчык, ён часта застаецца дома адзін, і яму страшна, у яго няма ежы. Яна хацела, каб мы яго прынялі і палюбілі. Разумела — гэта няпроста. Дзеці могуць і не палюбіць. І зрабіла разумна, яна не прывяла Барыса, а паслала нас па яго: «Ідзіце і прывядзіце гэтага хлопчыка і будзеце з ім сябраваць». Мы пайшлі і прывялі.

У Барыса было шмат кніг з прыгожымі малюнкамі, усе гэтыя кнігі ён узяў з сабою, мы дапамагалі яму несці. Сядзем потым на печы, і ён нам казкі расказвае. І так ён нам спадабаўся, што стаў раднейшы за роднага, можа, таму, што казак шмат ведаў. Мы ўсім у двары казалі: «Вы яго не крыўдзіце».

Мы ўсе беленькія, а Барыс — чорны. У ягонай мамы была тоўстая чорная каса, і яна, калі да нас прыходзіла, падаравала мне люстэрка. Люстэрка я схавала і вырашыла, што буду кожную раніцу ў яго глядзець, і ў мяне таксама будзе такая каса.

Бегаем па двары, дзеці гучна крычаць:

—А Барыс чый?

—Барыс наш.

—А чаму вы ўсе беленькія, а ён чорны?

—Бо мы дзяўчаткі, а ён — хлопчык, — гэта мама навучыла нас так адказваць.

Барыс сапраўды быў наш, бо маму ягоную забілі і тату забілі, а яго хацелі кінуць у гета. Аднекуль мы пра гэта ўжо ведалі. Мама наша баялася, каб яго не апазналі і не забралі. Пойдзем мы куды-небудзь, мы ўсе клічам нашу маму мамай, а Барыс — цёцяй. Яна яго просіць:

—Скажы — мама, — кавалачак хлеба яму дае.

Ён хлеб возьме, адыдзе:

—Цёця, дзякуй.

І слёзы ў яго крапаюць, крапаюць…

## «ТЫ МНЕ НЕ БРАТ, КАЛІ ГУЛЯЕШ З НЯМЕЦКІМІ ХЛОПЧЫКАМІ...»

*Вася Сігалёў-Князеў, 6 гадоў.*
*Цяпер — спартыўны трэнер.*

Гэта было на світанку...

Пачалі страляць, тата саскочыў з ложка, падбег да дзвярэй, адчыніў іх і крыкнуў. Мы думалі, што ён спалохаўся, а ён упаў, у яго трапіла разрыўная куля.

Мама знайшла нейкія кавалкі тканіны, святло не запальвала, бо працягвалі страляць. Тата стагнаў, пераварочваўся. З вакна сачылася слабае святло, яно падала яму на твар...

— Кладзіцеся на падлогу, — сказала мама.

І раптам загаласіла. Мы кінуліся з крыкамі да яе, я пакаўзнуўся на татавай крыві і ўпаў. Адчуў пах крыві і яшчэ нейкі цяжкі пах — тату разарвала страўнік...

Памятаю вялікую доўгую труну, а тата быў невысокі. «Навошта яму такая вялікая труна?» — думаў я. Потым вырашыў, што ў таты цяжкая рана, і яму не так будзе балець. Так і патлумачыў суседскаму хлопчыку.

Праз некаторы час, таксама на світанку, прыйшлі немцы і забралі нас з мамай. Паставілі на плошчы перад заводам, на гэтым заводзе працаваў да вайны наш тата (гэта ў мястэчку Смалоўка Віцебскай вобласці). Стаялі і яшчэ дзве партызанскія сям'і, дзяцей было больш, чым дарослых. А ў мамы, усе ведалі, вялікая радня: пяцёра братоў і пяцёра сясцёр, і ўсе яны ў партызанах.

Маму пачалі збіваць, усё мястэчка глядзела, як яе білі, і мы. Нейкая жанчына ўсё прыгінала маю галаву да зямлі: «Апусці вочы. Апусці вочы». А я выварочваўся з ейных рук. Я глядзеў…

За мястэчкам быў лясісты пагорак, дзяцей пакінулі, а дарослых павялі туды. Я чапляўся за маму, яна адштурхоўвала мяне і крычала: «Бывайце, дзеці!» Памятаю, як ад ветру паднялася маміна сукенка, калі яна ляцела ў траншэю…

…Прыйшлі нашы, я ўбачыў афіцэраў у пагонах. Мне гэта вельмі спадабалася, я ўзяў і зрабіў сабе пагоны з бярозавай кары, вугалем намаляваў лычкі. Прымацаваў на сваю вясковую світку, якую пашыла мне цётка, у лапцях — прыйшоў ды далажыў капітану Іванкіну (ад цёткі даведаўся ягонае прозвішча), што, маўляў, Вася Сігалёў хоча біць немцаў разам з вамі. Яны спачатку пажартавалі, пасмяяліся, потым спыталі ў цёткі, дзе мае бацькі. Калі даведаліся, што я сірата, салдаты за ноч пашылі мне боцікі з плашч-палаткі, укарацілі шынель, падгарнулі шапку, падгарнулі напалову пагоны. Хтосьці нават зрабіў афіцэрскую партупею. Так я стаў сынам дзвесце трэцяга асобнага атрада размінавання. Залічылі мяне на пасаду сувязнога. Стараўся я вельмі, але ні пісаць, ні чытаць не ўмеў. Калі яшчэ была мама, мой дзядзька папрасіў мяне: «Схадзі да чыгуначнага моста і падлічы, колькі там немцаў». Як я падлічу? Насыпаў ён мне жменьку жыта ў кішэню, і я па адным зярнятку перакладваў з правай кішэні ў левую. А дзядзька ўжо гэтыя зярняткі потым лічыў.

—Вайна вайной, а чытаць ды пісаць табе трэба вучыцца, — сказаў парторг Шапачнікаў.

Салдаты раздабылі паперу, ён сам зрабіў мне самаробны сшытак і напісаў на ім табліцу множання, напісаў

алфавіт. Я вучыў і адказваў яму. Прынясе пустую скрынку з-пад снарадаў, расчэрціць і кажа: «Пішы».

У Германіі нас ужо было трое хлапчукоў: Валодзя Пачывадлаў, Віця Барынаў і я. Валодзю — чатырнаццаць гадоў, Віцю — сем, мне ў гэты час — дзевяць. Мы вельмі сябравалі, як браты, бо ў нас не было больш нікога.

Аднак, калі я ўбачыў, што Віця Барынаў гуляе «ў вайну» з нямецкімі хлопчыкамі і аддаў аднаму сваю пілотку з зорачкай, я закрычаў, што ён мне больш не брат. Ніколі больш не будзе мне братам! Схапіў свой трафейны пісталет і загадаў яму ісці ў размяшчэнне часткі. І сам пасадзіў яго на гаўптвахту ў нейкую камору. Ён быў радавым, а я малодшым сяржантам, гэта значыць, я паводзіў сябе як старэйшы званнем.

Нехта расказаў пра гэта капітану Іванкіну. Той паклікаў мяне:

— Дзе радавы Віця Барынаў?

— Радавы Барынаў на гаўптвахце, — дакладваю я.

Капітан доўга мне тлумачыў, што дзеці ўсе добрыя, яны ні ў чым не вінаватыя, што рускія і нямецкія дзеці цяпер, калі канчаецца вайна, будуць сябраваць.

Скончылася вайна, мне ўручылі тры медалі: «За ўзяцце Кёнігсберга», «За ўзяцце Берліна» і «За Перамогу над Германіяй». Нашая частка вярнулася ў Жыткавічы, тут мы размініроўвалі палі. Выпадкова даведаўся, што мой старэйшы брат жывы і жыве ў Вілейцы.

З накіраваннем у суворАўскую вучэльню я збег у Вілейку. Знайшоў там брата, хутка да нас прыехала сястра. Жыць мы ўладкаваліся на нейкім гарышчы. А з харчаваннем было туга, пакуль я не надзеў формы, сваіх трох медалёў і не пайшоў у гарвыканкам.

Прыходжу. Знайшоў дзверы з шыльдачкай: «Старшыня». Пастукаў. Зайшоў і далажыў па ўсёй форме:

—Малодшы сяржант Сігалёў прыйшоў хадайнічаць наконт дзяржзабеспячэння.

Старшыня ўсміхнуўся і падняўся мне насустрач.

—А дзе жывеш, — спытаўся.

Я адказаў:

—На гарышчы, — і даў адрас.

Увечары нам прывезлі мяшок капусты, праз дзень — мяшок бульбы.

Аднойчы старшыня сустрэў мяне на вуліцы і даў адрас:

—Увечары зайдзі, там цябе чакаюць.

Сустрэла мяне там жанчына, гэта была ягоная жонка. Звалі яе Ніна Максімаўна, а яго Аляксей Міхайлавіч. Мяне накармілі, я памыўся. Са свайго салдацкага я ўжо вырас, мне далі пару кашуль.

Пачаў я да іх прыходзіць, спачатку рэдка, затым часцей, а потым кожны дзень. Вайсковы патруль сустрэне і пытае:

—Хлопец, чые медалі начапіў? Дзе твой бацька?

—У мяне няма бацькі…

Даводзілася насіць з сабой пасведчанне.

Калі Аляксей Міхайлавіч спытаў:

—Хочаш быць нашым сынам?

Адказаў:

—Хачу. Вельмі хачу.

Яны мяне ўсынавілі, далі сваё прозвішча: Князеў.

Доўга я не мог вымавіць «тата» і «мама». А Ніна Максімаўна адразу палюбіла мяне, шкадавала. Калі даставалі штосьці салодкае, то гэта было для мяне. Ёй хацелася мяне пагладзіць. Прылашчыць. А я салодкага не любіў, бо ніколі яго не еў. Да вайны мы жылі небагата, а ў войску я прывык да ўсяго салдацкага. І быў я няласкавым хлопчыкам, бо пяшчоты асаблівай даўно не

бачыў, жыў сярод мужчынаў. Я нават ласкавых словаў не ведаў.

Ноччу адзін раз прачнуўся і пачуў, як Ніна Максімаўна плакала за перагародкай. Яна, відаць, плакала і раней, але так, каб я не бачыў і не чуў. Яна плакала і скардзілася: ён ніколі не будзе нам родным, не зможа забыць сваіх бацькоў... Сваю кроў... У ім так мала дзіцячага, і ён няласкавы. Я падышоў да яе і абняў за шыю: «Не плачце, мама». Яна перастала плакаць, я ўбачыў яе павесялелыя вочы. Упершыню я назваў яе «мама». Прайшоў час, і Аляксея Міхайлавіча назваў татам, адно толькі засталося на ўсё жыццё, я казаў ім «вы».

Яны не рабілі з мяне хатняга хлопчыка, і за гэта я ім удзячны. У мяне былі дакладныя абавязкі: прыбраць у хаце, выбіць дываны, нанасіць дроў з хлеўчука, выпаліць печ пасля школы... Без іх я не атрымаў бы вышэйшай адукацыі. Гэта яны пераканалі мяне, што трэба вучыцца, а пасля вайны вучыцца трэба добра. Толькі добра.

Яшчэ ў войску, калі наша частка стаяла ў Жыткавічах, Валодзю Пачывадлаву, Віцю Барынаву і мне камандзір загадаў вучыцца. Мы трое селі за адну парту, у другім класе. У нас была пры сабе зброя, і мы ні з кім не лічыліся. Не хацелі падпарадкоўвацца цывільным настаўнікам: як ён можа нам загадваць, калі ён не ў вайсковай форме? Аўтарытэтам для нас былі толькі камандзіры. Уваходзіць настаўнік, увесь клас устае, мы сядзім.

—Чаму вы седзіце?

—А мы не будзем вам адказваць. Мы падпарадкоўваемся толькі камандзіру.

На вялікім перапынку мы шыхтавалі ўсіх вучняў паўзводна і маршыравалі, развучвалі вайсковыя песні.

Дырэктар школы прыйшоў у частку і распавёў нампаліту, як мы сябе паводзім. Нас пасадзілі на гаўптвахту і разжалавалі. Воўка Падшывадлаў быў старшым сяржантам — стаў сяржантам, я быў сяржантам — стаў малодшым сяржантам, Віцька Барынаў быў малодшым сяржантам — стаў яфрэйтарам. Камандзір доўга з кожным з нас размаўляў, намаўляў, што чацвёркі і пяцёркі па арыфметыцы цяпер для нас важнейшыя, чым медалі. Мы хацелі страляць, а нас пераконвалі, што трэба вучыцца.

Аднак усё ж у школу мы прыходзілі з медалямі. У мяне захаваўся здымак: я сяджу з медалямі за партай і малюю для нашай піянерскай газеты.

Калі я прыносіў са школы пяцёрку, крычаў з парога:

—Мама, пяцёрка!

І мне так лёгка было казаць «мама».

## «МЫ НАВАТ ЗАБЫЛІ ГЭТАЕ СЛОВА...»

*Аня Гурэвіч, 2 гады.*
*Цяпер — радыёканструктарка.*

Ці то сама памятаю, ці то мама потым расказвала...

Мы ідзём па дарозе. Ісці нам цяжка: мама хворая, мы з сястрой — маленькія. Сястры — тры годзікі, мне — два. Як нас уратаваць?

Мама напісала на паперцы прозвішча, год нараджэння, паклала мне ў кішэньку і сказала: «Ідзі». Паказала гэты дом. Там дзеці бегалі... Яна хацела, каб я эвакуявалася, паехала з дзіцячым домам, яна баялася, што мы ўсе загінем. Хацела каго-небудзь з нас выратаваць. Я павінна была пайсці адна: калі б мама мяне прывяла ў дзіцячы дом, дык нас бы выправілі назад разам. Бо бралі толькі тых дзяцей, што без бацькоў засталіся, а ў мяне мама ёсць. Увесь лёс мой у тым, што я не азірнулася, іначай бы нікуды ад мамы не адышла, як усе дзеці, кінулася б ёй на шыю ў слязах, і мяне ніхто б не прымусіў застацца ў чужым доме. Мой лёс...

Мама сказала: «Пойдзеш і адчыніш вунь тыя дзверы». Я так і зрабіла. Аднак эвакуявацца гэты дзіцячы дом не паспеў...

Памятаю вялікую залу... І свой ложачак каля сцяны. І шмат-шмат такіх ложачкаў. Мы самі іх акуратна прыбіралі. Вельмі старанна. Падушка павінна была ляжаць заўсёды на адным месцы. Пакладзеш не так, выхавальніцы сварыліся, асабліва калі прыходзілі нейкія дзядзькі ў чорнай форме. Паліцаі ці немцы, не ведаю,

у памяці — чорная форма. Каб нас білі, не памятаю, а вось страх, што мяне за штосьці могуць біць, быў. І не магу прыгадаць нашых гульняў... Свавольства... Мы шмат рухаліся — прыбіралі, мылі, але гэта была праца. А дзіцячага ў памяці няма. Смеху... Капрызаў...

Нас ніхто ніколі не лашчыў, але я не плакала па маме. Побач са мною ні ў каго не было мамы. Мы нават не згадвалі гэтага слова. Забылі.

Кармілі нас так: за ўвесь дзень дадуць міску зацірκі і кавалачак хлеба. А я не любіла зацiркі і аддавала сваю порцыю дзяўчынцы, а яна давала мне свой кавалачак хлеба. У нас было такое сяброўства. На гэта ніхто не звяртаў увагі, усё было добра, пакуль не заўважыла наш абмен адна выхавальніца. Мяне паставілі ў кут на каленцы. І я доўга стаяла на каленцах адна. У пустой вялікай зале... Да гэтага часу, калі чую слова «зацірка», мне адразу хочацца плакаць. Калі стала дарослай, не магла зразумець: адкуль, чаму гэтае слова выклікае такую агіду? Я забыла пра дзіцячы дом...

Мне было ўжо шаснаццаць гадоў, не, напэўна, сямнаццаць... Я сустрэла сваю выхавальніцу з дзіцячага дома. Сядзіць у аўтобусе жанчына... Гляджу на яе, і мяне цягне да яе магнітам, так цягне, што праехала свой прыпынак. Не ведаю я гэтай жанчыны, не памятаю, а мяне да яе цягне. Нарэшце не вытрымала, расплакалася і злуюся на сябе: ну чаму я так? Глядзела на яе, як на малюнак, які калісьці бачыла, але забыла, і хочацца мне яшчэ раз на яе паглядзець. І штосьці такое роднае, можа, падобнае нават да мамы... Бліжэй за маму, а хто — не ведаю. І вось гэтая злосць і слёзы — як пацяклі з мяне! Я адвярнулася, пайшла наперад, да выхаду, стаю і плачу.

Жанчына ўсё бачыла, падышла да мяне і кажа:

—Анечка, не плач!

А ў мяне яшчэ больш слёз ад гэтых ейных словаў.

—Ды я вас не ведаю.

—Ты паглядзі на мяне лепш!

—Чэснае слова, я вас не ведаю, — і раву.

Вывела яна мяне з аўтобуса:

—Паглядзі на мяне добранька, ты ўсё ўспомніш. Я ж Сцепаніда Іванаўна…

А я на сваім:

—Я вас не ведаю. Я вас ніколі не сустракала.

—Ты памятаеш дзіцячы дом?

—Які дзіцячы дом? Вы, напэўна, мяне з кімсьці перablыталі.

—Не, ты прыгадай дзіцячы дом… Я твая выхавальніца.

—У мяне тата загінуў, а мама ў мяне ёсць. Які дзіцячы дом?

Я нават забылася пра дзіцячы дом, бо жыла ўжо з мамай. Дома. Гэтая жанчына мяне ціхенька пагладзіла па галаве. А ўсё роўна ручаём слёзы цякуць. І тады яна кажа:

—Вось табе мой нумар тэлефона… Патэлефануеш, калі захочаш даведацца пра сябе. Я цябе добра памятаю. Ты была ў нас самая меншая…

Яна пайшла, а я з месца зрушыць не магу. Мне, вядома, трэба было пабегчы за ёй, распытаць. Я не пабегла і не дагнала.

Чаму я гэтага не зрабіла? Я была дзікаватай, проста дзікаватай, для мяне людзі — гэта штосьці чужое, небяспечнае, размаўляць ні з кім я не ўмела. Адна сядзела гадзінамі, сама з сабой размаўляла. Усяго баялася.

Мама мяне знайшла толькі ў сорак шостым годзе… Мне было восем гадоў. Разам з сястрой іх вывезлі

ў Германію, там яны неяк выжылі, а калі вярнуліся, мама абшукала ўсе дзіцячыя дамы ў Беларусі, ужо не спадзявалася мяне знайсці. А я была побач… у Мінску. Аднак, відаць, згубілася паперка, якую мама мне дала, і мяне запісалі на іншае прозвішча. Мама перагледзела ўсіх дзяўчатак з імем Аня ў мінскіх дзіцячых дамах. Яна вызначыла, што я ейная дачка, па вачах, па высокім росце. Тыдзень яна прыходзіла і глядзела на мяне: ейная Анечка ці не ейная? Імя ў мяне засталося сапраўднае. Калі я бачыла маму, адчувала незразумелае, без прычыны пачынала плакаць. Не, гэта былі не ўспаміны пра штосьці знаёмае, гэта штосьці іншае… Вакол казалі: «Мама. Твая мама». І адкрываўся нейкі новы свет — мама! Расчыняліся таямнічыя дзверы… Я нічога не ведала пра тых людзей, якіх завуць «мама» і «тата». Мне было страшна, а іншыя радаваліся. Усе мне ўсміхаліся.

Мама паклікала з сабой нашую даваенную суседку:

— Знайдзі тут маю Анечку.

Суседка адразу паказала на мяне:

— Вось твая Анька! Не сумнявайся, бяры. Твае вочы, твой твар…

Увечары да мяне падышла выхавальніца:

— Цябе заўтра забяруць, ты паедзеш ад нас…

Мне было страшна…

Ранкам мяне мылі, апраналі, ад усіх я бачыла ласку. Наша бурклівая старая нянечка ўсміхалася мне. Я зразумела, што я з імі апошні дзень, яны са мною развітваюцца. Мне нават раптам не захацелася куды-небудзь ісці. Пераапранулі мяне ўва ўсё тое, што мама прынесла: у маміны чаравічкі, у маміну сукенку, і гэтым я ўжо вылучылася са сваіх дзетдомаўскіх сяброўак… Стаяла сярод іх — як чужая. І яны разглядвалі мяне, нібыта ўпершыню бачылі.

Самым вялікім уражаннем дома стала радыё. Прыёмнікаў яшчэ не было, у куце вісела чорная талерка. І адтуль даносіўся гук. Кожную хвіліну я глядзела туды, ем — туды гляджу, спаць кладуся — туды гляджу. Адкуль там людзі, як яны туды памясціліся? І ніхто мне не змог патлумачыць, я ж была зусім нелюдзімай. У дзіцячым доме я сябравала з Томачкай, яна мне падабалася, яна была вясёлая, часта ўсміхалася, а я нікому не падабалася, бо я ніколі не ўсміхалася. Я стала ўсміхацца ў пятнаццаць-шаснаццаць гадоў. У школе я хавала ўсмешку, каб не бачылі, як я ўсміхаюся, мне было сорамна. Не ўмела зносіцца нават з дзяўчаткамі, яны на перапынку размаўляюць пра што заўгодна, а я нічога не магу сказаць. Сяджу і маўчу.

Мама забрала мяне з дзіцячага дома, і праз пару дзён у нядзелю мы пайшлі з ёй на рынак. Там я ўбачыла міліцыянера і пачала біцца ў істэрыцы, закрычала:

— Мама, немцы! — кінулася ўцякаць.

Мама — за мною, людзі абступілі мяне, а я ўся трасуся:

— Немцы!

Пасля гэтага два дні не выходзіла на вуліцу. Мама мне тлумачыла, што гэта міліцыянер, ён ахоўвае нас, парадак на вуліцы, а мяне не пераканаць… Ну ніяк… У чорных шынялях да нас прыязджалі ў дзіцячы дом немцы… Праўда, калі яны бралі кроў, яны вялі нас у асобны пакой і былі ў белых халатах, але белыя халаты не запомніліся. Запомнілася іхная форма…

Дома я не магла прывыкнуць да сястры: гэта павінна было быць штосьці такое роднае, а я першы раз у жыцці яе бачу, і яна чамусьці мая сястра. Мама днямі была на працы. Раніцай мы прачынаемся, яе ўжо дома няма, у печы два гаршкі стаяць, самі вымаем кашу. Увесь

дзень я чакаю маму — як штосьці незвычайнае, як нейкае шчасце. А яна прыйдзе позна, мы ўжо спім.

Знайшла недзе не ляльку, а галаву ад лялькі. Палюбіла яе. Гэта была мая радасць, насіла яе з раніцы да вечара. Адзіная цацка. Марыла пра мячык. Выйду ў двор, ува ўсіх — мячыкі, насілі іх тады ў спецыяльных сетачках, яны так і прадаваліся. Папрашу ў каго-небудзь, дадуць патрымаць.

Купіла я сабе мячык у васямнаццаць гадоў з першага свайго заробку на гадзіннікавым заводзе. Мара здзейснілася: прынесла мячык і павесіла дома ў сетачцы на этажэрцы. У двор мне з ім сорамна было пайсці, я ўжо вялікая, я сядзела дома і глядзела на яго.

Праз шмат гадоў сабралася я да Сцепаніды Іванаўны. Адна так і не адважылася б, але муж настояў:

— Пойдзем удваіх. Як гэта ты нічога пра сябе не хочаш даведацца?

— Хіба я не хачу? Я баюся…

Набрала хатні нумар і пачула ў адказ:

— Сцепаніда Іванаўна Дзядзюля памерла…

Дараваць сабе не магу…

# «ВАМ ТРЭБА ЕХАЦЬ НА ФРОНТ, А ВЫ ЗАКАХАЛІСЯ Ў МАЮ МАМУ...»

*Яна Чарніна, 12 гадоў.*
*Цяпер — настаўніца.*

Звычайны дзень... Дзень той пачаўся як звычайна...

Але калі я ехала ў трамваі, людзі ўжо казалі: «Які жах! Які жах!» — а я ніяк не магла зразумець, што здарылася. Прыбегла дадому і ўбачыла сваю маму, яна мясіла цеста, і слёзы ліліся з ейных вачэй. Я пытаю: «Што здарылася?» Першае, што яна сказала: «Вайна! Бамбілі Мінск...» А мы толькі на днях вярнуліся ў Растоў з Мінска, дзе гасцявалі ў цёткі.

Першага верасня мы ўсё-ткі пайшлі ў школу, а дзясятага верасня школу зачынілі. Пачалася эвакуацыя Растова. Мама кажа, што нам трэба збірацца ў дарогу, а я не пагаджаюся: «Якая можа быць эвакуацыя?» Я пайшла ў райкам камсамола і прасілася, каб мяне датэрмінова прынялі ў камсамол. Мне адмовілі, бо ў камсамол прымалі з чатырнаццаці гадоў, а мне толькі дванаццаць. А я лічыла, што калі ўступлю ў камсамол, змагу адразу ж ва ўсім удзельнічаць, адразу стану дарослай. Змагу пайсці на фронт.

Селі мы з мамай у вагон, быў у нас з сабой адзін чамадан, у тым чамадане ляжалі дзве лялькі: вялікая і малая. Памятаю, што мама нават не супраціўлялася, калі я іх узяла. Як гэтыя лялькі нас уратавалі, потым раскажу...

Даехалі да станцыі «Каўказская», цягнік разбамбілі. Узлезлі на нейкую платформу. Куды едзем, не разабраліся. Ведалі адно: ад'язджаем ад лініі фронту. Ад

баёў. Ліў дождж, мама мяне затуляла сабой. На станцыі «Баладжары» пад Баку злезлі мокрыя і чорныя ад паравознага дыму. І галодныя. Жылі мы да вайны сціпла, у нас не было добрых рэчаў, якія можна было аднесці на кірмаш, абмяняць ці прадаць, у мамы быў з сабою толькі пашпарт. Сядзім на вакзале і не ведаем, на што адважыцца. Куды пайсці? Ідзе салдат, не салдат, а салдацік, зусім маладзенькі, чорненькі, з пляцачком за плячыма, з кацялком. Відаць, яго толькі што ўзялі ў войска, ён на фронт накіроўваецца. Спыніўся каля нас, я прытулілася да мамы. Ён пытае:

—Жанчына, куды едзеш?

Мама адказвае:

—Не ведаю. Мы эвакуяваныя.

Гаворыць ён па-руску, але з моцным акцэнтам:

—Не бойся нас, едзь у аул да маёй мамы. У нас усіх забралі ў войска: бацьку нашага, мяне, двух братоў. Яна адна засталася. Дапамажы ёй, і пражывяце разам. А я вярнуся і ажанюся з тваёй дачкой.

І сказаў адрас, запісаць не было на чым, мы запомнілі: станцыя Яўлах, раён Ках, сяло Кум, Мусаеў Муса. Адрас запомніўся на ўсё жыццё, хоць мы па ім не паехалі. Узяла нас да сябе адзінокая жанчына, жыла яна ў фанернай часовай хатцы, у якой змяшчаліся толькі ложак і маленькая тумбачка. Спалі так: галовы нашыя — на праходзе, а ногі — пад ложкам.

Нам шанцавала на добрых людзей...

Не забуду, як да мамы падышоў вайсковец, разгаварыліся, і ён распавёў, што ў яго ў Краснадары загінула ўся сям'я, а ён едзе на фронт. Таварышы крычаць, клічуць да эшалона, а ён стаіць і не можа ад нас пайсці.

—Я бачу, што вы галадаеце, дазвольце мне пакінуць вам свой вайсковы атэстат, у мяне нікога больш няма, — раптам кажа ён такія словы.

Мама заплакала. А я зразумела ўсё па-свойму, і стала на яго крычаць:

— Ідзе вайна... У вас уся сям'я загінула, вам трэба ехаць на фронт і помсціць фашыстам, а вы закахаліся ў маю маму. Як вам не сорамна!

Яны з мамай стаяць, і ў іх слёзы на вачах, а я не разумею, як мая добрая мама можа размаўляць з такім кепскім чалавекам: ён не хоча ехаць на фронт, ён гаворыць пра каханне, а каханне ж можа быць толькі ў мірны час. Чаму я вырашыла, што ён казаў пра каханне? Размова ж ішла толькі пра ягоны лейтэнанцкі атэстат...

Яшчэ хачу распавесці пра Ташкент... Ташкент — гэта мая вайна. Жылі мы ў інтэрнаце завода, на якім працавала мама. Ён быў у цэнтры горада, пад яго аддалі клуб. У вестыбюлі і ў глядацкай зале жылі сямейныя, а на сцэне — «халасцякі», іх звалі халасцякамі, але гэта былі рабочыя, чые сем'і не былі з імі. Наша з мамай месца было ў куце глядацкае залы.

Далі нам карткі на пуд бульбы, мама з раніцы да вечара працавала на заводзе, я павінна была атрымаць гэтую бульбу. Паўдня прастаяла ў чарзе, а потым чатыры ці пяць кварталаў цягнула мяшок па зямлі, падняць яго не магла. У транспарт дзяцей не пускалі, бо пачаўся грып і аб'явілі каранцін. Якраз у гэтыя дні... Як ні прасілася — мяне не пусцілі ў аўтобус. Калі засталося толькі перайсці дарогу перад нашым інтэрнатам, сілаў ужо не было. Упала на мяшок і заплакала. Чужыя людзі дапамаглі — прынеслі ў інтэрнат мяне і бульбу. Дагэтуль я адчуваю той цяжар. Кожны той квартал... Кінуць бульбы я не магла, у ёй было нашае выратаванне. Памерла б, але не кінула. Мама прыходзіла з працы галодная, сіняя.

Мы галадалі, і мама стала гэткай жа худзенькай, як і я. Думка пра тое, што я павінна дапамагаць, не пакідала

мяне. Неяк, калі зусім не было чаго есці, я вырашыла прадаць адзіную байкавую коўдру і на гэтыя грошы купіць хлеба. А дзецям не дазвалялася гандляваць, і мяне адвялі ў дзіцячы пакой міліцыі. Я сядзела там, пакуль не паведамілі маме на завод. Мама прыехала пасля змены, забрала мяне, а я ўся сплакалася ад сораму і ад таго, што мама галодная, а ў нас няма ні кавалачка хлеба. У мамы была бранхіяльная астма, ноччу яна страшна кашляла і задыхалася. Ёй трэба было праглынуць хоць бы крошку хлеба, і рабілася лягчэй. І я заўсёды хавала пад падушку хлебны кавалачак для яе. Здаецца, ужо сплю, але ўсё роўна памятаю, што пад падушкай ляжыць хлеб, і мне страшна хочацца яго з'есці.

Таемна ад мамы пайшла ўладкоўвацца на завод. Была я такая маленькая, тыповы дыстрофік, што браць мяне не хацелі. Стаю і плачу. Нехта зжаліўся, мяне ўзялі ў цэхавую бухгалтэрыю: запаўняць нарады рабочым, налічваць заробак. Працавала на машыне, гэткім прататыпе лічыльнай машыны. Цяпер яна працуе бязгучна, а тады гэта быў трактар, прычым яна працавала толькі з лямпай. Дванаццаць гадзінаў мая галава была як на гарачым сонцы, а ад грукату машыны да канца дня я глухнула.

І вось адбыўся са мною жахлівы выпадак: аднаму рабочаму замест двухсот васьмідзесяці рублёў я налічыла восемдзесят. А ў яго было шасцёра дзяцей, і ніхто маёй памылкі не заўважыў, пакуль не надышоў дзень атрымання заробку. Чую, хтосьці бяжыць па калідоры і крычыць: «Заб'ю! Заб'ю! Чым я дзяцей карміць буду?» Мне кажуць:

—Хавайся, гэта, напэўна, цябе.

Дзверы расчыніліся, і я прыціснулася да машыны, схавацца няма куды. Ускочыў вялізны мужчына, у руках у яго штосьці цяжкае:

—Дзе яна?

Яму паказалі на мяне:

—Вось яна...

Ён як да сцяны прыліп.

—Цьфу! I збіць няма каго, у самога такія. — Павярнуўся і пайшоў.

А я як упаду на машыну, як зараву...

Мама працавала ў аддзеле тэхнічнага кантролю гэтага ж завода. Завод наш рабіў снарады да «Кацюш», снарады былі двух калібраў — шаснаццаць і восем кілаграмаў. Корпус снарада пад ціскам правяраўся на трываласць. Снарад трэба было падняць, замацаваць і даць патрэбную колькасць атмасфер. Калі корпус быў якасны, яго здымалі і клалі ў скрынку. А калі няякасны, разьба не вытрымлівала, снарады з гулам выляталі і ляцелі ўверх пад купал, а потым падалі абы-куды. I вось гэты гуд і гэты страх, калі снарады ляцелі... Усе залазілі пад станкі...

Мама ўздрыгвала і крычала па начах. Я абдыму яе, і яна сцішыцца.

Заканчваўся сорак трэці год... Наша армія даўно наступала. Я зразумела, што мне трэба вучыцца. Пайшла да дырэктара завода. У ягоным кабінеце стаяў высокі стол, мяне з-за гэтага стала амаль не відаць. Пачынаю падрыхтаваную прамову:

—Хачу звольніцца з завода, мне трэба вучыцца.

Дырэктар раззлаваўся:

—Мы нікога не звальняем. Цяпер — ваенны час.

—Я памыляюся ў нарадах, бо непісьменная. Вось нядаўна чалавека аблічыла.

—Навучышся. У мяне людзей не хапае.

—А пасля вайны трэба будуць пісьменныя людзі, а не недавучкі.

— Ах ты, казяўка, — дырэктар падняўся з-за стала, — усё ты ведаеш!

У школе я пайшла ў шосты клас. У час урокаў літаратуры і гісторыі настаўнікі нам распавядалі, а мы сядзелі і вязалі шкарпэткі, рукавіцы, кісеты для войска. Вяжам і вершы вучым. Хорам паўтараем Пушкіна.

Чакалі канца вайны, гэта была такая жаданая мара, што мы з мамай баяліся нават пра яе размаўляць. Мама была на заводзе, а да нас прыйшлі ўпаўнаважаныя і ўва ўсіх пыталі: «Што вы можаце даць у фонд абароны?» Спыталі і ў мяне. Што ў нас было? У нас нічога не было, апроч некалькіх аблігацыяў, якія мама зберагала. Усе штосьці даюць, а як гэта мы не дамо?! Аддала я ўсе аблігацыі.

Памятаю, што мама, вярнуўшыся з працы, на мяне не сварылася, яна толькі сказала: «Гэта ўсё, што ў нас было, апроч тваіх лялек».

З лялькамі мне таксама давялося развітацца… Мама згубіла хлебныя карткі на цэлы месяц, мы літаральна паміралі. І мне прыйшла ў галаву ўратавальная думка паспрабаваць абмяняць на што-небудзь мае дзве лялькі — вялікую і маленькую. Пайшлі з імі на кірмаш. Падышоў стары ўзбек: «Колькі каштуе?» Мы сказалі, што нам трэба пражыць месяц, у нас няма картак. Стары ўзбек даў нам пуд рысу. І мы не памерлі з голаду. Мама паклялася: «Я куплю табе дзве прыгожыя лялькі, як толькі мы вернемся дамоў».

Калі мы вярнуліся ў Растоў, яна не змагла іх мне купіць, нам зноў было цяжка жыць. Яна купіла іх мне ў дзень заканчэння інстытута. Дзве лялькі — вялікую і маленькую…

## «У АПОШНІЯ ХВІЛІНЫ ЯНЫ ВЫКРЫКВАЛІ СВАЕ ІМЁНЫ...»

*Артур Кузееў, 19 гадоў.*
*Цяпер — адміністратар гатэля.*

Хтосьці біў у званы. Раскачваў і раскачваў...

Царкву даўно ў нас зачынілі, я нават не памятаю, калі яе зачынілі, там заўсёды быў калгасны склад. Захоўвалі збожжа. Пачуўшы даўно мёртвы звон, вёска анямела: «Бяда!» Мама... Усе выбеглі на вуліцу...

Так пачалася вайна...

Вось заплюшчу вочы... Бачу...

Па вуліцы вядуць трох чырвонаармейцаў, рукі ў іх ззаду скручаныя калючым дротам. Яны ў спорднім. Двое маладых, адзін старэйшы. Ідуць яны, апусціўшы галовы.

Расстрэльваюць іх каля школы. На дарозе.

У апошнія хвіліны яны пачалі гучна выкрываць свае імёны і прозвішчы ў надзеі, што хтосьці пачуе і запомніць. Перадасць родным.

Адзін — Ванечка Балай, другі — Раман Ніканаў. А той, што быў старэйшым, крыкнуў: «Няхай жыве таварыш Сталін!»

І адразу ж па гэтай дарозе рушылі грузавікі. Цяжкія нямецкія грузавікі. А яны ляжаць... Па іх пайшлі грузавікі з салдатамі і боезапасамі. Услед матацыклісты. Немцы ехалі і ехалі. Дзень і ноч. Шмат дзён.

А я паўтараў... Ноччу прачнуся... Паўтараю: Ванечка Балай, Раман Ніканаў... Трэцяга прозвішча не ведаю...

## «УСЕ ЎЧАТЫРОХ УПРЭГЛІСЯ МЫ Ў ГЭТЫЯ САНАЧКІ...»

*Зіна Прыходзька, 4 гады.*
*Цяпер — рабочая.*

Бамбяць... Дрыжыць зямля, дрыжыць наша хата...

А хата была вялікая, з садам. Мы схаваліся ў хаце, зачынілі аканіцы. Сядзім учатырох: мае дзве сястрычкі, я і наша мама. Мама кажа, што зачыніла аканіцы і цяпер не страшна. І мы пагаджаемся, што не страшна, а самі баімся, аднак не хочам хваляваць маму.

...Ідзём услед за возам, потым нас, маленькіх, нехта пасадзіў на вузлы. Чамусьці мне здавалася, што калі я засну, дык мяне заб'юць, і з усіх сілаў старалася не заплюшчваць вачэй, а яны самі заплюшчваліся. Тады мы дамовіліся са старэйшай сястрычкай, што спачатку я заплюшчу вочы, пасплю, а яна будзе вартаваць, каб нас не забілі, потым яна засне, а я буду вартаваць. Але заснулі абедзве і прачнуліся ад крыку мамы: «Не палохайцеся! Не палохайцеся!» Наперадзе стралялі. Крычалі людзі... Мама прыгінала нам галовы. А нам хацелася паглядзець, што там...

Страляніна сціхла, паехалі далей. Я ўбачыла, што ў канаве каля дарогі ляжаць людзі, і спытала ў мамы:

— Што гэтыя людзі там робяць?

— Яны спяць, — адказала мама.

— А чаму яны спяць у канаве?

— Бо вайна.

— Значыць, і мы будзем спаць у канаве? А я не хачу спаць у канаве, — закапрызіла я.

Перастала капрызіць, калі ўбачыла, што ў мамы слёзы на вачах.

Куды мы ішлі, куды мы ехалі, я, канечне, не ведала. Не разумела. Памятаю толькі слова «Азарычы» і дрот, да якога мама не дазваляла падыходзіць. Пасля вайны я даведалася, што мы трапілі ў Азарыцкі канцлагер. Я нават ездзіла потым туды, на тое месца. Але што там цяпер убачыш? Трава, зямля... Усё звычайнае. Калі што і засталося, дык толькі ў нашай памяці.

Я, калі расказваю, рукі да крыві кусаю, каб не плакаць...

Маму аднекуль прыносяць і кладуць на зямлю. Падпаўзаем да яе, памятаю, што падпаўзаем, а не падыходзім. Клічам: «Мама! Мама!» Я прашу: «Мама, не спі!» А мы ўжо ўсе ў крыві, бо мама ў крыві. Думаю, мы не разумелі, што гэта кроў і што такое кроў, аднак да нас дайшло, што гэта нешта страшнае.

Кожны дзень прыходзілі машыны, на іх сядалі людзі і з'язджалі. Мы прасілі маму: «Мамачка, давай паедзем на машыне. Можа, яна едзе ў той бок, дзе жыве бабуля?» Чаму мы згадвалі бабулю? Бо мама заўсёды казала, што тут побач жыве наша бабуля і не ведае, дзе мы. Яна думае, што мы ў Гомелі. Мама не хацела ехаць на тых машынах, яна адцягвала нас кожны раз ад машынаў. А мы плакалі, прасіліся, угаворвалі. Адным ранкам яна пагадзілася... Пачалася зіма, мы сталі мерзнуць...

Кусаю сабе рукі, каб не плакаць. Не магу без слёз...

Ехалі мы доўга, і хтосьці маме сказаў ці яна сама здагадалася, што вязуць нас на расстрэл. Калі машына спынілася, усім сказалі выходзіць. Там быў хутар, і мама пытае ў канваіра: «Ці можна папіць вадзічкі?

Дзеці просяць піць». Ён дазволіў нам зайсці ў хату. Мы зайшлі ў хату, гаспадыня дала вялікі кубак вады. Мама п'е маленькімі глыткамі, павольна, а я думаю: «Мне так хочацца есці, а чаму гэта маме захацелася піць?»

Выпіла мама адзін кубак, папрасіла другі. Гаспадыня зачарпнула, падала ёй і кажа, што кожную раніцу ў лес вядуць шмат людзей, а назад ніхто не вяртаецца.

—А ёсць у вас другі выхад, каб нам сысці адсюль? — пытае мама.

Гаспадыня паказала рукой — ёсць. Адныя дзверы ў яе вялі на вуліцу, а другія — у двор. Мы выскачылі з гэтай хаты і папаўзлі. Мне здаецца, што мы не дайшлі, а дапаўзлі да хаты нашай бабулі. Як і колькі паўзлі, не памятаю.

Нас бабуля паклала на печ, а маму — на ложак. Раніцай мама пачала паміраць. Мы сядзелі спалоханыя і не маглі зразумець: як гэта мама можа памерці, пакінуць нас, калі няма таты? Памятаю, што мама паклікала нас, усміхнулася:

—Ніколі не сварыцеся, дзеці.

А навошта нам сварыцца? З-за чаго? Цацак ніякіх. Вялікі каменьчык быў у нас лялькай. Не было цукерак. Не было мамы, каб паскардзіцца.

Раніцай бабуля захінула маму ў вялікую белую прасціну і паклала на саначкі. Усе ўчатырох упрэгліся мы ў гэтыя саначкі…

Даруйце… Не магу больш… Плачу…

## «ГЭТЫЯ ДВА ХЛОПЧЫКІ СТАЛІ ЛЁГЕНЬКІМІ, БЫ ВЕРАБ'І...»

*Рая Ільінская, 14 гадоў.*
*Цяпер — выкладчыца логікі.*

Я не забуду, як пахлі ліпы ў родным Ельску...

Падчас вайны ўсё, што было да вайны, здавалася самым цудоўным на свеце. Так гэта ўва мне засталося назаўсёды. Па сёння.

З Ельска эвакуяваліся — мама, я і малодшы брат. Спыніліся ў сяле Грыбанаўка пад Варонежам, думалі там жыць да канца вайны, аднак праз некалькі дзён пасля таго, як мы прыехалі, немцы падышлі да Варонежа. Услед за намі.

Селі ў таварняк, нам сказалі, што павязуць усіх далёка на ўсход. Мама суцяшала нас так: «Там будзе шмат садавіны». Ехалі доўга, бо часта стаялі на запасных пуцях. Дзе і колькі стаяць будзем, мы не ведалі, таму з вялікай рызыкай выскоквалі на станцыях, каб узяць вады. Гарэла ў нас «буржуйка», на ўвесь вагон варылі на ёй вядро прасяной кашы. Колькі ехалі, столькі елі гэтую кашу.

Цягнік стаў на станцыі Курган-Цюбе. Пад Андыжанам... Мяне ўразіла незнаёмая прырода і ўразіла так моцна, што на нейкі час я нават забылася пра вайну. Усё цвіло, гарэла, было столькі сонца. Я зноў стала вясёлаю. Да мяне ўсё вярнулася, усё ранейшае.

Прывезлі нас у калгас «Кызыл юл». Колькі часу прайшло, а ўсе назвы памятаю. Нават сама здзіўляюся, што не забылася. Памятаю, як тады завучвала, паўтарала

нязвыклыя словы. Сталі мы жыць у школьнай спартзале, разам восем сем'яў. Мясцовыя жыхары прынеслі нам коўдры і падушкі. Узбекскія коўдры шыюцца з рознакаляровых кавалачкаў, падушкі набіваюцца бавоўнай. Я хутка навучылася збіраць абярэмкі сухіх сцяблінаў бавоўніку — ім палілі печ.

Мы не адразу зразумелі, што і тут вайна. Далі нам трохі мукі, але гэтага мала, ненадоўга хапіла. Пачалі галадаць. Узбекі таксама галадалі. Разам з узбекскімі хлопчыкамі мы бегалі ўслед за вазамі, шчасце, калі нешта з возу ўпадзе. Самай вялікай радасцю для нас была макуха, макуха з лёну, а з баваўняных зярнятак яна цвёрдая, жоўтая, падобная да гарохавай.

Брату Вадзіку было шэсць гадоў, яго пакідалі дома аднога, а мы з мамай ішлі на працу ў калгас. Абганялі рыс, збіралі бавоўну. З непрывычкі ў мяне балелі рукі, ноччу я не магла заснуць. Увечары вяртаемся з мамай дамоў, насустрач нам ляціць Вадзік, і праз плячо на вяровачцы ў яго матляюцца тры вераб'і, а ў руках рагатка. Ён ужо памыў свае «паляўнічыя» трафеі ў рэчцы і чакае маму, зараз пачнём варыць суп. Ганарыцца так! Ядзім мы з мамай суп і нахвальваем, а вераб'і такія худыя, што ў каструльцы ні тлушчынкі не блішчыць. Толькі над каструляй блішчаць шчаслівыя вочы брата.

Сябраваў ён з узбекскім хлопчыкам, аднойчы той прыйшоў да нас са сваёй бабуляй. Глядзіць яна на хлопчыкаў, ківае галавой і штосьці кажа маме. Мама не разумее, але тут зайшоў брыгадзір, ён ведаў рускую мову. Ён нам пераклаў: «Яна са сваім Богам размаўляе, з Алахам. І скардзіцца яму, што вайна — гэта справа мужчынаў, ваяроў. Навошта ж дзецям пакутаваць? Як ён дапусціў, што гэтыя два хлопчыкі сталі лёгенькія, бы вераб'і, у якіх яны страляюць з рагатак?» Бабуля

высыпае на стол жменю залатых сушаных уручынаў — цвёрдых і салодкіх, як цукар! Іх можна доўга смактаць, адкусваць па маленькім кавалачку, а потым разбіць костачку і з'есці хрумсткае зярнятка.

Унук ейны глядзіць на гэты ўрук, і вочы ў яго таксама галодныя. Гарачь! Мама разгубілася, бабуля пагладзіла ёй руку, супакоіла, прыціснула ўнука да сябе. «У яго заўсёды ёсць піяла катэку, бо ён жыве дома, з бабуляй», — пераклаў брыгадзір. Катэк — гэта кіслае казінае малако. Нам з братам, колькі мы былі ў эвакуацыі, здавалася, што няма на свеце нічога смачнейшага.

Яны сыходзяць, бабуля і хлопчык, а мы сядзім за сталом, усе трое. Ніхто не адважваецца першым працягнуць руку да залатых уручынак…

# «САРОМЕЎСЯ, ШТО ЧАРАВІКІ Ў МЯНЕ ДЗЯВОЧЫЯ...»

*Марлен Рабейчыкаў, 11 гадоў.*
*Цяпер — загадчык аддзела райвыканкама.*

Вайну я ўбачыў з дрэва...

Дарослыя нам не дазвалялі, а мы ўсё роўна залазілі на дрэвы і назіралі за паветранымі баямі з высокіх ялінаў. Плакалі, калі гарэлі нашы самалёты, а страху не было, як быццам кіно глядзелі. На другі ці на трэці дзень сабралі агульную лінейку, і дырэктар аб'явіў, што наш піянерскі лагер эвакуюецца. Мы ўжо ведалі, што гарыць ад бомбаў Мінск, і дамоў нас не павязуць, павязуць некуды далей ад вайны.

Я хачу распавесці, як мы збіраліся ў дарогу... Загадалі нам узяць чамаданы і скласці ў іх толькі самыя неабходныя рэчы: майкі, кашулі, шкарпэткі, насоўкі. Упакавалі мы іх, а паверх кожны паклаў свой піянерскі гальштук. У дзіцячым уяўленні малявалася: сустрэнуць нас немцы, адчыняць чамаданы, а там ляжаць чырвоныя гальштукі. Так мы ім адпомсцім за ўсё...

Цягнік наш ішоў хутчэй за вайну. Абагнаў вайну... На тых станцыях, дзе мы спыняліся, пра вайну яшчэ нічога не ведалі, яе не бачылі. І мы, дзеці, расказвалі дарослым пра вайну: як гарэў Мінск, як бамбілі наш лагер, як гарэлі нашы самалёты. Але чым далей ад'язджалі ад дома, тым больш чакалі, што прыедуць бацькі і забяруць нас, а пра тое, што шмат у каго ўжо няма бацькоў,

мы і не здагадваліся. Такія думкі нават не маглі яшчэ з'явіцца. Мы размаўлялі пра вайну, але былі яшчэ мірнымі дзецьмі. З міру.

З цягніка нас перасадзілі на цеплаход «Парыжская камуна» і павезлі па Волзе. Паўмесяца мы ўжо былі ў дарозе і ні разу не распраналіся. На цеплаходзе я першы раз зняў тапачкі. У мяне былі прагумаваныя тапачкі з тасёмачкамі. Калі я іх зняў, гэта быў такі пах! Мыў, мыў і выкінуў. Прыехаў у Хвалынск босым.

Нас прыехала так шмат, што стварылі два беларускія дзіцячыя дамы. У першым — школьнікі, у другім — дашкольнікі. Чаму я пра гэта ведаю? Таму што вельмі плакалі тыя, каму трэба было разлучацца з братам альбо сястрычкаю, асабліва плакалі маленькія, баяліся згубіць старэйшых. Калі мы ў піянерскім лагеры засталіся без бацькоў, было цікава, гэта як быццам гульня, а тут усе спалохаліся. Хатнія дзеці, якія прывыклі да бацькоў, да ласкі. Мая мама мяне заўсёды раніцай будзіла, на ноч цалавала. Побач з намі быў дзіцячы дом, дзе жылі «сапраўдныя» дзетдомаўцы, ад іх мы рэзка адрозніваліся. Яны прывыклі жыць без бацькоў, а нам трэба было з гэтым звыкацца.

Запомніў ежу сорак трэцяга года: у дзень лыжачка адтопленага малака і кавалачак хлеба, вараныя буракі, летам — суп з кавуновых скурак. Паглядзелі кінафільм «Сакавік — красавік», там распавядалася, як нашы разведчыцы з бярозавай кары варылі кашу. Нашы дзяўчаткі таксама навучыліся варыць бярозавую кашу.

Увосень самі нарыхтоўвалі дровы, на кожнага норма — адзін кубаметр. Лес быў у гарах. Яго спачатку валілі, абчэсвалі, потым распілоўвалі на метровыя кавалкі і складвалі ў штабелі. Норма была разлічаная на дарослага чалавека, а з намі яшчэ і дзяўчаткі працавалі.

Больш працы было нам, хлопчыкам. Дома мы ніколі не пілавалі, бо ўсе гарадскія, а тут такія тоўстыя бярвёны трэба было пілаваць. Калоць.

Есці хацелася і ўдзень, і ноччу, падчас працы і ў сне, увесь час хацелася есці. Асабліва зімой. Мы беглі з дзіцячага дома ў вайсковую частку, там нам часта перападаў чарпак супу. Але нас было шмат, там таксама не маглі накарміць усіх. Паспееш першым — што-небудзь атрымаеш, спазніўся — застанешся ні з чым. У мяне быў сябар Мішка Чаркасаў. Сядзім, ён кажа: «За дваццаць кіламетраў пайшоў бы, каб ведаў, што там дадуць міску кашы». На вуліцы трыццаць градусаў, ён апрануўся і пабег у вайсковую частку. Просіць у салдатаў што-небудзь паесці, яны сказалі, што ёсць трохі супу, бяжы, хлопец, па кацялок. Ён выйшаў на вуліцу, бачыць: дзеці з суседняга дзіцячага дома таксама ідуць, калі ён пабяжыць назад па кацялок, яму нічога не застанецца.

Вяртаецца назад і кажа салдатам: «Ліце!» Замест кацялка здымае і падстаўляе шапку. Настолькі ў яго быў рашучы выгляд, што салдат узяў і выліў яму ў шапку ўвесь чарпак. Мішка героем прайшоў паўз дзетдомаўскіх, якім нічога не засталося, пабег у свой дзіцячы дом. Ён адмарозіў вушы, але прынёс нам суп, там быў ужо не суп, а поўная шапка лёду. Вывернулі гэты лёд у талерку, ніхто не чакаў, пакуль растане, елі, а дзяўчаткі адціралі Мішку вушы. Колькі на ягоным твары было радасці, што ён прынёс для ўсіх, ён нават есці першым не пачаў!

Самай смачнай стравай для нас была макуха, мы дзялілі яе на гатункі па смаку, адзін гатунак называўся халвічным. Праводзілі аперацыю «Макуха». Некалькі чалавек на хаду залазяць на машыну, скідваюць пласты

макухі, іншыя падбіраюць. Вярталіся ў дзіцячы дом з сінякамі, затое сытыя. Ну і вядома, летнія і восеньскія кірмашы! Вось калі было нам добра. Накаштуешся ўсяго: у адной гаспадыні — кавалачак яблыка, у іншай — кавалачак памідора. Красці што-небудзь не лічылася ганебным, наадварот — геройствам! Што красці — нам было ўсё роўна, нам бы чаго-небудзь паесці, а што — няважна.

У нас у класе вучыўся сын дырэктара маслазавода. Дзеці ёсць дзеці, сядзім на ўроку, у «марскі бой» гуляем. А ён есць ззаду хлеб з алеем, які пахне на ўвесь клас.

Шэпчамся і паказваем яму кулакі, маўляў, няхай толькі ўрокі скончацца…

Бачым — няма настаўніцы, глядзім — яна на падлозе ляжыць. Яна была галодная і таксама пачула гэты пах. І ўпала, страціла прытомнасць. Нашы дзяўчаткі адвялі яе дамоў, яна жыла з маці. Увечары вырашылі, што з гэтага дня кожны пачне пакідаць па маленькім кавалачку хлеба, аддаваць яго настаўніцы. Сама яна б у нас ні за што не ўзяла, мы таемна насілі ейнай маці і прасілі не казаць, што гэта ад нас.

Быў у нас свой сад і свой агарод. У садзе раслі яблыкі, а ў агародзе — капуста, морква, буракі. Мы іх ахоўвалі, дзяжурылі па некалькі чалавек. Здаючы дзяжурства, усё пералічвалі: кожны качан капусты, кожную морквінку. Ноччу думаеш: «Хоць бы за ноч яшчэ адна морквінка вырасла. Яе не будзе ў спісе і можна будзе з'есці». Калі морквінка лічыцца ў спісе, не дай бог ёй прапасці. Сорамна!

Сядзім у агародзе, вакол ежа, а мы трываем. А есці жах як хочацца. Адзін раз дзяжурыў я з хлопчыкам крыху старэйшым. У ягонай галаве нарадзілася ідэя:

— Бачыш, карова пасецца…

—Ну і што?

—Дурань! А ты хіба не ведаеш, што ёсць пастанова, калі прыватная карова пасецца на дзяржаўным полі, дык карову ці адбіраюць, ці штрафуюць гаспадароў.

—Яна ж на лузе пасецца.

—Што яна там: прывязаная?

І ён выкладае план: бярэм карову, прыцягваем у свой сад і прывязваем. Потым шукаем гаспадыню.

Так мы і зрабілі: прыцягнулі карову ў свой дзетдомаўскі сад і прывязалі. Напарнік мой збегаў у вёску, знайшоў гаспадыню, маўляў, так і так, карова ваша знаходзіцца ў дзяржаўным садзе, а вы ж ведаеце пастанову…

Не думаю… Цяпер сумняваюся, што гаспадыня паверыла нам і спалохалася. Пашкадавала яна нас, убачыла, што галодныя. Дамовіліся мы так: мы пасём ейную карову, а яна за гэта дае нам некалькі бульбін.

Захварэла ў нас адна дзяўчынка, ёй трэба пераліць кроў. Дык ва ўсім дзіцячым доме не было ў каго ўзяць кроў. Вы разумееце?

Мара? Трапіць на фронт. Сабралася нас некалькі хлапчукоў, самых адчайных, вырашылі ўцякаць. На наша шчасце, прыехаў у дзіцячы дом вайсковы капельмайстар капітан Гардзееў. Ён адабраў чатырох музычна адораных хлопчыкаў, у тым ліку мяне. Так я трапіў на вайну.

Нас праводзілі ўсім дзіцячым домам. У мяне не было чаго апрануць, дык адна дзяўчынка аддала свой матроскі касцюмчык, у другой было дзве пары чаравічак, адну яна падаравала мне.

Так і паехаў на фронт. Больш за ўсё саромеўся, што чаравічкі ў мяне дзявочыя…

## «Я КРЫЧАЛА І КРЫЧАЛА... НЕ МАГЛА СПЫНІЦЦА...»

*Люда Андрэева, 5 гадоў.*
*Цяпер — кантралёрка.*

Ад вайны ў мяне засталося ўражанне, як ад вогнішча... Яно гарэла і гарэла. Бясконца...

Збяромся маленькія дзеці, і ведаеце, пра што мы размаўляем? Што да вайны мы любілі булачкі і салодкую гарбату, і што гэтага больш ніколі не будзе.

Мамы нашы плакалі часта, кожны дзень яны плакалі... Таму мы стараліся плакаць менш, чым у мірны час. Менш капрызаваць.

Я ведала, што мама ў мяне маладая і прыгожая, у іншых дзяцей былі мамы старэйшыя, але ў пяць гадоў я зразумела, што для нас гэта кепска, што мама маладая і прыгожая. Гэта небяспечна. У пяць гадоў я гэта зразумела... Я нават зразумела, што тое, што я маленькая — гэта добра. Як такое дзіцё можа зразумець? Мне ж ніхто нічога не тлумачыў...

Праз столькі гадоў... Баюся гэта згадваць... Нават дакранацца...

Каля нашай хаты спынілася нямецкая машына, яна не спецыяльна спынялася, яна зламалася. Салдаты зайшлі ў хату, мяне і бабулю прагналі ў іншы пакой, а маму прымусілі ім дапамагаць. Грэлі ваду, гатавалі вячэру. Яны так гучна размаўлялі, што мне здавалася — яны не размаўляюць адзін з адным і смяюцца, а крычаць на маю маму.

Стала цёмна, ужо вечар. Ноч. Раптам мама забягае ў наш пакой, хапае мяне на рукі і бяжыць на вуліцу. Саду ў нас не было, і двор пусты, бегаем і не ведаем дзе схавацца. Залезлі пад машыну. Яны выйшлі ў двор, шукаюць, свецяць ліхтарыкамі. Мама ляжыць на мне, і я чую, як у яе стукаюць зубы, яна халодная зрабілася. Уся халодная.

Раніцай, калі немцы паехалі, мы зайшлі ў хату… Бабуля наша ляжала на ложку… прывязаная да яго вяроўкамі… Голая! Бабуля… Мая бабуля! Ад жаху… Ад страху я закрычала. Мама выштурхала мяне на вуліцу. Я крычала, крычала… Не магла спыніцца…

Доўга баялася машын. Толькі гук пачую, пачынаю дрыжэць. Ужо вайна скончылася, ужо мы ў школу пайшлі… Бачу: трамвай ідзе, і нічога не магу з сабой зрабіць, у мяне стукаюць зубы. Ад дрыготкі. У класе нас было трое, хто перажыў акупацыю. Адзін хлопчык баяўся гулу самалёта. Вясной цёпла, адчыніць настаўніца вокны… Гул самалёта… Ці машына пад'едзе… Вочы ў мяне і ў гэтага хлопчыка робяцца вялізнымі, зрэнкі расшыраюцца, мы ў паніцы. А дзеці, якія вярнуліся з эвакуацыі, смяюцца з нас.

Першы салют… Людзі выбеглі на вуліцу, а мы з мамай схаваліся ў яміне. Сядзелі там, пакуль не прыйшлі суседзі: «Вылазьце — гэта не вайна, а свята Перамогі».

Як хацелася дзіцячых цацак! Дзяцінства хацелася… Пакладзем кавалачак цагліны і ўяўляем, што гэта лялька. Ці нехта самы маленькі рабіў выгляд, што ён лялька. Калі я сёння ўбачу ў пяску каляровыя шкельцы, мне хочацца іх падняць. Яны мне і цяпер прыгожыя.

Падрасла я… І нехта сказаў: «Якая ты прыгожая. Як твая мама». Я не абрадавалася, я спалохалася. Ніколі не любіла, калі мне казалі гэтыя словы…

## «УСЕ ЎЗЯЛІСЯ ЗА РУКІ...»

*Андрэй Тоўсцік, 7 гадоў.*
*Цяпер — кандыдат эканамічных навук.*

Быў я маленькім хлопчыкам...

Маму памятаю... Яна пякла самы смачны хлеб у вёсцы, у яе былі самыя прыгожыя градкі на агародзе. Самая вялікая вяргіня цвіла ў нас у гародчыку і ў двары. Усім нам мама вышыла прыгожыя кашулі — тату, дваім старэйшым братам і мне. Вышываўся каўнерык. Чырвоным, сінім, зялёным крыжыкам...

Не памятаю, хто першы сказаў мне, што маму расстралялі. Хтосьці з суседскіх жанчын. Я прыбег дахаты. Кажуць: «Яе расстралялі не ў хаце, а за вёскай». Бацькі няма — бацька ў партызанах, братоў старэйшых няма — яны ў партызанах, стрыечнага брата няма — ён у партызанах. Пайшоў да суседа, дзеда Карпа:

— Маму забілі. Трэба прывезці.

Запрэглі карову (каня ў нас не было) і паехалі. Каля лесу дзед Карп мяне пакінуў:

— Ты тут пастой. Мне, старому, не страшна, калі заб'юць. А ты — хлапец.

Чакаю. Думкі ў галаве розныя: што я скажу бацьку? Як я яму скажу, што маму забілі? Ну і дзіцячае — калі я ўбачу маму мёртвую, дык яна ўжо ніколі не будзе жывая. А калі не ўбачу мёртвай, дык прыйду дамоў, і мама дома.

У мамы былі прастрэленыя аўтаматнай чаргой грудзі. Паласа такая на кофтачцы... І чорная дзірачка ля

скроні... Мне хацелася, каб ёй хутчэй завязалі белую хустку, каб не бачыць гэтай чорнай дзірачкі. Такое адчуванне, што ёй было балюча.

На воз не сеў, ішоў побач...

У вёсцы кожны дзень каго-небудзь хавалі... Запомніў, як хавалі чатырох партызанаў. Траіх мужчынаў і дзяўчыну. Партызанаў хавалі часта, але першы раз я бачыў, як хавалі жанчыну. Выкапалі ёй асобную магілку... Яна адна ляжала на траве пад старой ігрушай... Старыя жанчыны сядзелі побач і гладзілі ейныя рукі...

— Чаму яе паклалі асобна? — пытаўся я.

— Маладая... — адказвалі бабы.

Калі я застаўся адзін, без родных, без сваякоў, я спалохаўся. Як быць? Прывялі мяне ў вёску Залессе да цёткі Марфы. Сваіх дзяцей у яе не было, муж ваяваў на фронце. Сядзім у склепе, хаваемся. Яна прыцісне маю галаву да сваёй: «Сынок...»

Захварэла цётка Марфа на тыфус. За ёю захварэў я. Мяне забрала да сябе бабка Зенька. У яе два сыны ваявалі на фронце. Ноччу прачнуся, яна дрэмле каля мяне на ложку: «Сынок...» Усе з вёскі ўцякаюць ад немцаў у лес, а бабка Зенька — каля мяне. Ні разу не пакінула: «Разам, сынок, будзем гінуць».

Пасля тыфусу доўга не мог хадзіць. Роўная дарога — іду, а ледзь горка — ногі падкошваюцца. Ужо чакалі нашых салдатаў. Жанчыны пайшлі ў лес, набралі суніц. Не было іншых гасцінцаў.

Салдаты ішлі стомленыя. Бабка Зенька насыпала ім у каскі чырвоныя суніцы. Яны ўсе частавалі мяне. А я сядзеў на зямлі і не мог падняцца.

Вярнуўся з партызанаў бацька. Ён ведаў, што я хворы, і прынёс мне кавалачак хлеба і кавалачак сала,

з палец таўшчынёю. Сала і хлеб пахлі махоркай. Усё пахла бацькам.

Слова «Перамога!» пачулі, калі збіралі на лузе шчаўе. Усе дзеці ўзяліся за рукі і так беглі да вёскі…

## «МЫ НАВАТ НЕ ВЕДАЛІ, ЯК ХАВАЮЦЬ... А ТУТ АДНЕКУЛЬ УСПОМНІЛІ...»

*Міхаіл Шынкароў, 13 гадоў.*
*Цяпер — чыгуначнік.*

У нашых суседзяў была глухая дзяўчынка...

Усе крычаць: «Вайна! Вайна!», а яна прыбяжыць да мае сястры з лялькай, песенькі спявае. А ўжо нават дзеці не смяяліся. «Вось добра, — думаў я, — яна нічога не чула пра вайну».

Свае чырвоныя значкі акцябронкаў і чырвоныя гальштукі мы з сябрамі загарнулі ў цырату і закапалі ў кустах каля рэчкі. У пяску. Такія вось канспіратары! Кожны дзень прыходзілі на тое месца.

Немцаў баяліся ўсе, нават дзеці і сабакі. Мама клала яйкі на лаўку каля дома. На вуліцы. Тады яны не заходзілі ў хату. Не пыталі: «Юдэ?» У нас з сястрой былі кучаравыя валасы...

Купаліся на рэчцы... І ўбачылі, як з дна падымаецца нешта чорнае. Менавіта ў гэты момант! Вырашылі: затопленае бервяно, а яно, гэтае нешта, падганялася плынню да берага, і мы разгледзелі рукі, галаву... Мы ўбачылі, што гэта — чалавек. Мне здаецца, ніхто не спалохаўся. Не закрычаў. Успомнілі, як дарослыя казалі, што на гэтым месцы загінуў наш кулямётчык і разам са сваім «дзегцяром» упаў у ваду.

Усяго некалькі месяцаў вайны... А ў нас ужо не было страху, калі бачылі смерць. Выцягнулі кулямётчыка на бераг і пахавалі. Хтосьці збегаў па рыдлёўку, выкапалі

яму. Закапалі. Пастаялі моўчкі. Адна дзяўчынка нават перахрысцілася, у яе бабуля калісьці прыслугоўвала ў царкве, і яна ведала малітвы.

Усё зрабілі самі. Адныя, без дарослых. А да вайны мы нават не ведалі, як хаваюць… А тут аднекуль успомнілі.

Два дні ныралі па кулямёт…

## «САБРАЎ У КОШЫК...»

*Леанід Сівакоў, 6 гадоў.*
*Цяпер — слесар-інструментальнік.*

Ужо сонейка ўзышло...

Пастухі збіралі кароў. Карнікі далі час выгнаць статак за рачулку Гразу і сталі хадзіць па хатах. Заходзілі са спісам і па спісе расстрэльвалі. Чытаюць: маці, дзед, дзеці такія і такія, па столькі гадоў... Прасочаць па спісе, калі аднога няма, пачынаюць шукаць. Пад ложкам дзіцё знойдуць, пад печчу...

Калі ўсіх знойдуць, тады страляюць...

У нас у хаце сабралася шэсць чалавек: бабуля, мама, старэйшая сястра, я і два малодшыя брацікі. Шэсць чалавек... Убачылі ў вакно, як яны пайшлі да суседзяў, пабеглі ў сенцы з брацікам самым малодшым, зачыніліся на зашчапку. Селі на куфар і сядзім каля мамы.

Зашчапка слабенькая, немец адразу адарваў. Праз парог пераступіў і даў чаргу. Я разгледзець не паспеў: стары ён ці малады? Мы ўсе пападалі, я зваліўся за куфар...

Першы раз вярнуўся да прытомнасці, калі пачуў, што на мяне нешта крапае... Крапае і крапае, як вада. Падняў галаву: маміна кроў крапае, мама ляжыць забітая. Папоўз пад ложак, усё залітае крывёю... Я ў крыві, як у вадзе... Мокры...

Чую: заходзяць двое. Пералічваюць, колькі забітых. Адзін кажа: «тут аднога не хапае. Трэба шукаць». Сталі яны шукаць, нагнуліся пад ложак, а там

мама прыхавала мяшок жыта, а за ім я ляжу. Выцягнулі яны мяшок і пайшлі задаволеныя. Забылі, што аднога са спісу недалічыліся. Яны пайшлі, а я страціў прытомнасць.

Другі раз ачуўся, калі загарэлася наша хата…

Мне стала невыносна горача: млосна і нудзіць. Бачу, што ў крыві, а не разумею, што я паранены, болю не адчуваю. Поўная хата дыму… Неяк я выпаўз у агарод, потым у суседскі сад. І толькі тут адчуў, што ў мяне параненая нага і прабітая рука. Боль ударыў! Нейкі час я зноў нічога не памятаю…

Трэці раз вярнулася свядомасць, калі я пачуў страшны жаночы крык… Я папоўз на яго…

Крык вісеў і вісеў у паветры. Поўз па гэтым крыку, як па нітачцы, і прыпоўз да калгаснага гаража. Нікога не бачу… Крык аднекуль з-пад зямлі ідзе… Тады я здагадаўся, што хтосьці крычыць з ямы…

Устаць я не мог, падпоўз да ямы і зірнуў уніз… Поўная яма людзей… Гэта былі смаленскія бежанцы, яны жылі ў нашай школе. Сем'яў дваццаць. Усе ляжалі ў яме, а наверсе падымалася і падала параненая дзяўчынка. І крычала. Я азірнуўся назад: куды цяпер паўзці? Ужо гарэла ўся вёска… І нікога жывога… Адна дзяўчынка. Я ўпаў да яе… Колькі ляжаў не ведаю…

Адчуваю — дзяўчынка мёртвая. І штурхну, і паклічу — не адгукаецца. Адзін я жывы, а яны ўсе мёртвыя. Сонца прыгрэла, ад цёплай крыві пара ідзе. Закружылася галава…

Ляжаў так доўга, то ёсць прытомнасць, то няма. У пятніцу нас расстралялі, а ў суботу прыехалі з іншай вёскі дзед і маміна сястра. Яны знайшлі мяне ў яме, паклалі на тачку. Тачка падскоквае, мне балюча, я хачу крычаць, а ў мяне няма голасу. Я мог толькі плакаць…

Доўга не размаўляў. Сем гадоў… Штосьці шаптаў, але ніхто не мог разабраць маіх словаў. Праз сем гадоў пачаў адно слова вымаўляць добра, другое… Сам сябе слухаў…

Там, дзе быў наш дом, дзед сабраў у кошык костачкі. Поўнага кошыка нават не было…

Вось расказаў… І гэта ўсё? Усё, што засталося ад такога жаху? Некалькі дзясяткаў словаў…

## «КАЦЯНЯТАЎ ЯНЫ ВЫНЕСЛІ З ХАТЫ...»

*Тоня Рудакова, 5 гадоў.*
*Цяпер — загадчыца дзіцячага садка.*

Першы год вайны... Памятаю мала...

Прыехалі немцы раніцай, яшчэ на дварэ было шэранька. Паставілі ўсіх на лужку, і ўсім, хто стрыжаны, сказалі: «Выходзьце!» А стрыжанымі былі ваеннапалонныя, якіх людзі дамоў забралі. Адвезлі іх да лесу і расстралялі.

Да таго мы бегалі за вёску. Гулялі каля лесу. А тут страх ахапіў.

Памятаю, як напякла мама хлеба. Шмат хлеба напякла: на лаўках, на стале, на падлозе на ручніках ляжаў, у сенцах. Я здзіўлялася:

— Мама, навошта нам столькі хлеба? Дзядзькаў пастралялі. Каго ты будзеш карміць?

Яна прагнала мяне на вуліцу:

— Ідзі да дзяцей...

Я баялася, што маму заб'юць, і ўвесь час услед за ёй бегала.

Ноччу хлеб забралі партызаны. І ніколі больш я столькі хлеба не бачыла. Немцы падскрэблі па хатах усё, галадалі мы. Я ж не разумела... Прасіла маму:

— Распалі печ і напячы хлеба. Шмат-шмат...

Гэта ўсё, што я памятаю з першага года вайны...

Напэўна, я падрасла, бо далей памятаю болей. Як нашу вёску палілі... Спачатку нас расстралялі, а потым спалілі. Я вярнулася з таго свету...

На вуліцы яны не стралялі, а заходзілі ў хаты. Стаім усе каля вакна:

— Вунь Аніську пайшлі расстрэльваць…

— У Аніські скончылі. Да цёткі Анфісы ідуць…

І мы стаім, мы чакаем — прыйдуць і нас расстраляюць. Ніхто не плача, ніхто не крычыць. Стаім. У нас была суседка са сваімі хлопчыкамі, яна кажа:

— Пойдземце на вуліцу. На вуліцы не расстрэльваюць.

Заходзяць яны ў двор: першы — салдат, другі — афіцэр. Афіцэр высокі, боты ў яго высокія, высокая фуражка. Добра памятаю…

Сталі заганяць нас у хату. Суседка ўпала на траву і цалуе афіцэру боты:

— Не пойдзем. Ведаем — там страляць будзеце.

Яны: «Цурук! Цурук!», гэта значыць — назад. У хаце мама села на лаўку каля стала. І я запомніла, што яна ўзяла кружку з малаком, стала нашага маленькага карміць. А так ціха, што мы ўсе чуем, як ён чмокае.

Я села ў куточку, паперадзе сябе венік паставіла. На стале быў доўгі абрус, суседскі хлопчык пад стол схаваўся. Пад абрус. Брат пад ложак залез. А суседка каля парогу на калені стала і за ўсіх просіць:

— Паночку, у нас дзеткі маленькія. Паночку, у нас дзетак, што гароху…

Вось я запомніла, як яна прасіла. Прасіла доўга.

Афіцэр падышоў да стала, падняў абрус і стрэліў. Адтуль — крык, ён яшчэ раз стрэліў. Суседскі хлопчык крычыць… Разоў пяць страляў…

Глядзіць на мяне… Як я ні стараюся схавацца за венік, ніяк не схаваюся. У яго такія прыгожыя вочы… Трэба ж, памятаю… Я так спалохалася, што ад страху спытала: «Дзядзечка, вы мяне забіваць будзеце?» Але ён

нічога мне не адказаў. Якраз у гэты час выходзіць з іншага пакою салдат, ну як выходзіць… сарваў вялікую занавеску паміж пакоямі і ўсё. Кліча афіцэра, паказвае — на ложку ляжаць маленькія кацяняты. Коткі няма, кацяняты адны. Яны бяруць іх на рукі, усміхаюцца, пачалі з імі гуляць. Пагуляліся, і афіцэр аддае іх салдату, каб ён вынес на вуліцу. Кацянятаў яны вынеслі з хаты…

Памятаю, як гарэлі ў забітай мамы валасы… А ў маленькага каля яе — пялюшкі… Мы перапаўзлі праз іх са старэйшым братам, я трымалася за ягоную калашыну: спачатку ў двор, потым у агарод, да вечару хаваліся ў бульбе. Увечары запаўзлі ў кусты. І тут я заплакала…

Якім чынам мы засталіся жывымі? Не памятаю… Жывымі засталіся мы з братам і чатыры кацяняты. Прыйшла наша бабуля, яна жыла за рэчкай. Забрала нас усіх…

## «ЗАПОМНІ: МАРЫУПАЛЬ, ПАРКАВАЯ 6...»

*Саша Салянін, 14 гадоў.*
*Цяпер — інвалід вайны першай групы.*

Як не хацелася паміраць... Асабліва не хочацца паміраць на досвітку...

Нас вядуць на расстрэл. Вядуць хутка. Немцы кудысьці спяшаюцца, гэта я зразумеў з іхнае размовы. Да вайны любіў урокі нямецкай мовы. Нават сам вывучыў на памяць некалькі вершаў Гейнэ. Нас трое: двое ваеннапалонных — два старэйшыя лейтэнанты і я. Хлопчык... Мяне злавілі ў лесе, калі я зброю збіраў. Некалькі разоў уцякаў, але ўрэшце злавілі.

Паміраць не хочацца...

Мне шэпчуць:

—Уцякай! Мы кінемся на канвойных, а ты скачы ў кусты.

—Не буду ўцякаць...

—Чаму?

—Буду з вамі.

Я хацеў загінуць разам з імі. Як салдат.

—Загадваем: уцякай! Каб жыць!

Адзін, Даніла Рыгоравіч Іярданаў, быў з Марыупаля... Другі, Аляксандр Іванавіч Ільінскі, — з Бранску...

—Запомні: Марыупаль, Паркавая 6... Запомніў?

—Бранск, вуліца... Запомніў?

Пачалі страляць...

Пабег... Я бег... У галаве ў мяне стукала: як так... запомніць... так-так-так... запомніць... І ад страху забыўся.

Я забыўся назву вуліцы і нумар дома ў Бранску...

## «Я ЧУЛА, ЯК У ЯГО СПЫНІЛАСЯ СЭРЦА...»

*Лена Аронава, 12 гадоў.*
*Цяпер — юрыстка.*

Наш горад раптам стаў ваенным. Наш ціхі і зялёны Гомель...

Бацькі вырашылі адправіць мяне ў Маскву, там у вайсковай акадэміі вучыўся мой брат. Усе лічылі, што Маскву ніколі не захопяць, гэта непераможная крэпасць. Ад'язджаць я не хацела, але бацькі пераканалі, бо, калі нас бамбілі, я нічога не ела цэлымі днямі, у мяне сілай упіхвалі ежу. Заўважна схуднела. Мама вырашыла, што ў Маскве спакойна, у Маскве добра. І там я папраўлюся. А яны з татам прыедуць, як толькі вайна скончыцца. Вельмі хутка.

Цягнік да Масквы не дайшоў, высадзілі нас у Малаяраслаўцы. На вакзале быў міжгародні тэлефон, я ўсё бегала, хацела датэлефанавацца да брата, каб даведацца, што мне рабіць далей. Датэлефанавалася, брат сказаў: «Сядзі і чакай, я па цябе прыеду». У трывозе прайшла ноч, людзей было вельмі шмат, раптам аб'явілі: праз паўгадзіны адпраўляецца цягнік на Маскву, сядайце. Я сабрала рэчы і пабегла да цягніка, залезла на верхнюю паліцу і заснула. Калі прачнулася, цягнік стаяў каля невялікай рачулкі, жанчыны штосьці мылі ў ёй... «Дзе Масква?» — здзівілася я. Адказалі, што нас вязуць на Усход...

Выйшла я з вагона і заплакала з крыўды, з адчаю. І — о! Мяне ўбачыла Дзіна, гэта была мая сяброўка, з Го-

меля мы выязджалі разам, нас разам нашы мамы праводзілі, а ў Малаяраслаўцы мы згубіліся. Цяпер нас зноў стала двое. І мне ўжо не так страшна. На станцыях нам прыносілі ежу да цягніка: бутэрброды, малако ў бітонах на вазах, адзін раз нават суп прывезлі.

У Кустанайскай вобласці на станцыі Джаркуль нас высадзілі. Першы раз мы з Дзінай ехалі на возе. Адна адну супакойвалі, што прыедзем і адразу напішам дамоў. Я казала: «Калі наш дом не разбамбяць, дык бацькі атрымаюць нашы лісты, а калі разбамбяць, дык куды ж мы напішам?» Мама мая была галоўным урачом дзіцячай бальніцы, а тата — дырэктарам рамеснай вучэльні. Тата мой быў чалавек мірны, выгляд у яго ўвесь настаўніцкі, калі ён першы раз прыйшоў з працы з пісталетам (ім выдалі пісталеты), ён адзеў кабуру на цывільны пінжак, я спалохалася. Ён, мне здаецца, таксама яго баяўся, асцярожна здымаў увечары і клаў на стол. Жылі мы ў вялікім доме, аднак вайскоўцаў у ім не было, я раней ніколі не бачыла зброі. Мне здавалася, што пісталет сам пачне страляць, што ў нашым доме ўжо жыве вайна. Вось здасць тата пісталет, тады вайна закончыцца.

Былі мы з Дзінай дзяўчаткі гарадскія, нічога не ўмелі. Прыехалі, а на наступны дзень нас паслалі на працу ў поле, цэлы дзень прастаялі сагнутыя. У мяне закружылася галава, і я ўпала. Дзіна нада мною плакала, але не ведала, як дапамагчы. Было сорамна: мясцовыя дзяўчаткі нормы выконваюць, мы дойдзем да паловы поля, а яны ўжо недзе далёка. Самае жахлівае, калі мяне паслалі даіць карову, далі ў рукі даёнку, а карову я ніколі не даіла, баялася да яе падысці.

Аднойчы хтосьці прыехаў са станцыі і прывёз газеты. Там мы прачыталі, што Гомель узяты, і вельмі плакалі з Дзінай. Раз Гомель узяты, значыць, загінулі нашы

бацькі, а нам трэба ісці ў дзіцячы дом. Пра дзіцячы дом я і чуць не хацела, думала шукаць брата. Але па нас прыехалі бацькі Дзіны, яны нейкім цудам нас адшукалі. Бацька ейны працаваў галоўным урачом у горадзе Саракташ Чкалаўскай вобласці. На тэрыторыі бальніцы была невялікая хатка, і там мы жылі. Спалі на драўляных нарах з дошак. Матрац набілі саломай. Вельмі пакутавала я з-за свае доўгае касы — ніжэй каленяў. Абрэзаць касу я не магла без мамінага дазволу. У мяне была надзея, што мама ўсё-ткі ёсць, яна знойдзе мяне. Мама любіла маю касу і будзе сварыцца. Калі я яе абрэжу.

Аднойчы… На досвітку… Так здараецца толькі ў казках, а яшчэ — на вайне. Пачуўся стук у вакно… Я паднялася: стаіць мая мама. І я губляю прытомнасць… Мама абрэзала мне касу і нацерла галаву газай ад вошай.

Мама ўжо даведалася, што татаву вучэльню эвакуявалі ў Навасібірск, і мы паехалі з ёю да таты. Там я пачала хадзіць у школу. Зранку мы вучыліся, а пасля паўдня хадзілі дапамагаць у шпіталь, у горад паступала шмат параненых, з фронту іх накіроўвалі ў тыл. Прынялі нас санітаркамі, мяне накіравалі ў хірургію. Самае цяжкае аддзяленне. Давалі нам старыя прасціны, мы рвалі іх на бінты, скручвалі, потым закладвалі ў боксы і вазілі на стэрылізацыю. Мылі старыя бінты, але часам з фронту прывозілі такія бінты, што выносілі іх кашамі і закопвалі ў двары. Яны ў крыві, гноі…

Расла я ў сям'і ўрача і да вайны марыла, што абавязкова буду ўрачом. У хірургію — дык у хірургію. Іншыя дзяўчаткі баяліся, а мне было ўсё роўна, толькі б дапамагаць, адчуваць сябе патрэбнай. Скончацца ўрокі, бяжым хутчэй у шпіталь, каб не спазніцца, прыйсці своечасова. Памятаю, што я некалькі разоў губляла прытомнасць. Размотваюць раны, усё прыліплае, параненыя

крычаць… Некалькі разоў мяне ванітавала ад паху бінтоў, бінты моцна пахлі, не лекамі, а… чымсьці такім… Незнаёмым, млосным… Смерцю… Я ўжо ведала пах смерці. Заходзіш у палату — паранены яшчэ жывы, але ты ўжо чуеш гэты пах… Шмат хто з дзяўчатак сыходзіў, не маглі гэтага выносіць. Яны шылі пальчаткі для фронту. Хто ўмеў — вязаў. А я не магла пайсці са шпіталю — як я пайду, калі ўсе ведаюць, што мая мама — доктарка?

Але я моцна плакала, калі параненыя паміралі. Яны паміраюць і клічуць: «Доктар! Доктар! Хутчэй!» Доктар прыбяжыць, а выратаваць не можа. У хірургіі параненыя цяжкія. Памятаю аднога лейтэнанта… Ён папрасіў у мяне грэлку. Паклала яму грэлку, ён схапіў мяне за руку… Не магу яе вырваць… Да сябе прыціскае. Трымаецца за мяне, з усіх сілаў трымаецца. Я чула, як у яго спынілася сэрца. Білася, білася і спынілася…

Я за вайну столькі ўсяго пабачыла… Больш, чым за ўсё жыццё…

## «УЦЁК НА ФРОНТ ЗА СЯСТРОЙ, СТАРШЫМ СЯРЖАНТАМ ВЕРАЙ РЭДЗЬКІНАЙ...»

*Мікалай Рэдзькін, 11 гадоў.*
*Цяпер — механік.*

У хаце стала ціха... Сям'я зменшылася...

Старэйшых братоў адразу прызвалі ў войска. Сястра Вера хадзіла і хадзіла ў ваенкамат і ў сакавіку сорак другога таксама пайшла на фронт. Засталіся дома толькі я і малодшая сястрычка.

У эвакуацыі прытулілі нас у сябе сваякі ў Арлоўскай вобласці. Я працаваў у калгасе, мужчынаў ужо не было, усе мужчынскія клопаты ляглі на плечы такіх, як я, падлеткаў. Замест мужчынаў мы — нам ад дзевяці да чатырнаццаці гадоў. Паехаў першы раз араць. Жанчыны сталі каля сваіх коней — і пагналі. Стаю, чакаю, што хто-небудзь прыйдзе і мяне навучыць, а яны адну баразну прайшлі, на другую павярнулі. А я — адзін. Давай сам, дзе каля баразны, дзе па ёй, так і прагнаў. З раніцы — у поле, а ноччу з хлопцамі едзем у начное. Коней пасвім. Адзін дзень так, другі... На трэці дзень араў, араў і зваліўся.

У сорак чацвёртым сястра Вера на адзін дзень заехала да нас са шпіталю пасля ранення. Раніцай павезлі яе да станцыі на возе, а я пабег услед за ёй. На вакзале салдат не пускаў мяне ў вагон: «Ты з кім, хлопчык?» Я не разгубіўся: «Са старшым сяржантам Верай Рэдзькінай».

Так мяне прапусцілі на вайну...

## «У ТОЙ БОК, АДКУЛЬ УЗЫХОДЗІЦЬ СОНЦА...»

*Валя Кажаноўская, 10 гадоў.*
*Цяпер — рабочая.*

Дзіцячая памяць... У дзіцячай памяці застаецца толькі страх ці штосьці добрае...

Дом наш стаяў непадалёк вайсковага шпіталя. Шпіталь бамбілі, я бачыла, як з вокнаў падалі параненыя з мыліцамі. Загарэўся наш дом... Мама скочыла ў агонь: «Я вазьму дзеткам адзенне».

Гарэў наш дом... Гарэла наша мама... Мы кінуліся за ёй, людзі адагналі нас, трымалі: «Дзеткі, мамы ўжо не ўратуеце». Куды беглі ўсе, туды і мы. Ляжаць мёртвыя... Стогнуць, просяць дапамогі параненыя. Але хто дапаможа? Мне — адзінаццаць гадоў, сястры — дзевяць. Мы з ёю згубіліся...

Сустрэліся ў дзіцячым доме ў Астрашыцкім Гарадку пад Мінскам. Да вайны нас сюды прывозіў тата ў піянерскі лагер. Прыгожая мясціна. З піянерскага лагеру немцы зрабілі дзіцячы дом. Усё знаёмае і чужое. Некалькі дзён адзін плач, адны слёзы: засталіся без бацькоў, згарэў наш дом. Выхавальніцы былі старыя, а парадкі — нямецкія. Праз год... думаю, што праз год... Сталі нас адбіраць, каб вывезці ў Германію. Адбіралі не па гадах, а па росце, і я, на няшчасце, была высокага росту, як тата, а сястрычка — як мама, маленькага. Падагналі машыны, вакол немцы з аўтаматамі, мяне загналі на машыну, сястра крычыць, яе адштурхоўваюць, пад ногі страляюць. Не пускаюць да мяне. Так нас разлучылі...

Вагон. Біткам набіты... Поўны вагон дзяцей, не было нікога старэйшага за трынаццаць гадоў. Першы раз спыніліся ў Варшаве. Ніхто нас не паіў і не карміў, толькі нейкі дзядок зайшоў з поўнымі кішэнямі згорнутых паперак, на якіх па-руску была напісаная малітва «Ойча наш». І даў кожнаму такую паперку.

Пасля Варшавы ехалі яшчэ два дні. Прывезлі на санітарны, відавочна, пункт. Распранулі ўсіх нагала, разам і хлопчыкаў і дзяўчатак, я плакала з сораму. Дзяўчаткі хацелі ў адзін бок, хлопчыкі — у другі, нас збілі ў адзін гурт, накіравалі шланг... Халодная вада... З нейкім незразумелым пахам, ніколі больш яго не чула, не ведаю, што там быў за дэзынфекцыйны сродак. Не звярталі ўвагі: вочы не вочы, рот не рот, вушы не вушы — правялі санапрацоўку. Потым раздалі паласатыя штаны і пінжакі кшталту піжамаў, на ногі — драўляныя сандалі, а на грудзіну прыкалолі жалезныя біркі «Ost».

Выгналі на вуліцу і пашыхтавалі, як на лінейку. Я думала, што нас кудысьці павядуць, у які-небудзь лагер, а ззаду шэпчуць: «Нас прадаваць будуць». Падышоў стары немец, выбраў разам са мною яшчэ траіх дзяўчынак, аддаў грошы і паказвае на воз з саломай: «Сядайце!»

Прывезлі ў нейкі маёнтак... Стаяў вялікі высокі дом, а вакол яго — стары парк. Пасялілі нас у хляве, на адной палове жылі дванаццаць сабакаў, на другой — мы. Адразу ж — на працу ў поле, збіраць камяні, каб плугі ды сеялкі не ламаліся. Камяні трэба было складваць роўненька, у адным месцы. А мы ў гэтых драўляных сандалях, мазалі абсыпалі ўсе ногі. Кармілі дрэнным хлебам і знятым малаком.

Адна дзяўчынка не вытрывала, памерла. Яе на конях адвезлі ў лес і проста так, без нічога, закапалі.

Драўляныя сандалі і паласатую піжаму прывезлі назад у маёнтак. Памятаю, што клікалі яе Воля.

Быў там стары-стары немец, карміў сабакаў. Ён вельмі кепска размаўляў па-руску, але размаўляў, стараўся нас падтрымаць: «Кіндэр, Гітлер капут. Рускі ком». Пойдзе ў куратнік, накрадзе ў шапку яек і схавае ў сваю скрынку з інструментамі — ён яшчэ цяслярыў у маёнтку. Возьме ў рукі сякеру і ідзе быццам бы працаваць, а сам паставіць скрынку каля нас і глядзіць па баках, махае рукамі, каб хутчэй з'елі. Яйкі вып'ем, а шкарлупінне закапаем.

Паклікалі нас два сербскія хлопчыкі, якія таксама працавалі ў гэтым маёнтку. Былі, як і мы, рабамі. Распавялі пра свой сакрэт… Прызналіся, што ў іх ёсць план: «Трэба ўцякаць, а то ўсе памрэм, як Воля. Закапаюць у лесе, а дзеравяшкі нашы ды піжамы назад прывязуць». Мы баяліся, але яны нас пераканалі. Было так… За маёнткам — балота, мы туды незаўважна раніцай прабраліся, а потым пабеглі. Беглі ў той бок, адкуль сонца ўзыходзіць, на ўсход.

Увечары ў кустах упалі ўсе і заснулі, стомленыя. Ранкам расплюшчылі вочы — цішыня, адныя жабы квакаюць. Усталі, расою ўмыліся і рушылі. Прайшлі зусім трохі і ўбачылі наперадзе шашу, трэба яе перайсці, насупраць — густы і прыгожы лес. Наша выратаванне. Адзін хлопчык папоўз, агледзеў шашу і паклікаў: «Сюды!» Мы на дарогу, а з лесу нам насустрач нямецкая машына з аўтаматчыкамі. Акружылі нас і сталі біць хлопчыкаў, таптаць.

У машыну іх кінулі мёртвых, а нас з дзяўчынкай пасадзілі побач. Сказалі, што ім добра, а вам яшчэ лепей будзе, рускія свінні. Па бірках нас пазналі, што мы ўсходнія. У нас такі страх, што мы нават не плакалі.

Прывезлі ў канцлагер. Там мы ўбачылі: на саломе сядзяць дзеці, а па іх поўзаюць вошы. Салому вазілі з палёў, якія пачыналіся адразу за калючым дротам з токам.

Кожную раніцу грымела жалезная засаўка, уваходзілі са смехам афіцэр і прыгожая жанчына, яна па-руску нам казала:

—Хто хоча кашы, хуценька станавіцеся па двое ў шэраг. Павядзём вас карміць…

Дзеці спатыкаліся, штурхаліся, кашы хацелі ўсе.

—Трэба толькі дваццаць пяць чалавек, — пералічвала жанчына. — Не сварыцеся, астатнія пачакайце да заўтра.

Я спачатку верыла, разам з маленькімі бегла, штурхалася, а потым пачала баяцца: «Чаму не вяртаюцца тыя, каго адводзяць карміць кашай?» Сядала пад самыя жалезныя дзверы пры ўваходзе, і, калі нас ужо было мала, жанчына ўсё роўна мяне не заўважала. Яна заўсёды стаяла і лічыла да мяне спінай. Як доўга гэта працягвалася, не скажу. Мне падаецца… Я тады страціла памяць…

Ні адной птушкі і нават жука я ў канцлагеры не бачыла. Марыла знайсці хоць бы чарвяка. Але яны там не жылі…

Чуем аднойчы: шум, крык, стральба. Грукае жалезная засаўка — у барак да нас урываюцца родныя салдаты з крыкам: «Дзеткі!» Бяруць нас на плечы, на рукі, па некалькі чалавек, бо мы ўжо нічога не важым. Цалуюць, абдымаюць, плачуць. Выносяць на вуліцу…

Мы бачым чорны комін крэматорыя…

Некалькі тыдняў нас лячылі, кармілі. У мяне пытаюць: «Колькі табе гадоў?» Я адказваю: «Трынаццаць…» «А мы думалі: восем». Калі падужэлі, павезлі нас у той бок, адкуль узыходзіць сонца.

Дадому…

## «БЕЛАЯ КАШУЛЯ Ў ЦЕМРЫ ДАЛЁКА СВЕЦІЦЦА...»

*Яфім Фрыдлянд, 9 гадоў.*
*Цяпер — намеснік дырэктара камбіната сілікатных вырабаў.*

Дзяцінства скончылася... З першымі стрэламі. Ува мне яшчэ жыло дзіцё, але ўжо побач з кімсьці іншым...

Да вайны я баяўся адзін заставацца ў кватэры, а тут страх прайшоў. Ні ў якіх маміных дамавікоў, што сядзяць за печчу, я ўжо не верыў, ды і яна не ўспамінала. З'язджалі з Хоцімска на возе, мама купіла кошык яблыкаў, паставіла каля нас з сястрой, і мы елі. Пачалася бамбёжка, у сястрычкі ў руках два прыгожыя яблыкі, мы сталі з-за іх біцца, яна не аддавала. Мама сварыцца: «Хавайцеся!» — а мы дзелім яблыкі. Біліся, пакуль я не папрасіў сястру: «Дай мне хоць бы адзін яблык, а то заб'юць нас і не пакаштую». Яна аддала адзін, самы прыгожы. І тут бамбёжка скончылася. Я не стаў есці шчаслівага яблыка.

Ехалі на возе, а паперадзе нас ішоў статак. Ад бацькі (да вайны ён быў у Хоцімску дырэктарам канторы для нарыхтоўвання жывёлы) мы ведалі, што гэта не звычайныя каровы, а племянны статак, які за вялікія грошы купілі за мяжой. Памятаю, як тата не мог мне патлумачыць, колькі гэта — вялікія грошы, пакуль не прывёў прыклад, што кожная карова каштуе, як трактар. Як танк. Раз танк, значыць, вельмі шмат. Бераглі кожную карову.

Паколькі я рос у сям'і заатэхніка, жывёлу любіў. Калі пасля чарговай бамбёжкі засталіся мы без воза, я ішоў папярэдзе статка, прывязаўшыся да быка Ваські. У яго ў носе было колца, за колца прывязаная вяроўка, а да канца вяроўкі я сябе прывязаў. Каровы доўга не маглі прывыкнуць да бамбёжак, яны былі цяжкія, не прыстасаваныя да вялікіх пераходаў, у іх трэскаліся капыты, яны страшна стамляліся. Пасля абстрэлу іх цяжка было сабраць. Аднак, калі выходзіў на дарогу бык, яны ўсе ішлі за ім. А бык слухаўся аднога мяне.

Маці ноччу памые дзе-небудзь маю белую кашулю… На світанку: «Пад'ём!» — крычыць старэйшы лейтэнант Турчын, які ўзначальваў абоз. Апранаю кашулю, бяру быка, і ідзем. Вось памятаю, што ўвесь час я быў у белай кашулі. У цемры яна свеціцца, далёка ўсім мяне бачна. Спаў побач з быком, пад ягонымі пярэднімі нагамі — так было цяплей. Васька ніколі не ўставаў першым, чакаў, калі я ўстану. Адчуваў, што побач з ім дзіцё, і ён можа зрабіць балюча. Я клаўся з ім і ніколі не хваляваўся.

Пешкам дайшлі да Тулы. Больш за тысячу кіламетраў. Тры месяцы ішлі, ішлі ўжо босымі, усё на нас парвалася. Пастухоў засталося мала. У кароў надзімалася вымя, не паспявалі іх выдойваць. Вымя баліць, карова спыняецца каля цябе і глядзіць. У мяне скурчвала рукі, за дзень выдойвалі па пятнаццаць-дваццаць кароў. Як цяпер бачу: ляжыць на дарозе карова з перабітай задняй нагой, з пасінелага вымя крапае малако. Яна глядзіць на людзей, чакае. Салдаты спыніліся — і за вінтоўкі: прыстрэліць, каб не пакутавала. Я папрасіў іх: «Пачакайце…»

Падыходжу і здойваю на зямлю малако. Карова ўдзячна ліжа мне плячо. «Ну, — падымаюся, — цяпер страляйце». А сам уцякаю, каб не бачыць…

У Туле даведаліся, што ўся прыгнаная намі жывёла пойдзе на мясакамбінат, падзець яе больш няма куды. Да горада падыходзяць немцы. Я апрануў белую кашулю і пайшоў развітацца з Васькам. Бык цяжка дыхаў мне ў твар…

…У траўні сорак пятага… Мы вярталіся дамоў. Пад'язджалі да Оршы, у гэты момант я стаў каля вакна. Падышла мама. Адчыніў вакно. Мама кажа: «Ты чуеш пах нашых балотаў?» Я плакаў рэдка, а тут зарумзаў. У эвакуацыі мне нават у сне бачылася, як косяць балотную траву, як збіраюць сена ў стажкі і як яно, трохі падсохлае, падвялае, пахне. Ні з чым не параўнальны родны пах балотнага сена. Мне здаецца, што толькі ў нас у Беларусі такі востры пах балотнага сена, ён пераследаваў мяне паўсюль. Я яго нават у сне чуў.

У дзень Перамогі выбег на вуліцу сусед дзядзька Коля і пачаў страляць уверх. Хлопчыкі акружылі яго:

— Дзядзька Коля, дайце я?

— Дзядзька Коля, дайце я?

Ён даваў усім. І я стрэліў упершыню…

## «НА ЧЫСТУЮ ПАДЛОГУ, ЯКУЮ Я ТОЛЬКІ ШТО ВЫМЫЛА...»

*Маша Іванова, 8 гадоў.*
*Цяпер — настаўніца.*

У нас была дружная сям'я. Усе любімыя...

Мой тата ваяваў у грамадзянскую. З таго часу хадзіў на мыліцах. Але ён узначаліў калгас, гаспадарка ў яго была перадавая. Калі я навучылася чытаць, ён паказваў мне выразкі з газеты «Правда», дзе пісалі пра наш калгас. Як лепшага старшыню, тату перад вайной пасылалі на з'езд калгаснікаў-ударнікаў і на сельскагаспадарчую выставу ў Маскву. Ён прывёз мне адтуль прыгожыя дзіцячыя кнігі і бляшанку з шакаладнымі цукеркамі.

Мы з мамай любілі нашага тату. Я яго моцна-моцна, а ён любіў нас. Мяне і маму. Магчыма, я прыхарошваю сваё дзяцінства? Аднак усё даваеннае ў памяці радаснае і светлае. Бо... Гэта было дзяцінства. Сапраўднае дзяцінства...

Запомніліся песні. З поля жанчыны вярталіся з песнямі. Сонца хаваецца за далягляд, а з-за гары даносіцца працяжнае:

Уже пора домой. Пора.
Уже вечерняя заря...

Я бягу насустрач песні — там мая мама, я чую ейны голас. Мама падхоплівае мяне на рукі, абдымаю яе моцна за шыю, саскокваю і бягу наперадзе, а песня даганяе,

яна запаўняе ўвесь свет вакол — і так весела, і так цудоўна!

Пасля такога шчаслівага дзяцінства... Раптам... Адразу — вайна!

У першыя дні тата пайшоў... Яго пакінулі ў падполлі. Дома ён не жыў, бо яго ў нас ведалі ўсе. Ён прыходзіў да нас толькі ноччу.

Аднойчы пачула, як ён размаўляў з мамай:

—Падарвалі нямецкую машыну на шашы каля...

Я закашляла на печы, бацькі спалохаліся.

—Пра гэта ніхто не павінен ведаць, дачушка, — папярэдзілі яны мяне.

Я пачала баяцца ночы. Тата прыйдзе да нас, а фашысты даведаюцца і забяруць нашага тату, якога я так люблю.

Увесь час чакала яго. Залазіла ў самы далёкі кут нашай вялікай печы, абдымала бабулю, але баялася заснуць, калі засынала, дык часта прачыналася. У коміне вые завея, юшка дрыжыць і пазвоньвае. У мяне думка: не праспаць бы тату.

Раптам мне пачынае здавацца, што гэта не завіруха вые, а плача мама. У мяне гарачка. Тыфус.

Позна ноччу прыйшоў тата. Першай пачула яго я і паклікала бабулю. Тата быў халодны, а я гарэла, ён сядзеў каля мяне і не мог сысці. Стомлены, пастарэлы, але такі свой, такі родны. Нечакана ў дзверы пагрукалі. Гучна пагрукалі. Тата нават кажуха не паспеў накінуць, у хату ўварваліся паліцаі. Выштурхалі яго на вуліцу, я — за ім, ён працягнуў да мяне рукі, але яго ўдарылі аўтаматам па руках. Білі па галаве. Босая я бегла за ім па снезе да самай рэчкі і крычала: «Татачка! Татачка...» Дома галасіла бабуля: «А дзе ж Бог? Куды ён хаваецца?»

Тату забілі...

Бабуля не змагла перажыць такога гора. Плакала ўсё цішэй і цішэй і праз два тыдні памерла ноччу на печы, а побач спала я і абдымала яе, мёртвую. У хаце нікога больш не было, мама з братам хаваліся ў суседзяў.

Пасля татавай смерці мама таксама стала зусім іншай. З хаты нікуды не хадзіла. Гаварыла толькі пра тату, хутка стамлялася, а да вайны была стаханаўкай, усюды самай першай. Мяне яна не заўважала, а я ўвесь час старалася трапіць ёй на вочы. Чым-небудзь яе парадаваць. Але яна ажывала толькі тады, калі мы згадвалі тату.

Памятаю, як прыбеглі шчаслівыя бабы:

—З суседняй вёскі прыслалі на кані хлопчыка — вайна скончылася. Хутка нашы мужчыны пачнуць вяртацца.

Мама ўпала на чыстую падлогу, якую я толькі што вымыла…

## «А ЦІ ГЛЯДЗЕЎ НА ГЭТА БОГ? І ШТО ЁН ДУМАЎ...»

*Юра Карповіч, 8 гадоў.*
*Цяпер — шафёр.*

Я бачыў тое, чаго нельга бачыць... Чалавеку нельга. А я быў маленькі...

Я бачыў, як салдат бяжыць і нібыта спатыкаецца. Падае. Доўга драпае зямлю, абдымае яе...

Я бачыў, як гналі праз вёску нашых ваеннапалонных. Доўгія калоны. У рваных і абпаленых шынялях. Там, дзе яны спыняліся на ноч, была абгрызеная кара з дрэваў. Замест ежы ім кідалі дохлага каня. Яны разрывалі яго.

Я бачыў, як ноччу пайшоў пад адхон і згарэў нямецкі эшалон, а раніцай паклалі на рэйкі ўсіх, хто працаваў на чыгунцы, і пусцілі па іх паравоз...

Я бачыў, як запрагалі ў брычкі людзей. У іх былі жоўтыя зоркі на спіне. Іх паганялі пугамі. Весела ездзілі.

Я бачыў, як у маці штыкамі выбівалі з рук дзяцей. І кідалі ў агонь. У студню... А да нас з мамай чарга не дайшла...

Я бачыў, як плакаў суседскі сабака. Ён сядзеў на папялішчы суседскай хаты. Адзін. У яго былі вочы старога чалавека...

А я быў маленькі...

Я вырас з гэтым... Я вырас змрочным і недаверлівым, у мяне цяжкі характар. Калі хтосьці плача, мне не шкада, а, наадварот, лягчэй, бо сам я плакаць не ўмею.

Два разы жаніўся, і два разы ад мяне сыходзілі жонкі, ніхто доўга не вытрымліваў. Мяне цяжка кахаць. Я ведаю... Я сам ведаю...

Прайшло шмат гадоў... Цяпер я хачу спытаць: а ці глядзеў на гэта Бог? І што ён думаў...

## «А БЕЛЫ СВЕТ — НЕНАГЛЯДНЫ...»

*Людміла Ніканорава, 12 гадоў.*
*Цяпер — інжынерка.*

Хачу прыгадаць... Ці размаўлялі мы да вайны пра вайну?

Па радыё гучалі песні: «Если завтра война» і «Броня крепка, и танки наши быстры». Дзецям можна было спакойна засынаць...

Жыла наша сям'я ў Варонежы. Горад майго дзяцінства... У школах шмат настаўнікаў са старой інтэлігенцыі. Высокая музычная культура. Дзіцячы хор нашай школы, дзе я спявала, меў вялікую папулярнасць у горадзе. Па-мойму, усе любілі тэатр.

Наш дом насялялі сем'і вайскоўцаў. Дом чатырохпавярховы з калідорнай сістэмай, у двары ўлетку цвіла духмяная акацыя. У скверыку перад домам мы шмат гулялі, там было дзе схавацца. Мне дужа пашанцавала з бацькамі. Тата — кадравы вайсковец. Вайсковая форма ўсё дзяцінства ў мяне перад вачыма. У мамы — мяккі характар, залатыя рукі. Я — адзіная дачка. Як і павінна быць у такім выпадку, я настойлівая, капрызная і сарамлівая адначасова. Займаюся музыкай і харэаграфіяй пры Доме Чырвонай Арміі. Кожную нядзелю — адзіны дзень, калі ён не заняты, — тата любіў з намі гуляць па горадзе. Нам з мамай трэба было ісці злева, бо тата ўвесь час вітаў сустрэчных вайскоўцаў. Браў пад казырок.

Яшчэ ён любіў чытаць са мною вершы, асабліва Пушкіна:

> Учись, мой сын: наука сокращает
> Нам опыты быстротекущей жизни.

Той чэрвеньскі дзень… Я ў прыгожай сукенцы прыйшла з сяброўкай у сад Дома Чырвонай Арміі на спектакль, пачатак якога быў прызначаны на дванаццаць гадзінаў дня. Бачым: усе слухаюць рэпрадуктар, прымацаваны на слупе. Твары разгубленыя.

—Чуеш, вайна! — кажа сяброўка.

Імчу дамоў. Ірванула дзверы. У кватэры ціха, мамы дома няма, тата засяроджана голіцца перад люстэркам. Я ўбачыла ягоныя вочы з незнаёмым мне выразам. Памятаю, што рэпрадуктар на сцяне быў выключаны. Гэта ўсё, што ён мог зрабіць, каб адцягнуць ад нас з мамай хвіліну страшнага паведамлення.

Жыццё імгненна змянілася… Я зусім не памятаю таты дома ў гэтыя дні. Стаў іншым побыт. Праводзіліся агульныя сходы жыхароў: як тушыць пажар, калі загарыцца дом, як завешваць вокны на ноч — горад павінен быць без агнёў. Зніклі з прылаўкаў прадукты, з'явіліся харчовыя карткі.

І вось надышоў той апошні вечар. Ён быў позні, да гэтага часу ў доме зачыняліся ўсе дзверы, апроч парадных, каб выйсці ў двор, нам давялося з першага паверха падняцца на другі, прайсці доўгім калідорам і зноў спусціцца. На вуліцы цёмна, і наш заўсёды ўважлівы тата сказаў:

—Далей праводзіць мяне не трэба.

Абняў нас:

—Усё будзе добра. Не хвалюйцеся, дзяўчаткі.

І пайшоў.

З фронту ён даслаў некалькі лістоў: «Хутка пераможам, тады зажывём па-іншаму. Як паводзіць сябе наша Людмілачка?» Не магу прыгадаць, чым была занятая я да першага верасня. Вядома, засмучала маму тым, што, не спытаўшы, сыходзіла надоўга да сяброўак. Паветраная трывога стала, можна сказаць, прывычнай. З ёй усе хутка звыкліся: не спускаліся ў бамбасховішчы, а сядзелі па кватэрах. Мяне не раз бамбёжка заспявала на вуліцах у цэнтры. Забягала ў краму ці пад'езд — і ўсё.

Хадзіла шмат чутак. Але яны не засталіся ў памяці. У маёй дзіцячай галаве… Мама дзяжурыла ў шпіталі. Кожны дзень прыбывалі цягнікі з параненымі.

Што дзіўна — на прылаўках зноў з'явіліся тавары, людзі іх куплялі. Некалькі дзён мы з мамай вырашалі: ці не купіць нам новае піяніна? Вырашылі пакуль не набываць, пачакаць тату. Усё-ткі вельмі вялікая пакупка.

Розуму недаступна, але мы пачалі вучобу ў школе, як звычайна, першага верасня. А ад таты ўвесь жнівень — ні слова. Верым і чакаем, хоць ведаем ужо такія словы, як «акружэнне» і «партызаны». У канцы месяца аб'явілі: быць гатовымі ў любы момант да эвакуацыі. Дакладны дзень даведаліся, здаецца, за суткі. Мамам хапіла… Усё роўна мы былі ўпэўненыя, што з'язджаем на пару месяцаў, перасядзім дзе-небудзь у Саратаве і вернемся. Клунак — пасцель, клунак — посуд і чамадан з адзеннем. Мы гатовыя.

У дарозе запомніла такі малюнак: без свістка цягнік наш адыходзіць, хапаем каструлі з вогнішчаў, няма часу патушыць агонь — едзем, і ўздоўж насыпу — ланцужкі агеньчыкаў. Эшалон дайшоў да Алма-Аты, потым вярнуўся ў Чымкент. І так некалькі разоў — туды-сюды. Нарэшце, на марудлівых валах, запрэжаных у мажары

(вазы), прыехалі мы ў аул. Упершыню ўбачыла кібітку… Як ва ўсходняй казцы… Усё каляровае, незвычайнае. Мне цікава.

Але калі заўважыла ў мамы першы сівы волас — анямела. Я пачала імкліва сталець. Маміны рукі! Я не ведаю, чаго яны не ўмелі. Як мама здагадалася ўзяць у апошні момант швейную машынку (без кораба, у падушцы) і кінуць у машыну, якая ад'язджала да эшалона. Машынка — наша карміліца. Начамі мама схітралася шыць. Ці спала ўвогуле мая мама?

А на даляглядзе — снежныя вяршыні Цянь-Шаню. Вясною стэп, чырвоны ад цюльпанаў, а ўвосень — гронкі вінаграду, дыні. Але як гэта купіць?! І вайна! Мы шукалі нашага татачку! За тры гады напісалі яму тры дзясяткі запытаў: штаб арміі, палявая пошта нумар сто шаснаццаць, наркамат абароны, ГУК — Галоўнае ўпраўленне кадраў Чырвонай Арміі ў Бугуруслане… Адусюль прыходзіў адказ: «У спісах забітых, параненых не значыцца…» Калі не значыцца — чакаем і чакаем, спадзяемся.

Радыё пачало паведамляць радасныя звесткі. Нашы войскі вызваляюць адзін горад за другім. Вось і Орша вызваленая. Гэта — радзіма мамы. Там бабуля, маміны сёстры. Вызвалены Варонеж… Але Варонеж без таты нам чужы. Спісаліся і едзем да бабулі. Ехалі заўсёды ў тамбуры — трэба было здалець зайсці ў вагон. Пяць сутак у тамбуры…

Маё любімае месца ў бабулінай хаце — за цёплай печчу. У школе сядзім у паліто, шмат у каго з дзяўчатак паліто перашытае з шыняля, у хлопчыкаў — проста шынялі. Раніцай чую з рэпрадуктара: перамога! Мне пятнаццаць гадоў… Я апранаю перадваенны падарунак таты — ваўняную (гарусную) кофтачку і новенькія

туфлі на абцасах і іду ў школу. Мы зберагглі гэтыя рэчы, яны былі купленыя навырост, вось я і дарасла.

Увечары сядзім за сталом, на стале перад намі татава фотакартка і патрыманы томік Пушкіна… Гэта ягоны падарунак нявесце — маме. Я згадваю, як мы з татам чыталі разам вершы і як ён, калі яму што-небудзь асабліва падабалася, казаў: «А белы свет — ненаглядны». Ён заўсёды паўтараў гэтыя словы ў добрыя хвіліны.

Такога любімага тату я не магу ўявіць не жывым…

# «ПРЫНОСІЛІ ДОЎГІЯ ВУЗКІЯ ЦУКЕРКІ... ПАДОБНЫЯ ДА АЛОЎКАЎ...»

*Леаніда Белая, 3 гады.*
*Цяпер — прасавальніца.*

Ці запамінае што-небудзь дзіцё ў тры гады? Я вам адкажу...

Тры-чатыры малюнкі я запомніла зусім дакладна.

...За хатай на лузе нейкія дзядзькі займаюцца гімнастыкай, купаюцца ў рэчцы. Пырскаюцца, крычаць, смяюцца, ганяюцца адзін за адным, як нашы вясковыя хлапчукі. Толькі да тых мама мяне пускала, а тут спалохана крычыць і не дазваляе выходзіць з хаты. На маё пытанне: «Хто гэтыя дзядзькі?» — са страхам адказвае: «Немцы». Іншыя дзеці бегалі да рэчкі і прыносілі доўгія вузкія цукеркі... Частавалі мяне...

Гэтыя ж дзядзькі ўдзень маршыруюць па нашай вуліцы. Перастралялі ўсіх сабакаў, бо тыя на іх брахалі.

Пасля гэтага мама забараніла мне з'яўляцца на вуліцы ўдзень. Разам з катом мы сядзелі дома.

...Кудысьці бяжым... Раса халодная. У бабулі мокрая спадніца да пояса, а ў мяне і сукенка мокрая, і галава. У лесе хаваемся, я сохну ў бабуліным пінжаку, сукенка сушыцца.

Нехта з суседзяў залез на дрэва. Я чую: «Гарыць... Гарыць... Гарыць...» Адное слова...

...Вяртаемся ў вёску. Замест хат — чорныя галавешкі. Там, дзе жылі нашы суседзі, знаходзім грабянец. Я пазнаю гэты грабянец, суседская дзяўчынка, яе клікалі

Анютка, мяне ім расчэсвала. Мама не можа мне адказаць: дзе яна і дзе яе мама? Чаму яны не вяртаюцца? Мая мама трымаецца за сэрца. А я памятаю, як Анютка прыносіла мне ад дзядзькоў, якія весела купаліся ў рэчцы, доўгія вузкія цукеркі. Такія доўгія, як алоўкі... Вельмі смачныя, мы такіх не ведалі... Яна была прыгожая, ёй заўсёды давалі шмат цукерак. Больш за ўсіх.

Ноччу засоўваем ногі ў попел, каб сагрэцца і заснуць. Попел цёплы, мяккі...

## «СКРЫНКА БЫЛА ЯКРАЗ ЯМУ ПА РОСЦЕ...»

*Дуня Голубева, 11 гадоў.*
*Цяпер — даярка.*

Вайна... А араць трэба...

Мама, сястра і брат паехалі ў поле. Лён сеяць. Яны паехалі, а праз гадзіну, больш не прайшло, бягуць жанчыны:

—Тваіх, Дуня, пастралялі. На полі ляжаць...

Мама на меху ляжала, а з меху зерне сыпалася. Гэтак шмат-шмат было дзірачак ад куль...

Засталася я адна з маленькім сваім пляменнікам. Мая сястра нядаўна нарадзіла, а муж ейны быў у партызанах. Вось з гэтым хлопчыкам...

Карову даіць не ўмею. Яна раве ў хляве, адчувае, што гаспадыні няма. Сабака ўсю ноч вые. І карова...

Маленькі да мяне лезе... Цыцкі просіць... Малака... Я ўспомніла, як сястра яго карміла... Адцягну яму смочак, ён цмокае, цмокае і засне. Дзе ён прастудзіўся? Як захварэў? Сама малая, што я разумела? Кашляе, кашляе. Есці няма чаго. Кароўку паліцаі забралі.

І хлопчык памёр. Стагнаў-стагнаў і памёр. Чую: ціха стала. Падняла пялюшкі, ён чорны ляжыць, толькі тварык белы, чысты застаўся. Белы тварык, а сам увесь чорны.

Ноч. Цёмныя вокны. Куды мне ісці? Буду чакаць раніцы, ранкам людзей паклічу. Сяджу і плачу, што нікога ў хаце няма, нават гэтага маленькага хлопчыка. Пачало світаць, паклала я яго ў скрынку... Захавалася

ў нас дзедава скрынка, дзе ў яго інструменты ляжалі, невялікая скрынка, як пасылачка. Баялася, што прыйдуць каты, пацукі, абгрызуць. Ён такі маленькі ляжыць, яшчэ меншы, чым жывы. У чысты ручнічок загарнула. Ільняны. І пацалавала.

Скрынка была якраз яму па росце…

## «БАЯЛАСЯ ЎБАЧЫЦЬ ГЭТЫ СОН...»

*Лена Старавойтава, 5 гадоў.*
*Цяпер — тынкоўшчыца.*

У мяне застаўся сон... Адзін сон...

Мама апранула сваё зялёнае паліто, боты, загарнула ў цёплую коўдру шасцімесячную сястрычку. І пайшла. Я сядзела і чакала каля вакна, калі яна вернецца. Раптам бачу: вядуць па дарозе некалькі чалавек, і сярод іх мая мама з сястрычкай. Каля нашага дома мама павярнула галаву і паглядзела ў вакно. Не ведаю: убачыла яна мяне ці не? Фашыст ударыў яе прыкладам... Ударыў так, што яна сагнулася...

Увечары прыйшла цётка, маміна сястра... Яна моцна плакала, яна ірвала на сабе валасы, а мяне называла «сіротка», «сірацінaчка». Я чула гэтыя словы ўпершыню...

Ноччу мне прысніўся сон, быццам мама паліць у печы, агонь ярка гарыць, і плача мая сястрычка. Мама мяне кліча... А я недзе далёка і не чую. Я ў жаху прачыналася: мама мяне кліча, а я не адгукаюся. Мама плакала ў сне... Я не магла сабе дараваць, што яна плача. Мне доўга сніўся гэты сон... Заўсёды адзін і той жа. Я хацела і... баялася яго ўбачыць...

У мяне нават фотакарткі мамінай няма. Адзін гэты сон... Я нідзе больш не магу маму ўбачыць...

## «Я ХАЦЕЛА БЫЦЬ АДНА Ў МАМЫ... І КАБ МАМА МЯНЕ ПЕСЦІЛА...»

*Марыя Пузан, 7 гадоў.*
*Цяпер — рабочая.*

Даруйце, калі я гэта прыгадваю... Не магу... Я... Я не магу глядзець у вочы іншаму чалавеку...

Выгналі з хлява калгасных кароў, а туды заштурхалі людзей. І нашу маму. Мы з брацікам сядзелі ў кустах, яму два годзікі, ён не плакаў. І сабака наш з намі сядзеў.

Раніцай прыйшлі дамоў, хата стаіць, а мамы няма. І людзей нікога няма. Адны мы засталіся. Я іду па ваду, трэба печ паліць, брацік есці хоча. На асверы віселі нашы суседзі. Павярнула ў іншы канец вёскі, там крынічная студня была, самая лепшая вада. Самая смачная. І там людзі вісяць. З пустымі вёдрамі вярнулася. Брацік плакаў, бо галодны: «Хлеба дай. Дай скарыначку». Адзін раз я яго ўкусіла, каб не плакаў.

Так мы жылі некалькі дзён. Адны ў вёсцы. Людзі ляжалі і віселі мёртвыя. Мы мёртвых не баяліся, гэта ўсё былі знаёмыя людзі. Потым сустрэлі чужую жанчыну, пачалі плакаць: «Будзем з вамі жыць. Адным страшна». Яна пасадзіла нас на саначкі і павезла ў сваю вёску. У яе былі два хлопчыкі і нас двое. Жылі так, пакуль не прыйшлі нашы салдаты.

...У дзіцячым доме мне падаравалі памаранчавую сукенку, з кішэнькамі. Так любіла яе, што ўсіх прасіла: «Калі памру, пахавайце ў гэтай сукенцы». Мама памерла, тата памёр, і я хутка памру. Доўга-доўга чакала, калі

памру. Заўсёды плакала, калі чула слова «мама». Аднойчы, калі на мяне за нешта пасварыліся і паставілі ў кут, я ўцякла з дзіцячага дома. Некалькі разоў уцякала шукаць маму.

Дня нараджэння свайго я не памятала... Сказалі: выберы сама любы дзень, які хочаш. Ну, які табе спадабаецца. А я любіла майскія святы. Але, думаю, ніхто не паверыць, калі я скажу, што нарадзілася Першага мая, і другога — не паверыць, а калі скажу трэцяга мая, дык гэта будзе падобным да праўды. Імяніннікаў аб'ядноўвалі па кварталах, рабілі нам святочны стол з цукеркамі ды гарбатай, дарылі падарункі: дзяўчаткам што-небудзь на сукенку, хлопчыкам — кашулі. Адзін раз у дзіцячы дом прыйшоў незнаёмы дзядуля і прынёс шмат вараных яек, раздаваў усім і радаваўся, што робіць нам прыемнае. Якраз на мой дзень нараджэння...

Я ўжо была вялікая, але сумавала без цацак. Калі клалася спаць і ўсе засыналі, выцягвала з падушкі пёркі і разглядвала іх. Гэта была мая любімая гульня. Калі хварэла, ляжала і марыла пра маму. Я хацела быць адна ў мамы... І каб мама мяне песціла.

Доўга не расла... Мы ўсе ў дзіцячым доме кепска раслі. Я думаю, што, напэўна, ад самоты. Мы не раслі таму, што мала чулі ласкавых словаў. Без мам не раслі...

## «А ЯНЫ НЕ ТАНУЛІ, ЯК МЯЧЫКІ...»

*Валя Юркевіч, 7 гадоў.*
*Цяпер — на пенсіі.*

Мама чакала хлопчыка... І тата хацеў хлопчыка. А нарадзілася дзяўчынка...

Аднак усе так хацелі хлопчыка... І я расла больш хлопчыкам, чым дзяўчынкай. Бацькі апраналі мяне ў хлапчуковае адзенне і падстрыгалі пад хлопчыка. Гульні мне падабаліся хлапечыя: «казакі-разбойнікі», «у вайну», «у ножыкі». «У вайну» асабліва падабалася мне гуляць. Я думала, што я смелая.

Пад Смаленскам наш вагон з эвакуяванымі разбамбілі цалкам. Мы неяк ацалелі, нас выцягнулі з-пад абломкаў. Дабраліся да вёскі, а там пачаўся бой. Сядзелі ў кагосьці ў склепе, абвалілася хата, нас засыпала. Калі бой заціх, сяк-так выпаўзлі са склепа, і першае, што я памятаю, — гэта машыны. Ішлі легкавыя машыны, а ў іх сядзелі і ўсміхаліся людзі ў чорных бліскучых дажджавіках. Я не магу пераказаць таго пачуцця, быў страх, і была нейкая хваравітая цікавасць. Яны праехалі па вёсцы і зніклі. Мы, дзеці, пайшлі глядзець, што адбываецца за вёскай. Калі выйшлі ў поле, гэта было нешта страшнае. Усё жытнёвае поле было... засеянае забітымі. Напэўна, я мела не дзявочы характар, бо не баялася глядзець на ўсё гэта, хоць бачыла ўпершыню. Яны ляжалі ў чорнай сажы, было іх так шмат, што не верылася, што гэта людзі ляжаць. Гэта было маё першае ўражанне ад вайны... Нашы чорныя салдаты...

Вярнуліся з мамай да сябе ў Віцебск. Дом наш быў разбураны, але бабуля нас чакала... Прытуліла нас усіх габрэйская сям'я, двое вельмі хворых і вельмі добрых старых. Мы ўвесь час баяліся за іх, бо ў горадзе ўсюды развешвалі аб'явы пра тое, што габрэі павінны з'явіцца ў гета, мы прасілі, каб яны нікуды не выходзілі з дома. Аднойчы нас не было... Я з сястрой недзе гуляла, а мама кудысьці пайшла. І бабуля... Калі вярнуліся, знайшлі цыдулачку, што гаспадары пайшлі ў гета, бо баяцца за нас, нам трэба жыць, а яны — старыя. Па горадзе начаплялі загадаў: рускія павінны здаваць габрэяў у гета, калі ведаюць, дзе яны хаваюцца. Інакш — таксама расстрэл.

Прачыталі гэтую цыдулачку і пабеглі з сястрою да Дзвіны, моста ў тым месцы не было, у гета людзей перавозілі на лодках. Бераг ачапілі немцы. На нашых вачах загружалі лодкі старымі, дзецьмі, на катары дацягвалі да сярэдзіны ракі і лодку перакульвалі. Мы шукалі, нашых старых не было. Бачылі, як села ў лодку сям'я: муж, жонка і двое дзяцей, калі лодку перакулілі, дарослыя адразу пайшлі на дно, а дзеці ўвесь час усплывалі. Фашысты, смеючыся, білі іх вёсламі. Яны ўдараць іх у адным месцы, тыя ўсплываюць у іншым, даганяюць і зноў б'юць. А яны не танулі, як мячыкі...

Стаяла цішыня, а можа, мне заклала вушы, і здавалася, што было ціха, усё замёрла. Раптам сярод гэтай цішыні пачуўся смех. Нейкі малады вантробны смех... Побач стаялі маладыя немцы, назіраючы ўсё гэта, яны смяяліся. Я не памятаю, як прыйшлі мы з сястрою дамоў, як я яе дацягнула. Тады, пэўна, вельмі хутка сталелі дзеці, ёй было тры гады, яна ўсё разумела, маўчала і не плакала.

Я баялася хадзіць па вуліцах, і нейк больш спакойна сябе адчувала, калі хадзіла сярод руінаў. Аднойчы ноччу ў дом уварваліся немцы і пачалі нас будзіць. Я спала

з сястрою, мама з бабуляй. Выгналі нас усіх на вуліцу, не далі нічога з сабою ўзяць, а гэта быў пачатак зімы, пагрузілі на машыны і павезлі да цягніка.

Алітус — так называўся літоўскі горад, у якім мы апынуліся праз некалькі тыдняў. На станцыі пашыхтавалі ў шэрагі і павялі, па дарозе мы сустрэлі літоўцаў. Яны, мабыць, ведалі, куды нас вядуць, адна жанчына падышла да мамы і кажа: «Вас вядуць у лагер смерці, дайце мне сваю дзяўчынку, я яе выратую. Калі застанецеся жывымі, знойдзеце». Сястра была прыгожанькая, усе яе шкадавалі. Але якая маці аддасць сваё дзіцё?

У лагеры ў нас адразу забралі бабулю. Сказалі, што старых пераводзяць у іншы барак. Мы чакалі, бабуля нейкім чынам паведаміць пра сябе, аднак яна знікла. Потым аднекуль стала вядома, што ўсіх старых у першы ж дзень адправілі ў газавую камеру. Услед за бабуляй аднойчы раніцай забралі сястру. Перад тым некалькі немцаў хадзілі па бараку і перапісвалі дзяцей, выбіралі прыгожых, абавязкова беленькіх. У сястры былі белыя кучары і блакітныя вочы. Запісвалі не ўсіх, а менавіта такіх. Мяне не ўзялі, я была чорненькая. Немцы гладзілі сястру па галоўцы, яна ім вельмі падабалася.

Сястру бралі раніцай, а вярталі ўвечары. З кожным днём яна марнела. Мама яе распытвала, аднак яна нічога не расказвала. Ці іх напалохалі, ці ім штосьці там давалі, якія-небудзь пілюлькі, але яна нічога не памятала. Потым мы даведаліся, што ў іх бралі кроў. Крыві, пэўна, бралі шмат, праз некалькі месяцаў сястра памерла. Яна памерла раніцай, калі прыйшлі зноў па дзяцей, яна ўжо была мёртвая.

Бабулю я вельмі любіла, бо заўсёды заставалася з ёю, калі тата з мамай сыходзілі на працу. Аднак мы не бачылі ейнай смерці і ўсё спадзяваліся, што яна жывая.

А смерць сястры была побач… Яна ляжала як жывая… Ляжала прыгожая…

У суседнім бараку жылі арлоўскія жанчыны, яны хадзілі ў футрах, футры ў іх былі расклёшаныя, у кожнай шмат дзяцей. Іх выганялі з барака, строілі па шэсць чалавек і прымушалі маршаваць разам з дзецьмі, дзеці чапляліся за іх. Нават ставілі нейкую музыку… Калі жанчына ішла не ў нагу з астатнімі, білі бізуном. Яе б'юць, а яна ўсё-ткі ідзе, бо ведае: калі ўпадзе, дык яе расстраляюць і дзяцей ейных расстраляюць. У мяне падымалася нешта ў грудзях, калі я бачыла, як яны ўставалі і ішлі. У сваіх цяжкіх футрах…

Дарослых ганялі на працу, яны даставалі з Нёмана бярвёны і выцягвалі іх на бераг. Там жа, у вадзе, многія паміралі. Адзін раз камендант схапіў мяне і паставіў у групу, якая павінна была ісці на працу. Тады з натоўпу выбег стары, адштурхнуў мяне і стаў на маё месца. Калі ўвечары мы з мамай хацелі падзякаваць яму, мы яго не знайшлі. Нам сказалі, што ён памёр у рацэ.

Мая мама была настаўніцай. Яна паўтарала: «Трэба заставацца чалавекам». Нават у пекле яна старалася захаваць нейкія прывычкі нашага дома. Не ведаю, дзе яна мыла і калі, але на мне заўсёды было ўсё чыстае, вымытае. Зімою яна мыла снегам. Здыме з мяне ўсё, я сяджу на нарах пад коўдрай, а яна мые. У нас было толькі тое, што было на нас.

Аднак усё ж мы адзначалі нашы святы… Прыхоўвалі на гэты дзень што-небудзь з ядомага. Кавалачак варанага бурака. Ці моркаўку. Мама спрабавала ўсміхацца ў гэты дзень. Яна верыла, што прыйдуць нашы. Дзякуючы гэтай веры мы і выжылі.

Пасля вайны я пайшла не ў першы, а адразу ў пяты клас. Я была дарослая. Аднак вельмі замкнёная, доўга

пазбягала людзей. Але на ўсё жыццё палюбіла адзіноту. Мне было цяжка сярод людзей, мне было невыносна з імі. Штосьці захоўвала ў сабе сваё, чым не магла ні з кім падзяліцца.

Мама, вядома, заўважала, як я змянілася. Яна старалася адцягнуць маю ўвагу, прыдумвала святы, не забывала на мае імяніны. У нас увесь час былі госці, ейныя сябры. Яна сама клікала маіх знаёмых дзяўчатак. Мне гэта цяжка было зразумець. А яе цягнула да людзей. І я не здагадвалася, як мама мяне любіць.

Яна мяне ратуе любоўю…

# «ЗАПОМНІЎ СІНЯЕ-СІНЯЕ НЕБА… І НАШЫ САМАЛЁТЫ Ў ГЭТЫМ НЕБЕ…»

*Пётр Каліноўскі, 12 гадоў.*
*Цяпер — інжынер-будаўнік.*

Да вайны…

Я памятаю, што вучыліся вайне. Рыхтаваліся. Вучыліся страляць, кідаць гранаты. Нават дзяўчаткі. Усе хацелі здаць на значок варашылаўскага стралка, палалі жаданнем. Спявалі песню «Гранада». Там былі цудоўныя словы пра тое, што герой ідзе ваяваць, «каб зямлю ў Гранадзе сялянам аддаць». Працягваць справу рэвалюцыі. Сусветнай рэвалюцыі! Так, гэта былі мы. Гэта былі нашыя мары.

У дзяцінстве я сам складаў казкі. Навучыўся рана чытаць ды пісаць. Быў здольны хлопчык. Мама хацела зрабіць з мяне, па-мойму, артыста, а мая мара была навучыцца лятаць, апрануць форму лётчыка. І ў гэтым таксама ж той час. Я, напрыклад, не сустракаў да вайны хлопчыка, які б не марыў стаць лётчыкам ці мараком. Нам трэба было ці неба, ці мора. Увесь зямны шар!

Цяпер уявіце сабе, што адбывалася са мною… З нашымі людзьмі… Што адбывалася з намі, калі мы ўбачылі немцаў у родным горадзе. На родных вуліцах. Я плакаў. Калі надыходзіла ноч, людзі зачынялі аканіцы і плакалі пры зачыненых вокнах.

Тата пайшоў у партызаны… Праз вуліцу суседская сям'я апранула белыя вышытыя кашулі, яны сустракалі немцаў з хлебам і соллю. Іх здымалі на кінаплёнку.

Калі я ўбачыў першых нашых павешаных людзей, я прыбег дамоў: «Мама, нашы людзі вісяць у небе». Упершыню я спалохаўся неба, у мяне пасля гэтага выпадку змяніліся адносіны да неба, я пачаў насцярожана да яго ставіцца. Мне запомнілася, што людзі віселі вельмі высока. А можа, мне так падалося з-за страху? Бачыў жа я забітых людзей на зямлі? Але так не палохаўся.

Хутка тата вярнуўся па нас… Мы сыходзілі разам…

Адзін партызанскі пост, другі… І раптам чуем — на ўвесь лес рускія песні спяваюць. Пазнаю голас Русланавай. У атрадзе быў патэфон і тры ці чатыры зайграныя кружэлкі. Стаяў агаломшаны і не верыў, што я ў партызанах і тут спяваюць песні. Два гады я жыў у горадзе, у які прыйшлі немцы, я забыўся, як людзі спяваюць. Я бачыў, як яны паміраюць… Як яны баяцца…

У сорак чацвёртым годзе ўдзельнічаў у мінскім парадзе партызанаў. Ішоў крайнім у правым шэрагу, мяне паставілі так, каб я ўбачыў трыбуну. «Ты яшчэ не вырас, — казалі партызаны, — сярод нас згубішся і нічога не ўбачыш, а табе трэба гэты дзень запомніць». Сярод нас не было фатографа. А шкада. Я не магу ўявіць, якім я быў тады. А я хацеў бы ведаць… Убачыць свой твар…

Трыбуны не запомніў. Запомніў сіняе-сіняе неба. І нашы самалёты ў гэтым небе. Мы іх так чакалі, усю вайну чакалі…

## «ЯК СПЕЛЫЯ ГАРБУЗЫ...»

*Якаў Каладзінскі, 7 гадоў.*
*Цяпер — настаўнік.*

Першыя бамбёжкі...

Пачнуць бамбіць... Мы цягалі ў сад пад вішні падушкі, адзенне. Падушкі вялікія, нас за імі не відаць, адныя ногі тырчаць. Самалёты адляталі, мы цягалі ўсё назад, у хату. І так па некалькі разоў за дзень. А потым ужо не шкада было нічога, мама толькі нас, дзяцей, збярэ, астатняе кідалі...

Той дзень... Мне падаецца, я штосьці дадаў з расповедаў таты, але шмат што сам памятаю.

Раніца... Туман на агародзе. Ужо кароў выгналі. Мама будзіць мяне, дае кубак цёплага малака. Нам хутка ісці ў поле. Тата кляпае касу.

— Валодзя, — сусед грукае ў вакно і кліча тату.

Той выходзіць на вуліцу.

— Уцякаем... Немцы ходзяць са спісам па вёсцы. Хтосьці перапісаў усіх камуністаў. Настаўніцу забралі...

Удвух яны папаўзлі агародамі да лесу. Праз нейкі час заходзяць да нас два немцы і паліцай.

— Дзе бацька?

— Паехаў на сенакос, — адказала мама.

Пахадзілі па хаце, паглядзелі, нас чапаць не сталі і выйшлі.

Ранішняя сінеча яшчэ смугою сцелецца. Холадна. Глядзім з мамай з-за веснічак: аднога суседа на вуліцу выштурхалі, вяжуць яму рукі, настаўніцу вядуць...

Звязваюць усім рукі ззаду і ставяць па два чалавекі. Я ніколі не бачыў звязанага чалавека. Па мне дробныя дрыжыкі пайшлі. Мама гоніць: «Ідзі ў хату. Апрані пінжачок». Я ў маечцы стаю, мяне дрыжыкі б'юць, але я ў хату не іду.

Наша хата стаяла якраз пасярод вёскі. Да яе ўсіх зганялі. Усё хутка рабілася. Звязаныя людзі стаялі, апусціўшы галовы. Па спісе пералічылі іх і пагналі за вёску. Было шмат вясковых мужчынаў і настаўніца.

Жанчыны і дзеці за імі пабеглі. Гналі іх хутка. Мы адсталі. Дабеглі да апошняга хлява, чутны стрэлы. Людзі пачынаюць падаць, то ўпадзе, то падымецца. Хутка іх пастралялі і збіраюцца з'язджаць. Адзін немец на матацыкле разварочваецца і аб'язджае забітых людзей. У яго ў руках нешта цяжкае… Ці дубінка, ці завадная ручка ад матацыкла… Не запомніў… Ён, не злазячы з матацыкла, на ціхім ходзе расколвае ўсім галовы… Другі немец хацеў з пісталета дабіваць, гэты махнуў рукою, маўляў, не трэба. Усе паехалі, а ён не паехаў, пакуль усім галовы не раскалоў. Я ніколі раней не чуў, як трашчаць чалавечыя косці… Мне запомнілася, што яны трашчалі, як спелыя гарбузы, калі тата іх рассякаў сякерай, а я выбіраў насенне.

Мне стала так страшна, што я кінуў маму, кінуў усіх і кудысьці пабег. Адзін. Схаваўся не ў хаце, а чамусьці ў хляве, мама мяне доўга шукала. Я два дні не мог слова вымавіць. Ніводнага гуку.

На вуліцу баяўся выйсці. Праз вакно бачыў: адзін нясе дошку, другі сякеру, трэцяя з вядром бяжыць. Абчэсвалі дошкі, пах свежаабчасаных дошак стаяў у кожным двары, бо амаль у кожным двары была труна. У мяне ад гэтага паху дагэтуль камяк да горла падымаецца. Да сёння…

У труне ляжалі знаёмыя мне людзі. Ні ў кога не было галавы. Замест галавы штосьці ў белай хустачцы… Тое, што сабралі…

…Тата вярнуўся з двума партызанамі. Ціхі вечар, кароў прыгналі. Трэба класціся спаць, а мама нас збірае ў дарогу. Апранулі касцюмчыкі. У мяне яшчэ два браты былі. Аднаму — чатыры гады, другому — дзевяць месяцаў. Самы вялікі — я. Дайшлі да кузні, там спыніліся, і тата азірнуўся. Я таксама азірнуўся. Вёска ўжо была падобная не на вёску, а на чорны незнаёмы лес.

У мамы на руках маленькі, тата нясе клункі і сярэдняга брата. А я за імі не паспяваю. Малады партызан кажа: «Дайце мне яго на спіну».

Ён нёс кулямёт і мяне…

## «МЫ ЕЛІ... ПАРК»

*Аня Грубіна, 12 гадоў.*
*Цяпер — мастачка.*

У мяне голас прападае, калі я пра гэта расказваю... Памірае голас...

У Мінск мы прыехалі пасля вайны. А дзяўчынка я ленінградская. Перажыла там блакаду. Ленінградскую блакаду... Калі паміраў ад голаду цэлы горад, мой любімы, прыгожы горад. У нас памёр тата... Выратавала дзяцей мама. Да вайны яна была «агеньчык». У сорак першым нарадзіўся брацік Славік. Колькі яму было, калі блакада пачалася? Шэсць месяцаў, вось-вось шэсць месяцаў... Яна і гэтае немаўлё выратавала... Усіх нас, траіх... А тату мы страцілі. У Ленінградзе ва ўсіх паміралі таты, таты паміралі хутчэй, а мамы заставаліся. Ім, напэўна, нельга было паміраць. На каго б тады засталіся мы?

З Ленінграда, калі прарвалі кола блакады, па дарозе жыцця нас вывезлі на Урал, у горад Карпінск. Першымі ратавалі дзяцей. Эвакуявалі ўсю нашую школу. У дарозе ўсе не перастаючы пра ежу размаўлялі, пра ежу і бацькоў. У Карпінску адразу кінуліся ў парк, мы не гулялі ў парку, мы яго елі. Асабліва любілі лістоўніцу, яе пушыстыя іголачкі — гэта такая смаката! У маленькіх хвоек аб'ядалі маладыя атожылкі, сашчыпвалі траўку. З блакады я ведаю ўсю ядомую траву, у горадзе людзі з'ядалі ўсё зялёнае. У парках і батанічным садзе ўжо з вясны не заставалася лістоты. А ў карпінскім парку

было шмат кісліцы, так званай заечай капусты. Гэта сорак другі год, на Урале таксама голадна, аднак усё роўна не так страшна, як у Ленінградзе.

У гэтым дзіцячым доме, дзе я была, сабралі толькі ленінградскіх дзяцей, нас немагчыма было накарміць. Нас доўга не маглі накарміць. Мы сядзелі на ўроках і жавалі паперу. Нас кармілі асцярожна... Я сядзела за сталом, гэта быў сняданак. І я ўбачыла коціка. Жывога коціка... Выскачыла з-за стала: «Кот! Кот!» Выхавальніцы былі мясцовыя, яны глядзелі на нас, як на звар'яцелых. У Ленінградзе жывых катоў не засталося... Жывы кот — гэта была мара. На цэлы месяц ежы... Мы расказвалі, а нам не верылі. Памятаю, што нас часта і шмат гладзілі. Абдымалі. Ніхто на нас не павышаў голасу, пакуль не адраслі валасы. Усіх перад ад'ездам пастрыглі «пад нуль», хлопчыкаў і дзяўчатак аднолькава, а ў некаторых валасоў не засталося з-за голаду. Мы не гулялі, не бегалі. Сядзелі і глядзелі. І елі ўсё...

Не памятаю, хто нам у дзіцячым доме распавёў пра палонных немцаў... Калі я ўбачыла першага немца... дык я ўжо ведала, што гэта палонны. Яны працавалі за горадам на вугальных шахтах. Да сёння не разумею, чаму яны прыходзілі да нашага дзіцячага дома, менавіта да ленінградскага?

Калі я яго ўбачыла... Гэтага немца... Ён нічога не казаў. Не прасіў. У нас толькі скончыўся абед, і я, відаць, яшчэ пахла абедам, ён стаяў каля мяне і нюхаў паветра, у яго міжволі рухалася сківіца, яна як быццам жавала, а ён спрабаваў трымаць яе рукамі. Спыняць. А яна рухалася і рухалася. Я зусім не магла бачыць гэтага чалавека. Абсалютна! У нас ва ўсіх была гэтая хвароба... Пабегла і паклікала дзяўчатак, у кагосьці застаўся кавалачак хлеба, мы аддалі яму гэты кавалачак.

Ён дзякаваў і дзякаваў.

—Данке шон... Данке шон...

На наступны дзень прыйшоў да нас са сваім сябрам. І так і пайшло... Хадзілі яны ў цяжкіх драўляных чаравіках. Грук-грук... Як пачую гэты грукат, выбягаю...

Мы ўжо ведалі, калі яны прыйдуць. Нават чакалі іх. Выбягалі з тым, у каго што заставалася. Калі я дзяжурыла па кухні, пакідала ім увесь свой дзённы кавалак хлеба, а ўвечары выскрабала каструлі. Усе дзяўчаткі штонебудзь ім пакідалі, а ці пакідалі хлопчыкі, не памятаю. Хлопчыкі нашы былі ўвесь час галодныя, ім заўсёды не хапала ежы. Выхавальніцы на нас сварыліся, бо дзяўчаткі таксама, здаралася, гублялі прытомнасць, але мы таемна ўсё роўна пакідалі ежу для гэтых палонных.

У сорак трэцім яны ўжо да нас не прыходзілі, у сорак трэцім годзе стала лягчэй. Урал ужо не так галадаў. У дзіцячым доме быў сапраўдны хлеб, давалі ўдосталь кашы. Але я дагэтуль не магу бачыць галоднага чалавека... Як ён глядзіць... Ён не глядзіць ніколі проста ў вочы, заўсёды кудысьці міма... Нядаўна па тэлевізары паказвалі бежанцаў... Зноў недзе вайна. Страляюць. Галодныя людзі стаялі ў чарзе з пустымі місачкамі. З пустымі вачыма. Я памятаю гэтыя вочы... Я выбегла ў іншы пакой, у мяне была істэрыка...

Першы год у эвакуацыі мы не заўважалі прыроды, усё, што было прыродай, выклікала ў нас адно жаданне: пакаштаваць, ядомае яно ці не. І толькі праз год я ўбачыла, якая прыгожая ўральская прырода. Якія там стромкія яліны, высокія травы, цэлыя лясы чаромхі. Якія там заходы сонца! Я пачала маляваць. Фарбаў не было, малявала алоўкам. Малявала паштоўкі, мы дасылалі іх сваім бацькам у Ленінград. Больш за ўсё любіла маляваць чаромху. Карпінск пах чаромхай.

Ужо каторы год пераследуе жаданне — з'ездзіць туды. Дужа хочацца пабачыць — ці стаіць наш дзіцячы дом… Будынак быў драўляны — ці ацалеў ён у новым жыцці? Які цяпер гарадскі парк? Хацела б паехаць вясною, калі ўсё зацвіце. Цяпер не ўяўляю, што ягады чаромхі можна есці жменямі, а мы іх елі. Елі нават тады, калі яны яшчэ былі зялёныя. Горкія.

Пасля блакады… Я ведаю, што чалавек можа есці ўсё. Людзі елі нават зямлю… На кірмашах прадавалі зямлю з разбітых і згарэлых Бадаеўскіх харчовых складоў. Асабліва цанілася зямля, на якую разліўся алей, ці зямля, на якой стаялі бочкі з селядцамі. Гэтая зямля пахла соллю, а солі ў ёй не было. Адзін пах селядцоў.

Радавацца кветкам… Маладой траве… Проста радавацца… Я навучыліся не хутка…

Праз дзясяткі гадоў пасля вайны…

## «ХТО БУДЗЕ ПЛАКАЦЬ, ТАГО БУДЗЕМ СТРАЛЯЦЬ...»

*Вера Ждан, 14 гадоў.*
*Цяпер — даярка.*

Я баюся мужчынаў... Гэта ў мяне з вайны...

Нас узялі пад аўтаматы і павялі, павялі ў лес. Знайшлі паляну. «Не, — круціць галавою немец, — не тут...» Павялі далей. Паліцаі кажуць: «Раскоша, пакласці вас, партызанскіх бандытаў, у такой прыгожай мясціне. Пакладзём у балоце».

Выбралі самае нізкае месца, там заўсёды стаяла вада. Далі тату і брату рыдлёўкі капаць яму. А нас з мамай пад дрэвам паставілі глядзець. Мы глядзелі, як яны капалі яму, брат апошні раз капнуў: «Эх, Верка!..» Яму шаснаццаць гадоў было... Шаснаццаць... Толькі-толькі...

Мы з мамай глядзелі, як іх расстрэльвалі... Нельга было адвярнуцца і заплюшчыць вочы. Паліцаі сачылі... Брат упаў не ў яму, а перагнуўся ад кулі і наперад ступіў, сеў каля ямы. Ботамі спіхнулі яго ў яму, у гразь... І больш за ўсё страшна было ўжо не за тое, што іх застрэлілі, а тое, што ў ліпкі бруд паклалі. У ваду. Паплакаць нам не далі, пагналі ў вёску. А іх нават зямлёю зверху не прысыпалі.

Два дні плакалі мы з мамай. Плакалі ціха, дома. На трэці дзень прыходзяць той жа немец і два паліцаі: «Збірайцеся хаваць сваіх бандытаў». Мы прыйшлі на тое месца, яны ў яме плаваюць, там калодзеж ужо, а не

магіла. Рыдлёўкі мы свае ўзялі, прыкопваем і плачам. А яны кажуць: «Хто будзе плакаць, таго будзем страляць. Усміхайцеся». Яны прымушалі нас усміхацца... Я нагнуся, ён падыходзіць і ў твар заглядвае: усміхаюся я ці плачу?

Стаяць... Усе маладыя мужчыны, прыгожыя... Усміхаюцца... Я ўжо не мёртвых, я гэтых, жывых, спалохалася. З таго часу баюся маладых мужчынаў...

Замуж не выйшла. Кахання не зведала. Баялася, а раптам нараджу хлопчыка...

## «МАМАЧКА І ТАТАЧКА — ЗАЛАТЫЯ СЛОВЫ...»

*Іра Мазур, 5 гадоў.*
*Цяпер — будаўніца.*

Напэўна, я павінна распавесці пра сваю адзіноту. Як я гэтаму навучылася...

У адной дзяўчынкі, у Леначкі, коўдра была чырвоная, а ў мяне — карычневая. І калі ляцелі нямецкія самалёты, мы клаліся на зямлю і накрываліся коўдрамі. Знізу — чырвонай, а паверх — маёй, карычневай. Я дзяўчаткам казала, што лётчык зверху ўбачыць карычневае і падумае, што камень...

Пра маму ў памяці засталося толькі, як баялася яе страціць. Я ведала дзяўчынку, у якой мама загінула пры бамбёжцы. Яна ўвесь час плакала. Мая мама брала яе на рукі і супакойвала. Потым... Мы з чужой цёткай пахавалі ў вёсцы маю маму... Мы яе мылі, яна ляжала худзенькая, як дзяўчынка. Я не баялася, я яе ўвесь час гладзіла. Як звычайна пахлі ейныя валасы і рукі, куды яе параніла, не заўважыла. Пэўна, ранка была ад кулі, маленькая. Чамусьці я думала, што ранка ў мамы маленькая ад кулі, на дарозе адзін раз я бачыла маленькія кулі. І яшчэ здзіўлялася: як гэтымі маленькімі кулькамі можна забіць вялікага чалавека? Нават мяне — я ж у тысячу, у мільён разоў большая за яе. Чамусьці мне запомніўся гэты мільён, мне здавалася, што гэта вельмі і вельмі шмат: так шмат, што нельга падлічыць.

Мама памерла не адразу. Яна доўга ляжала на траве, расплюшчвала вочы:

— Іра, мне трэба табе расказаць...

— Мама, я не хачу…

Мне здавалася, што калі яна скажа мне тое, што хоча, тады памрэ.

Калі мы маму памылі, яна ляжала ў хустачцы, з вялікай касой. Ну — дзяўчынка… Гэта ўжо сённяшні мой погляд на яе. Я ўжо старэйшая за яе ў два разы, маме было дваццаць пяць гадоў. У мяне цяпер дачка такая, і яна нават знешне падобная да маёй мамы.

Што ў мяне засталося ад дзіцячага дома? Катэгарычны характар, я не ўмею быць мяккай, асцярожнай у словах. Даравацьне ўмею. У сям'і скардзяцца, што я не вельмі ласкавая. Ці можна вырасці ласкавай без мамы?

У дзіцячым доме мне хацелася мець свой, асабісты кубачак, каб ён быў толькі маім. Заўсёды зайздросціла: у людзей застаюцца нейкія рэчы з дзяцінства, а ў мяне іх няма. Ні пра што я не магу сказаць: «Гэта ў мяне з дзяцінства». А так хочацца сказаць, часам нават прыдумаць…

Іншыя дзяўчаткі цягнуліся да нашых выхавальніц, а я любіла нянечак. Яны былі больш падобнымі да нашых мам, як мы ўяўлялі іх… Выхавальніцы былі строгія і акуратныя, а нянечкі вечна растрапаныя, па-хатняму бурклівыя, маглі адшлёпаць нас, але зусім не балюча. Па-мацярынску. Яны нас мылі ў лазні, мы маглі пасядзець у іх на каленях. Яны дакраналіся да нашых голенькіх целаў. А гэта толькі мама магла рабіць, вось гэта я разумела, яны нас кармілі. Сваімі спосабамі лячылі ад прастуды і выціралі слёзы. Калі мы траплялі да іх у рукі, гэта быў ужо не дзіцячы дом, гэта пачынаўся дом.

Часта чую, як кажуць: «мая маці» ці «мой бацька». Я не разумею, як гэта — маці, бацька? Быццам гэта чужыя людзі. Толькі — мама і тата. А калі б яны ў мяне былі жывыя, я звала б іх «мамачка» і «татачка».

Залатыя гэта словы…

## «ПРЫНЕСЛІ ЯЕ ПА КАВАЛАЧКАХ...»

*Валя Змітровіч, 11 гадоў.*
*Цяпер — рабочая.*

Прыгадваць не хачу... Не хочацца ўспамінаць, ніколі не хочацца...

Нас было сямёра дзяцей. Да вайны мама смяялася: «Сонейка свеціць, усе дзеці вырастуць». Пачалася вайна — плакала: «Такі ліхі час, а дзяцей у хаце, як бобу...» Юзіку — сямнаццаць гадоў, мне — адзінаццаць, Івану — дзевяць, Ніне — чатыры гады, Галі — тры, Аліку — два, Сашы — пяць месяцаў. Дзіцё грудное, яно яшчэ грудзі смактала і плакала.

Тады я не ведала, гэта нам пасля вайны людзі расказалі, што нашы бацькі былі звязаныя з партызанамі і з нашымі ваеннапалоннымі, якія працавалі на малаказаводзе. Там працавала і маміна сястра. Я адно памятаю: у нас сядзелі ноччу нейкія мужчыны, і, відаць, святло прабівалася, хоць вакно было завешанае тоўстай коўдрай, пачуўся стрэл — і проста ў вакно. Мама схапіла лямпу і схавала пад стол.

Мама штосьці пякла нам з бульбы, з бульбы яна магла зрабіць усё — як цяпер кажуць, сто страў. Да нейкага свята рыхтаваліся. Я памятаю, што ў хаце смачна пахла. А тата касіў каля лесу канюшыну. Немцы акружылі хату і загадваюць: «Выходзьце!» Выйшлі мама і мы, трое дзяцей. Маму пачалі біць, а яна крычыць:

— Дзеці, ідзіце ў хату.

Яе паставілі да сцяны пад вакном, а ў вакне — мы.

—Дзе твой старэйшы сын?

Мама адказвае:

—Торф капае.

—Паехалі туды.

Яны заштурхоўваюць маму ў машыну і самі садзяцца.

Галя выбегла з хаты і крычыць, да мамы просіцца. Кінулі і яе да мамы ў машыну. А мама крычыць:

—Дзеці, ідзіце ў хату…

Прыбег з лугу тата, пэўна, яму перадалі людзі, узяў нейкія дакументы і бягом за мамай. І таксама крыкнуў нам: «Дзеці, ідзіце ў хату». Як быццам хата нас уратуе ці там ёсць мама. Чакалі мы ў двары… Увечары залезлі хто на вароты, хто на яблыні: ці не ідуць нашы мама з татам і сястра з братам? Убачылі — бягуць з іншага канца вёскі людзі: «Дзеці, кідайце хату і ўцякайце. Вашых родных ужо няма. А па вас едуць…»

Па бульбяным полі папаўзлі да балота. Сядзелі там усю ноч, пачало ўзыходзіць сонца: што нам рабіць? Я ўспомніла, што ў калысцы мы забылі маленькую. Пайшлі ў вёску, забралі яе, яна была жывая, толькі пасінелая ад крыку. Брат Іван кажа: «Кармі». Чым я яе буду карміць? У мяне ж грудзей няма. А ён спалохаўся, што яна памрэ, і просіць: «Паспрабуй…»

Заходзіць суседка:

—Дзеткі, вас будуць шукаць. Ідзіце да цёткі.

А цётка нашая жыла ў іншай вёсцы. Мы кажам:

—Пойдзем шукаць цётку, а вы скажыце, дзе нашы мама з татам і сястрычка з брацікам?

Яна нам расказала, што іх расстралялі. Яны ляжаць у лесе…

—Але вам туды не трэба, дзеткі…

—Мы будзем выходзіць з вёскі і зойдзем развітацца.

— Не трэба, дзеткі…

Правяла яна нас за вёску, а туды, дзе ляжалі нашы родныя, не пусціла.

Праз шмат гадоў я даведалася, што маме выкалалі вочы і вырвалі валасы, адрэзалі грудзі. На маленькую Галю, якая схавалася пад яліну і не адгукалася, напусцілі аўчарак. Тыя прынеслі яе па кавалачках. Мама яшчэ была жывая, мама ўсё разумела… На яе вачах…

Пасля вайны засталіся мы з сястрычкай Нінай удвох. Знайшла я яе ў чужых людзей, забрала да сябе. Прыйшлі ў райвыканкам: «Дайце нам пакойчык, мы будзем жыць разам». Далі нам калідор у рабочым інтэрнаце. Я працавала на фабрыцы. Ніна ў школе вучылася. Ніколі я яе на імя не называла, заўсёды: «Сястрычка». Яна ў мяне адна. Адзіная.

Успамінаць не хачу. А расказаць пра сваю бяду людзям трэба. Цяжка плакаць адной…

## «У НАС ЯКРАЗ ВЫВЕЛІСЯ КУРАНЯТЫ, Я БАЯЎСЯ, ШТО ІХ ЗАБ'ЮЦЬ...»

*Алёша Крывашый, 4 гады.*
*Цяпер — чыгуначнік.*

Мой успамін... Адзіны...

У нас якраз вывеліся кураняткі. Жоўценькія, яны бегалі па падлозе, ішлі да мяне на рукі. Падчас бамбёжкі бабуля збірала іх у рэшата:

— Трэба ж, вайна — і кураняты.

Я баяўся, што куранятак заб'юць. Дагэтуль памятаю, як я плакаў з-за гэткага страху. Бамбяць... Усе бягуць у склеп хавацца, а мяне нельга вынесці з хаты. Абдымаю куранятак... Возьме бабуля з сабой рэшата з імі, тады я іду. Іду і лічу: адно куранятка, другое, трэцяе... Іх было пяць...

Бомбы лічыў. Адна ўпала, дзве... Сем...

Так лічыць і навучыўся...

## «КАРОЛЬ ХРЭСЦІ, КАРОЛЬ БУБНОВЫ...»

*Галіна Матусева, 7 гадоў.*

*Цяпер — на пенсіі.*

Чалавек нараджаецца...

Каля яго сядзяць два анёлы, і яны даюць яму лёс. Прызначаюць — колькі жыць, доўгі ці кароткі будзе шлях. А Бог зверху глядзіць, гэта ён паслаў анёлаў, каб вітаць новую душу. Сказаць, што Ён ёсць.

Мая ты харошая... Я па вачах бачу: шчаслівы чалавек ці не. Не да кожнага падыду на вуліцы і спыню: «Малады, прыгожы, можна спытацца?» Бягуць, бягуць людзі, а я выберу ў натоўпе аднога, быццам ведаю, у мяне штосьці ў грудзях адгукнецца, цёпла зробіцца, і з'явяцца словы. Жар мовы. Я пачынаю казаць... Лёс чытаю... Раскрыю карты, а ў картах усё ёсць: што было і што будзе, і як душа супакоіцца, і з чым яна пойдзе. Пойдзе туды, адкуль і прыйшла — на неба. Карты пакажуць... Чалавек горды, а лёс ягоны загадзя на нябёсах напісаны. Ёсць там тэкст... Але кожны па-свойму яго чытае...

Мы — цыганы... Вольны народ... У нас свае законы, цыганскія. Наша радзіма там, дзе мы жывём, і там, дзе радуецца наша сэрца, для нас — усюды радзіма. Усюды — пад небам. Мяне бацька так вучыў, і мама вучыла. Кібітка калышацца, трасецца па дарогах, а мама мне нашы малітвы чытае. Напявае. Шэры колер... Колер дарогі, колер пылу... Колер майго дзяцінства... Мая ты харошая, а ці бачыла ты цыганскі шацёр? Круглы і высокі,

як неба. У ім я нарадзілася. У лесе. Пад зоркамі. З пялюшак ні начных птушак, ні звяроў не баюся. Танчыць і спяваць ля вогнішча навучылася. Без песні не ўявіць цыганскага жыцця, у нас кожны спявае і танчыць — як размаўляе. Словы ў нашых песняў пяшчотныя. Згубныя... Я маленькая не разумела, а ўсё роўна плакала. Такія словы... Яны крадуцца да чалавечага сэрца, дражняць яго. Закалыхваюць. Дарогай дражняць. Воляй. Вялікім каханнем... Не дарэмна кажуць, што рускі чалавек памірае двойчы: адзін раз — за радзіму, другі раз — слухаючы цыганскія песні.

Мая ты харошая, навошта шмат пытанняў задаеш? Сама раскажу...

Я ў дзяцінстве бачыла шчасце. Павер мне!

Улетку мы жылі табарам разам. Адна сям'я. Спыняліся заўсёды каля ракі. Каля лесу. У прыгожай мясціне. Ранкам птушкі спяваюць, і мама спявае. Будзіць мяне. А зімою на кватэры да людзей прасіліся, тады людзі былі залатыя. З добрым сэрцам. Жылі мы з імі добра. Але колькі ляжаў снег, столькі і вясну чакалі. Даглядалі коней, цыганы клапоцяцца пра коней, як пра дзяцей. У красавіку... На Вялікдзень кланяліся добрым людзям і збіраліся ў дарогу. Сонца, вецер... Мы жывём адным днём, сёння ёсць шчасце — хтосьці цябе ноччу абдыме, ці дзеці здаровыя і сытыя — і ты шчаслівая. А заўтра будзе новы дзень. Мамінны словы... Мама мяне не шмат вучыла. Калі дзіця ад Бога, яго доўга вучыць не трэба, яно само вучыцца.

Так я расла... Маё нядоўгае шчасце. Цыганскае...

Прачнулася раніцай ад размоваў. Ад крыкаў.

—Вайна!

—Якая вайна?

—З Гітлерам.

—Няхай ваююць. А мы — вольныя людзі. Птушкі. У лесе жывём.

Тут наляцелі самалёты. Пастралялі на лузе кароў. Дым да неба... У мамы ўвечары карты так рассыпаліся, што яна абхапіла галаву і качалася па траве.

Табар стаў. Не рухаецца. Мне сумна. Я люблю дарогу.

Аднойчы ўвечары падыходзіць да вогнішча старая цыганка. У маршчынах, як сухая зямля ад сонца. Я яе не ведаю, яна з чужога табара. Здалёк.

Яна расказала:

—Раніцай акружылі нас. На добрых, сытых конях. Грывы тых коней блішчалі, падковы моцныя. Немцы сядзелі ў сёдлах, а паліцаі выцягвалі цыганоў з шатроў. Пярсцёнкі з пальцаў здзіралі, ірвалі завушніцы з вушэй. Ува ўсіх жанчын вушы былі ў крыві, а пальцы вывіхнутыя. Штыкамі калолі пярыны. Золата шукалі. А пасля пачалі страляць...

Адна дзяўчынка папрасіла іх: «Дзядзечкі, не страляйце. Я вам цыганскую песеньку спяю». Яны засмяяліся. Яна ім спела, станчыла, тады яны яе расстралялі... Увесь табар... Цэлы табар прапаў. Шатры падпалілі. Адны коні засталіся. Без людзей... Коней яны з сабою забралі.

Вогнішча гарыць. Цыганы маўчаць. Я сяджу каля мамы.

Раніцай — зборы: вузлы, падушкі, гаршкі ляцяць у кібітку.

—Куды едзем?

—У горад, — адказвае мама.

—Навошта ў горад? — мне шкада кідаць рэчку. Шкада сонца.

—Немцы загадалі...

Жыць у Мінску нам дазволілі на трох вуліцах. У нас было сваё гета. Раз на тыдзень з'яўляліся немцы і звяралі

па спісе: «Айн цыгайнер… Цвай цыгайнер…» Мая ты харошая…

Як жылі?

Хадзілі з мамай па вёсках. Прасілі. Хто пшаніцы вынесе, хто кукурузы. Кожны клікаў да сябе: «Ой, цыганачка, заходзь. Раскажы пра лёс. У мяне муж на фронце». Вайна разлучыла людзей, усе ў разлуцы. У чаканні. Жадалі атрымаць надзею.

Мама гадала. Я слухала… Кароль хрэсці, кароль бубновы… Смерць — чорная карта. Карта віні. Сямёрка… Каханне гарачае — кароль белы. Ваенны чалавек — чорны віновы кароль. Хутка дарога — шасцёрка бубновая…

З двара выйдзе мама вясёлая, а ў дарозе плача. Страшна сказаць чалавеку праўду: твой муж забіты, твайго сына ўжо няма сярод жывых. Зямля іх прыняла, яны — там. Карты так кажуць…

У адной хаце засталіся начаваць. Я не спала… Бачыла, як у поўнач жанчыны распусцілі свае доўгія косы і варажылі. Кожная адчыняла вакно, кідала ў цёмную ноч зерне і слухала вецер: ціхі вецер — муж жывы, а завые, пастукае ў вакно, дык не чакай яго, не вернецца. Вецер выў і выў. Грукаў па шыбах.

Ніколі нас так людзі не любілі, як у вайну. У цяжкія хвіліны. Мама замовы ведала. Магла чалавеку дапамагчы і жывёле: кароў ратавала, коней. З усімі размаўляла на іхнай мове.

Хадзілі чуткі: адзін табар расстралялі, другі… Трэці ў канцлагер завезлі…

Скончылася вайна, мы радаваліся адно аднаму. Сустрэнеш — абнімеш. Нас засталося мала. А людзі зноў гадалі і варажылі. Ляжыць у хаце пад абразом пахаванка, а жанчына ўсё адно просіць: «Ой, цыганачка,

пагадай. А раптам мой — жывы. Можа, пісар памыліўся?»

Мама гадала. Я слухала…

Першы раз сама пагадала на кірмашы дзяўчынцы. Ёй вялікае каханне выпала. Шчаслівая карта. І яна дала мне рубель. Я ёй шчасце падаравала, няхай нават на адну хвіліну.

Мая ты харошая, і ты будзь шчаслівай! Ідзі з Богам. Раскажы пра наш цыганскі лёс. Людзі мала ведаюць…

Тэ авэс бахтало… З Богам!

## «ВЯЛІКІ СЯМЕЙНЫ ФОТАЗДЫМАК...»

*Толя Чарвякоў, 5 гадоў.*
*Цяпер — фатограф.*

Калі штосьці засталося ў памяці, дык як адзін вялікі сямейны фотаздымак...

На пярэднім плане тата з вінтоўкай і ў афіцэрскай фуражцы, ён насіў яе і зімою. Фуражка і вінтоўка вымалёўваюцца выразней, чым татаў твар. Вельмі хацелася мне мець і тое і другое — фуражку і вінтоўку. Хлапчук!

Побач з татам — мама. Саму маму тых гадоў не памятаю, больш запомнілася тое, што яна рабіла: увесь час прала штосьці белае, ад яе пахла лекамі. Мама была медсястрой у партызанскім атрадзе.

Недзе тут мы з маленькім брацікам. Ён увесь час хварэе. Вось яго памятаю — чырвонага, усё цельца пакрытае каростай. Удваіх плачуць з мамай ноччу. Ён ад болю, мама ад страху, што ён памрэ.

А далей бачу, як да вялікай сялянскай хаты, у якой размясціўся мамін шпіталь, ідуць бабы з кубачкамі. У кубачках малако. Малако зліваюць у вядро, і мама купае ў ім брата. Брат ноччу не крычыць, спіць. Першую ноч... А раніцай мама кажа тату:

— Чым я адплачу людзям?

Вялікі фотаздымак... Адзін вялікі фотаздымак...

## «ДЫК Я ВАМ ХОЦЬ БУЛЬБАЧКІ Ў КІШЭНІ НАСЫПЛЮ...»

*Каця Заяц, 12 гадоў.*
*Цяпер — рабочая саўгаса «Клічаўскі».*

Бабуля адганяе нас ад вокнаў...

А сама глядзіць і маме расказвае:

—Знайшлі ў жыце старога Тодара... Там былі нашы параненыя салдаты... Ён прынёс ім касцюмы сваіх сыноў, хацеў пераапрануць, каб немцы не пазналі. Салдатаў пастралялі ў жыце, а Тодара прывялі на ягоны двор і загадалі выкапаць яму каля хаты. Капае...

Дзед Тодар — гэта наш сусед. З вакна відаць, як ён капае яму. Вось выкапаў... Немцы забіраюць у яго рыдлёўку, штосьці па-свойму яму крычаць. Дзед не разумее ці не чуе, бо даўно глухі, тады яны штурхнулі яго ў яміну і паказалі, каб стаў на калені. Так і засыпалі жывога... На каленях...

Усім стала страшна. Хто гэта? Хіба гэта людзі? Першыя дні вайны...

Доўга абыходзілі хату дзеда Тодара. Усім здавалася, што ён і з-пад зямлі крычыць.

Спалілі нашу вёску так, што адна зямля засталася. Адны камяні ў дварах, і тыя чорныя. У нас на агародзе травы нават не засталося. Згарэла. Жылі за міласціну — ідзём з сястрычкаю ў чужыя вёскі, просім людзей:

—Падайце што-небудзь...

Мама хворая. Мама хадзіць з намі не магла, яна саромелася.

Прыйдзем у хату:

—Адкуль вы, дзеткі?

—З Ядранай Слабады. Нас спалілі.

Давалі: ячменю місачку, хлеба кавалачак, яйка адно… Дзякуй людзям, усё давалі.

Іншы раз пераступіш парог, бабы ў голас плачуць:

—Ой, дзеткі, колькі ж вас! Раніцай прайшло дзве пары.

Ці:

—Толькі выйшлі ад нас людзі. Хлеба не засталося, дык я вам хоць бульбачкі ў кішэні насыплю.

Так з хаты не выпусцяць, каб з пустымі рукамі. Хоць лёну па жменьцы, але дадуць, і назбіраем мы за дзень ільняны снапок. Мама прала сама, ткала. На балоце торфам фарбавала, у чорны колер.

Вярнуўся з фронту тата. Пачалі ставіць хату, на ўсю вёску засталіся дзве каровы. Лес на каровах вазілі. На сабе. Большае за свой рост бервяно мне было не адужаць, а калі аднолькавае са мной у росце — цягнула.

Вайна не хутка скончылася… Лічаць: чатыры гады. Чатыры гады стралялі… А забывалі — колькі?

## «МА-МА МЫ-ЛА РА-МУ...»

*Федзя Труцько, 13 гадоў.*
*Цяпер — начальнік аддзела вапнавага заводу.*

Такая гісторыя...

За два дні да вайны мы адвезлі маму ў бальніцу, яна цяжка захварэла. Бальніца была ў Брэсце. Больш нашу маму мы не бачылі.

Праз два дні немцы ўвайшлі ў горад. Яны выгналі з бальніцы хворых, а тых, хто не мог хадзіць, кудысьці вывезлі на машынах. Сярод іх, расказвалі людзі, была і мая мама. Іх недзе расстралялі. Але дзе? Як? Калі? Я не даведаўся, ніякіх слядоў не пакінулі.

Нас з сястрой і татам вайна застала дома ў Бярозе. Брат Валодзя вучыўся ў Брэсцкай дарожна-тэхнічнай вучэльні. Другі брат, Аляксандр, закончыў у Пінску чырванафлоцкую вучэльню і там жа працаваў матарыстам на параходзе.

Бацька наш — Сцяпан Аляксандравіч Труцько — намеснік старшыні Бярозаўскага райвыканкама. Яму далі загад — эвакуявацца з дакументамі ў Смаленск. Забег дамоў:

—Федзя, забірай сястру і ідзіце да дзеда ў Агароднікі...

Раніцай прыйшлі мы на хутар да дзеда, а ноччу пастукаў у вакно брат Валодзя, два дні і дзве ночы ішоў ён з Брэста. У кастрычніку з'явіўся на хутары і Аляксандр. Ён расказаў, што параход, на якім яны плылі да

Днепрапятроўска, разбамбілі. Хто ацалеў, той трапіў у палон. Некалькі чалавек уцякло, сярод іх і наш Саша.

Усе абрадаваліся, калі да дзеда зайшлі партызаны, — пойдзем з імі! Будзем помсціць.

—Колькі класаў скончыў? — спытаў мяне камандзір, калі нас прывялі да яго.

—Пяць класаў.

Пачуў загад:

—Пакінуць у сямейным лагеры.

Братам выдалі вінтоўкі, а мне — аловак, каб вучыўся.

Я ўжо быў піянерам. Гэта быў мой галоўны козыр, што я піянер. Прасіўся ў баявы атрад.

—У нас алоўкаў менш, чым вінтовак, смяяўся камандзір.

Вакол вайна, а мы вучыліся. Школу нашу называлі «зялёнай школай». Не было партаў, класаў, падручнікаў, былі толькі вучні ды настаўнікі. На ўсіх — адзін буквар, адзін падручнік гісторыі, адзін задачнік па арыфметыцы і адзін падручнік граматыкі. Без паперы, крэйды, атраманту і алоўкаў. Расчысцілі паляну, пасыпалі пяском, і гэта была нашая школьная дошка, на ёй пісалі тонкімі дубчыкамі. Замест сшыткаў партызаны прыносілі нам нямецкія ўлёткі, старыя шпалеры і газеты. Нават школьны званок недзе здабылі. Яму радаваліся больш за ўсё. Хіба гэта сапраўдная школа, калі не звініць званок?

Былі ў нас чырвоныя гальштукі.

—Па-вет-ра! — крычыць дзяжурны.

Паляна пусцее.

А пасля бамбёжкі ўрок працягваецца. Першакласнікі выводзяць дубчыкамі на пяску:

—Ма-ма мы-ла ра-му...

З галінак і цурбанкоў зрабілі вялікія лічыльнікі. З дрэва выразалі некалькі камплектаў азбукі. У нас былі нават урокі фізкультуры. Абсталявалі спартыўную пляцоўку з перакладзінай, бегавой дарожкай, шастом і коламі для кідання гранат. Гранаты я кідаў далей за ўсіх.

Закончыў шосты клас і цвёрда сказаў, што ў сёмы пайду пасля вайны. Далі мне вінтоўку. Потым здабыў бельгійскі карабін, ён быў маленькі і лёгкі.

Я навучыўся добра страляць... А матэматыку забыў...

## «ЁН ДАЎ МНЕ КУБАНКУ З ЧЫРВОНАЙ СТУЖАЧКАЙ...»

*Зоя Васільева, 12 гадоў.*
*Цяпер — інжынер-патэнтазнаўца.*

Колькі ў мяне было радасці да вайны! Шчасця! І гэта ўратавала...

Я паступіла ў харэаграфічную студыю пры нашым Тэатры оперы і балета. Студыя эксперыментальная, выбіралі самых таленавітых дзяцей. А мне напісаў рэкамендацыйны ліст знакаміты маскоўскі рэжысёр Галізоўскі. У трыццаць восьмым годзе быў парад фізкультурнікаў у Маскве, і я на яго трапіла, нас паслалі ад мінскага Палаца піянераў. Запускалі ў неба сінія і чырвоныя шары... Ішлі ў калоне... Галізоўскі быў галоўным рэжысёрам гэтага параду, і ён мяне заўважыў.

Праз год ён прыязджае ў Мінск, знаходзіць мяне і піша ліст Зінаідзе Анатолеўне Васільевай, народнай артысткі... Нашай беларускай знакамітасці... Яна ў гэты час арганізавала харэаграфічную студыю. Нясу ліст, вельмі хочацца прачытаць, што ў ім напісана, але я сабе гэтага не дазваляю. Зінаіда Анатолеўна жыла ў гатэлі «Еўропа», непадалёк кансерваторыі. Паколькі я ўсё рабіла таемна ад бацькоў, дык вельмі спяшалася, калі сыходзіла з дому. Бегала па вуліцы босая, а тут толькі ў сандалі ўлезла, не пераапраналася. Калі б апранула я нешта святочнае, мама б спытала: «Куды ты?» А бацькі чуць не хацелі ні пра які балет, былі супраць. Катэгарычна.

Аддала я Зінаідзе Анатолеўне ліст, яна прачытала, і кажа: «Распранайся. Паглядзім рукі, ножкі». Я замёрла

ў жаху: як гэта я зараз здыму сандалі, калі ў мяне ногі брудныя? У мяне, мабыць, быў такі выраз твару, што яна ўсё зразумела. Дала мне ручнік, падсунула зэдлік да ўмывальніка…

У студыю мяне залічылі, з дваццаці чалавек засталося толькі пяцёра. Пачалося новае жыццё: класіка, рытміка, музыка… Якая я была шчаслівая! Зінаіда Анатолеўна мяне любіла. А мы ўсе любілі яе, гэта быў наш кумір, нашае боства, ніхто ў свеце не быў прыгажэйшы за яе. У сорак першым годзе я ўжо танчыла ў балеце «Салавей» Крошнера, была занятая ў другім акце ў танцы казачкоў. Мы яшчэ паспелі паказаць яго на дэкадзе беларускага мастацтва ў Маскве. Быў поспех. Я танчыла таксама маленькае куранятка ў нашай студыйнай прэм'еры — у балеце «Кураняты». Там была вялікая кура-мама, а я самае малое куранятка.

Пасля дэкады ў Маскве нас узнагародзілі пуцёўкамі ў піянерскі лагер пад Бабруйскам. Там мы таксама танчылі сваіх «куранятаў». У падарунак нам абяцалі спячы вялікі торт. Яго спяклі дваццаць другога чэрвеня…

На знак салідарнасці з Іспаніяй мы насілі пілотачкі, мой любімы галаўны ўбор. Я яго адразу надзела, калі дзеці закрычалі «Вайна!». Па дарозе ў Мінск я згубіла пілотачку…

У Мінску мама абняла мяне на парозе, і мы пабеглі да станцыі. Пад бамбёжкай згубіліся. Я не знайшла мамы з сястрычкай, ехала без іх. Раніцай цягнік спыніўся ў Крупках і далей не пайшоў. Людзі заходзяць у вясковыя хаты, а я саромеюся, бо без мамы, адна. Увечары ўсё-ткі зайшла ў адну хату, папрасіла папіць чаго-небудзь. Далі мне малака. Падымаю вочы ад кубка і бачу — мая маладая мама ў шлюбнай сукенцы. Як закрычу: «Мама!» Дзед з бабуляй сталі мяне распытваць: «Адкуль

ты? Хто такая?» Падобнае можа толькі падчас вайны здарыцца: я трапіла да свайго стрыечнага дзеда, брата татавага бацькі, якога ніколі не бачыла. Вядома, ён мяне нікуды не пусціў. Такі вось цуд!

У Мінску я танчыла «куранятаў», а цяпер мне трэба было іх вартаваць, каб сарокі не пакралі. Кураняты — гэта нічога, а гусей я баялася. Я баялася ўсяго, я нават пеўня баялася. Упершыню мужнасць я паказала, калі пагнала гусей на выпас. Гусак быў разумны, ён бачыў, што я яго баюся, шыпеў ды імкнуўся пацягнуць мяне ззаду за сарафанчык. Даводзілася хітрыць перад маімі новымі сябрамі, якія з дзяцінства не баяліся ні гусей, ні пеўня. Яшчэ я вельмі палохалася навальніцы. Калі я бачыла, што набліжаецца навальніца, адразу што-небудзь прыдумвала і забягала ў першую ж хату на шляху. І не было для мяне страшнейшага гуку, чым грукат грому. А я ж ужо бачыла бамбёжку…

Мне падабаліся вясковыя людзі, іхная дабрыня, усе клікалі мяне «дзіцятачка». Памятаю, што мяне вельмі цікавіў конь, падабалася кіраваць ім, дзед дазваляў. Конь фыркне, хвастом махне, але галоўнае — ён мяне слухаўся: торгну правай рукой, ён ведае, што сюды трэба павярнуць, калі ўлева, то налева.

Прасіла дзеда:

—Адвязі мяне на кані да мамы.

—Закончыцца вайна, тады і адвязу.

Дзед быў самотны і строгі.

Я вырашыла ўцячы, за вёску мяне вывела сяброўка.

На станцыі залезла ў вагон, адтуль выгналі. Залезла на нейкую машыну, села з краю. Успомніць страшна: садзяцца ў машыну немец з немкай і з імі паліцай, і я там, але яны мяне не кранулі. У дарозе сталі задаваць пытанні: «Дзе вучылася? Колькі скончыла класаў?»

Калі яны даведаліся, што я вучылася яшчэ і ў балетнай школе, не паверылі. Тут жа, у кузаве, паказала ім сваё «куранятка». А ці вучыла я замежную мову?

У пятым класе мы пачалі ўжо вучыць французскую мову, усё гэта было яшчэ свежае ў памяці. Немка штосьці спытала ў мяне па-французску, я ёй адказала. Яны былі ўражаныя, што падабралі ў вёсцы дзяўчынку, якая закончыла пяць класаў, вучылася ў балетнай школе і нават ведае французскую мову. А гэта былі, як я зразумела, медыкі, адукаваныя людзі. Ім давялі, што мы дзікуны. Недачалавекі.

Вось цяпер смешна: пеўня баялася, а ўбачыла партызанаў — у папахах, партупеі, з зорачкамі і аўтаматамі: «Дзядзечкі, я смелая. Вазьміце мяне з сабою…» У партызанскім атрадзе ўсе мае мары скончыліся тым, што я сядзела на кухні і абірала бульбу. Вы ўяўляеце бунт у маёй душы! Тыдзень аддзяжурыла на кухні, прыходжу да камандзіра атрада: «Хачу быць сапраўдным байцом». Ён даў мне кубанку з чырвонай стужачкай, а я адразу хацела вінтоўку. Памерці не баялася.

Вярнулася да мамы з медалём «Партызан Айчыннай вайны II ступені». Пайшла ў школу і забыла пра ўсё, гуляла з дзяўчаткамі ў лапту, каталася на ровары. Адзін раз уляцела на ровары ў яму ад бомбы, параніласяся, убачыла кроў і не вайну ўспомніла, а сваю балетную студыю. Як я цяпер буду танчыць? Прыедзе хутка Зінаіда Анатолеўна Васільева, а ў мяне разбітае калена…

Толькі не давялося мне вярнуцца ў балетную школу. Пайшла працаваць на завод, трэба было дапамагаць маме. А вучыцца хацелася… Дачка мая вучылася ў першым класе, а мама яе — у дзясятым. У вячэрняй школе.

Муж падараваў мне білет у Тэатр оперы і балета. Увесь спектакль я сядзела і плакала…

## «І СТРАЛЯЮ ЎВЕРХ...»

*Аня Паўлава, 9 гадоў.*
*Цяпер — кухарка.*

Ой, душа будзе балець... Зноў забаліць...

Немцы цягнулі мяне ў хлеў... Мама бегла ўслед і рвала на сабе валасы. Яна крычала: «Рабіце са мною што хочаце, толькі не чапайце дзіцё». У мяне былі два малодшыя браты, яны таксама крычалі...

Родам мы з вёскі Мехавая Арлоўскай вобласці. Адтуль нас пешкам гналі ў Беларусь. Гналі з канцлагера ў канцлагер... Калі мяне хацелі забраць у Германію, мама падклала сабе жывот, а мне дала на рукі малодшага брацікa. Так я выратавалася. Мяне выкраслілі са спісу.

Ой! Душа будзе сёння ўвесь дзень і ўсю ноч не на месцы. Кранула, разварушыла...

Сабакі ірвалі дзяцей... Сядзем над разарваным дзіцём і чакаем, калі сэрца ў яго спыніцца. Тады снегам прыкрыем... Вось яму і магілка да вясны...

У сорак пятым... Пасля Перамогі... Паслалі маму будаваць у Ждановічах санаторый, я — з ёю. Так тут і засталася. Сорак гадоў у санаторыі працую... З першага каменя я тут, усё на маіх вачах падымалася. Дадуць мне вінтоўку, дзесяць палонных немцаў і я іх на работу вяду. Першы раз прывяла, бабы абступілі нас: хто з каменем, хто з рыдлёўкай, хто з палкай. А я вакол палонных бегаю з вінтоўкай і крычу: «Бабачкі! Не чапайце іх... Бабачкі, я за іх распіску дала. Страляць буду!» І страляю ўверх.

Бабы плачуць, і я плачу. А немцы стаяць. Вачэй не падымаюць.

У ваенны музей мама ні разу мяне не вадзіла. Адзін раз убачыла, што я гляджу газету з фотаздымкамі расстраляных — забрала і насварылася.

У нас у доме дагэтуль няма ні адной кніжкі пра вайну. А я ўжо даўно жыву без мамы…

## «У ПЕРШЫ КЛАС МАМА НАСІЛА МЯНЕ НА РУКАХ...»

*Іна Старавойтава, 6 гадоў.*
*Цяпер — аграномка.*

Мама пацалавала нас і пайшла...

Мы засталіся ў будане ўчатырох: малодшыя — брацік, стрыечныя брат і сястра — ды я, самая старэйшая, сем гадоў. Мы не ўпершыню заставаліся адны і навучыліся не плакаць, паводзіць сябе ціха. Ведалі, што мама наша разведчыца, яе паслалі на заданне, а нам трэба яе чакаць. З вёскі мама нас забрала, і жылі мы цяпер з ёю разам у сямейным партызанскім лагеры. Гэта доўга было нашай марай! А цяпер — наша шчасце.

Сядзім і слухаем: дрэвы шумяць, жанчыны непадалёк сціраюць, на дзяцей сваіх сварацца. Раптам крык: «Немцы! Немцы!» Усе пачалі выбягаць са сваіх буданоў, клікаць дзяцей і ўцякаць як далей у лес. А куды мы пабяжым адны, без мамы? А раптам мама ведае, што немцы ідуць у лагер, і бяжыць да нас? Я, як самая старэйшая, загадваю: «Маўчаць усім! Тут цёмна, і немцы нас не знойдуць».

Прыціхлі. Зусім замоўклі. Нехта зазірнуў у будан і сказаў па-руску:

—Хто ёсць, выходзьце!

Голас быў спакойны, і мы вылезлі з будана. Я ўбачыла высокага чалавека ў зялёнай форме.

—У цябе ёсць тата? — спытаў ён у мяне.

—Ёсць.

—А дзе ён?

—Ён далёка, на фронце.

Памятаю, што немец нават засмяяўся.

—А мама твая дзе? — задаў наступнае пытанне.

—Мама з партызанамі на разведку пайшла.

Падышоў другі немец, той быў у чорным. Штосьці яны перамовіліся, гэты, чорны, паказаў нам рукою, куды трэба ісці. Там стаялі жанчыны з дзецьмі, якія не паспелі ўцячы. Чорны немец навёў на нас кулямёт, і я зразумела, што ён зараз будзе рабіць. Я не паспела нават закрычаць і абняць маленькіх…

Прачнулася я ад мамінага плачу. Так, мне падалося, што я спала. Прыпаднялася і бачу: мама капае яму і плача. Яна стаяла спінай да мяне, а ў мяне не было сілаў паклікаць яе, сілаў хапіла толькі, каб паглядзець на яе. Мама разагнулася перадыхнуць, павярнула да мяне галаву і як закрычыць: «Іначка!» Яна кінулася да мяне, схапіла на рукі. У адной руцэ мяне трымае, а другой астатніх абмацвае: раптам яшчэ хто-небудзь з дзяцей жывы? Не, яны былі халодныя…

Калі мяне падлячылі, мы з мамай налічылі ў мяне дзевяць ран ад куляў. Я вучылася лічыць: у адным плечуку — дзве кулі і ў другім — дзве кулі. Гэта будзе чатыры. У адной ножцы дзве кулі і ў другой — дзве кулі. Гэта будзе ўжо восем. І на шыі ранка. Гэта будзе ўжо дзевяць.

Закончылася вайна… У першы клас мама насіла мяне на руках…

## «САБАКА, МІЛЕНЬКІ, ДАРУЙ... САБАКА, МІЛЕНЬКІ, ДАРУЙ...»

*Галіна Фірсава, 10 гадоў.*
*Цяпер — на пенсіі.*

У мяне была мара — злавіць вераб'я і з'есці...

Рэдка, але птушкі з'яўляліся ў горадзе. Нават вясною ўсе глядзелі на іх і думалі пра адно: пра тое ж, пра што думала і я. Пра тое ж... Пазбавіцца думак пра ежу ні ў кога не хапала сілаў. Ад голаду я адчувала ўнутры пастаянны холад, страшны ўнутраны холад. Нават у сонечныя дні. Колькі на сябе ні апрані, холадна, немагчыма сагрэцца.

Дужа хацелася жыць...

Я распавядаю пра Ленінград, дзе мы тады жылі. Пра ленінградскую блакаду. Забівалі нас голадам, забівалі доўга. Дзевяцьсот дзён блакады... Дзевяцьсот... Калі адзін дзень мог падацца вечнасцю. Вы не ўяўляеце, якім доўгім галоднаму чалавеку здаецца дзень. Гадзіна, хвіліна... Доўга чакаеш абеду. Потым вячэры. Блакадная норма дайшла да ста дваццаці пяці грамаў хлеба на дзень. Гэта ў тых, хто не працаваў. Па ўтрыманскай картцы... З гэтага хлеба цякла вада... Раздзяліць яго трэба было на тры часткі — сняданак, абед, вячэра. Пілі толькі варголы. Голы вар.

У цемры... З шасці раніцы я займала зімой (памятаю больш за ўсё зіму) чаргу ў булачную. Стаіш гадзінамі. Пакуль падыдзе мая чарга, на вуліцы зноў цёмна. Га-

рыць свечка, і прадавец рэжа гэтыя кавалачкі. Людзі стаяць і сочаць за ім. За кожным рухам… А вочы гараць вар'яцкім бляскам… І ўсё гэта ў маўчанні.

Трамваі не ходзяць. Вады няма, ацяплення няма, электрычнасці няма. Але самае страшнае — голад. Я бачыла чалавека, які жаваў гузікі. Маленькія і вялікія гузікі. Людзі вар'яцелі ад голаду…

Быў момант, калі я перастала чуць. Тады мы з'елі ката… Я раскажу, як мы яго з'елі. Потым я аслепла… Нам прывялі сабаку. Гэта мяне ўратавала.

Не згадаю… Не запомніла, калі думка пра тое, што можна з'есці свайго ката ці свайго сабаку, стала нармальнай. Звычайнай. Стала бытам. Не адсачыла гэтага моманту… Услед за галубамі і ластаўкамі раптам пачалі знікаць у горадзе каты ды сабакі. У нас не было іх, мы неяк не заводзілі, бо мама меркавала: гэта вельмі адказна, асабліва вялікага сабаку ўзяць у кватэру. Аднак маміна сяброўка не магла сама з'есці свайго ката і прынесла нам. І мы яго з'елі. Я зноў пачала чуць… Слых знік у мяне раптоўна, раніцай яшчэ чула, а ўвечары мама штосьці кажа мне, а я не адгукаюся.

Прайшоў час… І вось мы зноў паміраем… Маміна сяброўка прывяла да нас свайго сабаку. І яго мы таксама з'елі. І калі б не сабака, мы б не выжылі. Вядома, не выжылі б. Гэта зразумела. Пачалі ўжо апухаць з голаду. Сястра не хацела раніцай уставаць… Сабака быў вялікі і ласкавы. Два дні мама не магла… Як адважыцца? На трэці дзень яна прывязала сабаку да батарэі на кухні, а нас выгнала на вуліцу…

Памятаю тыя катлеты… Памятаю…

Дужа хацелася жыць…

Часта выбіраліся і сядзелі каля татавай фотакарткі. Тата быў на фронце. Лісты ад яго прыходзілі рэдка.

«Дзяўчаткі мае...» — пісаў ён нам. Мы адказвалі, але стараліся яго не хваляваць.

Мама захоўвала некалькі кавалачкаў цукру. Маленькі папяровы мяшэчак. Гэта быў наш залаты запас. Адзін раз... Я не вытрымала, я ведала, дзе ляжыць цукар, залезла і ўзяла адзін кавалачак. Праз некалькі дзён яшчэ адзін... Потым... Прайшло трохі часу — зноў... Хутка ў маміным мяшэчку нічога не засталося. Пусты мяшэчак...

Захварэла мама... Ёй патрэбна глюкоза. Цукар... Яна ўжо не можа падняцца... На сямейнай радзе вырашылі — дастаць запаветны мяшэчак. Наш скарб! Ну вось мы яго і зберагалі для такога дня! Мама абавязкова акрыяе. Старэйшая сястра пачала шукаць, а цукру няма. Усю кватэру перашукалі. Я разам з усімі шукала.

А ўвечары прызналася...

Сястра мяне біла. Кусала. Драпала. А я прасіла яе: «Забі мяне! Забі! Як я буду цяпер жыць?!» Я хацела памерці...

Я вам распавяла пра некалькі дзён. А іх было дзевяцьсот.

Дзевяцьсот такіх дзён...

На маіх вачах дзяўчынка скрала на кірмашы ў адной жанчыны булачку. Маленькая дзяўчынка... Яе дагналі і паваліці на зямлю. Пачалі біць... Білі страшна. Смяротным боем. А яна спяшалася даесці, праглынуць булачку. Праглынуць раней, чым яе заб'юць.

Дзевяцьсот такіх дзён...

Наш дзядуля так аслабеў, што аднойчы ўпаў на вуліцы. Ён ужо развітаўся з жыццём. А міма ішоў рабочы, у рабочых харчовыя карткі былі лепшыя, не нашмат, але лепшыя... Усё-ткі... Дык гэты рабочы спыніўся і ўліў дзядулю ў рот алею — свой паёк. Дзядуля дайшоў

дахаты, расказваў нам і плакаў: «Я нават імя ягонага не ведаю!»

Дзевяцьсот…

Людзі, як цені, павольна рухаліся па горадзе. Як у сне… У глыбокім сне… То бок ты гэта бачыш, але думаеш, што ты бачыш сон. Вось гэтыя павольныя… Вось гэтыя плаўныя рухі… Быццам не па зямлі ідзе чалавек, а па вадзе…

Голас змяняўся з голаду. Ці зусім прападаў. Нельга было вызначыць па голасе: мужчына гэта ці жанчына? І па адзенні нельга, усе захутаныя ў нейкія анучы. Наш сняданак… Наш сняданак быў кавалак шпалераў, старыя шпалеры, на іх застаўся клей. Мучны клей. Вось гэтыя шпалеры… І вар…

Дзевяцьсот дзён…

Іду з булачнай… Атрымала дзённы паёк. Гэтыя крыхі, гэтыя вартыя жалю грамы… А насустрач мне бяжыць сабака. Параўняўся са мною і абнюхвае — чуе пах хлеба.

Я разумела, што гэта — наша шчасце. Гэты сабака…

Наша выратаванне! Я прывяду сабаку дамоў…

Дала яму кавалачак хлеба, і ён пайшоў за мною. Каля дома яшчэ кавалачак адшчыпнула, ён лізнуў мне руку. Увайшлі ў наш пад'езд… Але па прыступках падымаўся ён неахвотна, на кожным паверсе спыняўся. Я аддала яму ўвесь наш хлеб… Кавалачак за кавалачкам… Так дабраліся мы да чацвёртага паверха, а наша кватэра на пятым. Тут ён заўпарціўся і не ідзе далей. Глядзіць на мяне… Штосьці адчувае. Разумее. Я яго абдымаю. «Сабака, міленькі, даруй… Сабака, міленькі, даруй…» Прашу яго, упрошваю. І ён пайшоў.

Дужа хацелася жыць…

Пачулі… Па радыё перадалі: «Блакада прарваная! Блакада прарваная!» — шчаслівейшых за нас людзей не

было. Больш шчаслівымі нельга было быць… Мы выстаялі! Блакада прарваная…

Па нашай вуліцы ішлі нашы салдаты. Я падбегла да іх… Абняць — сілаў не хапіла.

У Ленінградзе шмат помнікаў. Аднак няма аднога, які павінен быць. Пра яго забылі. Гэта помнік блакаднаму сабаку.

Сабака, міленькі, даруй…

## «А ЯНА ЎЦЯКАЛА: «ГЭТА НЕ МАЯ ДАЧКА! НЕ МАЯ-А-А!»

*Фаіна Люцко, 15 гадоў.*
*Цяпер — работніца кіно.*

Я кожны дзень успамінаю, аднак жыву... Як я жыву? Растлумачце мне...

Памятаю, што карнікі чорныя ўсе, чорныя... З высокімі фуражкамі... У іх нават сабакі былі чорныя. Блішчэлі.

Мы туліліся да маці... Яны не ўсіх забівалі, не ўсю вёску. Яны ўзялі тых, хто стаяў справа. І мы з мамай там стаялі... Нас падзялілі: дзяцей — асобна, а бацькоў — асобна. Мы зразумелі, што яны бацькоў зараз будуць расстрэльваць, а нас пакінуць. Там была мая мама... А я не хацела жыць без мамы. Я прасілася да яе і плакала. Нейкім чынам мяне пусцілі...

А яна — як убачыла... Як закрычыць:

— Гэта не мая дачка!

— Мамачка! Ма...

— Гэта не мая дачка! Не мая дачка! Не мая-а-а...

— Ма-а-а-мачка!

Вочы ў яе не слёз былі поўныя, а крыві. Поўныя вочы крыві...

— Гэта не мая дачка!

Кудысьці мяне адцягнулі... І я бачыла, як спачатку стралялі ў дзяцей. Стралялі і глядзелі, як бацькі пакутуюць. Расстралялі дзвюх маіх сясцёр і двух братоў. Калі

забілі дзяцей, пачалі забіваць бацькоў. Мамы я ўжо не ўбачыла... Мама, напэўна, упала...

Стаяла жанчына, трымала на руках немаўля, яно смактала вадзічку з пляшачкі. Яны выстралілі спачатку ў пляшачку, потым у дзіця... І толькі потым маці забілі...

Я здзіўляюся, як я пасля ўсяго гэтага жыву? Дзіцём выжыла... Але як я дарослая жыву? Я ўжо даўно дарослая...

## «ХІБА МЫ — ДЗЕЦІ?
## МЫ БЫЛІ МУЖЧЫНАМІ І ЖАНЧЫНАМІ...»

*Віктар Ляшчынскі, 6 гадоў.*
*Цяпер — дырэктар энергетычнага тэхнікума.*

Прыехаў я ў госці. Цётка паклікала на лета да сябе...

Жылі мы ў Быхаве, а цётка — у вёсцы Камуна пад Быхавам. У цэнтры вёскі стаяў доўгі дом, сем'яў на дваццаць — камунарскі дом. Гэта ўсё, што я паспеў запомніць.

Кажуць: «Вайна». Трэба ехаць да бацькоў. Цётка не пусціла:

—Вайна скончыцца, тады паедзеш.

—А хутка вайна скончыцца?

—Вядома, хутка.

Праз нейкі час прыходзяць пешкам бацькі: «У Быхаве немцы. Людзі разбягаюцца па вёсках». Засталіся мы ў цёткі.

Зімою зайшлі ў хату партызаны... Я папрасіў вінтоўку. Гэта былі маміны пляменнікі, а мае стрыечныя браты. Пасмяяліся і далі патрымаць у руках. Цяжкая.

У хаце ўвесь час пахла скурай. Цёплым клеем. Бацька шыў партызанам боты. Я прасіў, каб ён і мне пашыў боты. Ён казаў, маўляў, пачакай, у мяне шмат працы. А я, памятаю, даказваў, што мне трэба маленькія боты, у мяне ножка маленькая. Ён абяцаў...

Апошні ўспамін пра бацьку, як яго гоняць па вуліцы да вялікай машыны... І б'юць палкай па галаве...

...Скончылася вайна, а ў нас ні таты, ні хаты. Мне адзінаццаць гадоў, я самы старэйшы ў сям'і. Яшчэ двое — брацік і сястрычка, зусім маленькія. Мама ўзяла пазыку. Купіла старую хату, там быў такі дах, што калі ішоў дождж, схавацца не было дзе, усюды цякло. Цурчэла вада. У адзінаццаць гадоў я сам асаджваў вокны, перакрываў дах саломай. Будаваў хляўчук...

Як?

Першае бервяно закаціў і паклаў сам, другое — мама дапамагла. А вышэй падняць нам ужо не па сіле. Рабіў я так: абчашу бервяно на зямлі, засяку вугал і чакаю, калі жанчыны будуць ісці на працу ў поле. Раніцай яны разам учэпяцца і адно бервяно падымуць, я яго padраблю і апушчу ў вугал. Да вечара яшчэ адно бервяно абчашу. Яны ідуць увечары з працы, падымуць... І сцяна расце...

У вёсцы семдзесят двароў, і ўсяго два мужчыны з фронту вярнуліся. Адзін — на мыліцах. «Дзетачка! Мая ты дзетачка!» — галасіла нада мною мама. Я дзе сяду ўвечары, там і засну.

Хіба мы — дзеці? У дзесяць-адзінаццаць гадоў мы былі мужчынамі і жанчынамі...

## «НЕ АДДАВАЙ ЧУЖОМУ ДЗЯДЗЬКУ ТАТАВАГА КАСЦЮМА...»

*Валера Нічыпарэнка, 8 гадоў.*
*Цяпер — кіроўца тралейбуса.*

Гэта ўжо сорак чацвёрты год...

Мне, напэўна, было ўжо восем гадоў... Мы ўжо ведалі, што таты ў нас няма. Іншыя чакалі, атрымалі пахавальныя, аднак усё роўна чакалі. А ў нас быў дакладны знак. Доказ. Сябар таты пераслаў ягоны гадзіннік. Сыну... Мне... Пра гэта тата папрасіў яго перад смерцю. У мяне і цяпер гэты гадзіннік ёсць, я яго захоўваю.

Жылі мы на маленькі мамін заробак утраіх. Перабіваліся з вады на хлеб. Захварэла сястра. У яе выявілі адкрытую форму сухотаў. Дактары сказалі маме: трэба добрае харчаванне, трэба масла. Мёд. І кожны дзень — масла! Для нас гэта было золата. Кавалак золата... Штосьці неверагоднае... Па кірмашовых коштах мамінага заробку хапала на тры буханкі хлеба. А масла за гэтыя грошы можна было купіць дзвесце грамаў.

У нас заставаўся яшчэ татаў касцюм. Добры касцюм. Панеслі мы з мамай яго на кірмаш. Знайшоўся пакупнік, знайшоўся хутка. Бо касцюм быў прыгожы. Тата набыў яго перад самай вайной і не паспеў панасіць. Касцюм вісеў у шафе... Новенькі... Пакупнік прыцаніўся, патаргаваўся і грошы маме аддае, а я як закрычу на ўвесь кірмаш: «Не аддавай чужому дзядзьку татавага касцюма!..» Да нас нават міліцыянер падышоў...

Хто пасля гэтага скажа, што дзеці не былі на вайне? Хто...

## «НОЧЧУ Я ПЛАКАЛА: ДЗЕ МАЯ ВЯСЁЛАЯ МАМА?..»

*Галя Спаноўская, 7 гадоў.*
*Цяпер — тэхнік-канструктар.*

У памяці ёсць колер...

Тое, што было да вайны, памятаецца ўсё ў руху, яно рухаецца і змяняе фарбы. Часцей за ўсё — фарбы яркія. А вайна, дзіцячы дом — усё нібыта спынілася. І фарбы шэрыя.

Нас везлі ў тыл. Адных дзяцей. Без мам. Везлі доўга, вельмі доўга. І кармілі печывам ды шакаладным маслам, відаць, нічым іншым запасціся на дарогу не паспелі. Да вайны я любіла печыва і шакаладнае масла, гэта вельмі смачна. Але за месяц дарогі я разлюбіла іх на ўсё жыццё.

Усю вайну мне хацелася, каб хутчэй прыехала мама, і мы вярнуліся ў Мінск. Мне сніліся вуліцы, кінатэатр каля нашага дома, мне сніліся трамвайныя званкі. Мама ў мяне была вельмі добрая, вельмі вясёлая, мы з ёй жылі, як сяброўкі. Таты не памятаю, таты ў нас рана не стала.

І вось мама знайшла мяне і прыехала ў дзіцячы дом. Гэта было зусім нечакана. Радасць! Бягу да мамы... Адчыняю дзверы... Стаіць нейкі вайсковец: у штанах, у ботах, пілотцы, гімнасцёрцы. Хто гэта? А гэта, аказваецца, мая мама — поўнае захапленне! Мама, ды яшчэ вайсковая!

Як яна ад'язджала, не памятаю, я вельмі плакала, таму, пэўна, не памятаю.

Зноў чакаю маму і чакаю. Тры гады чакаю. Мама прыехала ўжо ў сукенцы. У туфлях. Ад гэтай радасці, што цябе забіраюць, я нічога не бачыла, была толькі мама — і гэтая радасць! Я глядзела на маму, але не заўважала, што ў яе няма аднога вока. Мама — гэта нейкі цуд... З ёй нічога не можа здарыцца... Мама! А мама прыехала з фронту вельмі хворая. Гэта была ўжо іншая мама. Яна мала ўсміхалася, яна не спявала, не жартавала, як раней, яна шмат плакала.

Вярнуліся ў Мінск і жылі вельмі цяжка. Мы не знайшлі свайго дома, які я так любіла. Не было нашага кінатэатра... І нашых вуліц... Замест усяго — камяні ды камяні...

Мама заўсёды была сумная. Не жартавала і мала размаўляла. Больш маўчала.

Ноччу я плакала: дзе мая вясёлая мама? А раніцай усміхалася, каб мама не здагадвалася пра мае слёзы...

## «ЁН НЕ ДАЕ МНЕ ПАЛЯЦЕЦЬ...»

*Вася Савульчанка, 8 гадоў.*
*Цяпер — сацыёлаг.*

Пасля вайны мне доўга не даваў спакою адзін і той жа сон...

Сон пра першага забітага немца... Якога я сам забіў, а не бачыў забітага іншымі. То я лячу, і ён мяне не пускае. Вось падымаюся... Лячу... Лячу... Ён даганяе, і я падаю разам з ім. Правальваюся ў нейкую яміну. То я хачу падняцца, устаць... А ён не дае... З-за яго я не магу паляцець...

Адзін і той жа сон... Ён пераследаваў мяне дзясяткі гадоў...

Да таго часу, калі я забіў гэтага немца, я ўжо шмат што бачыў... Я бачыў, як застрэлілі майго дзеда на вуліцы, а бабулю — каля нашае студні... На маіх вачах маму білі прыкладам па галаве... Валасы ў яе зрабіліся чырвонымі... Аднак калі я страляў у гэтага немца, я не паспеў пра гэта падумаць. Ён быў паранены... Я хацеў забраць у яго аўтамат, мне сказалі забраць у яго аўтамат. Мне было дзесяць гадоў, партызаны ўжо бралі мяне на заданні. Падбягаю да яго і бачу, як перад маімі вачыма скача пісталет, немец у яго ўчапіўся дзвюма рукамі і водзіць перад маім тварам. Але ён не паспявае першым стрэліць, паспяваю я...

Я не спалохаўся, што забіў... І падчас вайны яго не згадваў. Вакол было шмат забітых, мы жылі сярод забітых. Нават прывыклі. Адзін толькі раз мне стала

страшна. Зайшлі ў вёску, якую нядаўна спалілі. Раніцай спалілі, а ўвечары мы прыйшлі. Я ўбачыў абгарэлую жанчыну... Яна ляжала ўся чорная, а рукі белыя, жывыя жаночыя рукі. Вось тады мне ўпершыню стала страшна. Я хацеў закрычаць, аднак стрымаўся.

Не, дзіцём я не быў. Не памятаю сябе дзіцём. Хоць... Забітых не баяўся, а ісці ноччу ці ўвечары праз могілкі баяўся. Мёртвыя, якія на зямлі, не палохалі, а тыя, што ў зямлі, палохалі. Дзіцячы страх... Ён застаўся. Хоць... Хоць я думаю, што дзеці нічога не баяцца...

Вызвалілі Беларусь... Паўсюль ляжалі забітыя немцы. Сваіх падбіралі, хавалі ў брацкіх магілах, а немцы доўга ляжалі, асабліва зімою. Дзеці бегалі ў поле глядзець на мёртвых... І тут жа, непадалёку, працягвалі гуляць «у вайну» ці «у казакоў-разбойнікаў».

Я здзівіўся, калі праз шмат гадоў з'явіўся гэты сон пра забітага немца... Гэта было нечакана для мяне...

А сон пераследаваў дзясяткі гадоў...

У мяне сын, ужо дарослы мужчына. Калі ён быў маленькім, я пакутаваў ад самой думкі — паспрабаваць распавесці яму... Распавесці пра вайну... Ён распытваў, а я пазбягаў размовы. Я любіў чытаць яму казкі, я хацеў, каб у яго было дзяцінства. Ён вырас, а мне ўсё роўна не хочацца размаўляць з ім пра вайну. Можа быць, калінебудзь я раскажу яму пра свой сон. Можа быць... Я не ўпэўнены...

Гэта можа разбурыць ягоны свет. Свет без вайны... Людзі, якія не бачылі, як чалавек забівае чалавека, гэта зусім іншыя людзі...

## «УСІМ ХАЦЕЛАСЯ ПАЦАЛАВАЦЬ СЛОВА "ПЕРАМОГА"...»

*Аня Корзун, 2 гады.*
*Цяпер — заатэхнік.*

Я памятаю, як вайна скончылася... Дзявятага мая сорак пятага года...

У дзіцячы садок прыбеглі жанчыны:

—Дзеці, перамога! Перамога-а-а!

Усе смяюцца і плачуць. Плачуць і смяюцца.

Пачалі ўсе нас цалаваць. Незнаёмыя жанчыны... цалуюць і плачуць... Цалуюць... Уключылі рэпрадуктар. Усе слухалі. А мы, маленькія, словаў не разумелі, мы разумелі, што радасць ідзе адтуль, зверху, з чорнай талерачкі рэпрадуктара. Каго падымалі на руках дарослыя... Хто сам лез... Залазілі адно на аднога лесвічкай, толькі трэці ці чацвёрты даставаў да чорнай талерачкі і цалаваў яе. Потым мяняліся. Усім хацелася пацалаваць слова «Перамога»...

Увечары быў салют. Неба ззяла. Мама расчыніла вакно і заплакала:

—Дачушка, запомні гэта на ўсё жыццё...

Калі вярнуўся з фронту тата, я яго баялася. Ён дасць мне цукерку і просіць:

—Скажы: тата...

Вазьму цукерку, схаваюся з ёю пад стол:

—Дзядзя...

У мяне ўсю вайну таты не было. Я вырасла з мамай і бабуляй. З цёткай. Не ўяўляла: што будзе рабіць у нашым доме тата?

Ён жа прыйдзе з вінтоўкай...

## «У КАШУЛІ З ТАТАВАЙ ГІМНАСЦЁРКІ...»

*Мікола Бярозка, 1945 года нараджэння.*
*Цяпер — таксіст.*

Нарадзіўся я ў сорак пятым годзе, але вайну памятаю. Я ведаю вайну.

Мама зачыняла мяне ў іншым пакоі... Ці выпраўляла на вуліцу да хлопчыкаў... Але я ўсё роўна чуў, як крычаў тата. Ён крычаў доўга. Я прыпадаў да шчылінкі паміж створкамі дзвярэй: тата качаўся па падлозе і біў кулакамі: «Вайна! Праклятая вайна!»

Калі боль праходзіў, тата браў мяне на рукі, я кранаўся ягонай нагі:

— Гэта вайна баліць?

— Вайна! Яна, праклятая, — адказваў тата.

А яшчэ... У суседзяў былі два маленькія хлопчыкі... Я з імі сябраваў... Яны падарваліся за вёскай на міне. А гэта быў ужо, напэўна, сорак дзявяты год...

Іхная мама, цётка Ганна, кідалася да іх у магілу. Яе выцягвалі... Яна крычала... Людзі так не крычаць...

У школу я пайшоў у кашулі з татавай гімнасцёркі. Шчаслівы. Ува ўсіх хлопчыкаў, чые бацькі вярнуліся з вайны, кашулі былі пашытыя з бацькоўскіх гімнасцёрак.

Пасля вайны тата памёр ад вайны. Ад ранаў.

Мне не трэба нічога прыдумваць. Я бачыў вайну. Мне сніцца вайна. Я ў сне плачу, што заўтра прыйдуць і забяруць нашага тату. У доме пахне новым вайсковым сукном...

Вайна! Яна, праклятая...

## «Я ЎПРЫГОЖЫЛА ЯЕ ЧЫРВОНЫМІ ГВАЗДЗІКАМІ...»

*Марыям Юзэфоўская, 1941 года нараджэння.*
*Цяпер — інжынерка.*

Я нарадзілася ў вайну. І за час вайны вырасла.

І вось... Чакаем з вайны тату...

Што толькі са мною мама ні рабіла: стрыгла нагала, націрала газай, прыкладвала мазь. А я ненавідзела сябе адчайна. Саромелася. Нават у двор не выходзіла. Вошы і скулы ў першы пасляваенны год... Ад іх не было ратавання...

А тут гэтая тэлеграма: тата дэмабілізуецца. Прыйшлі сустракаць на вакзал. Мама мяне прыгожа апранула. На самую макаўку чырвоны бант прывязала. На чым ён толькі трымаўся — незразумела. І ўвесь час торгае мяне: «Не чашыся. Не чашыся». Сверб жа нясцерпны! Праклятны бант вось-вось адваліцца. А ў галаве круцілася: «А раптам я тату не спадабаюся? Ён жа мяне яшчэ ні разу не бачыў».

Аднак тое, што адбылося, было яшчэ горш. Тата ўбачыў і кінуўся да мяне першы. Але адразу ж... На імгненне, на нейкае імгненне... Аднак я адчула гэта адразу... скурай, усім цельцам... Ён як быццам адхінуўся... На адно імгненне... І так крыўдна стала. Так невыносна горка. Што калі ён узяў мяне на рукі, я з усіх сілаў штурхнула яго ў грудзі. У нос мне раптам ударыў пах газы. А ён жа суправаджаў мяне паўсюль і заўсёды ўжо год, я было перастала яго чуць. Прывыкла ўжо. А тут пачула. Можа, таму, што ад таты так цудоўна і незнаё-

ма пахла. Ён быў такі прыгожы ў параўнанні са мною і спакутаванай мамай. І гэта ўджаліла мяне ў самую душу. Я сарвала бант. Кінула на зямлю. І наступіла на яго нагой.

—Што ты робіш? — здзівіўся тата.

—Твой характар, — засмяялася мама, якая ўсё разумела.

Яна трымалася за тату дзвюма рукамі, яны і дамоў так ішлі.

Ноччу я клікала маму, прасіла, каб яна ўзяла мяне да сябе ў ложак. Я заўсёды спала з мамай… Усю вайну… Але мама не адгукалася, нібыта яна спіць. І мне не было каму распавесці пра сваю крыўду.

Ужо засынаючы, я вырашыла, што ўцяку ў дзіцячы дом…

Раніцай тата падараваў мне дзве лялькі. А ў мяне да пяці гадоў не было сапраўдных лялек. Адныя самаробкі з анучак. Бабуліны. У лялек, якія прывёз тата, вочы заплюшчваліся і расплюшчваліся, рухаліся рукі і ногі, адна пішчала нешта кшталту «мама». Мне гэта здавалася чарадзействам. Вельмі даражыла імі, баялася нават на вуліцу выносіць. Але ў вакно паказвала. Мы жылі на першым паверсе, паглядзець на мае лялькі збіраліся дзеці з усяго двара.

Была я слабая, хваравітая. Вечна мне не шанцавала. То лоб разаб'ю, то на цвік наступлю. А то і ўвогуле прытомнасць страчу ды ўпаду. І дзеці мяне ў свае гульні не вельмі каб бралі. Чаго я толькі не вынаходзіла, каб дабіцца іх даверу. Дайшла нават да таго, што пачала падлізвацца да Дусі, дачкі дворнічыхі. Дуся была дужая, вясёлая. Гуляць з ёю любілі ўсе.

Яна папрасіла мяне вынесці ляльку, я не стрымалася. Праўда, не адразу. Яшчэ нейкі час супраціўлялася.

## «Я ДОЎГА ЧАКАЎ НАШАГА ТАТКУ... УСЁ МАЁ ЖЫЦЦЁ...»

*Арсен Гуцін, 1941 года нараджэння.*
*Цяпер — электрык.*

У Дзень Перамогі мне споўнілася чатыры гады…

З раніцы я пачаў усім казаць, што мне ўжо пяць гадоў. Не пяты год, а пяць гадоў. Хацеў стаць вялікім. Тата вернецца з вайны, а я ўжо вялікі.

Старшыня ў гэты дзень склікаў жанчын: «Перамога!» Пацалаваў усіх. Кожную. Я быў з мамай… Радаваўся. А мама плакала.

Сабраліся ўсе дзеці… За вёскай шыны гумавыя ад нямецкіх машынаў падпалілі. Крычалі: «Ура! Ур-ра! Перамога!» Білі ў нямецкія каскі, якіх перад гэтым назбіралі ў лесе. Білі, як у барабаны.

Жылі мы ў зямлянцы… Я прыбег у зямлянку… Мама плача. Я не разумеў, чаму яна плача, а не радуецца ў такі дзень.

Пачаўся дождж, я адламаў дубчык і мераў лужынкі каля нашай зямлянкі.

— Што робіш? — пыталіся ў мяне.

— Мераю, — ці глыбокая ямка? А то татка будзе да нас ісці і праваліцца.

Суседзі плачуць, і мама плача. Я ж не разумеў, што гэта такое — «прапаў без вестак».

Я доўга чакаў татку. Усё маё жыццё…

## «ЛЯ ТОЙ МЯЖЫ... ЛЯ ТОГА КРАЮ...»

*Валя Брынская, 12 гадоў.*
*Цяпер — інжынерка.*

Лялькі... Самыя прыгожыя... Яны заўсёды нагадваюць мне пра вайну...

Пакуль тата быў жывы, пакуль мама была жывая, мы пра вайну не расказвалі. Цяпер, калі іх няма, я часта думаю, як добра, калі ў хаце ёсць старэйшыя. Пакуль яны жывыя — мы яшчэ дзеці. Нават пасля вайны мы яшчэ дзеці...

Тата наш быў вайскоўцам. Жылі мы пад Беластокам. Вайна пачалася для нас з першай гадзіны, з першых хвілінаў. Скрозь сон чую нейкі гул, нібыта грукат грому, але нейкага нязвыклага, безупыннага. Прачынаюся і бягу да вакна — над казармамі ў мястэчку Граева, куды мы з сястрою хадзілі ў школу, гарыць неба.

—Тата, гэта навальніца?

Тата сказаў:

—Адыдзі ад вакна, гэта вайна.

Мама збірае яму паходны чамадан. Па трывозе тату падымалі часта. Як быццам нічога незвычайнага... Мне хацелася спаць... Звалілася ў ложак, бо нічога не зразумела. Ляглі з сястрою позна — хадзілі ў кіно. У тую даваенную пару хадзіць у кіно было зусім не тое, што цяпер. Фільмы прывозілі толькі перад выходным днём, і іх было няшмат: «Мы из Кронштадта», «Чапаев», «Если завтра война», «Весёлые ребята». Прагляд рабілі ў чырвонаармейскай сталоўцы. Мы, дзеці, не прапускалі

ніводнага паказу і ведалі ўсе фільмы на памяць. Нават падказвалі акторам на экране альбо забягалі наперад, перабіваючы іх. Электрычнасці ні ў вёсцы, ні ў частцы не было, кіно «круцілі» з дапамогай рухавічка — «дзвіжка». Загрукоча рухавічок — кідаем усё і бяжым займаць месцы каля экрану, а то і зэдлікі з сабою цягнем.

Ішлі фільмы доўга: закончыцца частка, усе цярпліва чакаюць, калі кінамеханік пераматае чарговую бабіну. Добра, калі стужка новая, а калі старая, дык яна пастаянна рвецца, — пакуль яе склеяць, пакуль падсохне. А то і загарыцца стужка — яшчэ горш. Зусім безнадзейная справа, калі рухавічок заглухне. Часта бывала, што фільм не паспявалі да канца дагледзець. Чулася каманда:

— Першая рота — на выхад! Другая рота — на пастраенне!

А калі падымалі па трывозе, дык і кінамеханік сыходзіў. Калі перапынкі паміж часткамі моцна зацягваліся, трыванне ў гледачоў заканчвалася і пачыналася хваляванне, свіст, крыкі... Сястра залазіла на стол і аб'яўляла: «Пачынаем канцэрт». Сама яна страшна любіла, як тады казалі, дэкламаваць. Тэкст не заўсёды ведала добра, але на стол залазіла без страху.

Гэта ў яе засталося з дзетсадаўскіх часоў, калі мы жылі ў вайсковым гарнізоне пад Гомелем. Пасля вершаў мы з ёю спявалі, на біс нас выклікалі з песняй «Броня крепка и танки наши быстры». Шыбы ў сталоўцы дрыжэлі, калі байцы падхоплівалі прыпеў:

Гремя огнём, сверкая блеском стали,
Пойдут машины в яростный поход...

Дык вось, дваццаць першага чэрвеня сорак першага года... За ноч да вайны... У дзясяты, напэўна, раз мы

глядзелі фільм «Если завтра война»… Пасля кіно доўга не разыходзіліся, тата ледзь загнаў нас дамоў: «Спаць вы сёння будзеце? Заўтра — выходны».

…Канчаткова я прачнулася, калі выбух пачуўся побач і з вакна на варыўні пасыпалася шкло. Мама захутвала ў коўдрачку паўсоннага брацікa Толіка. Сястра ўжо была апранутая, таты дома няма.

— Дзяўчаткі, — прыспешвае мама, — хутчэй. На мяжы правакацыя.

Мы бяжым да лесу: мама задыхаецца, у яе на руках брацік, і ўвесь час паўтарае:

— Дзяўчаткі, не адставайце… Дзяўчаткі, прыгніцеся…

Чамусьці мне запомнілася, што вельмі моцна біла ў вочы сонца. Было ясна-ясна. Пелі птушкі. І гэты пранізлівы гуд самалётаў…

Я дрыжэла, а потым мне стала сорамна, што я дрыжу. Я заўсёды хацела быць падобнай да мужных герояў з кнігі Аркадзя Гайдара «Цімур і яго каманда», а тут раптам дрыжу. Узяла брацікa на рукі, стала яго калыхаць і нават напяваць: «І дзяўчынка маладая…» Была такая «любоўная» песня ў фільме «Варатар». Яе часта спявала мама, і яна вельмі добра клалася на мой тагачасны настрой. Я была… закаханая! Не ведаю, як там згодна з навукай, кнігамі па псіхалогіі падлеткаў, але я заўсёды хадзіла закаханай. Быў час, калі мне падабаліся адразу некалькі хлопчыкаў. Але ў той момант падабаўся мне адзін — Віця з граеўскага гарнізону, ён вучыўся ў шостым класе. А гэты шосты клас быў з нашым пятым у адным пакоі. Першы шэраг партаў — пяты клас, другі шэраг — шосты клас. Не ўяўляю, як настаўнікам удавалася весці ўрокі. Мне было не да ўрокаў. Як я сабе шыю не звярнула, выварочваючы вочы на Віцю!

Мне падабалася ў ім усё: і тое, што ён быў маленькага росту — такі, як і я, што ў яго блакітныя-блакітныя вочы — як у майго таты, і тое, што ён быў вельмі начытаны — не тое, што Алька Паддубняк, які даваў балючыя пстрычкі і якому падабалася я. Віця асабліва любіў Жуля Верна! Як і я. У чырвонаармейскай бібліятэцы быў ягоны поўны збор твораў, і я ўвесь прачытала…

Не памятаю, колькі мы прасядзелі ў лесе… Стала не чутна выбухаў. Наступіла цішыня. Жанчыны з палёгкай уздыхнулі: «Адбілі нашы». Але тут… Сярод гэтай цішыні… Раптам пачуўся гул самалётаў… Мы выскачылі на дарогу. Самалёты ляцелі ў бок мяжы: «Ур-ра!» Аднак штосьці «не наша» было ў гэтых самалётах: крылы не нашы і гулі яны не па-нашаму. Гэта былі нямецкія бамбардзіроўшчыкі, яны ляцелі крыло ў крыло, павольна і цяжка. Здавалася, што ад іх на небе няма прасвету. Мы пачалі лічыць, збіліся з ліку. Пазней ужо, у хроніцы ваенных гадоў, я бачыла гэтыя самалёты, але ўражанне — не тое. Здымкі рабілі на ўзроўні самалётаў. А калі на іх глядзіш знізу, скрозь галіны дрэваў ды яшчэ вачыма падлетка — жахлівае відовішча. Мне потым часта сніліся гэтыя самалёты. Але сон быў з працягам — усё гэтае жалезнае неба павольна падала на мяне і ціснула, ціснула, ціснула. Прачыналася я ў халодным поце, і мяне білі дрыжыкі. Жах!

Нехта сказаў, што разбамбілі мост. Мы спалохаліся: а як жа тата? Тата не пераплыве, ён не ўмее плаваць.

Цяпер не магу сказаць дакладна… Аднак памятаецца мне, што тата прыбег да нас: «Вас эвакуююць на машыне». Перадаў маме тоўсты альбом з фотаздымкамі і цёплую ватную коўдру: «Ухутай дзяцей, прадзьме». Узялі з сабою толькі гэта. Так спяшаліся. Ні дакументаў, ні пашпарта, ні капейкі грошай. У нас з сабой была яшчэ

каструлька катлет, якую мама прыгатавала на выходны дзень, і чаравічкі брата. А сястра — о, цуд! — схапіла ў апошні момант нейкі пакет, там былі маміна крэпдэшынавая сукенка і туфлі. Нейкім цудам. Выпадкова. Можа быць, яны з татам хацелі на выходныя паехаць у госці? Успомніць ужо ніхто не мог. Мірнае жыццё знікла імгненна, адступіла на далёкі план.

Так мы эвакуяваліся...

Да станцыі даехалі хутка, а на станцыі сядзелі доўга. Усё дрыжэла і грымела. Патухла святло. Пачалі паліць паперу, газеты. Знайшоўся ліхтар. Ад яго святла аграмадныя цені людзей — па сценах, па столі. Яны то застывалі, то рухаліся. І вось тут маё ўяўленне разыгралася: немцы — у крэпасці, нашы — у палоне. Я вырашыла паспрабаваць — вытрымаю катаванні ці не. Засунула пальцы паміж скрынак і прыціснула. Завыла ад болю. Мама спалохалася:

—Што з табою, дачушка?

—Я баюся, што не вытрываю катаванняў на допыце.

—Што ты, дурнічка, які допыт? Нашы немцаў не прапусцяць.

Яна гладзіла мяне па галаве, цалавала ў макаўку.

Эшалон ішоў увесь час пад бомбамі. Толькі пачынаюць бамбіць, мама кладзецца на нас: «Калі заб'юць, дык разам. Ці мяне адну...» Першы забіты, якога я ўбачыла, быў маленькі хлопчык. Ён ляжаў і глядзеў уверх, а я яго будзіла. Будзіла... Я не магла зразумець, што ён нежывы. У мяне быў кавалачак цукру я давала яму гэты кавалачак цукру, каб ён толькі ўстаў. А ён не ўставаў...

Бамбяць, а сястра шэпча мне: «Перастануць бамбіць, і я буду слухацца маму. Заўсёды буду слухацца яе». І сапраўды, пасля вайны Тома была вельмі паслухмянай.

Мама згадвала, што да вайны клікала яе гарэзай. А наш маленькі Толік... Ён да вайны ўжо добра хадзіў, добра размаўляў. А тут ён перастаў размаўляць, увесь час хапаўся за галаву.

Я бачыла, як пасівела мая сястра. У яе былі доўгія-доўгія чорныя валасы, яны пабялелі. За адну ноч...

Цягнік крануўся. А дзе Тамара? У вагоне яе няма. Глядзім, а Тамара бяжыць за вагонам з букетам васількоў. Там было вялікае поле, пшаніца вышэй за наш рост, а ў ёй васількі. Ейны твар... Да гэтай пары ейны твар — у мяне перад вачыма. Чорныя вачаняты расплюшчаныя шырока, бяжыць, маўчыць. Нават «мама» не крычыць. Бяжыць і маўчыць.

Мама як звар'яцела... Яна ірвецца выскачыць з цягніка на хаду... Я трымаю Толіка, і разам крычым. І тут з'яўляецца салдат... Ён адштурхнуў маму ад дзвярэй, выскачыў, дагнаў Томку і з размаху кінуў яе ў вагон. Раніцай мы ўбачылі, што яна белая. Некалькі дзён ёй нічога не казалі, хавалі наша люстэрка, пакуль яна выпадкова не зірнула ў чужое і не заплакала:

—Мама, я ўжо бабуля?

Мама яе супакойвала:

—Абстрыжэм, зноў вырастуць чорныя.

Пасля гэтага выпадку мама сказала:

—Усё. З вагона — нікуды. Заб'юць дык заб'юць. Застанёмся жывымі, значыць, лёс!

Калі крычалі: «Самалёты! Усім выходзіць з вагонаў!», — яна запіхвала нас пад матрацы, а тым, хто выганяў яе з вагона, казала:

—Дзеці пабеглі, а я ісці не магу.

Трэба сказаць, што мама часта ўжывала такое загадкавае слова: «лёс». Я ўсё дапытвалася ў яе:

—Што такое лёс? Гэта — Бог?

— Не, не Бог. У Бога я не веру. Лёс — гэта лінія жыцця, — адказвала мама. — Я заўсёды, дзеці, верыла ў ваш лёс.

Пад бамбёжкай мне было страшна... Жахліва страшна. Потым ужо, у Сібіры, я сябе ненавідзела за баязлівасць. Выпадкова, краем вока прачытала мамін ліст... Яна пісала тату. Мы таксама складалі першыя ў сваім жыцці лісты, і я вырашыла падгледзець, што піша мама. А мама якраз пісала, што Тамара маўчыць, калі бамбяць, а Валя плача і баіцца. І для мяне гэтага было дастаткова. Калі вясною сорак чацвёртага да нас прыехаў тата, я не магла на яго вачэй падняць — мне было сорамна. Жах! Аднак пра сустрэчу з татам потым. Да яе яшчэ далёка...

Успамінаю начны налёт... Звычайна ноччу налётаў не было, і цягнік ішоў хутка. А тут налёт. Моцны налёт... Кулі барабаняць па даху вагона. Равуць самалёты. Светлавыя палосы ад куляў, што ляцяць... Ад асколкаў... Побач са мною забіваюць жанчыну. Гэта я потым зразумела, што яна забітая... Але яна не падае. Упасці няма куды, бо вагон набіты людзьмі. Жанчына стаіць паміж намі і хрыпіць, ейная кроў залівае мне твар, цёплая, ліпкая. І вось ужо мая майка і трусікі мокрыя ад крыві. Калі мама закрычала, дакрануўшыся да мяне рукой:

— Валя, цябе забілі? — я нічога не магла адказаць.

Пасля гэтага ў мяне адбыўся нейкі пералом. Я ведаю, што пасля гэтага... Так... Я перастала дрыжэць. Мне ўжо было ўсё роўна... Не страшна, не балюча, не шкада... Было нейкае атупенне, абыякавасць.

Памятаю, што да Уралу мы адразу не даехалі. На нейкі час спыніліся ў вёсцы Баланда Саратаўскай вобласці. Прывезлі нас туды ўвечары, мы заснулі. Раніцай,

у шэсць гадзін, пастух ляснуў пугай, і ўсе жанчыны паўскоквалі, схапілі сваіх дзяцей і з крыкам «Бамбёжка!» выбеглі на вуліцу. Крычалі, пакуль не прыйшоў старшыня і не сказаў, што гэта пастух гнаў кароў. Тады ўсе апамяталіся…

Пачынаў гусці элеватар, палохаўся і дрыжэў наш Толік. Ён ні на секунду нікога ад сябе не адпускаў, толькі калі засне, можна было выйсці без яго на вуліцу. Мама пайшла з намі ў ваенкамат, каб даведацца пра тату, папрасіць дапамогі. Ваенкам у яе пытае:

—Пакажыце мне дакументы, што ваш муж камандзір Чырвонай Арміі.

Дакументаў у нас не было, быў толькі татаў фотаздымак, тата на ім у вайсковай форме. Ён узяў здымак і сумняваецца:

—А можа, гэта не ваш муж. Як вы дакажаце?

Толік убачыў, што ён трымае здымак і не аддае:

—Аддай тату…

Ваенкам засмяяўся:

—Ну, гэтаму «дакументу» я не магу не паверыць.

Сястра хадзіла плямістая, мама састрыгла ёй валасы. Кожную раніцу ўсе правяралі: якія будуць новыя: чорныя ці сівыя? Брат яе супакойваў: «Не пач, Тома… Не пач, Тома…» Валасы ўсё роўна выраслі белыя. Хлопчыкі яе дражнілі. Задражнівалі. Яна ніколі не здымала хусткі, нават на ўроках.

Прыйшлі са школы. Дома няма Толіка.

—Дзе Толік? — пабеглі на працу да мамы.

—Толік у бальніцы.

Нясем з сястрой па вуліцы блакітны вянок… З пралесак… І матроскі касцюмчык брата. З намі ідзе мама, яна сказала, што Толік памёр. Каля морга мама стала і зайсці туды не можа. Не адважваецца. Я зайшла адна

і адразу пазнала Толіка — ён ляжаў голенькі. У мяне ні адной слязінкі, я — драўляная.

Татаў ліст дагнаў нас у Сібіры. Мама ўсю ноч плакала, як напісаць тату, што сын памёр. Раніцай мы ўсе ўтрох аднеслі на пошту тэлеграму: «Дзяўчаткі жывыя. Тома пасівела». І тата здагадаўся, што Толіка няма. У мяне была сяброўка, у яе загінуў бацька, і я заўсёды ў канцы свайго ліста прыпісвала — яна прасіла: «Тата, прывітанне табе ад мяне і ад сяброўкі Леры». Усім хацелася мець тату.

Хутка ад таты прыйшоў ліст. Ён пісаў, што доўга быў з асаблівым заданнем у тыле і захварэў. У шпіталі яму сказалі, што вылечыць яго можа толькі сям'я: ён убачыць родных, і яму стане лягчэй.

Тату чакалі некалькі тыдняў. Мама дастала з чамадана сваё запаветнае… крэпдэшынавую сукенку і туфлі. У нас была дамова — не прадаваць гэтую сукенку і туфлі, як бы ні было цяжка. З-за прымхаў. Баяліся: калі мы іх прададзім, дык тата не вернецца.

Чую праз вакно татаў голас і не магу паверыць: няўжо гэта тата? Не верылася, што я магу ўбачыць тату, мы прывыклі яго чакаць. Для нас тата быў тым, каго трэба чакаць і толькі чакаць. У той дзень сарваліся заняткі — вакол нашага дома сабралася ўся школа. Чакалі, калі выйдзе тата. Ён быў першым татам, які прыехаў з вайны. Яшчэ два дні мы з сястрой не вучыліся, да нас без канца прыходзілі, распытвалі, пісалі цыдулачкі: «Які тата?» А тата ў нас асаблівы — Герой Савецкага Саюза, Антон Пятровіч Брынскі…

Тата, як калісьці наш Толік, не хацеў быць адзін. Не мог. Яму было кепска аднаму. Ён паўсюль цягаў мяне з сабой. Аднойчы я пачула… Ён расказваў камусьці, як партызаны падышлі да вёскі і ўбачылі шмат свежа

ўскапанай зямлі. Спыніліся. Стаяць на ёй… А праз поле бяжыць хлопчык і крычыць, што тут расстралялі іхнюю вёску і закапалі. Усіх людзей.

Тата азірнуўся, бачыць — я падаю. Больш ніколі пры нас ён пра вайну не расказваў…

Мы размаўлялі пра вайну мала. Тата з мамай былі ўпэўненыя, што такой страшнай вайны больш ніколі не будзе. Яны доўга ў гэта верылі. Адзінае, што ў нас з сястрой засталося ад вайны, — мы куплялі лялькі. Я не ведаю чаму. Таму, напэўна, што нам не хапіла дзяцінства. Дзіцячых радасцяў. Вучылася я ў інстытуце, сястра ведала: найлепшы падарунак для мяне — лялька. У сястры нарадзілася дачка, я прыехала да яе:

—Што табе падарыць?

—Ляльку…

—Я пытаю, што табе падарыць, а не тваёй дзяўчынцы.

—Я адказваю: падары мне ляльку.

Раслі нашы дзеці — мы дарылі ім лялькі. Мы ўсім дарылі лялькі, усім нашым знаёмым.

Першай не стала нашай чароўнай мамы, потым не стала нашага таты. Мы адчулі, адразу адчулі, што мы — апошнія. Мы — апошнія сведкі. Наш час заканчваецца. Мы павінны гаварыць…

Нашыя словы будуць апошнімі…

1978–2004

# ЗМЕСТ


Замест прадмовы .......... 5

«Ён азірнуцца баяўся…» .......... 6

«Мая першая і апошняя цыгарэта…» .......... 8

«Бабуля малілася… Яна прасіла,
каб мая душа вярнулася…» .......... 12

«Яны ляжалі на вуголлі ружовыя…» .......... 13

«А я ўсё роўна хачу маму…» .......... 17

«Такія прыгожыя нямецкія цацкі…» .......... 21

«Адна жменька солі…
Усё, што засталося ад нашага дома…» .......... 27

«І пацалавала ў падручніку ўсе партрэты…» .......... 31

«Я іх рукамі збірала… Яны белыя-белыя…» .......... 33

«Жыць хачу! Жыць хачу!..» .......... 35

«Праз пяцельку для гузіка…» .......... 37

«Толькі мамін крык чула…» .......... 41

«Мы гулялі, а салдаты плакалі…» .......... 44

«На могілках нябожчыкі ляжалі наверсе…
Як быццам яшчэ раз забітыя…» .......... 47

«І зразумеў — гэта бацька…
У мяне дрыжэлі калені…» .......... 49

«Заплюшчы вочы, сынок… Не глядзі…» .......... 52

«Брацік плача, бо яго не было, калі быў тата…» .......... 56

«Першай прыйшла гэтая дзяўчынка…» ....................... 57
«Я — твая мама…» ....................... 60
«Просім: можна аблізаць?..» ....................... 62
«…Яшчэ паўлыжачкі цукру» ....................... 64
«Хатка, не гары! Хатка, не гары!..» ....................... 68
«Яна прыйшла ў белым халаце, як мама…» ....................... 71
«Цётачка, вазьміце мяне на калені…» ....................... 74
«…І стала калыхаць, як ляльку» ....................... 76
«Мне ўжо буквар купілі…» ....................... 78
«…І не жаніхі, і не салдаты» ....................... 88
«Хоць бы адзін сыночак застаўся…» ....................... 90
«Слёзы рукавом выцірае…» ....................... 93
«Ён вісеў на вяровачцы, як дзіцянё…» ....................... 95
«Цяпер будзеце маімі дзецьмі…» ....................... 98
«Мы цалавалі ім рукі…» ....................... 100
«Я глядзела на іх вачыма маленькай дзяўчынкі…» ... 102
«Мама наша не ўсміхалася…» ....................... 104
«Не магла прывыкнуць да свайго імя…» ....................... 106
«Гімнасцёрка ў яго была мокрая…» ....................... 108
«Як быццам яна яму дачку выратавала…» ....................... 111
«У атрад мяне неслі на руках…
Усё ўва мне было адбіта ад пятак да макаўкі…» ....................... 114
«А чаму я такі маленькі?..» ....................... 118
«Іх цягнула на чалавечы пах…» ....................... 120
«Навошта яны стралялі ў твар?
Мая мама была такая прыгожая…» ....................... 122
«Ты просіш, каб я цябе прыстрэліў…» ....................... 127

«А на мне нават касыначкі няма…» ........................ 132
«Гуляць на вуліцы няма з кім…» ........................ 136
«Я адчыню ноччу вакно…
І аддам аркушыкі ветру…» ........................ 139
«Капайце тут…» ........................ 145
«Дзядулю пахавалі пад вакном…» ........................ 147
«…Яшчэ рыдлёўкамі прыпляскалі,
каб было прыгожа» ........................ 148
«Куплю сабе сукенку з банцікам…» ........................ 151
«Як памёр, калі сёння не стралялі?..» ........................ 154
«Бо мы — дзяўчаткі, а ён — хлопчык…» ........................ 161
«Ты мне не брат, калі гуляеш
з нямецкімі хлопчыкамі…» ........................ 164
«Мы нават забылі гэтае слова…» ........................ 170
«Вам трэба ехаць на фронт,
а вы закахаліся ў маю маму…» ........................ 176
«У апошнія хвіліны яны выкрыквалі свае імёны…» .. 182
«Усе ўчатырох упрэгліся мы ў гэтыя саначкі…» ......... 183
«Гэтыя два хлопчыкі сталі лёгенькімі, бы вераб'і…» . 186
«Саромеўся, што чаравікі ў мяне дзявочыя…» .......... 189
«Я крычала і крычала… Не магла спыніцца…» ......... 194
«Усе ўзяліся за рукі…» ........................ 196
«Мы нават не ведалі, як хаваюць…
А тут аднекуль успомнілі…» ........................ 199
«Сабраў у кошык…» ........................ 201
«Кацянятаў яны вынеслі з хаты…» ........................ 204
«Запомні: Марыупаль, Паркавая 6…» ........................ 207

«Я чула, як у яго спынілася сэрца…» ..........................208
«Уцёк на фронт за сястрой, старшым сяржантам
Верай Рэдзькінай…» ..................................................212
«У той бок, адкуль узыходзіць сонца…» ........................213
«Белая кашуля ў цемры далёка свеціцца…» ..................217
«На чыстую падлогу, якую я толькі што вымыла…» .220
«А ці глядзеў на гэта Бог? І што ён думаў…» ..............223
«А белы свет — ненаглядны…» ...................................225
«Прыносілі доўгія вузкія цукеркі…
Падобныя да алоўкаў…» .............................................230
«Скрынка была якраз яму па росце…» ........................232
«Баялася ўбачыць гэты сон…» ...................................234
«Я хацела быць адна ў мамы…
І каб мама мяне песціла…» ........................................235
«А яны не танулі, як мячыкі…» ..................................237
«Запомніў сіняе-сіняе неба…
І нашы самалёты ў гэтым небе…» ...............................242
«Як спелыя гарбузы…» ..............................................244
«Мы елі… парк» .......................................................247
«Хто будзе плакаць, таго будзем страляць…» ..............251
«Мамачка і татачка — залатыя словы…» .....................253
«Прынеслі яе па кавалачках…» ..................................255
«У нас якраз вывеліся кураняты,
я баяўся, што іх заб'юць…» .......................................258
«Кароль хрэсці, кароль бубновы…» ............................259
«Вялікі сямейны фотаздымак…» ................................264
«Дык я вам хоць бульбачкі ў кішэні насыплю…» .......265

«Ма-ма мы-ла ра-му…» ....................................... 267
«Ён даў мне кубанку з чырвонай стужачкай…» ........ 270
«І страляю ўверх…» ............................................ 274
«У першы клас мама насіла мяне на руках…» ........... 276
«Сабака, міленькі, даруй… сабака,
міленькі, даруй…» ............................................ 278
«А яна ўцякала: «Гэта не мая дачка! Не мая-а-а!»...... 283
«Хіба мы — дзеці?
Мы былі мужчынамі і жанчынамі…» ........................ 285
«Не аддавай чужому дзядзьку
татавага касцюма…» .......................................... 287
«Ноччу я плакала: дзе мая вясёлая мама?..» .............. 288
«Ён не дае мне паляцець…» ................................. 290
«Усім хацелася пацалаваць слова "Перамога"…» ..... 292
«У кашулі з татавай гімнасцёркі…»......................... 293
«Я ўпрыгожыла яе чырвонымі гваздзікамі…» ........... 294
«Я доўга чакаў нашага татку… Усё маё жыццё…» ..... 298
«Ля той мяжы… Ля тога краю…» ........................... 299

12+

Алексіевіч Святлана Аляксандраўна

ГАЛАСЫ УТОПІІ | КНІГА ДРУГАЯ

АПОШНІЯ СВЕДКІ

Сола для дзіцячага голасу

Рэдактар Сяргей Дубавец

Карэктар Настасся Мацяш

Дызайн вокладкі Арцём Масюкевіч

Падпісана да друку 19.04.2018. Фармат 60×100/32.
Аб'ём 9,2 умоўн. друк. арк. Папера афсетная. Друк афсетны.
Гарнітура Charter ITC, Aeroport. Наклад 5 000. Заказ 3426/18.

Выдавец Logvino literatūros namai
J. Savickio g. 4, LT-01108 Vilnius
lohvinau.by

Друк ООО «ИПК Парето-Принт»

ISBN 978-609-8213-33-1

9 786098 213331

Галоўныя героі гэтай кнігі — дзеці, у якіх не было дзяцінства. Яны апошнія сведкі Вялікай вайны. А таму, бадай, самае частае пачуццё ў іхных расповедах — страх, самае частае жаданне — есці, і, адпаведна, самае частае слова — голад... Чытачы, якія возьмуць у рукі гэты томік Святланы Алексіевіч, пабачаць, што «Апошнія сведкі» — адна з самых беларускіх кніг лаўрэаткі Нобелеўскай прэміі. Большасць падзей адбываецца ў Беларусі, большасць апавядальнікаў — беларускія дзеткі, якім выпалі найжахлівейшыя жыццёвыя выпрабаванні: страта родных і бясконцая адзінота ў гэтым жорсткім свеце дарослых...

**БАРЫС ПЯТРОВІЧ**

ulej
Белгазпромбанк
Энергия твоего будущего!
Логвінаў

АПОШНІЯ СВЕДКІ

СВЯТЛАНА АЛЕКСІЕВІЧ